**Яўген Міраповіч**

# Найноўшая гісторыя Беларусі

**Санкт-Пецярбург**
**Неўскі Прасцяг**
**2003**

www.kamunikat.org

**УДК 947.6**«18-20»
ББК 63.3 (4Беі)

**Навуковы рэдактар**
**Аляксандр Краўцэвіч**
**доктар гістарычных навук**

**Падбор ілюстрацый**
**Уладзімера Ляхоўскага**

**Мірановіч Я.**

Найноўшая гісторыя Беларусі / Мірановіч Я.; Навук. рэд. Аляксандр Краўцэвіч. - Спб. Неўскі Прасцяг, 2003. - 243 с.: іл.

ISBN 5-94716-032-3

Аўтар разглядае гісторыю беларускай нацыі ад канца XIX стагоддзя да нашых дзён. Ён сцісла перадае асаблівасці кожнага з этапаў гістарычнага шляху, які прайшлі беларусы за гэты час, шукае адказ на пытанне, чаму лес народа стаўся менавіта такім, а не інакшым. Для ўсіх, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

**УДК 947.6**«18-20»
ББК 63.3 (4Беі)

**ISBN 5-94716-032-3**

© **Мірановіч Я. 2003**

www.kamunikat.org

## Прадмова навуковага рэдактара

Аўтар гэтай кнігі — беларус, грамадзянін Польшчы, прафесар Беластоцкага універсітэта, асоба, кроўна павязаная з беларускай культурай, і гісторык, які атрымаў адукацыю ў польскім універсітэце. Польскую Народную Рэспубліку нездарма называлі самым вясёлым баракам у савецкім лагеры. Універсітэты гэтай краіны захавалі некаторую аўтаномію і, калі параўноўваць з савецкімі калегамі, значна менш былі падданыя ідэалагічнаму дыктату камуністаў.

Працы па найноўшай гісторыі Беларусі, напісаныя савецкімі гісторыкамі за гады існавання БССР, не маюць нічога агульнага (а калі маюць, то вельмі мала) з рэальнай гісторыяй краіны. Тыя працы ствараліся пад пільным ідэалагічным кантролем апарату камуністычнай партыі і павінны былі апяваць савецкую рэчаіснасць і адвечнае імкненне беларусаў да яднання з Расеяй. З тае прычыны абсалютная большасць падобных твораў станавілася макулатурай адразу пасля выхаду з друкарскай машыны. З тае самае прычыны вялікая "армія" дыпламаваных беларускіх гісторыкаў найноўшага часу (каля тысячы дактароў і кандыдатаў навук) не здолела стварыць ніводнай навуковай сінтэзы гісторыі краіны XX стагоддзя.

Яўген Міранові́ч цалкам свабодны ад савецкіх ідэалагічных штампаў, прапагандысцкай тэрміналогіі і ўвогуле ад стылю мыслення савецкага чалавека. Адметнасцю аўтарскага стылю з'яўляецца "непрыўкрашанасць" інтэрпрэтацыі беларускай гісторыі. Падкрэслена сухая, "аб'ектывісцкая" будова тэксту спрацавала як прадуманы літаратурны прыём, які толькі ўзмацняе напругу і эмацыйнае ўздзеянне аўтарскага выкладу. Чытач не мае сумненняў, што аўтар не толькі спрабуе паказаць як развіваліся падзеі, але з глыбокім зацікаўленнем і хваляваннем шукае адказу на пытанне: "Чаму так сталася?" Гэтае хваляванне, аднак, не перашкаджае лагічнаму навуковаму аналізу, які афармляецца ў адстароненую, нават халаднаватую канстатацыю.

Абазнаны чытач не з усім пагодзіцца, у прыватнасці, з некаторымі ацэнкамі апошніх падзеяў у краіне. Але галоўнае ў кнізе тое, што яна ўяўляе сабою твор новай суб'ектнай гістарыяграфіі незалежнай Беларусі.

Аляксандар Краўцэвіч<br>
доктар гістарычных навук<br>
Старшыня выканкама Беларускага гістарычнага таварыства

www.kamunikat.org

# Уступ

У польскай гістарыяграфіі гісторыя Беларусі на фоне іншых суседзяў Польшчы займае надзвычай мала месца. У школьных падручніках Полацкае княства, якое паспяхова супраціўлялася інтэграцыі з сярэднявечнай дзяржавай Кіеўскай Руссю, нават не згадваецца. Цягам некалькіх стагоддзяў Беларусь уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. У свядомасці палякаў Вялікае Княства Літоўскае часта атаясамліваецца адно толькі з дзяржавай літоўцаў, хоць літоўцамі (ліцвінамі) у XVI стагоддзі называлі беларускіх князёў і баяраў, а старабеларуская мова была дзяржаўнай і на ёй вялося ўсё справаводства. У XIX стагоддзі тэрмін "Рэч Паспалітая" абазначаў тое ж, што і "Польшча", таму ўзнікненне на пераломе XIX і XX стагоддзяў беларускага нацыянальнага руху пераважнай большасцю польскіх элітаў успрымалася як ненатуральная з'ява і расейская інтрыга. Падобным чынам да гэтага пытання ставіліся расейскія ўлады, уважаючы яго за польскую выдумку.

Падзеі 1918-1920 гадоў надта выразна паказалі, што беларускія і польскія нацыянальныя інтарэсы ўзаемасупярэчныя. Беларускія нацыянальныя і палітычныя памкненні таксама нельга было пагадзіць з расейскімі імперскімі інтарэсамі, якія ажыццяўлялі бальшавікі.

Абвешчаная ў 1918 годзе беларуская дзяржаўнасць існавала больш як ідэя, чым рэальная палітычная з'ява. Аднак у свядомасці беларускіх элітаў яна набыла трывалы характар. На падзеленай у выніку Рыжскае дамовы тэрыторыі стварыліся розныя ўмовы нацыянальнага развіцця. Большасць беларускіх палітычных арганізацыяў, якія дзейнічалі ў ІІ Рэчы Паспалітай, не адмовіліся ад думкі пра незалежную і аб'яднаную Беларусь. Некалькі гадоў ліберальнага бальшавіцкага кіравання ў 1920-х гадах спрычыніліся да таго, што на тэрыторыі Савецкай Беларусі стварылася амаль беларуская нацыянальная дзяржава. Беларускія дзеячы са згоды цэнтральных савецкіх уладаў маглі ажыццяўляць найбольш смелыя планы, аб якіх марылі пад час І Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 года. Іх дасягненняў у галіне беларусізацыі не ўдалося цалкам знішчыць у 1930-х гадах, калі знішчаліся ўсе, хто меў хоць якое дачыненне да беларускай нацыянальнай ідэі.

У Беларусі некалькі дзесяткаў гадоў змагаюцца між сабою два погляды на форму нацыянальнага існавання. Кожная канцэпцыя дзяржаўнай і нацыянальнай самастойнасці разыходзіцца з мацнейшай прарасейскай арыентацыяй, якая працягвае існаваць у нязмененай форме ад часоў стваральніка ідэі "заходнерусізму" Міхаіла

Каяловіча. Расейска-праваслаўную супольнасць ён ставіў вышэй за беларускую нацыянальную. З вядомых прычынаў прарасейская арыентацыя падтрымоўвалася маскоўскімі ўладнымі цэнтрамі. Праяўлялася гэта ў кадравай палітыцы, прапагандзе і асабліва ў выхаванні маладых пакаленняў беларусаў. У дванаццацітамовай "Беларускай савецкай энцыклапедыі" дарма шукаць прозвішчы людзей, якія ўсякім спосабам выказваліся за незалежную Беларусь. Гэтыя людзі не згадваюцца таксама ў школьных падручніках, іх імёнамі не называлі ні вуліцы, ні гарадскія плошчы.

У свядомасці грамадзянаў рэспублікі замацаваўся такі вобраз свету, у якім усё добрае прыходзіць з Усходу, а дрэннае — з Захаду. Феадалізм, войны, голад, расстрэлы прыносілі палякі, французы, немцы, і толькі супольнае змаганне з расейскім народам дазваляла беларусам скінуць чужое панаванне. Такую ідэю прапагандаваў самы папулярны аўтар школьных падручнікаў па гісторыі БССР Лаўрэн Абэцэдарскі. Пасля некалькіх дзесяцігоддзяў унушэнняў нават калгас станавіўся апорай грамадскага і цывілізацыйнага парадку — даваў працу, патрэбныя для жыцця сродкі і бяспеку.

Ідэалізаваная прапагандай і школай карціна савецкай улады давяла да таго, што напрыканцы 1980-х гадоў шмат хто з недаверам успрыняў паведамленні прэсы аб сталінскім генацыдзе, свядомым знішчэнні беларускай мовы і культуры камуністычнымі героямі, імёны якіх упрыгожвалі назвы вуліцаў, заводаў, калгасаў. Крытыка камунізму пасля 1990 года для мільёнаў савецкіх грамадзянаў падалася аспрэчваннем дасягненняў іхнага жыцця. Зародкавая дэмакратыя была творам Захаду. Разам з яе надыходам апусцелі паліцы крамаў, з'явіліся няпэўнасць заўтрашняга дня, палітычны хаос, разбурэнне ўсёй іерархіі неаспрэчных каштоўнасцяў.

У гэтакай сітуацыі беларускім нацыянальным элітам пашанцавала дасягнуць значна болей, чым іхным папярэднікам у 1918 годзе. Беларусь дэ-юрэ стала незалежнай дзяржавай, суверэнітэт якой быў прызнаны ў свеце. Аднак вось ужо некалькі гадоў адбываецца адваротны працэс, некалькі гадоў прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка намагаецца абмежаваць суверэнітэт дзяржавы. Тым не менш, ліквідаваць становішча, якое склалася ў 1991 годзе, да гэтай пары не ўдалося. Беларусь і надалей застаецца незалежнай дзяржавай, хоць гэта не толькі заслуга яе грамадзянаў, але і вынік сітуацыі ў Расеі і міжнароднай кан'юнктуры.

www.kamunikat.org

# Беларусь у складзе Расіі

У канцы XVIII стагоддзя большасць беларускай шляхты падвяргласся паланізацыі. Хаця прадстаўнікі гэтай грамадскай праслойкі называлі сябе ліцьвінамі — насельнікамі Вялікага княства Літоўскага — аднак думалі палітычнымі катэгорыямі Рэчы Паспалітай, так як мазавецкая ці малапольская шляхта. Каталіцкае веравызнанне, мова, культура ўчынялі іх падобнымі да польскай эліты і заадно адрознівалі іх ад мясцовага народу. Старабеларуская літаратурная мова, на якой калісьці былі створаны статуты Вялікага княства Літоўскага, у сапраўднасці стала мовай мёртвай. Рознымі беларускімі гаворкамі карысталіся сялянства, маламестачковае насельніцтва і дробная шляхта. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння ўсіх беларускіх зямель да Расіі ў 1795 г., афіцыйна дзяржаўнай мовай стала руская, але фактычна да 1863 г. у публічным ужытку пераважала польская. Грамадскае павышэнне асоб плебейскага паходжання найчасцей рабіла іх палякамі або расіянамі.

Многае ўказвае на тое, што ў перыяд паўстання 1863 г. у колах польскіх элітаў панавала даволі распаўсюджанае перакананне, што беларусы з’яўляюцца ўскраінным (kresowym) польскім людам. Царская адміністрацыя ў сваю чаргу прыняла тэзіс, што беларусы — гэта “истинно русский народ”, і рабіла многа намаганняў, каб гэтая тэорыя стала рэчаіснасцю. Не абазначае гэта, што ў II палове XIX ст. не існавалі паняцці “беларус”, “беларусы”, “беларуская мова”. Наадварот, гэтымі тэрмінамі ахвотна карысталіся не толькі расійская адміністрацыя, але і навука, культура і асвета. Беларускасць, аднак, выступала ў гэтым выпадку ў кантэксце акрэсленай геаграфічнакультурнай прасторы, выключна як адзін з рэгіянальных кампанентаў расійскай супольнасці.

Беларуская пісьменнасць XIX стагоддзя, асабліва перыяду паўстання 1863 г., стваралася галоўным чынам у асяроддзі каталіцкай шляхты, ссылалася на польскую традыцыю змагання з Расіяй, ідэалізавала каталіцызм і колішнюю Рэч Паспалітую, прапагандавала супольнасць палітычных інтарэсаў Польшчы і Беларусі ў якасці яе правінцыі. Гэтая творчасць уздзейнічала аднак выключна на каталіцкае насельніцтва, якое складала ўсяго 20 працэнтаў ад агульнай колькасці жыхароў Беларусі. Адначасна непрыхільны тон тадышняй публіцыстыкі аблягчаў расійскім уладам мабілізацыю мясцовых праваслаўных элітаў да процідзеяння гэтым тэндэнцыям.

www.kamunikat.org

У другой палове XIX ст. развіваліся дзве беларускія інтэлектуальныя плыні, якія адлюстроўвалі тадышнія рэлігійныя падзелы. Паколькі католікі і праваслаўныя жылі быццам бы ва ўзаемнай духовай адасобленасці, падтрымоўванай, дарэчы, палітыкай расійскіх улад, таму нацыянальная ідэя гэтых двух канфесійных асяроддзяў развівалася рознымі шляхамі. Сярод праваслаўных вельмі папулярнай была ідэя заходнерусізму, вельмі блізкая царскай дактрыне расійскага народа, які складалі “велікарусы” (расіяне), “маларусы” (украінцы) і “заходнерусы” (беларусы). Галоўны ідэолаг гэтага руху — Міхаіл Каяловіч — патрабаваў увесці беларускую мову ў дзяржаўныя школы і ўрадавыя ўстановы ў Беларусі. Прапанаваў ён таксама правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы, а ў яе выніку — падзел вялікай зямельнай уласнасці і перадачу зямлі сялянам. Гэты апошні пастулат Каяловіча не быў доказам яго грамадскага радыкалізму, а толькі вынікам разважанняў “заходнерусаў” вакол нацыянальных пытанняў. Зыходзілі яны з перадумовы, што вялікая зямельная ўласнасць у Беларусі знаходзіцца перш за ўсё ў руках палякаў, а тых лічылі чужаземцамі, якія непрыхільна, а нават варожа ставяцца да беларусаў. Разглядалася нават — асабліва ў час паўстання 1863 г. — магчымасць перасялення палякаў “у Польшчу”, значыць, у межы Варшаўскага герцагства. Палякамі — паводле Каяловіча — лічыліся ўсе пражываючыя ў Беларусі католікі. Не дапускаў ён магчымасці ўзнікнення нацыянальнай катэгорыі беларусаўкатолікаў. “Заходнерусы” лічылі, што беларусы, якія перайшлі на каталіцызм, самі адракліся ад сваёй нацыянальнасці і сталі палякамі.

Пасля пацыфікацыі паўстання 1863 г. “заходнерускі” рух, па прычыне свайго грамадскага радыкалізму, аказаўся не надта выгадным саюзнікам для царскіх улад і таму скора быў ён выведзены на абочыну грамадскапалітычнага жыцця. Аднак выступаў ён ад імені больш за 70 працэнтаў жыхароў Беларусі і гэты факт асноўным чынам паўплываў на працэс фарміравання беларускай нацыянальнай ідэалогіі ў канцы XIX ст. Заходнерусізм прадрашыў таксама аб тым, што каталіцкія эліты перасталі думаць аб Беларусі ў катэгорыях традыцыі Рэчы Паспалітай і стаў прычынай адарвання беларускай ідэі ад псіхалагічнакультурнага польскага кантэксту.

Крыніц беларускага нацыянальнага адраджэння ў каталіцкім асяроддзі трэба шукаць, так як і ў праваслаўным, у палове XIX ст. Найчасцей пачыналася яно з зацікаўнення сыноў апалячанай шляхты гісторыяй сваіх родаў, мясцовасці, даследаваннем культуры мясцовага насельніцтва. Паводле іх меркаванняў, аспрэчванне тэзісу

аб асіміляцыі беларускай шляхты абазначала б адабрэнне тэорыі “заходнерусаў”, якая ўсіх католікаў на беларускай зямлі лічыла чужым элементам. Многія інтэлігенты шляхецкакаталіцкага паходжання, якія пачыналі даследаваць мінулае, усведамлялі сабе наяўнасць блізкіх культурнамоўных сувязей уласнага роду з мясцовым сялянствам. Не пераставалі яны быць палякамі, але яшчэ больш ахвотна спасылаліся на легенды Вялікага княства Літоўскага, міфы аб “тутэйшасці”, “краёвасці”. Вінцэнт ДунінМарцінкевіч (1808—1884) пісаў, што адчуваў ён сябе чалавекам польскай культуры і адначасна быў свядомы свайго літоўскага (беларускага) паходжання. Будучы шляхціцам, ён не быў у змозе ўвайсці ў тую сферу культуры, у якой апынуліся сялянскія масы. Такіх праблемаў не было ў інтэлігенцыі, якая адарвалася ад засценка і ягонай традыцыі. Францішак Багушэвіч (1840-1900), хаця не адчуваў ніякіх эмацыянальных сувязей з узнікаючай нацыянальнай ідэяй, аднак з прычыны салідарнасці з сялянскім асяроддзем напісаў вядомы заклік да беларусаў: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!”. Багушэвіч, падобна як і ДунінМарцінкевіч, пісаў на беларускай мове, але ў адрозненні ад Марцінкевіча гэтую мову лічыў “сваёй”.

У канцы XIX ст. з’явілася новае пакаленне беларускай інтэлігенцыі, нацыянальная свядомасць якога склалася не ў выніку працяглых роздумаў, а толькі шляхам выхавання ў сямейным асяроддзі. У 1898 г. вучні мінскай гімназіі Іван і Антон Луцкевічы арганізавалі нефармальную групу з мэтай вывучэння гісторыі, этнагарфіі і беларускай грамадскай думкі. Супольна з пісьменнікам Казімірам Кастравіцкім збіралі яны кніжкі і ўсялякія іншыя публікацыі на згаданыя тэмы. Іх бацька — Іван Луцкевіч — сябраваў з ДунінымМарцінкевічам і часта гасцяваў у яго доме. Аб беларускасці маладых Луцкевічаў, будучых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, прадрашыў выбар іхных бацькоў.

На пачатку васьмідзесятых гадоў XIX ст. беларускія студэнты, якія вучыліся ў Пецярбургу, заснавалі некалькі гурткоў сацыялістычнага і рэвалюцыйнага характару. Найчасцей былі яны беларускімі структурамі ў расійскім нарадавольніцкім руху. У 1883-1884 гадах пецярбургскія студэнты выпусцілі некалькі адозваў, адрасаваных жыхарам Беларусі. Напісаны яны былі на рускай мове, а іх загалоўкі — “Да беларускай моладзі”, “Да беларускай інтэлігенцыі”, “Пасланне да землякоўбеларусаў” — сведчаць аб эвалюцыі нацыянальных поглядаў у коле “заходнерусаў”. Аўтары гэтых публікацый, якія падпісваліся псеўданімамі “Шчыры беларус” ці “Даніла Баравік” пераконвалі беларусаў, што ў беларускага народа

www.kamunikat.org

ёсць свае інтарэсы, іншыя чым у расіян і палякаў, што Беларусь як краіна мае свае прыкметы, такія як этнаграфія, мова, менталітэт і культура насельніцтва. У адозве “Да беларускай інтэлігенцыі”, што распаўсюджвалася ў Беларусі пад канец 1883 г., яе аўтары пісалі, што народ, які калісьці страціў сваю эліту і выстаяў паланізацыю і русіфікацыю, заслугоўвае таго, каб стаць свабодным ад чужых паноў і манархаў. У выдадзеных беларускімі нарадавольцамі ў 1884 г. двух нумарах часопіса “Гоман” былі сфармуляваны іх палітычныя і нацыянальныя пастулаты. Будучыню Беларусі бачылі яны ў дэмакратычнай Расіі, якая была б федэрацыяй шматлікіх нацый. Беларусы — адзін з элементаў гэтага саюза народаў, мелі атрымаць права “вырашаць аб сваім лёсе”. Пастулат аўтаноміі для Беларусі ў складзе расійскай дзяржаўнасці рашуча аспрэчваўся расійскімі сацыялістамі з “Народнай волі” як недарэчны, які стварае новую нацыю — беларускую.

Зусім іншую пазіцыю ў адносінах да беларускіх нацыянальных памкненняў прадстаўлялі польскія сацыялісты. Згодна рашэнням III З’езда Польскай сацыялістычнай партыі (ПСП) ад чэрвеня 1895 г., гэтая партыя намервалася падтрымоўваць сепаратысцкія рухі народаў, якія насялялі Расійскую імперыю. Пры дапамозе ПСП удалося ў Кракаве ў 1896 г. выдаць і пераправіць кантрабандай у Беларусь другое выданне “Дудкі беларускай” Францішка Багушэвіча — своеасаблівай ідэалагічнай інструкцыі для беларускага нацыянальнага руху.

На пачатку XX стагоддзя сталіцай беларускага інтэлектуальнага жыцця быў Пецярбург. У вышэйшых школах сталіцы Расіі вучылася многа маладых беларусаў. Большую частку іх складалі людзі шляхецкага паходжання. Атмасфера ў расійскім студэнцкім асяроддзі спрыяла ўзніканню розных арганізацый, якія адмоўна ставіліся да тадышняй рэчаіснасці. Апрача згаданых беларускіх нарадавольцаў, якія прадстаўлялі адзін з варыянтаў заходнерусізму, неўзабаве з’явіліся нефармальныя групоўкі, гуртуючыя студэнтаў з каталіцкага асяроддзя. Так як і нарадавольцы, былі яны сацыялістамі. Ад папярэднікаў розніліся яны тым, што не праяўлялі энтузіязму для любой формы сувязі Беларусі з Расіяй.

У 1902 г. па ініцыятыве Вацлава Іваноўскага была створана Беларуская рэвалюцыйная партыя (БРП). Нямнога вядома аб праграме гэтай арганізацыі. З адозвы БРП “Да інтэлігенцыі”, выдадзенай восенню 1902 г. на польскай мове вынікае, што партыя аддавала перавагу асветнай працы з беларускім народам. Прыметнік “рэвалюцыйная” ў назве арганізацыі перш за ўсё адлюстроўваў моду,

якая панавала ў студэнцкім асяроддзі, паколькі ніякага перавароту гэтая партыя рабіць не намервалася. Неадкладнай задачай прызнана было пашырэнне асветы на роднай мове і ведаў пра мінулае свайго народа. У 1903 г. сузаснавальнікі БРП, браты Іван і Антон Луцкевічы, давялі да расколу ў партыі і стварылі сваю арганізацыю — Беларускую рэвалюцыйную граматy (БРГ). Вацлаў Іваноўскі ў сваю чаргу заснаваў Круг беларускай народнай прасветы і культуры і даў пачатак сістэматычнаму выдаванню літаратуры на беларускай мове.

I З'езд БРГ, які адбыўся ў Вільні ў снежні 1903 г. прыняў праграму набліжаную да расійскай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў), якая вырасла на глебе нарадавольніцкай традыцыі. Нацыянальнае пытанне ставілася ў праграме не надта выразна. Партыя патрабавала, каб усе народы Расіі атрымалі свабоду, але не акрэслівала, так як зрабілі выдаўцы "Гоману", межаў гэтай свабоды. Пастулат аўтаноміі для Беларусі да 1905 г. БРГ не прапагандаваўся. Гэтая справа раздзяляла БРГ і ПСП. Польскія сацыялісты выказваліся ў той час за нейкую форму самастойнага дзяржаўнага існавання Беларусі, вядома, у саюзе з Польшчай. Узнікненне БРГ і яе праграма ўказваюць на загладжванне адрозненняў паміж рэвалюцыйнай плынню, выцекшай з заходнерусізму, і беларускімі рэвалюцыянерамі каталіцкашляхецкага паходжання. На пачатку XX ст. у беларускім руху выразна дамінавала прарасійская арыентацыя.

Аднак найбольш пякучай справай у Беларусі было не столькі нацыянальнае, колькі аграрнае пытанне. Правадыры БРГ бачылі ў сялянстве сілу, якая магла б ажыццявіць нацыянальныя ідэі. Справа будучай уласнасці зямлі раздзяляла БРГ не толькі ад ПСП, але таксама і ад расійскіх эсэраў. Польскія сацыялісты, свядомыя таго, што вялікая зямельная ўласнасць у большасці належыць палякам, не ўзнімалі гэтай праблемы. Яе раздзел паміж сялян прапанавалі разгледзець у больш спрыяльных палітычных умовах. Эсэры, так як і ў выпадку ўсёй Расіі, выказваліся за перадачу зямлі сялянскім камунам. Дзеячы Беларускай рэвалюцыйнай партыі былі прыхільнікамі перадачы яе ў карыстанне паасобным земляробам.

Рэвалюцыя 1905 г. у Расійскай імперыі прынесла верыфікацыю ўплываў паасобных сацыялістычных партый на тэрыторыі Беларусі. Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая ў канцы 1904 г. памяняла назву на Беларускую сацыялістычную граматy (БСГ), вяла сваю дзейнасць перш за ўсё ў сялянскім асяроддзі. У гарадах Беларусі дамінавалі расійскія, яўрэйскія і польскія сацыялістычныя арганізацыі. У 1905 г. БСГ вярнулася да гоманскай ідэі аўтаноміі для

Беларусі ў складзе дэмакратычнай і федэратыўнай Расіі. Кожны народ, які састаўляе федэрацыю — паводле БСГ — павінен мець свой парламент, выбіраць сабе чыноўнікаў, гаварыць і пісаць на сваёй мове. Выкананне гэтага апошняга пастулата дапамагло партыі заснаванне ў Мінску ў канцы 1905 г. сваёй друкарні.

У студзені 1906 г. II З'езд БСГ далейшае кіраванне партыяй даручыў Вацлаву Іваноўскаму, Аляксандру Бурбісу і братам Луцкевічам. Новая праграма гэтай арганізацыі прадугледжвала змаганне за пераўтварэнне Расіі ў дэмакратычную і федэратыўную рэспубліку і за дзяржаўную аўтаномію Беларусі, у складзе гэтай структуры, з парламентам у Вільні.

17 кастрычніка 1905 г. цар Мікалай II адмяніў усе рэстрыкцыі, якія тармазілі развіццё нацыянальных моў у Расійскай імперыі. Для арганізаваных палітычных структур у Беларусі адкрываліся шырэйшыя магчымасці прапагандаваць свае ідэі ў народзе. 1 верасня 1906 г. з'вілася першая легальная беларуская газета “Наша доля”. Выйшла яна тыражом 10 тыс. экземпляраў, у тым ліку 6 тыс. было надрукаваных кірыліцай для праваслаўных і 4 тыс. — лацінкай для католікаў. Першы нумар выклікаў сенсацыю і вялікае зацікаўленне сярод віленскіх элітаў. За два дні ў Вільні было прададзена 3 тыс. паасобнікаў, 5 тыс. — трапіла на правінцыю, а рэшту канфіскавала паліцыя. Таксама чарговыя нумары выдання канфіскаваліся з прычыны радыкалізму прапагандаваных на яго старонках поглядаў на грамадскія справы. Толькі два з ліку шасці выйшаўшых нумароў дайшлі да чытачоў. Неафіцыйна “Наша доля” была органам БСГ, а рэдагавалі яе лідэры партыі — Іван і Антон Луцкевічы, Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец), Алаіза Пашкевіч (Цётка), Францішак Умястоўскі і, праўдападобна, Вацлаў Іваноўскі. Прадбачваючы заняпад газеты, браты Луцкевічы спярша прабавалі змякчыць тон больш радыкальных публікацый уласнымі палемічнымі артыкуламі, а пасля заснавалі новы легальны беларускі штотыднёвік “Наша ніва”, накіраваны ў большай ступені на прапагандаванне асветнай працы з народам, чым інструкцый для рэвалюцыянераў. “Наша ніва”, становячыся цэнтрам масавай грамадскай інфармацыі, дала пачатак сапраўднаму рэнесансу інтэлектуальнага жыцця ў Беларусі, інспіравала творчасць цэлай плеяды пісьменнікаў беларускага адраджэння — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Міхася Арла, Сяргея Палуяна, Змітрака Бядулі. Штотыднёвік у 1906-1915 гадах быў найбольш значным асяродкам беларускага нацыянальнага жыцця. У рэдакцыі працавалі самыя выдатныя беларускія літаратары, публіцысты і палітычныя

www.kamunikat.org

дзеячы. Іх творчасць даходзіла ва ўсе куткі Беларусі, а нават да беларускіх эмігрантаў у Амерыцы. Выданне да 1912 г. друкавалася кірыліцай і лацінкай, пазней — выключна кірыліцай. Беларуская ідэя дзякуючы "Нашай ніве" пераставала быць элітарнай з'явай і станавілася паўсюднай. Рэдакцыя ў сваю чаргу паслядоўна прапагандавала канцэпцыю беларускай нацыянальнай, культурнай і духовай супольнасці, асобнай ад польскай і расійскай.

Пасля 1910 г. пачалі ўзнікаць іншыя беларускія перыядычныя выданні: з сатырычным ухілам — "Пялун", "Крапіва" або адрасаваныя да сялян, напрыклад, "Хатка", выдаваная Аляксандрам Уласавым. Ідэалагічную канкурэнцыю для сацыялістычнай "Нашай нівы" стараўся стварыць заснаваны ў 1913 г. каталіцкі штотыднёвік "Беларус", які фінансава падтрымоўвала княгіня Магдалена Радзівіл. "Беларус" паклаў аснову пад будову фундаментаў беларускай кансерватыўнай думкі, якая была адказам на пашырэнне сацыялізму сярод моладзі. Па прычыне пазнейшых палітычных здарэнняў працэс гэты быў спынены.

Выбары ў расійскую Думу ў 1907 г. сталі паказчыкам уплываў і папулярнасці розных партый, якія дзейнічалі ў Беларусі. Апрача ўсерасійскіх прыхільных ураду груповак, такіх як "Саюз 17 кастрычніка", сваіх кандыдатаў вылучыла таксама заснаванае ў 1906 г. "Рускае ўскраіннае таварыства", якое з'яўлялася новай формай заходнерусізму. Гэтым групоўкам дасталася ў Беларусі 36 дэпутацкіх мандатаў (80,5%). Паражэнне на выбарах пацярпеў блок сацыялістычных партый, які складалі БСГ, ПСП, Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд) і Расійская сацыялдэмакратычная рабочая партыя (РСДРП). Сацыялісты не атрымалі ніводнага мандата.

Выбарчае паражэнне стала прычынай спынення дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады. Сяляне, у якіх беларускія сацыялісты шукалі падтрымкі, прагаласавалі за заходнерускія групоўкі. БСГ гуртавала пераважна людзей, якія выводзіліся са шляхецкіх і чыноўніцкіх колаў. Не ўмелі яны паўплываць на свядомасць вясковага насельніцтва, якое заставалася пад уздзеяннем Праваслаўнай царквы і ўрадавай прапаганды, распаўсюджваемай школай, арміяй, установамі і лаяльнымі ў адносінах да царызму заходнерускімі арганізацыямі. Большасць лідэраў БСГ абмежавала сваю актыўнасць да асветнай працы з народам.

У 1906-1907 гг. у пецярбургскай выдавецкай суполцы "Загляне сонца і ў наша ваконца" выйшлі друкам тры падручнікі па беларускай мове. У 1907 г. паўсталі першыя прыватныя школкі, у якіх навучанне вялося на беларускай мове. Немагчыма вызначыць памеры

гэтай з’явы, але гэта не былі адзіночныя выпадкі. Восенню 1907 г. адбыўся з’езд настаўнікаў гэтых школ, які заснаваў нелегальны Беларускі настаўніцкі саюз.

У Пецярбургу, Вільні, Мінску паўставалі многія новыя арганізацыі — літаратурныя, культурныя, асветныя, выдавецкія суполкі. У 1907-1912 гг. адна толькі рэдакцыя “Нашай нівы” выпусціла 31 кніжку, у тым ліку 12 надрукаваных лацінкай. У Вільні неўзабаве паўсталі новыя выдавецтвы — “Наша хатка”, “Палачанін” і Беларускае выдавецкае таварыства (БВТ). Гэтае апошняе, якім загадваў Вацлаў Іваноўскі, адкрыла нават сваю кнігарню — адмысловы асяродак распаўсюджвання беларускай літаратуры.

Апрача прыгожага пісьменства, гістарычнай літаратуры і падручнікаў БВТ рыхтавалася друкаваць кніжачкі для набажэнства і Свяшчэннае Пісанне на беларускай мове.

Актыўнасць нешматлікай беларускай інтэлігенцыі была настолькі відавочнай, што выклікала працідзеянне расійскіх нацыяналістычных груповак. Расійскія газеты, якія выдаваліся ў Мінску і Вільні — “Белорусский вестник”, “Минское слово” і заходнеруская “Белорусская жизнь” (з 1911 г. — “СевероЗападная жизнь”), вялі пастаянную ідэалагічную вайну з “Нашай нівай”. Выдаўцы “СевероЗападной жизни”, праўду кажучы, не аспрэчвалі існавання беларускай нацыянальнасці, але беларускай літаратурнай мовай, культурнай мовай беларусаў — пераконвалі — з’яўляецца мова Гогаля і Пушкіна. Друкаванне кніжак і перыядычных выданняў на беларускай мове называлі яны польскакаталіцкай інтрыгай.

Беларускія нацыянальныя імкненні таксама з недаверам успрымаліся некаторымі польскімі асяроддзямі. “Кур’ер літэўскі” (“Kurier Litewski”), “Пшэглёнд віленьскі” (“Przeglad Wilenski”), а таксама іншыя польскія перыядычныя выданні не раз унушалі, што “Наша ніва” і кніжкі на беларускай мове выдаюцца за дзяржаўныя грошы, а канчатковай мэтай гэтых стаянняў з’яўляецца русіфікацыя народу, які мае схільнасці да польскай культуры. “Сумніўнай ёсць справа, — пісаў В. Чачот, — ці сённяшні люд ацаніў бы дабрадзейства, якое хочуць яму аказаць нацыяналісты, вучачы яго іх уласнай гаворкі замест культурнай польскай мовы”. Беларускую мову ў польскім віленскім друку часта называлі “грубай мовай”, а яе распаўсюджванне — “адцягваннем простанароддзя ад польскасці”. Польскія публіцысты беларусаўкатолікаў прынцыпова прылічалі да польскага народа. Паўсюднай была боязь, што развіццё беларускага руху можа пагражаць польскай зямельнай уласнасці ў Беларусі.

Саюзнікамі беларускай інтэлігенцыі не былі таксама сяляне, ад

імя якіх рэвалюцыянеры і пазітывісты фармулявалі свае пастулаты. Слабасць беларускіх эканамічна прывілеяваных слаёў — мяшчанства, памешчыкаў і інтэлектуальнай эліты, якія звычайна былі істотнай умовай развіцця культуры і нацыянальнай ідэалогіі, была прычынай кволасці беларускіх патрабаванняў на фоне інтэнсіўна змагаючыхся польскіх і расійскіх уплываў. Плебейскі характар беларускай грамадскасці стаў прычынай таго, што грамадскія пытанні, а не нацыянальныя, вызначалі яе свядомасць.

## Насельніцтва Беларусі ў пачатку XX стагоддзя

У 1897 г. быў праведзены першы перапіс насельніцтва Расійскай імперыі. Яго вынікі былі аб’яўлены толькі ў 1905 г. У пяці губернях ПаўночнаЗаходняга краю — Магілёўскай, Мінскай, Віцебскай, Віленскай і Гродзенскай — пражывала 8 518 247 чалавек, у тым ліку 5 408 420 беларусаў (63,5%), 1 202 129 яўрэяў (14,1%), 492 921 расіянін (5,8%), 424 236 палякаў (5,0%), 377 487 украінцаў (4,4%), 288 921 літовец (3,4%), 272 775 латышоў (3,2%), 27 311 немцаў (0,3%), 8 448 татараў (0,1%), 19 658 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей (0,2%). Амаль 480 тысяч беларусаў жыло паза межамі пяці названых губерняў, галоўным чынам на Смаленшчыне і Чарнігаўшчыне. Беларускай мовай у найбольшай ступені карысталася насельніцтва Магілёўскай (82,4%) і Мінскай (76%) губерняў. На гэтай мове размаўляла 56% жыхароў Віленскай, 52% Віцебскай і 42% Гродзенскай губерняў. Рассяленне беларускамоўнага насельніцтва было таксама нераўнамернае і ў паасобных губернях. У Віленскай губерні, напрыклад, у Вілейскім павеце складалі яны 86,9% жыхароў, а ў Віленскім павеце — толькі 26%. Таксама і ў Сакольскім павеце Гродзенскай губерні беларускамоўнае насельніцтва складала 83,9% ад агульнай колькасці жыхароў, а ў суседнім Беластоцкім павеце гэтая катэгорыя насельніцтва займала трэцяе месца (26,1%) за палякамі (34,2%) і яўрэямі (28,3%). Беларускай мовай карысталася амаль 90% насельніцтва Краснага павета Смаленскай губерні і 70% Сумскага павета Чарнігаўскай губерні.

Рэлігійная структура насельніцтва Беларусі ў пэўнай ступені адрознівалася ад моўнай. Праваслаўныя складалі 70,4% усіх жыхароў, каталікі — 13,5%, яўрэі — 14,0%, а прадстаўнікі іншых канфесій — 2,1%.

Пераважная большасць беларускага насельніцтва — 85,5% — жыла на вёсцы. Астатнія найчасцей былі жыхарамі малых мястэчак. У губернскіх цэнтрах жыло толькі 2,6% беларусаў. У гарадах на

www.kamunikat.org

тэрыторыі Беларусі дамінавала яўрэйскае насельніцтва, якое складала 53,5% усіх гараджан.

Паводле перапісу ад 1897 г. найбольш палякаў пражывала ў Гродзенскай і Віленскай губернях, а ў некаторых паветах складалі яны большасць жыхароў. Але ўжо ў Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях іх удзел у агульнай структуры насельніцтва складаў толькі 2,3%. Рашучую большасць польскамоўнага насельніцтва, асабліва ў выпадку названых губерняў, складала шляхта. З ліку 153 тыс. чалавек, якія належалі да гэтай грамадскай праслойкі, 43,3% палічыла сваёй роднай мовай беларускую, 33,8% — польскую і 19,1% — рускую. Сярод амаль паўмільённай масы расіян толькі 5% складалі земляробы, а чыноўнікі і іх сем'і — 51,8%. Рускую мову роднай прызналі 61,5% працэнта праваслаўных, астатнія ўказалі на беларускую.

У ліку 5,4 млн. чалавек, якія размаўлялі на беларускай мове, 81% складалі праваслаўныя, 18,5% — каталікі, 0,4% — стараверы, 0,03% — лютэране. Амаль 40% чыноўнікаў і 60% настаўнікаў усіх тыпаў школ назвалі сябе беларускамоўнымі. Можна меркаваць, што значная частка духоўных, чыноўнікаў, настаўнікаў сваю беларускасць разумела ў катэгорыях заходнерусізму, а не паводле канцэпцыі прапагандаванай “Нашай нівай”. У выпадку шляхты моўны крытэрый праўдападобна не прадрашаў пытання нацыянальнай свядомасці асоб, якія належалі гэтай грамадскай праслойцы.

## Час вайны, міграцыі і рэвалюцыі (1914-1917)

Першая сусветная вайна, з пункту гледжання беларускіх палітычных і нацыянальных інтарэсаў, пачалася зарана. Застала яна беларускія эліты без выразнай канцэпцыі дзеяння ў выпадку парушэння існуючага геапалітычнага парадку, а само грамадства — у стадыі ўваходжання на шлях фарміравання нацыі. Вайна аказалася, аднак, каталізатарам перамен у свядомасці сялянскіх мас. Разбурыла яна іх ізаляваны ад вонкавага свету спосаб жыцця. Дамінацыя элементаў натуральнай гаспадаркі на беларускай вёсцы не прымушала сялян кантактавацца са светам, які знаходзіўся паза межамі найбліжэйшай мясцовасці. Праўда, гэтыя ўмовы ахоўвалі сялянскае асяроддзе ад уплываў чужога акружэння і яго асіміляцыйнага ўздзеяння, але адначасна перашкаджалі кантактам са сваёй інтэлігенцыяй. Вайна выгнала са сваіх сядзіб мільёны людзей, давяла да канфрантацыі з чужым светам і дасведчанасці, якой не ведалі іхныя продкі.

www.kamunikat.org

Беларусь з першых дзён вайны стала прыфрантавой паласой. У жніўні 1914 г. на яе тэрыторыі ўведзена было ваеннае становішча, забаронены былі публічныя сходы, гандаль газетамі і кніжкамі без дазволу ўлад. У той час арганізаваліся шматлікія патрыятычныя маніфестацыі і набажэнствы. Неўзабаве размясцілася тут паўтараміл́ьённая расійская армія. У самым Мінску раскватаравалася 150 тыс. салдат. У армію былі прызваны сотні тысяч жыхароў Беларусі.

З увядзеннем ваеннага становішча большасць беларускіх арганізацый спыніла сваю дзейнасць. Выходзілі аднак два перыядычныя выданні — “Наша ніва” і “Беларус”.

“Наша ніва” да мабілізацыі і прагандысцкай падрыхтоўкі да вайны паставілася без энтузіязму, змяшчаючы публікацыі, якія паказвалі яе лютасць і бяссэнсавасць. Каталіцкакансерватыўны “Беларус” да дзеянняў расійскіх улад паставіўся са зразуменнем, падкрэсліваючы іх намаганні накіраваныя на запэўненне бяспечнасці краіне і яе жыхарам.

Паражэнне расійскіх армій ва Усходняй Прусіі ў канцы жніўня 1914 г. схіліла ўлады да рэвізіі палітыкі ў заходніх губернях, да змякчэння некаторых абмежаванняў ваеннага становішча і пошукаў падтрымкі з боку элітаў, прадстаўляючых паасобныя нацыянальнасці. У красавіку 1915 г. віленскія губернскія ўлады дазволілі заснаваць Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (БТДПВ), якога маршалкам стаў Вацлаў Іваноўскі, а намеснікамі — Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі. Неўзабаве аддзелы Таварыства паўсталі ў Мінску, Вілейцы, Друскеніках, Полацку, Гродне. У выдадзенай у чэрвені 1915 г. лістоўцы “Да грамадзян Беларусі” БТДПВ заклікала насельніцтва прыйсці з дапамогай асобам, якія страцілі маёмасць, сем’і, здароўе. Таварыства, як легальная арганізацыя, было таксама зручнай шырмай для вядзення нацыянальнай дзейнасці. У вялікай меры структуры БТДПВ выкарыстоўваліся беларускай інтэлігенцыяй для вядзення дзейнасці не зусім згоднай са статутам.

У выніку наступлення нямецкіх войскаў летам 1915 г. лінія фронту перасунулася на тэрыторыю Беларусі. Адступаючыя на ўсход расіяне распаўсюджвалі несапраўдныя весткі аб здзеках нямецкіх салдат над праваслаўным мірным насельніцтвам. Пад уплывам прапаганды, распаўсюджваемай таксама ў цэрквах, агромная лавіна людзей рушыла на ўсход. Сяляне загружалі вазы рухомай маёмасцю і падаваліся ў напрамку найбліжэйшай чыгуначнай станцыі ўказанай уладамі. Згодна з прынятай тактыкай спаленай зямлі, расійскія салдаты падпальвалі апусцелыя будынкі.

www.kamunikat.org

Невядомы дакладныя даныя аб маштабе бежанства. У палове 1916 г. на тэрыторыі Расіі прабывала 1,3 млн. чалавек з беларускіх губерняў, а ў маі 1918 г. было іх на мільён больш. Пераважную большасць бежанцаў складалі праваслаўныя жыхары Гродзенскай і Віленскай ды заходніх паветаў Мінскай губерняў. На захад ад лініі фронту, які праходзіў праз сярэдзіну Беларусі, засталіся перш за ўсё католікі і яўрэі, якія не паддаліся істэрыцы, выкліканай расійскімі ўладамі, і не пакінулі сваіх вёсак і мястэчак. Католікі, якія звычайна ў штодзённым жыцці карысталіся беларускай мовай, знаходзіліся аднак пад уздзеяннем кліру, які кіраваўся польскімі інтарэсамі, а тыя не патрабавалі пакідаць зямлю з прычыны змены акупанта.

Большасць бежанцаў з Беларусі папала ў Курскую, Разанскую, Екацерынбургскую, Харкаўскую, Саратаўскую і Самарскую губерні ды ў Маскву і Петраград (назва Пецярбурга ад 1914 г.).

Восенню 1915 г. фронт замацаваўся на лініі Дзвінск-Баранавічы-Пінск. Па абодвух баках гэтай лініі стаяла каля 2,5 млн. салдат. Наяўнасці такой колькасці войска спадарожнічалі рэквізіцыі коней, быдла, свіней, збожжа, знішчэнне пасяўной плошчы ў шырокай прыфрантавой паласе. Пагоршвала гэта становішча астаўшагася на месцы мірнага насельніцтва, якое абедзве арміі прымушалі працаваць на сваю карысць — капаць равы, будаваць дарогі, даваць падводы.

У канцы 1915 г. у нямецкай акупацыйнай зоне, нягледзячы на спрыяльную палітыку новых улад, беларускае нацыянальнае жыццё значна паслабела. Немцы падтрымоўвалі сепаратысцкія імкненні паасобных нацый, якія пражывалі ў Расійскай імперыі. На акупаваных немцамі абшарах хутка ўзнікалі структуры польскіх і літоўскіх грамадскіх, палітычных, культурных і асветных арганізацый. Беларускі рух не быў так дынамічны перш за ўсё з прычыны бежанства праваслаўнага насельніцтва. Беларусыкатолікі, інакш чым палякі, у выніку нямецкай акупацыі былі пазбаўлены кантакту з большасцю свайго народа. Частка дзеячаў БТДПВ на чале з Вацлавам Іваноўскім выехала ў Расію, у Вільні засталіся працягваць дзейнасць браты Луцкевічы, Францішак Аляхновіч, Алаіза Пашкевіч і Вацлаў Ластоўскі. У снежні 1915 г. удалося ім сарганізаваць настаўніцкія курсы, а неўзабаве адкрыць школу з беларускай мовай навучання.

Развіццю беларускага школьніцтва спрыялі распараджэнні акупацыйных нямецкіх улад, якія нерасіянам забаранялі вучыць сваіх дзяцей на рускай мове. Дзякуючы Касцёлу, памешчыкам і інтэлігенцыі павысілася перш за ўсё значэнне польскай мовы. 16 студзеня 1916 г. генералфельдмаршал Паўль фон Гіндэнбург выдаў

www.kamunikat.org

распараджэнне, якое ўводзіла абавязак навучаць на роднай мове. У палове кастрычніка 1916 г. у Свіслачы на Гродзеншчыне была адкрыта першая настаўніцкая семінарыя, а ў Вільні аднавіла дзейнасць Беларускае выдавецкае таварыства, выйшла газета "Гоман", якая выступала за палітычную і культурную аўтаномію для Беларусі ў складзе Расіі. Рэдактарам газеты стаў Вацлаў Ластоўскі.

У канцы 1916 г. у Вільні паўстаў Беларускі клуб — арганізацыя накшталт дыскусійнага форуму для асоб, якія прадстаўлялі розныя палітычныя погляды. Клуб перш за ўсё быў месцам абмяркоўвання спрэчных пытанняў у справе будучыні Беларусі. У 1917 г. віленскія беларусы мелі свой тэатр, якім кіраваў Францішак Аляхновіч, кнігарню і бібліятэку. Стварылі яны новыя арганізацыі — Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускае навуковае таварыства, Таварыства дапамогі бедным дзецям.

Апрача Вільні цэнтрамі беларускага нацыянальнага руху былі школы. У канцы 1916 г. было іх толькі восем. Некалькі месяцаў пазней працавала ўжо 50 школ, з ліку якіх 46 знаходзіліся ў беластоцкагродзенскай школьнай акрузе. Аднак была гэта невялікая колькасць у параўнанні з польскім школьніцтвам, якое мела ў сваім распараджэнні сотні школ на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны. Развіццё беларускага школьніцтва ўдачна тармазілася каталіцкім духавенствам, якое найчасцей выказвалася за пасыланне дзяцей у польскія школы. Лік беларускіх школ павысіўся да 350 толькі ў 1918 г., калі з Расіі пачалі вяртацца праваслаўныя бежанцы і настаўнікі, якія працавалі ў расійскай асвеце да 1915 г. Семінарыя ў Свіслачы, хаця і выпусціла звыш ста настаўнікаў, не была ў змозе вырашыць кадравае пытанне беларускага школьніцтва.

19 снежня 1915 г. у Вільні выйшаў "Універсал Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага". Быў ён надрукаваны на беларускай, літоўскай, яўрэйскай і польскай мовах. Яго аўтарамі былі браты Іван і Антон Луцкевічы. "Універсал" напісалі яны ў паразуменні з некалькімі прадстаўнікамі пералічаных народаў, а затым канцэпцыяй аднаўлення Вялікага княства Літоўскага, як самастойнай дзяржавы, прабавалі зацікавіць немцаў і цэнтры польскага і літоўскага палітычнага жыцця. Іх прапановы не знайшлі, аднак, ніякага водгуку ў адрасатаў. І палякі, і літоўцы выказваліся за аднаўленне сваіх нацыянальных дзяржаў, а немцы ў сваю чаргу дзяржаўную прыналежнасць Беларусі абумоўлівалі вынікамі вайны з Расіяй.

Беларускае пытанне ўпершыню паявілася на міжнароднай арэне ў красавіку 1916 г. падчас канферэнцыі народаў Расіі ў Стакгольме. У выніку захадаў прысутных на канферэнцыі беларускіх

палітыкаў — Івана Луцкевіча і Вацлава Ластоўскага — быў вынесены пастулат палітычнай і культурнай аўтаноміі для Беларусі ў складзе расійскай дзяржаўнасці.

Сітуацыя ў Беларусі на ўсходнім баку лініі фронту была звязана з ходам падзей у Расіі. І хаця ў 1915-1916 гадах у Мінску і Петраградзе дзейнічалі структуры Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны і выходзілі штотыднёвікі “Светач” і “Дзянніца”, аднак іх уздзеянне на беларускае грамадства было нязначнае. Арганізаванне месц працы, кравецкіх, пчалярскіх ці агародніцкіх курсаў для бежанцаў і гульняў для іхных дзяцей — гэта ўся дзейнасць, на якую дзеячам БТДПВ дазвалялі расійскія ўлады. З другога боку, служба ў расійскай арміі сотням тысяч беларускіх сялян прынесла паскораную палітычную адукацыю. Былі яны відавочцамі паступовага падзення аўтарытэту ўлады, арміі і расійскай дзяржавы. Лютаўская рэвалюцыя падштурхнула да дзеяння грамадскія і нацыянальныя групоўкі, якія некалькі гадоў раней далёкія былі ад ідэалаў, з якімі цяпер атаясамліваліся.

У Мінску і многіх іншых гарадах Беларусі падзенне царызму ўспрымалася энтузіястычна. Усе чакалі скорага заканчэння вайны. Антываенную атмасферу згушчаў факт прысутнасці ў Беларусі амаль паўтарамільённай расійскай арміі. Для насельніцтва знаходжанне так вялікай колькасці войска было надта значным абцяжараннем, а для расійскіх салдат вайна, пасля некалькіх спроб выгнання немцаў, цалкавіта страціла сэнс. У Мінску і наваколлі стаяла звыш 150 тыс. салдат. Пераняць кантроль над такой масай войска стараліся таксама бальшавікі, якія, так як ва ўсёй Расіі, пачалі ствараць саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Беларусь, аднак, заставалася часткай расійскага палітычнага тэатра, а беларускі нацыянальны рух, хаця пасля лютаўскай рэвалюцыі развіваўся надта інтэнсіўна, знаходзіўся ўсяго толькі на абочыне галоўнага рэчышча падзей 1917 г.

На пачатку сакавіка 1917 г., пасля дзесяцігадовага перапынку, узнавіла дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада. Яе адраджэнне адбылося на аснове структур БТДПВ. Найбольш прыхільнікаў аднаўленай партыі знаходзілася ў Мінску, Петраградзе, Віцебску, Бабруйску. За некалькі тыдняў дзейнасці БСГ удалося згуртаваць некалькі соцень членаў, пераважна прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Спрыялі гэтаму палітычныя абставіны, а перш за ўсё атмасфера свабоды і папулярнасць лозунгаў аб праве народаў Расіі на захаванне сваёй тоеснасці. На канферэнцыі БСГ 25 сакавіка 1917 г. паўторна была вынесена прапановаператварыць Расію ў

www.kamunikat.org

федэратыўную дзяржаву і даць Беларусі аўтаномію з краёвай радай як органам заканадаўчай улады. Апрача таго быў сфармуляваны шэраг прапаноў па правядзенні грамадскіх рэформ — перадача сялянам памешчыцкай зямлі, адмена прымусовай ваеннай службы і замена яе народнай міліцыяй, нацыяналізацыя асветы. На канферэнцыі БСГ прысутнічалі прадстаўнікі Беларускай партыі народных сацыялістаў (БПНС) і некалькіх меншых галіновых арганізацый. Па гэтай прычыне ўдзельнікі канферэнцыі абвясцілі сябе I З’ездам беларускіх нацыянальных арганізацый і абралі выканаўчы орган — Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), які ўзначаліў памешчык Раман Скірмунт. Управу БНК складалі: Павел Аляксюк, Браніслаў Тарашкевіч, кс. Вінцэнт Гадлеўскі, Казімір Кастравіцкі, Усевалад Фальскі, Зміцер Жылуновіч, Аркадзь Смоліч, Іван Краскоўскі, Лявон Дубейкаўскі. БНК атрымаў паўнамоцтвы прымаць у свой склад прадстаўнікоў новастворaных беларускіх арганізацый.

Побач БСГ і БПНС дзейнічалі ўжо іншыя беларускія партыі, якія таксама распрацоўвалі розныя праекты наконт будучыні. У Маскве паўстала Беларуская народная грамада, у Петраградзе — каталіцкая Хрысціянская дэмакратычная злучнасць, у Віцебску — Беларускі народны саюз, у Магілёве — Беларускі нацыянальны камітэт, у Гомелі — Саюз беларускай дэмакратыі. Большасць гэтых арганізацый мела сваіх прадстаўнікоў у БНК.

У красавіку 1917 г. дэлегацыя БНК на чале з Раманам Скірмунтам падалася ў Петраград, каб прад’явіць Часоваму ўраду пастулаты наконт аўтаноміі Беларусі. Дэмакратычныя ўлады Расіі, так як і раней царскія, не лічылі, аднак, беларусаў асобным народам і адмовіліся весці перагаворы на гэтую тэму. У такой сітуацыі сацыялісты БСГ, якія пераважалі ў беларускім нацыянальным руху, пачалі шукаць паразумення з расійскімі радыкаламі — эсэрамі і бальшавікамі. Нават сваю прапагандысцкую рыторыку прыпадобнілі яны да той, якой карысталіся рэвалюцыянеры партыі Леніна.

На з’ездзе БСГ у Петраградзе ў чэрвені 1917 г. старшынёю партыі быў абраны камуніст Зміцер Жылуновіч. Сваёй канчатковай мэтай БСГ абвясціла ўвядзенне сацыялістычнага парадку ў Беларусі “цераз развіццё класавай барацьбы і сацыяльную рэвалюцыю”. Гэта абазначала раскол у беларускім руху, паколькі для часткі кіраўніцтва БНК — Скірмунта, Алексюка, кс. Гадлеўскага — чужымі былі погляды, якія прадстаўлялі сацыялісты. У атмасферы пашыраючайся радыкалізацыі грамадскіх настрояў павялічваліся палітычны капітал БСГ і лік членаў партыі. У палове 1917 г. было іх ужо больш за 5

тысяч. Некаторыя з іх былі адначасова членамі расійскіх сацыялістычных груповак. У такой сітуацыі скліканы ў Мінск 8 ліпеня 1917 г. ІІ З'езд беларускіх партый і арганізацый праходзіў пад знакам дамінацыі БСГ. З'езд распусціў Беларускі нацыянальны камітэт з прычыны ягонай кансерватыўнасці і стварыў Цэнтральную раду беларускіх арганізацый і партый, якая мела прадстаўляць "поўнасцю дэмакратычныя" арганізацыі, што ў тадышніх умовах абазначала крайне левыя групоўкі.

У пераломны момант гісторыі, калі вырысоўваліся перспектывы атрымаць хаця б аўтаномію і неабходнай была кансалідацыя ўсіх беларускіх груповак, класавыя інтарэсы ўзялі верх над нацыянальнымі.

Летам 1917 г. палітычная сітуацыя ў Мінску адлюстроўвала стан настрояў у іншых гарадах Расіі. Гаспадарчы хаос, масы дэмаралізаваных салдат, над якімі страцілі кантроль генералы і Часовы ўрад ды вострая бальшавіцкая рыторыка аб патрэбе сілай пераняць "пралетарыятам" уладу сталі прычынай далейшай радыкалізацыі грамадскіх настрояў. Уздзейнічала гэта і на беларускі рух. У верасні 1917 г. частка членаў БСГ перайшла на бальшавіцкі бок. У штораз большай ступені партыя падвяргалася грамадскім настроям і траціла нацыянальную тоеснасць. Толькі чарговы з'езд БСГ у кастрычніку 1917 г. спыніў працэс уліцця гэтай самай вялікай беларускай арганізацыі ў рэчышча ўсерасійскай рэвалюцыі. З'езд старшынёю і ягонымі намеснікамі выбраў больш памяркоўных палітыкаў — Язэпа Дылу, Аляксандра Прушынскага і Аркадзя Смоліча, якія дзеля нацыянальнага інтарэсу згодны былі вярнуцца да супрацоўніцтва з партыямі несацыялістычных напрамкаў. Неўзабаве пасля з'езда БСГ было склікана пасяджэнне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый і партый, якая ўжо на другі дзень перайменавалася на Вялікую беларускую раду (ВБР). У ходзе пасяджэння ВБР, якое працягвалася ад 16 да 24 кастрычніка, яе састаў быў папоўнены прадстаўнікамі вайсковых і самаўрадавых асяроддзяў. Старшынёй выканаўчага камітэта стаў член БСГ Вячаслаў Адамовіч, а ў яго склад увайшлі дзеячы хрысціянскадэмакратычнай плыні — Эдуард Будзька і Павел Аляксюк. ВБР вызначыла сабе ролю вышэйшага органа часовай улады аўтаномнай Беларусі.

5 лістапада праходзіў у Мінску З'езд воінаўбеларусаў Заходняга фронту, які вырашыў падпарадкавацца ВБР і ад яе імя пачаць фарміраванне сваіх узброеных сіл. З гэтай мэтай была створана Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР), якая бесперашкодна

працягвала дзейнасць таксама пасля захопу ўлады ў Беларусі бальшавікамі. Ва ўмовах палітычнага хаосу і бальшавіцкай дэкларацыі аб праве народаў на самавызначэнне стварэнне беларускіх структур у расійскай арміі лічылася цалкам натуральнай з'явай, тым больш што мелі яны прадстаўляць Беларусь у складзе Расіі. З'езды воінаўбеларусаў праходзілі ў лістападзе і снежні 1917 г. таксама ў ваенных аркугах паза тэрыторыяй Беларусі — у Кіеве, Адэсе, Смаленску. Усюды прымаліся дэкларацыі падтрымкі для аўтаноміі Беларусі ў складзе федэратыўнай расійскай дзяржаўнасці і заявы аб гатоўнасці садзейнічаць намаганням ЦБВР у справе фарміравання беларускага войска. Некаторыя камандзіры, не чакаючы дазволу расійскіх начальнікаў, самі пачыналі ствараць беларускія нацыянальныя часці.

Бальшавіцкім пераваротам у Беларусі кіравалі людзі звонку — Карл Ландар, Міхаіл Фрунзе, Вільгельм Кнорын, Аляксандр Мяснікоў. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў практычна без барацьбы захапіў уладу ў горадзе і пераняў кантроль над мясцовымі ваеннымі гарнізонамі. У лістападзе амаль усе вайсковыя фарміраванні ў Беларусі апынуліся пад кантролем бальшавіцкага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту. Здзейснілася гэта шляхам замены царскіх генералаў малодшымі афіцэрамі, якія былі верныя новай уладзе і атрымалі павышэнне па службе.

Вялікая беларуская рада праігнаравала бальшавіцкі пераварот і паставілася да яго як да чарговай змены ў расійскай эліце ўлады і заадно палічыла яго знакам паглыблення няўстойлівасці палітычнай сітуацыі ў Расіі. ВБР прызнала новы ўрад у Петраградзе, але адмовілася прызнаць легальнай палітычнай уладай існуючы ў Мінску Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту, якім кіраваў Аляксандр Мяснікоў. Бальшавіцкі камітэт ВБР патрактавала як палітычны твор, падпарадкаваны выключна камандзіру расійскай арміі, якая стаяла ў Беларусі. Дзеля ўпарадкавання спраў у краіне Рада рашылася склікаць 5 снежня Усебеларускі з'езд. Меў ён шырока прадстаўляць усе беларускія грамадскія і палітычныя асяроддзі. З'езд, згодна намерам ВБР, павінен быў акрэсліць парадак аўтаномнай Беларусі. Справа дзяржаўнай незалежнасці не абмяркоўвалася ніводнай сур'ёзнай беларускай палітычнай сілай.

# Змаганне за сваю дзяржаўнасць

## Беларуская Народная Рэспубліка

I Усебеларускі з'езд быў скліканы ў Мінску са згоды і пры фінансавай падтрымцы Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей, якім кіраваў Іосіф Сталін. Хаця частка дэлегатаў — 300 чалавек — сабралася 5 снежня 1917 г., афіцыйна з'езд быў адкрыты два дні пазней. З розных бакоў Беларусі, а таксама Расіі і Украіны, прыбывалі прадстаўнікі беларускіх вайсковых фарміраванняў, губернскіх земстваў, павятовых і гмінных самаўрадаў, прафсаюзаў, бежанскіх камітэтаў. Агулам да 14 снежня зарэгістраваліся 1872 дэлегаты. У іх ліку пераважалі ваенныя, настаўнікі і чыноўнікі. У з'ездзе прымала ўдзел звыш 700 афіцэраў і унтэрафіцэраў усіх расійскіх гарнізонаў. Пераважная большасць дэлегатаў выводзілася з сялянскага саслоўя. Старшынёй З'езда быў выбраны прадстаўнік Цэнтральнай вайсковай беларускай рады Іван Серада. Да 14 снежня працягваліся працэдурныя ўзгадненні паміж прыхільнікамі розных палітычных плыняў і распрацоўка дакументаў, якія мелі разглядацца З'ездам. У тым часе праводзіліся лекцыі для дэлегатаў па гісторыі і актуальнай сітуацыі краіны. У ходзе пасяджэнняў прадстаўнікі Віленшчыны, Гродзеншчыны, Віцебшчыны і Міншчыны рашуча выказваліся за палітычную аўтаномію Беларусі. Дэлегаты Магілёўшчыны, Смаленшчыны і вельмі ўплывовыя прадстаўнікі беларускіх сацыялістычных партый Петраграда выказваліся за адзінства расійскай дзяржавы і гарантаванне беларусам выключна свабоды культурнага развіцця. 17 снежня З'ездам была прынята рэзалюцыя, у якой сцвярджалася, што "замацоўваючы свае правы на самавызначэнне, абвешчанае расійскай рэвалюцыяй і прымаючы рэспубліканскі строй на абшарах Беларускай Зямлі, дзеля паратунку Роднага Краю і дзеля забеспячэння яго ад раздзелу і адлучэння ад Расійскай дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі, Першы Усебеларускі З'езд ухваляе: безадкладна ўтварыць са свайго складу орган краёвай улады, у асобе Усебеларускай Рады Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, які часова становіцца на чале кіравання Краем, уступаючы ў дзелавыя зносіны з цэнтральнаю ўладаю адпаведнай перад саветамі рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў". З'езд паспрабаваў устанавіць беларускую савецкую ўладу без ведама Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту. 17

www.kamunikat.org

снежня каля поўначы будынак, у якім праводзіўся З'езд, быў ачэплены падраздзяленнямі Заходняга фронту. Па загаду Мяснікова прэзідыум З'езда быў арыштаваны, а дэлегаты — разагнаны салдатамі. Бальшавікі занялі таксама сядзібы Вялікай беларускай рады, Цэнтральнай вайсковай беларускай рады і Беларускай сацыялістычнай грамады. Беларускія вайскоўцы зусім не былі падрыхтаваны да барацьбы з расійскімі бальшавікамі. Дарэчы, раней заяўлялі яны волю супрацоўнічаць з імі.

На думку некаторых гісторыкаў, разгон З'езда бальшавікамі быў выяўленнем самавольнасці мінскіх рэзідэнтаў Савета Народных Камісараў, дзеяннем, якое супярэчыла інтэнцыям цэнтральных улад. Сапраўднай прычынай — пісаў беларускі гісторык з Варшавы Юры Туронак — было імкненне З'езда стварыць свае органы савецкай улады, замест прэтэндуючых на яе чужых камісараў, якія, так як Мураўёў ці Керанскі, не прызнавалі беларускага народа і яго права на самавызначэнне. Савецкія гісторыкі І Усебеларускі з'езд паслядоўна называлі антысавецкім, які імкнуўся ўстанавіць буржуазную рэспубліку і адлучыць яе ад Савецкай Расіі.

З'езд, яшчэ да разгону, паспеў выбраць Раду, якая засядала 18 снежня 1917 г. і стварыла пастаяннае нацыянальнае прадстаўніцтва — Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда. Старшынёй Выканаўчага камітэта і кіраўніком ведамства замежных спраў стаў Язэп Варонка, ваенныя справы былі даручаны Сымону РакМіхайлоўскаму, а ўнутраныя — Івану Сераду. У Выканкам з 11 чалавек неўзабаве былі ўключаны прадстаўнікі нацыянальных меншасцей: паляк Аляксандр Прыстар, яўрэі Гутман і Зарубавель (Віткін), літовец Мічуліс і расіянін Злобін. Такім чынам у Мінску стварыліся быццам бы два ўрады: яўны — савецкі і нелегальны — беларускі. Галоўная слабасць Выканаўчага камітэта заключалася ў адсутнасці фінансавых сродкаў на якую—небудзь дзейнасць. Выканкам не мог нават забяспечыць харчамі вайсковых падраздзяленняў, якія падпарадкаваліся яму як палітычнай уладзе ў Беларусі.

У студзені 1918 г. пачаліся сутычкі паміж раскінутымі па ўсёй Беларусі падраздзяленнямі 1-га польскага корпуса генерала Юзафа ДоўбарМусніцкага з часцямі расійскай арміі Заходняга фронту, якія кантраляваліся бальшавікамі. У бальшавіцкай прапагандзе ўсе палітычныя сілы, якія аспрэчвалі іх права на ўладу, былі абвінавачаны ў спрыянні палякам. За выдуманае супрацоўніцтва з палякамі 31 студзеня былі арыштаваны ў Мінску кіраўнікі Цэнтральнай беларускай вайсковай рады Канстанцін Езавітаў і Васіль

Захарка. Гэта стала прычынай далейшай дэзарганізацыі працэсу стварэння беларускіх ваенных структур. Бальшавікі распусцілі большасць беларускіх часцей у радах сваёй арміі, салдат раскінулі, разасланы па дамах або па іншых падраздзяленнях паза тэрыторыяй Беларусі.

У лютым 1918 г. у Брэсце пачаліся мірныя перагаворы паміж Савецкай Расіяй і Нямеччынай. Па жаданні старшыні расійскай дэлегацыі Льва Троцкага прадстаўнікі беларускага Выканкама не былі немцамі ўпушчаны на мірную канферэнцыю. Справа дзяржаўнай прыналежнасці Беларусі не знаходзілася менавіта ў коле іх зацікаўленняў. Немцы патрабавалі ад Расіі хуткай сплаты кантрыбуцыі, а ў сувязі з замаруджваннем расійскімі прадстаўнікамі падпісання адпаведных абавязацельстваў, 18 лютага нямецкая армія наступіла на ўсход і дайшла да Дзвіны і Дняпра, займаючы амаль усю Беларусь.

Немцы лічылі гэты абшар часткай тэрыторыі Расіі, а часова быў ён для іх закладам за вымаганую кантрыбуцыю. І менавіта таму яны самі імкнуліся сыскаць з Беларусі частку пабораў, якія — на іх погляд — была ім вінавата Расія.

Пачуўшы пра набліжэнне нямецкіх войскаў бальшавікі ўцяклі з Мінска. Расійскае войска, паралізаванае пацыфісцкай прапагандай, нават не думала супрацiўляцца немцам. У ахопленым эвакуацыйным хаосам Мінску змагацца за ўладу пачалі наспех арганізаваныя малалікія польскія падраздзяленні і астаткі беларускіх фарміраванняў. Палякі занялі пакінутыя бальшавікамі ваенныя скдады і ўзброілі некалькі соцень дабравольцаў. Вызваленым з турмы кіраўнікам Цэнтральнай беларускай вайсковай рады таксама ўдалося згуртаваць пару соцень салдат, якія былі ахвотны змагацца за стратэгічныя аб'екты ў горадзе. Нямнога большыя сілы, галоўным чынам розныя вартаўнічыя службы, былі на расійскім баку. Змаганне ўсіх з усімі, якое працягвалася больш за дзесяць гадзін, было перапынена ўваходам у сталіцу 21 лютага нямецкіх войскаў.

У гэты ж дзень Выканаўчы камітэт Рады І Усебеларускага з'езда выдаў Першую ўстаўную грамату да народаў Беларусі, у якой абвясціў сябе найвышэйшай цывільнай уладай у Беларусі. Спасылаючыся на права народаў на самавызначэнне, аўтары граматы сцвярджалі, што ўлада ў Беларусі павінна фарміравацца згодна волі народаў, якія насяляюць краіну. Гэты прынцып павінен ажыццяўляцца шляхам дэмакратычных выбараў ва Усебеларускі Устаноўчы Сойм. Выканкам стварыў Народны Сакратарыят Беларусі, а яго старшынёй прызначыў Язэпа Варонку. У згаданай грамаце

ўпершыню не гаварылася пра аўтаномію і неабходнасць заставацца ў складзе расійскай федэрацыі. Яе тэкст на беларускай і расійскай мовах быў расклеены па ўсім Мінску.

Беларускія дзеянні не мелі большага значэння, паколькі ўся ўлада ў Беларусі знаходзілася ў руках камандзіраў нямецкай арміі. 22 лютага загадалі яны польскім падраздзяленням пакінуць Мінск, а беларускім — скласці зброю. Не жадаючы ўскладняць адносіны з Расіяй, немцы не прызналі беларускага ўрада, занялі сядзібу Народнага Сакратарыята, рэквізавалі ягоную маёмасць, скінулі з будынкаў беларускія нацыянальныя сцягі і забаранілі членам урада пакідаць горад. Аднак пад канец лютага дайшло да перагавораў паміж Сакратарыятам і нямецкай ваеннай адміністрацыяй, у выніку якіх акупанты прызналі ўрад Варонкі прадстаўніцтвам беларускага насельніцтва. Немцы дазволілі Сакратарыяту весці легальную дзейнасць на тэрыторыі Міншчыны, галоўным чынам у галіне арганізавання лакальнай адміністрацыі, школьніцтва і выдавецкага руху.

9 сакавіка Выканаўчы камітэт Рады I Усебеларускага з’езда выдаў Другую ўстаўную грамату, у якой сцвярджалася, што “пасля трох з паловаю вякоў няволі ізноў на ўвесь свет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць”. Выканкам абвясціў узнікненне Беларускай Народнай Рэспублікі, вызначыў яе межы і часовы лад. Беларуская дзяржаўнасць — паводле граматы — павінна расцягвацца “ў рубяжах рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народа”. Да часу правядзення свабодных выбараў ва Устаноўчы Сойм выканаўчая ўлада мела належыць Народнаму Сакратарыяту.

Паколькі Выканкам быў легальным, прызнаным немцамі прадстаўніцтвам насельніцтва Беларусі, яго структуры пачалі хутка разрастацца. Гарнуліся да яго перш за ўсё земскія і гарадскія самаўрады, якія пабачылі рэальную сілу, здольную стрымаць грабежніцтва нямецкага войска. 9 сакавіка Выканкам абвясціў сябе Радай Беларускай Народнай Рэспублікі і ўзяў на сябе функцыі часовай заканадаўчай улады. Захоп усёй тэрыторыі Беларусі немцамі дазволіў аб’яднаць намаганні дзеячаў двух цэнтраў — віленскага і мінскага. Браты Іван і Антон Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі, якія ўсю нямецкую акупацыю знаходзіліся ў Вільні, канчаткова адракліся ад планаў стварэння канфедэратыўнай літоўскабеларускай дзяржавы, пасля таго як літоўцы 19 лютага аб’явілі незалежнасць. Прыклад Літвы быў таксама ўказальнікам для віленскіх беларускіх дзеячаў. Апрача таго яны меркавалі, што немцы, так як літоўцаў, будуць таксама падтрымоўваць беларусаў. 18 сакавіка Віленская беларуская рада

www.kamunikat.org

далучылася да Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Павялічаная на прадстаўнікоў усіх зямель і асяроддзяў БНР 25 сакавіка 1918 г. абвясціла незалежнасць Беларусі. У яе састаў мела ўваходзіць Магілёўшчына, Міншчына, Віцебшчына, Гродзеншчына (з Беластокам), беларускія часткі Віленшчыны, Смаленшчыны і Чарнігаўшчыны. Палессе, згодна Брэсцкаму мірнаму дагавору, было перададзена Украіне. Рашэнне аб абвяшчэнні незалежнасці не было Радай прынята аднадушна. Многія яе члены выступалі супраць парвання сувязей з Расіяй. Аднак большасць паднялася драматычнай спробы будаваць сваю дзяржаўнасць, спадзеючыся знайсці падтрымку немцаў. 25 красавіка правадыры Рады з Іванам Серадой на чале выслалі нямецкаму кайзеру Вільгельму II тэлеграму з падзякай за вызваленне Беларусі і прапановай заключыць нямецкабеларускі саюз. Апрача Серады тэлеграму падпісалі Раман Скірмунт, які быў ініцыятарам гэтай дыпламатычнай акцыі, Павел Аляксюк, Язэп Лёсік і Пётр Крачэўскі. Немцы на беларускія прапановы адказу не далі. Гвалтоўная змена арыентацыі з прарасійскай на пранямецкую выклікала востры канфлікт унутры беларускага руху. Па гэтай прычыне ў адстаўку падаўся кабінет Язэпа Варонкі, а самая вялікая беларуская арганізацыя — Беларуская сацыялістычная грамада — распалася на тры партыі: Беларускую партыю сацыялістаўрэвалюцыянераў (БПСР), Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю (БСДП) і Беларускую партыю сацыялістаўфедэралістаў (БПСФ). “Рэвалюцыянеры” выказваліся за супрацоўніцтва з Расіяй і бальшавікамі, “федэралісты” хацелі саюзу з Расіяй, але не мелі ахвоты кантактавацца з бальшавікамі, а “сацыялдэмакраты” ў сваю чаргу выразна не фармулявалі сваіх адносін да Расіі і засяродзіліся на ратаванні аўтарытэту Рады і стварэнні нацыянальнага войска.

Новы старшыня Нацыянальнага Сакратарыята Раман Скірмунт гатовы быў далей шукаць шляхі паразумення з немцамі, але Рада блакіравала ўсялякія ініцыятывы ў гэтым напрамку. Немцы са свайго боку не рабілі ніякіх істотных канцэсій на карысць беларусаў. Наадварот, рашуча тармазілі ўсялякія ініцыятывы па стварэнні беларускіх вайсковых, паліцэйскіх ці ваенізаваных структур. Немцы баяліся, што могуць яны ўзмоцніць спантанны партызанскі сялянскі рух, арганізаваны з мэтай абароны ад грабяжоў маёмасці, якія праводзіліся нямецкімі салдатамі ў рамках сыскання кантрыбуцыі, наложанай на Расію ў Брэсце.

У кастрычніку 1918 г. прэм’ерміністрам урада стаў Антон Луцкевіч. З прычыны адсутнасці ўмоў для ажыццяўлення палітыкі на тэрыторыі сваёй краіны засяродзіўся ён на дыпламатычнай

дзейнасці, галоўным чынам на пошуках сярод суседзяў саюзнікаў прыхільных ідэі незалежнай Беларусі. Кіраўніка ведамства вайсковых спраў палкоўніка Канстанціна Езавітава направіў ён у Коўна і Варшаву, а сам падаўся ў Кіеў. Не знайшоўшы ў сталіцах новаствораных дзяржаў ніякіх абяцанняў падтрымкі, Луцкевіч прыняў запрашэнне Леніна на перагаворы ў Маскве. Невядома як праходзілі гэтыя размовы, аднак Луцкевіч ужо больш не прабаваў дамаўляцца з бальшавікамі.

Пад канец лістапада 1918 г. немцы сталі эвакуіраваць свае войскі з Беларусі. Пакінутыя імі тэрыторыі займала Чырвоная Армія. 10 снежня бальшавікі былі ўжо ў Мінску. Два дні раней у Вільню падалася Рада БНР і ўрад Антона Луцкевіча. У Беларусі не было ніякіх войскаў, якія прабавалі б аказваць супраціўленне нешматлікім савецкім падраздзяленням, таму што немцы намнога больш паспяхова расправіліся з беларускімі вайсковымі структурамі чым бальшавікі.

## Стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Беларуская Народная Рэспубліка, хаця заіснавала ў большай ступені як ідэя чым рэальна існуючае палітычнае тварэнне, стала аднак каталізатарам, які давёў да стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. За такую форму нацыянальнага быту выказаўся таксама І Усебеларускі з'езд, пакуль быў разагнаны па волі мінскіх прадстаўнікоў Савета Народных Камісараў. З такімі патрабаваннямі выступалі беларускія бальшавікі, якія дзейнічалі ў розных секцыях Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) [РКП(б)]. Аднак воля беларусаў у гэтым выпадку мела другараднае значэнне. Аб узнікненні новых стварэнняў у выглядзе беларускай або літоўскабеларускай дзяржаўнасці прадрашалі патрэбы бягучай савецкай палітыкі. Экспарт рэвалюцыі ў Еўропу патрабаваў перш за ўсё надаць верагоднасць бальшавіцкім лозунгам аб праве народаў на самавызначэнне. Па гэтай прычыне трэба было нейтралізаваць урад БНР, які разаслаў свае дыпламатычныя місіі ў большасць еўрапейскіх краін.

8 снежня 1918 г. савецкія ўлады праклямавалі ў Маскве стварэнне Літоўскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. У яе межах мелі апынуцца амаль усе беларускія землі. Хутка аднак адышлі яны ад гэтай задумы і ўжо ў палове снежня Цэнтральны Камітэт РКП(б) разважаў праект стварэння асобных — літоўскай і беларускай — рэспублік. 25 снежня ў час сустрэчы Іосіфа Сталіна, тадышняга

камісара па справах нацыянальнасцей і старшыні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) Аляксандра Мяснікова былі вызначаны межы абедзвюх дзяржаў. Беларусь — паводле Сталіна — мелі састаўляць Гродзенская, Мінская і Смаленская, а Літву — Ковенская і Віленская губерні. Тры дні пазней Сталін па тэлеграфу загадаў далучыць да Беларусі Магілёўшчыну і Гомельшчыну. VI ПаўночнаЗаходняя канферэнцыя РКП(б), якая адбывалася 30 снежня ў Смаленску, пераўтварылася ў I З'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, які ў гэты ж дзень абвясціў рэзалюцыю аб старэнні Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі (БССР). "Каб забяспечыць свабоду працоўным масам і адраджаючымся народам і процістаўіцца акружаючым нас бандам наймітаў змрочных сіл імперыялізму, — пісалася ў рэзалюцыі , — VI Абласная канферэнцыя бальшавікоў лічыць неабходным стварэнне самастойнай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларускай".

1 студзеня 1919 г. аб сваім існаванні заявіў Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі. У выдадзеным маніфесце заклікаў ён народ Беларусі на барацьбу з "прадажнымі буржуямі, купцамі, памешчыкамі, фабрыкантамі і духаўнікамі", якіх прадстаўнікамі былі Рада БНР ды слугуючыя ёй нямецкія, польскія і ўкраінскія акупанты. Змест маніфеста як і вага абвінавачанняў былі доказам таго, што бальшавікі лічылі БНР важным канкурэнтам за ўладу ў Беларусі. Маніфест адначасна прызнаваў несапраўднымі ўсе законы, пастановы і распараджэнні ўлад БНР. Кіраўніком савецкага ўрада быў назначаны беларускі камуніст Зміцер Жылуновіч, але фарміраванне Народнага камісарыята ўнутраных спраў было даручана армяніну Аляксандру Мяснікову, які 17 снежня 1917 г. разганяў I Усебеларускі з'езд. У складзе ўрада было 8 беларускіх і 11 расійскіх камуністаў.

3 лютага Усебеларускі з'езд Саветаў вырашыў устанавіць федэратыўны саюз з Савецкай Расіяй і абвясціў канстытуцыю БССР пад назвай "Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа". Некалькімі днямі раней Цэнтральны Камітэт РКП(б) паменшыў тэрыторыю Беларусі, адарваўшы ад яе Смаленскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні і далучыўшы іх да Расіі. Неўзабаве непатрэбным палічылі яны таксама існаванне абрэзанай тэрытарыяльна Беларусі. Адпаведныя пастановы аб яе ліквідацыі "ад імя беларускіх рабочых і сялян" прыняў Усебеларускі з'езд Саветаў, абвяшчаючы 16 лютага 1918 г. волю далучэння БССР да ЛітоўскаБеларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (Літбел). Беларускія камуністы са Зміцерам Жылуновічам на чале, якія ў канцы 1918 г. суарганізавалі БССР, былі арыштаваны, паколькі пратэставалі супраць новых

падзелаў краіны. Ва ўладах Літбела не было ніводнага беларуса. Літоўскабеларуская савецкая дзяржава была федэрыравана з Расіяй. У выглядзе звышнацыянальнай арганізацыі мела яна перашкодзіць адраджэнню незалежніцкіх памкненняў беларусаў і літоўцаў, а заадно само яе існаванне давала савецкім уладам козыр у рукі як доказ іх паслядоўнай рэалізацыі прынцыпу аб праве народаў на самавызначэнне.

Да канца лютага большасць беларускіх зямель была занята Чырвонай Арміяй. 13 сакавіка з часткі савецкіх узброеных сіл была створана ЛітоўскаБеларуская армія, але мабілізаваных у Беларусі салдат найчасцей пасылалі на ўсходні або паўднёвы франты. Сама назва ЛітоўскаБеларуская армія не мела нічога супольнага з яе этнічным складам, бо ў пераважнай ступені састаўлялі яе расійскія салдаты.

На занятым абшары Беларусі бальшавікі паспешліва арганізавалі саветы сялянскіх дэпутатаў, якія пачалі дзяліць вялікую зямельную ўласнасць і заахвочваць сялян выступаць супраць двароў. Многія прадстаўнікі памешчыцкага саслоўя, якія раней падтрымоўвалі ідэю незалежнай беларускай дзяржаўнасці, памянялі сваю арыентацыю і забеспячэнне сваіх інтарэсаў сталі шукаць ва ўзнікаючай Польшчы. Большасць, баючыся рэпрэсій, апынулася на тэрыторыі Польшчы. У частцы нацыяналізаваных зямельных маёнткаў ствараліся сельскагаспадарчыя камуны. Іх членамі пераважна былі людзі, якія раней належалі да фальварковай службы. Сяляне не атрымоўвалі нічога і апрача таго былі прымушаны забяспечваць чырвонаармейцаў харчамі і фуражом, выконваць для войска транспартныя паслугі. Мабілізацыя ў савецкую армію чарговага штогодняга кантынгента прызыўнікоў выклікала бежанства маладых людзей у лясы, спрыяла ўзнікацню розных груп, якія рашаліся на партызанскую барацьбу з атрадамі Чырвонай Арміі, што высылаліся на вёскі для рэквізіцыі збожжа, коней, свіней.

## Польска-савецкая вайна. Падзеі на Беларусі

17 лютага 1919 г. дайшло да першых польска-савецкіх сутычак. У сакавіку польскае войска апынулася на лініі рэк Піна-Ясельда, а 21 красавіка пасля трохдзённых баёў была занята Вільня. Дзень пазней была абвешчана адозва Галоўнакамандуючага польскімі войскамі Юзафа Пілсудскага “Да насельніцтва былога Вялікага княства Літоўскага”. “Польскае войска нясе Вам усім вольнасць і свабоду”, - запэўніваў Ю. Пілсудскі. Галоўнакамандуючы дэклараваў таксама,

www.kamunikat.org

што створыць магчымасць вырашаць нацыянальныя і канфесійныя пытанні без ніякага гвалту і націску з боку Польшчы. Апрача Ю. Пілсудскага свае адозвы і загады на польскай і беларускай мовах выдалі генералы Эдвард Рыдз-Сміглы і Станіслаў Шаптыцкі. З загаду Э. РыдзаСміглага вынікае, што афіцыйнай мовай мела быць польская, а ўсе распараджэнні ўлад мелі перакладацца на беларускую мову. У кантактах з уладамі дапускалася ўжыванне беларускай мовы. У сітуацыі далейшай канфрантацыі з Савецкай Расіяй польскія ўлады імкнуліся здабыць прыхільнасць таксама і з боку беларусаў. Для часткі палітыкаў, якія стваралі структуры БНР, Юзаф Пілсудскі, вядомы прыхільнік федэралізму, уяўляўся магчымым саюзнікам беларускай незалежнасці.

8 жніўня польскія войскі заваявалі Мінск, у верасні апанавалі лінію Любань-Барысаў-Полацк-Дзвінск. Большасць беларускіх зямель апынулася пад польскім кантролем. Беларускі друк у Мінску і Вільні, асабліва рэдагаваны Янкам Купалам “Звон”, пісаў аб гістарычнай супольнасці палякаў і беларусаў, дзякаваў за вызваленне Беларусі з-пад расійскага імперыялізму, выказваў спадзяванні на дапамогу Ю. Пілсудскага ў пабудове незалежнай беларускай дзяржавы. Старшыня Часовага беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску Кузьма Цярэшчанка, вітаючы начальніка Польскай дзяржавы і дзякуючы яму за вызваленне Гродна, Вільні і Мінска прыгадаў, што ў няволі застаюцца прыналежныя Беларускай Народнай Рэспубліцы гарады - Віцебск, Магілёў, Смаленск. Пілсудскі ў Мінску, так як раней у Вільні, запэўніваў, што “зямлі гэтай нічога гвалтам навязана не будзе”. Пасля некалькіх месяцаў дачыненняў з бальшавікамі, запэўніванні начальніка Польскай дзяржавы выклікалі сярод беларускіх дзеячаў эйфарыю. Многія паверылі, што незалежнасць можа быць прыпаднесена ў падарунку. 20 верасня 1919 г. Канвент старэйшын Рады БНР паслаў ліст Ю. Пілсудскаму, у якім інфармаваў аб аднаўленні дзейнасці органаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Ад ліпеня дзейнічала ў Вільні Беларуская вайсковая камісія, якая чакала дазволу польскага камандавання на стварэнне беларускага войска. У Парыжы 1 ліпеня 1919 г. прэм’ер урада БНР Антон Луцкевіч і прэм’ер польскага ўрада Ігнацы Падарэўскі ўзгаднілі новы праект федэратыўнага пагаднення абедзвюх дзяржаў, якія мелі мець супольную замежную палітыку і супольнае камандаванне ўзброенымі сіламі.

Поспехі польскага войска ўлетку 1919 г., а асабліва федэратыўныя дэкларацыі Пілсудскага, якія так энтузіястычна ўспрымаліся ў Мінску і Вільні, занепакоілі савецкі ўрад. Выклікана

гэта было рэальным шансам узнікнення федэрацыі народаў пад эгідай Польшчы, здольнай супрацьпаставіцца расійскаму і нямецкаму імперыялізму. Менавіта таму бальшавікі спешна ліквідавалі ЛітоўскаБеларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку і прапанавалі палякам мір “з вечнай граніцай на Дзвіне, Уле і Бярэзіне”. Ленін аддаваў амаль усю Беларусь узамен за спыненне ваенных дзеянняў. Прапановы гэтыя не раз выносіліся падчас мірных перагавораў восенню 1919 г. у Мікашэвічах. Адначасна савецкія ўлады падтрымоўвалі ўсялякія дзеянні, накіраваныя на дэстабілізацыю сітуацыі на тылах польскага войска. Восенню 1919 г. у Смаленску была падпісана дамова паміж Беларускай партыяй сацыялістаўрэвалюцыянераў і Расійскай камуністычнай партыяй (бальшавікоў) у справе арганізавання беларускіх паўстанчых атрадаў на занятых палякамі тэрыторыях. Дамова прадугледжвала, што ў выпадку апанавання Беларусі Чырвонай Арміяй будзе створана беларуская савецкая дзяржаўнасць, а ўлада будзе перададзена эсэрам і мясцовым камуністам.

Польская палітыка ў Беларусі аблягчала эсэрам выкананне гэтай дамовы. Энтузіязм, выкліканы дэкларацыямі Юзафа Пілсудскага, хутка патух з прычыны дзеянняў польскага войска і адміністрацыі Цывільнага кіраўніцтва Усходніх зямель (ЦКУЗ). Рэчаіснасць у Беларусі пад польскім панаваннем у 1919-1920 гадах часам нямнога рознілася ад вобразу маляванага бальшавіцкай прапагандай. Паводле ацэнкі II Аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага, першапачатковы беларускі энтузіязм хутка пераходзіў у антыпатыю, ажно ўрэшце пераўтвараўся ў нянавісць да ўсяго польскага. Камісар ЦКУЗ Ежы Асмалоўскі на пасады ва ўсіх установах прызначыў мясцовых польскіх памешчыкаў, якія ўладу выкарыстоўвалі перш за ўсё для расправы над сялянамі і такім чынам адрэагоўвалі на рэзультаты савецкай акупацыі. Павятовымі старастамі прынцыпова былі памешчыкі, войтамі ў гмінах назначаліся выключна палякі і католікі; часта былі гэта асобы, якіх ненавідзела мясцовае беларускае насельніцтва. Насілле і рэквізіцыі, якім падвяргаліся жыхары вёсак з боку вайсковых падраздзяленняў, жандармерыі і паліцыі згладжвалі адмоўныя ўражанні, вынесеныя з перыяду савецкага панавання. Грабеж маёмасці, тэрор і расстрэлы падазроных у камунізме прыдавалі польскай прысутнасці рысы акупацыйнай улады. Ачагамі камунізму лічыліся праваслаўныя цэрквы і яўрэйскія сінагогі. Паспешліва і безумоўна перадаваліся католікам храмы, якія больш за сто гадоў знаходзіліся ва ўладанні праваслаўных. Працягвалася гэта таксама ў тых мясцовасцях, дзе палякі складалі нязначны працэнт ад

агульнага ліку жыхароў. Беларускую інтэлігенцыю адпіхала нішчэнне ўсіх праяваў адраджэння нацыянальнага жыцця. Рэквізіцыям і судам падвяргаліся незалежныя беларускія газеты, у Мінску забаронена было ставіць на сцэне п'есы папулярных беларускіх пісьменнікаў - Янкі Купалы і Каруся Каганца. Прапаганда на старонках часопіса "Страж крэсова", якой займаўся Камітэт абароны крэсаў, развеяла ілюзіі нават найбольшых прыхільнікаў саюза з Польшчай. "Федэратыўная канцэпцыя, - пісаў польскі гісторык Юзаф Левандоўскі, - мела на сваім баку ўвесь бельведэрскі лагер і падтрымку Юзафа Пілсудскага, але ў войску, якое фарміравалася як нацыянальная армія, разуменне гэтых імкненняў было нязначнае. Войска спантанна і на кожным кроку праводзіла палітыку, якая адпавядала канцэпцыі інкарпарацыі".

Адносіны да Польшчы і палякаў раз'ядналі беларускіх палітыкаў. Паводзіны войска і адміністрацыі ажыўлялі ідэю заходнерусізму. У Радзе БНР рашуча антыпольскія пазіцыі займалі дзеячы БПСР і БПСФ. Частка палітыкаў гэтых партый, асабліва федэралісты, не былі таксама прыхільнікамі паразумення з саветамі, але ў склаўшайся сітуацыі аднолькавым злом яны лічылі заключэнне якіх-небудзь пагадненняў з любым змагаючымся бокам, бачачы ў дзеяннях кожнага з іх ажыццяўленне сваіх імперыяльных памкненняў.

Аднак паразумення з палякамі шукалі дзеячы, згуртаваныя вакол прэм'ера ўрада БНР Антона Луцкевіча. Не давяралі яны бальшавікам і спадзяваліся ў выпадку перамогі Польшчы на выкананне абяцанняў начальніка Польскай дзяржавы дадзеных у Вільні і Мінску. 20 лістапада падчас сустрэчы А. Луцкевіча з Ю. Пілсудскім было ўзгоднена, што Рада БНР пераўтворыцца ў Нацыянальную беларускую раду, што абазначала б замену яе статусу з дзяржаўнага прадстаўніцтва на нацыянальнае. Гэтая дамоўленасць была адкінута большасцю членаў Рады. Прыхільнікі захавання незалежнасці Беларусі - Вацлаў Ластоўскі, Пётр Крачэўскі, Васіль Захарка, Аляксандр Цвікевіч, кс. Адам Станкевіч, Тамаш Грыб - рашылі адклікаць з паста прэм'ерміністра Антона Луцкевіча і такім чынам пазбавіць яго паўнамоцтваў выступаць ад імя Рады БНР. Прыхільнікі Луцкевіча з Паўлам Алексюком на чале прапанавалі стварэнне "Дырэкторыі", якая выконвала б ролю нацыянальнага прадстаўніцтва, і далейшае вядзенне перагавораў з палякамі. 13 снежня 1919 г. большасць членаў Рады новым прэм'ерміністрам абрала Вацлава Ластоўскага і абвясціла сябе Народнай Радай БНР, старшынёй якой стаў Пётр Крачэўскі. Астатнія, прыхільнікі супрацоўніцтва з Польшчай, абвясцілі сябе Найвышэйшай Радай БНР

і на пасадзе прэм'ерміністра пакінулі Антона Луцкевіча. Старшынёй Найвышэйшай Рады стаў Іван Серада. Некалькі дзён у Мінску існавалі два беларускія ўрады і дзве рады, якія выступалі ад імя беларускага народа. Неўзабаве ўрад В. Ластоўскага і частка членаў Народнай Рады былі палякамі арыштаваны. Пасля вызвалення з турмы большая частка іх падалася ў Коўна, дзе атрымалі статус эміграцыйнага ўрада і сродкі на вядзенне канспіратыўнай дзейнасці на тэрыторыі Польшчы. Антон Луцкевіч і большасць членаў Найвышэйшай Рады пераехалі ў Вільню. Быў гэта заадно канец надзеі на вырашэнне беларускіх праблем пры падтрымцы Польшчы. Папраўдзе яшчэ 24 сакавіка Вацлаў Іваноўскі, у якога былі паўнамоцтвы Найвышэйшай Рады, заключыў з Леанам Васілеўскім, які прадстаўляў начальніка Польскай дзяржавы, пагадненне ў справе ўрэгулявання польскабеларускага жыцця на Міншчыне, але ўжо не было адпаведнай атмасферы і - як выявілася - часу на ажыццяўленне падпісаных абавязацельстваў. "У ідэі польска-беларускага супрацоўніцтва, - пісаў Юры Туронак, - былі аднак па абодвух баках многія праціўнікі. Была яна новай з'явай і па гэтай прычыне мала зразумелай. Рашучая большасць памешчыкаў у Беларусі патрабавала не канфедэрацыі, але яе інкарпарацыі ў склад Польшчы, згаджалася з магчымасцю пайсці ў будучым на пэўныя культурныя ўступкі беларусам, аднак абуралася з прычыны трактавання іх як палітычнага партнёра. (...) Гэтай ідэі супрацьстаўлялася таксама прараганда беларускіх эсэраў, якія не раз выкарыстоўвалі скандальныя і безадказныя паводзіны войска і польскай адміністрацыі і, спасылаючыся на лозунг незалежнасці краіны, абвінавачвалі абаронцаў гэтага супрацоўніцтва ў згодніцтве перад Польшчай і здрадзе нацыянальным інтарэсам".

У ліпені 1920 г. Беларусь паўторна была занята Чырвонай Арміяй. 12 ліпеня бальшавікі падпісалі пагадненне з літоўскім урадам, у адпаведнасці з якім Віленшчына і Гродзеншчына былі перададзены Літве. Гэты дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецкапольскай вайны, а ў выніку - бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту, якія наступалі ў напрамку Варшавы. Адначасна амаль мільённая маса беларусаў у межах Літвы стварала Савецкай Расіі перспектыву ўплываць на ўнутраную сітуацыю ў гэтай краіне.

31 ліпеня існуючы яшчэ Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі паўторна абвясціў незалежнасць Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Утвораны ў тым жа часе Ваеннарэвалюцыйны камітэт (у складзе: Аляксандр Чарвякоў, Вільгельм Кнорын, Язэп Адамовіч) выконваў

функцыі беларускага савецкага ўрада. У дэкларацыі ЦК КП(б)ЛіБ аб абвяшчэнні "незалежнай БССР" гаварылася, што граніцы Беларусі з буржуазнымі дзяржавамі будуць устаноўлены па этнаграфічным крытэрыі, а з сацыялістычнай Расіяй і Украінай - "згодна з воляй беларускага народа". У склад створанай у адпаведнасці з гэтым дакументам дзяржавы ўваходзіла толькі 18 паветаў. Яе тэрыторыя ў невялікай ступені выходзіла паза межы Міншчыны. У кастрычніку 1920 г. большая частка тэрыторыі Беларусі разам з Мінскам была паўторна занята польскім войскам. Пасля падпісання прэлімінарнага дагавору ў Рызе, 12 паветаў, якія ўваходзілі ў састаў БССР, апынуліся ў межах Рэчы Паспалітай. На савецкім баку засталася мікраскапічная рэспубліка з 6 паветаў колішняй Мінскай губерні.

У час польска-савецкай вайны значная частка беларускіх палітыкаў, ведаючы з уласнага вопыту бальшавіцкае панаванне ў 1919 г., не спяшалася заключаць якія-небудзь пагадненні з А. Чарвяковым і В. Кнорыным. Разам з польскай арміяй адышлі ў горад Лодзь Беларуская вайсковая камісія і падначаленыя ёй падраздзяленні. Незалежна ад БВК, ад імя беларускага ўрада Антона Луцкевіча, на польскім баку змагаўся атрад пад камандаваннем ген. Станіслава БулакБалаховіча. 12 кастрычніка Павел Аляксюк, які выконваў абавязкі старшыні Беларускага палітычнага камітэта, заключыў пагадненне з ген. БулакБалаховічам, у адпаведнасці з якім Камітэт меў весці вярбовачную акцыю ў беларускае войска. Яго камандзірам меў быць БулакБалаховіч. Узамен меў ён дапамагчы дзейнічаючаму ад імя ўрада А. Луцкевіча Камітэту пераймаць цывільную ўладу на занятых ягоным войскам абшарах Беларусі.

Генарал Булак-Балаховіч разам са сваім атрадам, паралізуючы тылы Чырвонай Арміі, выдатна пасадзейнічаў польскім войскам у контрнаступленні ў верасні 1920 г. Прабаваў ён, згодна сакрэтнай дамоўленасці з Ю. Пілсудскім, ваяваць з Савецкай Расіяй яшчэ пасля перамір'я на польска-савецкім фронце ў кастрычніку 1920 г. Восенню армія ген. Булак-Балаховіча налічвала амаль 15 тыс. салдат. 10 лістапада ягоныя атрады завая валі Мазыр і рыхтаваліся да наступлення на Мінск і Гомель. У Мазыры С. Булак-Балаховіч праклама ваў незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, сябе абвясціў Галоўнакамандуючым, а Беларускі палітычны камітэт - урадам БНР, адмаўляючыся такім чынам падпарадкавацца існуючым ужо цэнтрам улады - урадам А. Луцкевіча ў Варшаве і В. Ластоўскага ў Коўне. Прэм'ерміністрам новага ўрада стаў Вячаслаў Адамовіч. Ад імя свайго кабінета выдаў ён маніфест да беларускага народа, у якім апавяшчалася далейшая барацьба за незалежнасць Беларусі ў саюзе з

Польшчай, правядзенне аграрнай рэформы, уключна з адчужэннем вялікай зямельнай уласнасці і скліканне нацыянальнага прадстаўніцтва дзеля акрэслення дзяржаўнага строю. Пасля баёў, якія цягнуліся некалькі дзён, атрады ген. С. БулакБалаховіча былі Чырвонай Арміяй разбіты і прымушаны адступіць на тэрыторыю Польшчы, дзе і былі інтэрніраваны.

У той жа час за незалежнасць Беларусі прабавалі змагацца таксама афіцэры, які выводзіліся са Слуцкага павета. У палове лістапада адбыўся З'езд Случчыны. Прадстаўнікі палітычных партый, сялянскіх саветаў, грамадскакультурных арганізацый прызналі Случчыну часткай Беларускай Народнай Рэспублікі і вырашылі змагацца за яе незалежнасць. Спадзяваліся яны, што іх змаганне будзе пачаткам акцыі, якая ахопіць усю Беларусь. На працягу двух дзён жыхарам Случчыны ўдалося сфарміраваць два стралковыя палкі. Далучыўся да іх беларускі батальён з Беласточчыны пад камандаваннем Міколы Дзямідава. На гэтай аснове была створана Слуцкая брыгада, якая налічвала каля 4 тыс. салдат. 30 лістапада пачаліся баі з атрадамі Чырвонай Арміі, вынік якіх, па прычыне перавагі расіян, быў загадзя вядомы. Аднак ваенныя дзеянні, галоўным чынам партызанскага характару, доўжыліся амаль да канца снежня 1920 г. Слуцкія паўстанцы, так як раней армія ген. С. Булак-Балаховіча, адышлі на тэрыторыю Польшчы, дзе таксама былі інтэрніраваны.

У канцы 1920 г. у прыфрантавой паласе, па абодвух баках дэмаркацыйнай лініі, дзейнічала больш за дзесяць беларускіх партызанскіх атрадаў, якія выступалі пад супольнай назвай "Зялёны дуб". Са згоды і пры падтрымцы польскай разведкі партызаны ўчынялі напады на кантраляваную савецкім войскам тэрыторыю, а ў выпадку небяспекі адыходзілі ў Польшчу. І хаця лозунгам "Зялёнага дуба" была барацьба за незалежную Беларусь у этнаграфічных граніцах, аднак, здаецца, мела яна ўсяго прапагандысцкае значэнне. Многія беларускія афіцэры, якія ўдзельнічалі ў вайне з бальшавікамі на пачатку 1921 г., перамір'е на польска-савецкай граніцы лічылі часовым становішчам. У гэтым перакананні праўдападобна ўмацоўвалі іх прадстаўнікі польскай разведкі, якія дастаўлялі ім зброю і сродкі на ўтрыманне атрадаў. Пасля падпісання 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора частка камандзіраў "Зялёнага дуба" прызнала беларускі эміграцыйны ўрад Вацлава Ластоўскага адзіным прадстаўніцтвам беларускага народа. Многія памянялі фронт, спынілі антысавецкую партызанскую дзейнасць, далучыліся да руху, які арганізаваўся ковенскім цэнтрам на тэрыторыі

Гродзеншчыны і Віленшчыны.

Летам 1921 г. польскія ўлады, у адпаведнасці з рашэннямі Рыжскага мірнага дагавора, забаранілі беларусам весці якія-небудзь дзеянні супраць СССР з тэрыторыі Польшчы. У рамках ліквідацыі антысавецкіх цэнтраў у межах польскай дзяржавы на Гродзеншчыне забаронена было выдаваць газеты на беларускай мове і закрыты былі беларускія школы.

У кастрычніку 1920 г. польскае войска пад камандаваннем ген. Люцыяна Жалігоўскага заняло Віленшчыну, якая з ліпеня знаходзілася ў межах Літвы. Пераможаныя літоўцы, зацікаўленыя ў аслабленні Польшчы, сталі тады прыхільнікамі беларускага незалежніцкага руху.

На тэрыторыі пракламаванай ген. Л. Жалігоўскім г.зв. Сярэдняй Літвы Вацлаў Івано̆ўскі і Браніслаў Тарашкевіч атрымалі высокія пасады ў польскай адміністрацыі - Часовай упраўляючай камісіі. Аднак віленскі Беларускі нацыянальны камітэт не аказаў падтрымкі іхнай місіі. Паза тэрыторыяй Сярэдняй Літвы, усюды там, дзе вярталася польская адміністрацыя, закрываліся беларускія школы. На тэрыторыі Віленшчыны беларускае школьніцтва існавала да той пары, пакуль у складзе Часовай упраўляючай камісіі былі В. Іваноўскі і Б. Тарашкевіч.

13 лістапада 1920 г. урад БНР Вацлава Ластоўскага падпісаў з урадам Літвы пагадненне аб узаемнай падтрымцы дзеля “стрымання польскага імперыялізму”. Узамен за фінансавую дапамогу і падтрымку на міжнароднай арэне урад Ластоўскага абавязаўся перадаць у распараджэнне літоўскага галоўнага камандавання ўсе беларускія вайсковыя часці, якія знаходзіліся на тэрыторыі Літвы. Паабяцаў ён таксама паўплываць на беларусаў, каб у выпадку аб’яўлення рэферэндуму ў справе дзяржаўнай прыналежнасці гэтай тэрыторыі галасавалі яны за карыснае для Літвы вырашэнне. Урад В. Ластоўскага атрымаў таксама 40 млн. марак крэдыту ад Нямеччыны на фінансавую падтрымку партызанскіх атрадаў, якія мелі змагацца з Польшчай у выпадку яе вайны з Літвой.

Падчас канчаючых польска-савецкую вайну мірных перагавораў, якія вяліся ў Рызе з восені 1920 г., беларусаў не прадстаўляў ніводзін палітычны цэнтр. Лёс Беларусі вырашаўся без беларусаў. Паводле ўдзельніка перагавораў з польскага боку Уладзіслава Грабскага, савецкі ўрад, узамен за ўступкі на тэрыторыі Украіны, прапанаваў Польшчы большую частку Беларусі разам з усёй Міншчынай. Баючыся залішне вялікай колькасці праваслаўнага насельніцтва ў межах Рэчы Паспалітай, Уладзіслаў Грабскі, прадстаўляючы эндэцкую (нацыяналдэмакратычную) палітычную

думку, фарсіраваў граніцу ўздоўж Дзвіны, ад латышска-савецкай мяжы ў напрамку сярэдняга цячэння Прыпяці. Такі выгляд граніцы з СССР выключаў, нават пры добрай волі польскага боку, ажыццяўленне якіх-небудзь федэратыўных планаў, спрыяў эндэцкай канцэпцыі інкарпарацыйнай палітыкі.

Рыжскі мірны дагавор нанёс вялікі ўдар па беларускіх палітыках Найвышэйшай Рады БНР і Беларускага палітычнага камітэта, якія паслядоўна выказваліся за аб'яднанне беларускіх зямель і стварэнне федэрацыі з Польшчай. Акцыя ген. С. БулакБалаховіча ў Мазыры і Слуцкае паўстанне не змянілі стаўлення польскага ўрада і парламента да выканання пагадненняў, заключаных з бальшавікамі ў кастрычніку 1920 г. і пацверджаных Рыжскім мірным дагаворам. Гэты дагавор, які падзяліў Беларусь, ніколі не быў адобраны ніводным важнейшым беларускім цэнтрам у Польшчы, ствараў сітуацыю супярэчнасці польскабеларускіх інтарэсаў і вялікія магчымасці ўздзеяння на гэтыя суадносіны з боку Масквы.

# Савецкая Беларусь (1921-1939)

### Нэп і беларусізацыя краіны

Адзін з пунктаў Рыжскага мірнага дагавора, падпісанага Польшчай і Расіяй 18 сакавіка 1921 г., прадугледжваў прызнанне абодвума бакамі "незалежнасці Беларусі і Украіны". Тэрыторыя "незалежнай Беларусі" абымала 59,6 тыс. квадратных кіламетраў. Састаўлялі яе 6 паветаў Мінскай губерні - Бабруйскі, Мазырскі, Слуцкі, Ігуменскі, Барысаўскі і Мінскі. На гэтым абшары пражывала 1,6 млн. людзей. Абрэзаная з усходу і захаду Беларусь была своеасаблівым дзяржаўным тварэннем. Хаця яна поўнасцю палітычна і гаспадарча апынулася ў залежнасці ад Расіі, аднак фармальна з'яўлялася суб'ектам міжнароднага права.

Назначаны сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі Вільгельм Кнорын імкнуўся быць галавой беларускай савецкай дзяржавы ў значна шырэйшых межах, чым Мінская губерня. У лістападзе 1920 г. прабаваў ён у Маскве дабіцца вяртання тых паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў, у якіх пражывалі беларусы. Рашучая адмова цэнтральных улад бальшавіцкай партыі весці размовы на гэтую тэму рабіла беспадстаўнымі далейшыя захады расійскіх камуністаў, якія кіравалі БССР, наконт пашырэння межаў гэтай дзяржавы. Дыскусія на гэту

тэму стала магчымай на пачатку 1921 г., калі быў падпісаны Саюзны рабочасялянскі дагавор паміж Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікай (РСФСР) і Беларускай ССР. Абодва бакі “зыходзячы з права народаў на самавызначэнне, (...) усведамляючы неабходнасць аб’яднаць свае сілы ў мэтах абароны, а таксама ў інтарэсе іх гаспадарчага будаўніцтва, рашылі заключыць саюзны рабочасялянскі дагавор”. Пагадненне ўводзіла супольныя для абедзвюх дзяржаў народныя камісарыяты (міністэрствы): ваенных і марскіх спраў, знешняга гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносін, поштаў і тэлеграфа. На практыцы абазначала гэта, што адміністрацыя на тэрыторыі Беларускай ССР апынулася ў залежнасці ад цэнтральных улад у Маскве яшчэ да ўзнікнення Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе адкрываў, аднак, кіруючым у Мінску камуністам магчымасць патрабаваць пашырыць граніцы рэспублікі на населеныя беларусамі землі, якія знаходзіліся ў межах Расіі. Масква, перасоўваючы расійскабеларускую мяжу на ўсход, не трацiла кантролю над усёй тэрыторыяй і магла прытым здабыць давер беларускай інтэлігенцыі і эміграцыйных палітыкаў, якія падвяргалі сумненню як сапраўднасць беларускай дзяржавы, так і верагоднасць савецкай нацыянальнай палітыкі.

У кастрычніку 1922 г. Пленум Цэнтральнага Камітэта Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў) прыняў рашэнне аб стварэнні СССР. 30 снежня З’езд Саветаў савецкіх рэспублік Беларусі, Украіны, Расіі і Закаўказзя абвясціў адпаведную дэкларацыю - юрыдычны акт, які спрыяў аднаўленню расійскай імперыі з новым ідэалагічным фасадам.

У сакавіку 1923 г. VII З’езд КП(б)Б прыняў пастанову, у якой было сказана, што для адраджэння Беларусі неабходным з’яўляецца ўключэнне ў яе састаў суседніх раёнаў “згодна іх гістарычнай, эканамічнай і нацыянальнакультурнай спецыфіцы”. Змест гэтага дакумента раней быў узгоднены з ЦК РКП(б). Адпаведныя пастановы перадалі ў ЦК РКП(б) таксама з’езды Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Гомеля і Віцебска. Надаванне верагоднасці інтэрнацыяналістычнаму характару бальшавіцкай улады здзяйснялася, між іншым, шляхам аб’ядноўвання беларускіх зямель, якія знаходзіліся на ўсходнім баку рыжскай мяжы. 7 сакавіка 1924 г. Прэзідыум Усесаюзнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта выдаў дэкрэт аб перадачы Беларусі 15 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам. У выніку тэрыторыя рэспублікі падвоілася і пасля ўзбуйнення складала 110,5

тыс. квадратных кіламетраў. Лік насельніцтва перавысіў 4 млн.

У снежні 1926 г. да БССР былі далучаны яшчэ Гомельскі і Рэчыцкі паветы, якія да гэтай пары знаходзіліся ў складзе Украінскай ССР. Такім чынам Беларусь павялічылася да 125 тыс. квадратных кіламетраў, а лік насельніцтва ўзрос да 5 млн. Паводле перапісу 1926 г. беларусы складалі 80,6% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны, яўрэі - 8,2%, расіяне - 7,7%, палякі - 2,0%, іншыя нацыянальнасці - 1,5%.

Саюзны дагавор ад 30 снежня 1922 г. уводзіў супольнае грамадзянства для жыхароў усіх рэспублік. 31 студзеня 1924 г. З'езд Саветаў СССР устанавіў канстытуцыю, якая сталася асноўным законам на гэтай тэрыторыі. З гэтай пары юрыдычныя акты паасобных рэспублік не маглі стаяць у супярэчнасці з канстытуцыяй СССР.

Канстытуцыя БССР была ўхвалена з некаторым спазненнем у параўнанні з астатнімі саюзнымі рэспублікамі, бо толькі ў 1927 г. Беларускія камуністы, падбадзёраныя адносна ліберальнай нацыянальнай палітыкай цэнтральных улад, хацелі пазбегнуць запісу аб дыктатуры пралетарыяту, прызнаючы такую фармулёўку нелагічнай у рэспубліцы, дзе звыш 80% насельніцтва складалі сяляне. Неўзабаве іх сталі дакараць за гэты грэх у ходзе расправы над гэтак званай нацдэмаўшчынай.

Канстытуцыя БССР фармальна перадавала ўладу саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Права выбіраць у саветы - дзейнае і пасіўнае - мелі рабочыя, сяляне і салдаты. Гэтых правоў былі пазбаўлены духоўныя, прыватныя гандляры, прадпрымальнікі, якія наймалі рабочую сілу, колішнія чыноўнікі і паліцыянты, асобы, якія прымалі ўдзел у палітычнай дзейнасці ў 1917-1921 гадах на баку праціўнікаў бальшавіцкага рэжыму.

У пачатку 20-х гадоў у Беларусі ўвесь час дзейнічала некалькі партый сацыялістычнага напрамку, якія звычайна адабралі бальшавіцкі парадак. Самай уплывовай і мнагалікай - звыш 20 тыс. членаў - была Беларуская партыя сацыялістаўрэвалюцыянераў. Варта прыгадаць, што Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі напрыканцы 1921 г. налічвала ўсяго 1,5 тыс. членаў, а чатыры гады пазней - 6,6 тыс. БПСР мела свае структуры перш за ўсё ў сялянскім асяроддзі, дзе ўплывы камуністаў былі нязначныя. Да таго лідэры гэтай партыі ўдзельнічалі ў эміграцыйным урадзе ў Коўне, арганізавалі партызанскі рух на тэрыторыі ІІ Рэчы Паспалітай. Другой партыяй, якая карысталася сапраўднай грамадскай падтрымкай, быў Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд). Па ліку членаў Бунд

www.kamunikat.org

перавышаў нават БПСР. Юрыдычны парадак СССР не прадугледжваў існавання - паза бальшавіцкай партыяй - ніякіх іншых палітычных арганізацый, нягледзячы на іх характар, ідэалогію і грамадскую падтрымку. Найхутчэй распушчаны быў Бунд. 25 сакавіка 1921 г. нечарговы з'езд гэтай партыі вырашыў аб самароспуску. Згодна з заклікам улад Бунду частка яўрэйскіх сацыялістаў папоўніла шэрагі КП(б)Б.

У выніку рашэнняў Цэнтральнага Бюро ЦК КП(б)Б на пачатку 1921 г. былі праведзены масавыя арышты дзеячаў БПСР. У турмах апынулася 860 самых актыўных членаў партыі. У такі менавіта спосаб бальшавікі вызваліліся ад апошняй добра арганізаванай палітычнай канкурэнцыі ў Беларусі. Аднак фармальна БПСР падвяргнулася “самароспуску” ў ходзе легальнага з'езда партыі ў Мінску 8 чэрвеня 1924 г. Апошні з'езд беларускіх эсэраў прызнаў, што існаванне іхняй партыі расколвае супольны фронт працоўных мас, тармозіць развіццё сацыяльнай рэвалюцыі, перашкаджае ўмацаванню савецкага ладу і спрыяе контррэвалюцыі. З'езд выявіў волю, ад імя ўсіх членаў партыі, уступіць у рады бальшавіцкай арганізацыі і далей супольна весці барацьбу з капіталізмам за сацыяльныя і нацыянальныя правы люду Беларусі. Змест пастаноў апошняга з'езда БПСР з'яўляецца доказам таго, што былі яны напісаны калі не Цэнтральным Бюро ЦК КП(б)Б, дык пад кантролем гэтай установы.

У ліпені 1923 г. была аб'яўлена амністыя для дзеячаў і членаў небальшавіцкіх арганізацый, якія дзейнічалі ў Беларусі ў 1918-1921 гадах. Гэта дазволіла зарэгістраваць усіх магчымых праціўнікаў савецкай улады, каб некалькі гадоў пазней падвяргнуць іх фізічнай ліквідацыі. Паколькі аднак у 1923 і наступных гадах ніхто не быў арыштаваны, нават за ўдзел у антысавецкіх узброеных фарміраваннях, расло перакананне аб паступовай дэмакратызацыі камуністычнай сістэмы.

Пасля шасці гадоў нямецкарасійскай і польскарасійскай войнаў, у выніку шматлікіх акупацый гаспадарка Беларусі ляжала ў руінах. Многія прадпрыемствы разам з працоўнымі калектывамі ў 1915 г. былі вывезены ў глыб Расіі. Рэквізіцыі коней, быдла, свіней і збожжа, якія праводзіліся ўсімі змагаючыміся арміямі, даводзілі да ўзнікнення ачагаў голаду ў некалькіх раёнах Беларусі. Несумненна, ратункам для сельскай гаспадаркі, якая дамінавала ў гэтай краіне, быў адыход бальшавікоў ад ваеннага камунізму і абвяшчэнне Леніным у сакавіку 1923 г. новай эканамічнай палітыкі (нэп). У прамысловасці лібералізацыя метадаў гаспадарання выклікала толькі хаос. Некампетэнтнасць новых улад у галіне гаспадаркі стала прычынай

таго, што частка заводаў выраблялa акурат непатрэбныя рынку артыкулы або бяздзейнічала ў чаканні сыравіны і паліва. Увядзенне прынцыпу калектыўнага кіравання, якое мела прадухіліць карупцыю і раскраданне маёмасці, давяло да паўсюднай безадказнасці кадраў, якія ўпраўлялі казённай уласнасцю. Каб прадухіліць далейшую дэзарганізацыю прамысловага сектара, былі спробы прышчапіць сацыялістычнай форме ўласнасці элементы капіталістычных прынцыпаў гаспадарання. Паасобныя прадпрыемствы атрымалі аўтаномію ў справах кіравання, падборкі віду вытворчасці і збыту. Нерэнтабельныя малыя дзяржаўныя прадпрыемствы закрываліся або здаваліся ў арэнду прыватным асобам.

Стаўка на дробную вытворчасць і дробны гандаль аказалася незвычайна паспяховым метадам ажыўлення гаспадаркі, асабліва наладжання эканамічных сувязей паміж горадам і вёскай. Ні прыватная дробная вытворчасць, ні такі ж гандаль не патрабавалі вялікіх дзяржаўных капіталаўкладанняў. Самае галоўнае заключалася ў тым, што гэтыя сектары маглі прапанаваць свае тавары вясковаму насельніцтву ўзамен за харчы. Гэта спрыяла зацікаўленасці сялян развіццём таварнаграшовых адносін і ўзнікненню рынку ўзаемных кантактаў розных сектараў гаспадаркі і рэгіёнаў краіны. Гэты стан не мог, аднак, існаваць надта доўга, бо эфектыўнасць працы і зарплаты ў прыватных прадпрыемствах пастаянна расла, калі на дзяржаўных назіраліся акурат адваротныя тэндэнцыі, а колькасць забастовак на сацыяльнай глебе набывала некантраляваныя памеры. На некаторых фабрыках, асабліва тэкстыльных, рабочыя раскрадалі нават палову вытворчасці. Эканамічная рэчаіснасць стаяла ў выразнай супярэчнасці з ідэалогіяй, якую прапагандавалі новыя ўладары, выклікала пытанні пра сэнс бальшавіцкай рэвалюцыі.

У палове 1925 г. дзяржаўныя ўлады правялі карэктуру галоўных прадпасылак нэпа і ўзялі курс на г.зв. інтэнсіфікацыю працы. Дзяржаўным прадпрыемствам былі назначаны памеры тыднёвай, месячнай і гадавой вытворчасці. Паколькі прыбытак працоўных калектываў залежаў выключна ад велічыні вытворчасці, вельмі хутка ўпала якаснасць выпускаемай прадукцыі. Часта былі гэта машыны і абсталяванне, што ў канчатковым выніку рабіла гаспадарку нерэнтабельнай. Марнатраўства людской працы, сыравіны і паліва давяло да дэмаралізацыі работнікаў як у сферы вытворчасці, так і ўпраўлення.

Паводле даных за 1923 г. на тэрыторыі БССР дзейнічала 10 367 суб’ектаў паза сельскагаспадарчым сектарам, з ліку якіх 65% належалі прыватным асобам. Аднак прыватныя прадпрыемствы давалі працу

www.kamunikat.org

напалову меншай колькасці чалавек, чым дзяржаўныя. Іх лічба пастаянна і хутка ўзрастала. У 1926 г. 58 тыс. прыватных прадпрыемстваў давала працу толькі 10 тыс. наёмных работнікаў. Уласнікі прадпрыемстваў разам з сем'ямі працавалі найчасцей у сваіх фірмах, а іхнія дамы і гаспадарчыя будынкі былі месцамі працы.

Буйнае развіццё прыватнага прадпрымальніцтва наступіла ў 1925 г., калі былі змякчаны падаткавыя тарыфы для ўласнікаў малых гандлёвых і вытворчых прадпрыемстваў. У верасні 1926 г. Савет Народных Камісараў СССР рашыў "максімальна абцяжарыць падаткамі прыватны капітал" і пачаць нацыяналізаваць прыватную вытворчасць і гандаль. У прынцыпе быў гэта канец нэпа і пачатак сталінскай палітыкі уніфікацыі гаспадарчага жыцця. У 1925 г. максімальнае падаткавае абцяжаранне ўласнікаў прыватных прадпрыемстваў складала 25% ад прыбытку. У канцы 1926 г. узрасло яно да 45% і разам з іншымі аплатамі дзяржава забірала ў рамеснікаў і дробных купцоў амаль 70% іх прыбытку. Вынікам гэтых захадаў было раптоўнае падзенне ўдзелу прыватнага сектара ў валавым прадукце краіны. У 1926 г. прыватны сектар дастаўляў 49% прамысловай вытворчасці БССР, а год пазней гэты паказчык скараціўся да 28% .

Адбудова сельскай гаспадаркі, якая давала занятак для амаль 80% жыхароў БССР, праходзіла намнога хутчэй, чым прамысловасці. Пра поспехі ў гэтай галіне вырашалі захаваныя індывідуальныя сялянскія гаспадаркі. Вялікія памешчыцкія маёнткі былі раздзелены паміж фальварковую службу і навакольных сялян. Агулам сялянскім гаспадаркам было перададзена звыш мільёна гектараў зямлі. Узбуйненне гаспадарак стала прычынай павелічэння сельгасвытворчасці, прызначанай на рынак. Нацыяналізацыя памешчыцкай зямлі ў 1919-1920 гг. заключалася ў перадачы яе ў карыстанне сялян і парабкаў. Абдораныя надзеламі зямлі не маглі аднак яе прадаваць, ні перадаваць у іншыя рукі, паколькі былі яны толькі яе карыстальнікамі. Зямля далей заставалася дзяржаўнай уласнасцю. Зямельны кодэкс БССР ад 1923 г. даваў права карыстацца зямлёю ўсім грамадзянам рэспублікі, за выключэннем асоб, якія прымалі на працу наёмную сілу. Згодна дзеючаму закону сяляне, аддаўшы дзяржаве абавязковыя падаткі, маглі свабодна распараджацца лішкамі сваёй вытворчасці. Нормы гэтых паставак да 1928 г. не былі надта высокімі і не абцяжарвалі празмерна сялянскіх гаспадарак.

У 1925-1928 гг. у рэспубліцы праводзілася камасацыя сельскагаспадарчых грунтаў, якая ліквідавала раздробленасць гаспадарак, што перашкаджала рацыянальнай апрацоўцы зямлі. Узніклыя пасля гэтай рэформы кампактныя гаспадаркі велічынёю ў дзесяць і больш

гектараў стваралі шанс зараджэння ў Беларусі сучаснай сельскай гаспадаркі. Аўтар гэтай рэформы, наркам па справах сельскай гаспадаркі Дзмітрый Прышчэпаў, будзе пасля абвінавачаны ў тварэнні кулацкіх гаспадарак.

Ва ўмовах гаспадарчага лібералізму эпохі нэпа некаторыя сялянскія гаспадаркі хутка ўзбуйняліся за кошт уласнасці тых сялян, якія не вытрымалі канкурэнцыі на рынку і, прадаўшы зямлю, пераязджалі ў гарады, дзе ўладкоўваліся на працу ў прамысловасці. У 1929 г. на тэрыторыі Беларусі 81 тыс. сельскагаспадарчых рабочых працавала ў якасці наёмнай сілы ў багатых сялян. Для 34% ад прыведзенага ліку гэтая праца была адзінай крыніцай утрымання. Уласнікі буйных гаспадарак (да некалькіх дзесяткаў гектараў), імкнучыся пазбегнуць нямілага ўладам найму рабочай сілы, часта здавалі ў арэнду мала або беззямельным сялянам частку сваёй зямлі ўзамен за арэндную плату натурай або грашыма, якая вылічалася прапарцыянальна да атрыманага плёну. Не была гэта масавая з'ява, бо сяляне, якія ў 1920-х гадах мелі буйныя гаспадаркі, складалі нязначны працэнт у структуры сельскагаспадарчай уласнасці БССР.

У дваццатых гадах беларускія камуністы вялі палітыку спрыяння развіццю буйных сялянскіх гаспадарак. Напрыклад, зніжалі падаткі з тых сялян, якія вырошчвалі сыравіну для прамысловасці - лён, каноплі, цукровыя буракі. Падаткавыя льготы выдзяляліся таксама сялянам, якія правялі меліярацыю і рабілі капіталаўкладанні дзеля паляпшэння якаснасці зямлі.

Росту заможнасці сялянскіх гаспадарак спадарожнічала ўзнікненне розных сельскагаспадарчых таварыстваў. Арганізаваліся яны нізамі і былі дазволены савецкімі законамі гэтай эпохі. У 1929 г. налічвалася звыш 3 тыс. розных таварыстваў, якія гуртавалі каля 340 тыс. членаў. Былі гэта крэдытныя, меліярацыйныя і машынныя таварыствы, якія ствараліся галоўным чынам дзеля накаплівання сродкаў для правядзення інвестыцый у сельскай гаспадарцы.

На базе сельскагаспадарчай вытворчасці хутка развівалася харчовая прамысловасць, у якой у 1929 г. працавала каля 30% занятых у пазасельскагаспадарчым сектары.

З 1918 г. праіснавалі таксама сельскагаспадарчыя камуны, якія ўзнікалі на базе ліквідаваных памешчыцкіх маёнткаў. Там, дзе ў 1919 г. дайшла польская армія, камуны былі распушчаны. На ўсходзе Беларусі існавалі яны ў якасці супольнасці фальварковай службы, дэмабілізаваных салдат, беззямельных і бяздомных сялян. Камуны аказаліся нерэнтабельнымі і для іх існавання неабходна была фінансавая падтрымка дзяржаўнага бюджэту.

www.kamunikat.org

У 1927 г. улады пачалі калектывізацыю, выкарыстоўваючы дзеля гэтага выключна эканамічныя элементы. Ствараліся саўгасы - дзяржаўныя гаспадаркі, якія мелі паказаць сялянам перавагу працы ва ўмовах сацыялістычнай эканомікі. Паўстала 277 саўгасаў, у якіх знайшло занятак 15 тыс. рабочых. Прынцыпова ўзнікалі яны на найбольш ураджайных землях, на базе былых памешчыцкіх маёнткаў, забяспечваліся трактарамі і самымі сучаснымі сельскагаспадарчымі машынамі, разбудоўвалася ўся інфраструктура гаспадаркі. Узроўнем жыцця і ўмовамі працы рабочых мелі яны заахвоціць сялян добраахвотна ствараць калектыўныя гаспадаркі. Некаторыя саўгасы ў першых гадах свайго існавання былі нават рэнтабельнымі гаспадаркамі. Аднак без адміністрацыйнапаліцэйскага прымусу правядзенне калектывізацыі аказалася немагчымае. Сяляне не былі зацікаўлены ліквідацыяй уласных гаспадарак.

У 1928 г. старшыня бальшавіцкай партыі і кіраўнік савецкай дзяржавы Іосіф Сталін вырашыў паскорыць працэс індустрыялізацыі краіны. Каб здабыць сродкі на інвестыцыі, павялічаны быў экспарт збожжа. Услед за гэтым узраслі нормы абавязковых паставак па намнога ніжэйшых, чым рынкавыя, цэнах. Супраціўленне вясковага насельніцтва, якое не хацела дарэмна аддаваць збожжа, падвяргнула іх новай хвалі рэпрэсій. Прапагандысцкая кампанія, якая клеймавала кулацтва, а асабліва эксплуатацыю вясковай бядоты, пачалася летам 1928 г. і была ўступам да калектывізацыі вёскі без уліку прынцыпу добраахвотнасці і рэнтабельнасці. Агітацыю праводзілі не толькі функцыянеры бальшавіцкай партыі і камсамола, але таксама калектывы рабочых, мастакоў, настаўнікаў і літаратараў. Селянін, у якога была добрая гаспадарка, ставаўся сімвалам зла, эксплуататарства і распусты.

Перыяд нэпа - гэта не толькі лібералізацыя ў гаспадарцы. Быў гэта час нябачанага раней, ні пазней, развіцця культуры, палітыкі беларусізацыі ўсіх галін публічнага жыцця, якая ішла зверху. Першапачаткова намаганні беларускіх камуністаў - Аляксандра Чарвякова, Зміцера Жылуновіча, Усевалада Ігнатоўскага - дзеля стварэння адукацыйнай сістэмы на роднай мове разбіваліся аб супраціў бальшавікоў з-паза Беларусі, якія пераважалі ў дзяржаўных структурах. Нешматлікія беларускія бальшавікі, якія займалі кіруючыя пасады ў Мінску, перамогу савецкай улады ўспрымалі як пачатак раўнапраўя культуры народаў расійскай імперыі. Іх праціўнікі не прызнавалі нацыянальнай адасобленасці беларусаў, выказваліся за захаванне цэласнасці Расіі і былі супраць стварання беларускай дзяржаўнасці. Беларусы, зрэшты, складалі толькі пад дваццаць

працэнтаў членаў КП(б)Б. Канчаткова праблема вырашылася на X З'ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 г., на якім Ленін абвясціў свой план новай эканамічнай палітыкі. У ходзе з'езда з трыбуны прагучэлі абвінавачанні, што ў Мінску мясцовыя камуністы штучна ствараюць беларускую нацыянальнасць. Нечакана за беларусамі заступіўся народны камісар па справах нацыянальнасцей Іосіф Сталін, які ад імя партыйных улад заявіў аб беспадстаўнасці абвінавачанняў, паколькі беларускі народ існуе і карыстаецца сваёй мовай, іншай ад рускай, і таму культура беларускага народа можа развівацца толькі на базе гэтай мовы. У такой сітуацыі нават ярыя праціўнікі якіх-небудзь канцэсій на карысць беларусаў сярод бальшавіцкага кіраўніцтва ў Мінску мусілі ўлічыць афіцыйную пазіцыю партыі, выкладзеную ў выступленні Сталіна на X З'ездзе. Падчас чарговых канферэнцый і з'ездаў Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі не ставілася ўжо пытанне неабходнасці беларусізацыі, а толькі разглядаліся метады яе ажыццяўлення. У ходзе VII З'езда КП(б)Б у сакавіку 1923 г. старшыні Савета Народных Камісараў БССР Аляксандру Чарвякову ўдалося давесці да прыняцця рэзалюцыі, якая сцвярджала, што беларуская мова з'яўляецца адзінай дзяржаўнай мовай на тэрыторыі рэспублікі. Школьныя, універсітэцкія, выдавецкія і навуковадаследчыя ўстановы мелі весці працу на базе беларускай мовы. Партыйны апарат, дзяржаўная адміністрацыя і часці Чырвонай Арміі, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, мелі таксама перавесці сваю працу з рускай мовы на беларускую. Згодна рашэнню Пленума ЦК КП(б)Б, чыноўнікі дзяржаўнай адміністрацыі і работнікі партыйнага апарату павінны былі да грамадзян звяртацца на беларускай мове. Паколькі на практыцы выканаць гэтыя рашэнні было складана, у 1925 г. паасобным ведамствам вызначаны былі канчатковыя тэрміны ажыццяўлення пастаноў партыі. Савету Народных Камісараў, Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту ды ведамствам асветы і сельскай гаспадаркі было загадана поўнасцю перайсці на беларускую мову за год. Двухгадовы тэрмін вызначаны быў ведамствам унутраных спраў і юстыцыі, трохгадовы - аховы здароўя, фінансаў і ваенных спраў.

У выніку рашэнняў, прынятых беларускай секцыяй бальшавіцкай партыі, у БССР узнікла шчыльная сетка дзённых і вячэрніх курсаў па вывучэнні беларускай мовы. На гэтай мове працавалі школы, тэатры, выдаваліся кніжкі і газеты. У палове дваццатых гадоў беларуская мова паўсюдна гучэла на мітынгах, арганізаваных уладамі і на партыйных сходах.

Улады БССР прымалі шырокія меры па ліквідацыі

www.kamunikat.org

непісьменнасці і развіцці школьніцтва ўсіх узроўняў. У 1921 г. у Мінску быў адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт, у 1922 г. - Інстытут беларускай культуры, які ў 1926 г. быў ператвораны ў Акадэмію навук Беларускай ССР. Да 1932 г. узніклі 32 вышэйшыя навучальныя ўстановы. У 1926 г. палова грамадзян умела чытаць і пісаць, а да канца дэкады дваццатых гадоў непісьменныя складалі менш за 20 працэнтаў грамадства.

Змяніліся таксама адносіны грамадзян расійскай, яўрэйскай і польскай нацыянальнасцей да беларускай мовы і культуры. Беларуская мова перастала быць сялянскай гаворкай, стала мовай дзяржаўнай. Па практычных прычынах валоданне беларускай мовай ставалася неабходнасцю. Аднак згодна дзеючым законам грамадзяне маглі звяртацца да партыйных і адміністрацыйных улад на мовах ідыш, польскай і рускай. У 1926 г. на тэрыторыі рэспублікі працавала 146 школ з навучаннем на мове ідыш, 118 - на польскай мове і 118 - на рускай. Настаўнікаў для гэтых школ рыхтавалі Дзяржаўны універсітэт у Мінску і некалькі педагагічных інстытутаў.

Палітыка беларусізацыі БССР змяніла таксама стаўленне да гэтай дзяржавы палітыкаў, якія ўваходзілі ў састаў эміграцыйных структур Беларускай Народнай Рэспублікі і беларускіх дзеячаў у Польшчы. На савецкія пазіцыі перайшлі амаль усе айчынныя інтэлектуалы, якія раней удзельнічалі ў стварэнні БНР. Атрымалі яны прэстыжныя пасады - загадчыкаў кафедраў Белджяржуніверсітэта, Акадэміі навук, навуковых, выдавецкіх і літаратурных інстытутаў. Стваралі яны беларускую нацыянальную рэчаіснасць, рабілі тое, аб чым марылі, засноўваючы Беларускую сацыялістычную грамаду і іншыя партыі да 1920 г. Тыя, што засталіся ў эміграцыі ў Нямеччыне, Чэхаславакіі і Літве мелі толькі кіраўнічыя пасады ў неіснуючай дэфакта дзяржаўнасці і ніякіх перспектыў уздзеяння на сітуацыю ў краіне. Беларускія дзеячы, якія апынуліся на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай, хутка пераканаліся, што атрыманне ад польскіх урадаў якіх-небудзь канцэсій на карысць беларускай культуры - немагчымае. У палітыкаў Беларускай сялянскаработніцкай грамады былі істотныя аргументы для таго, каб сваю партыю ўчыніць рухам на карысць аб'яднання беларускіх зямель у рамках савецкай дзяржаўнасці.

Беларускія камуністы дазвалялі эміграцыйным дзеячам, вядомым сваімі антысавецкімі поглядамі, публікаваць на старонках сваіх выданняў. У Мінску друкаваліся артыкулы аб здарэннях 1917-1920 гадоў, у якіх факты і іх інтэрпрэтацыя не супадалі з бальшавіцкім асвятленнем гэтых падзей. Улады БССР сістэматычна і ў рознай форме заахвочвалі эмігрантаў вярнуцца ў Беларусь і

ўключыцца ў дзеянні на карысць айчыны і нацыянальнай культуры. Згаданы з'езд БПСР ад 1924 г., які прыняў рашэнне аб самароспуску партыі, быў таксама прапагандысцкім мерапрыемствам, якое мела пераканаць беларусаў у замежжы ў тым, што няма лепшай дарогі да ажыццяўлення нацыянальных мэтаў як цераз шэрагі бальшавіцкай партыі.

Сярод прыхільнікаў ліквідацыі структур БНР і далучэння да будовы беларускай савецкай дзяржавы апынуўся Аляксандр Цвікевіч, які з красавіка 1923 г. выконваў абавязкі прэм'ерміністра эміграцыйнага ўрада ў Коўне. Падчас Усебеларускай канферэнцыі, якая адбылася ў Берліне 12-16 кастрычніка 1925 г. з удзелам прадстаўніка беларускага савецкага ўрада Зміцера Жылуновіча, Цвікевіч выступіў з тэзісам аб неабходнасці трывалага замацавання Беларусі ў структурах СССР. Сітуацыя беларусаў, якія апынуліся ў межах Польшчы - гаварыў Цвікевіч - указвала, што для савецкай арыентацыі няма ніякай альтэрнатывы. А існаванне структур БНР аслабляла і падрывала аўтарытэт беларускага савецкага ўрада. Цвікевіч, разам з некалькімі прадстаўнікамі эміграцыйнага ўрада падаліся ў адстаўку і пераехалі ў Мінск. Экспрэм'ер быў прызначаны старшынёю Таварыства культурных сувязей Савецкай Беларусі з заграніцай.

Год пазней на навуковую канферэнцыю ў Мінск прыбыў Вацлаў Ластоўскі, які ў эміграцыйных асяроддзях карыстаўся велізарным аўтарытэтам. Улады БССР падрыхтавалі яму спецыяльную праграму пабыўкі на радзіме. Пад уражаннем перамен, якія здзяйсняліся ў краіне, Ластоўскі рашыў застацца на пастаяннае жыхарства ў Мінску. Спачатку быў ён прызначаны дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, а пасля працаваў неадменным сакратаром Беларускай Акадэміі навук. Прыклад Цвікевіча і Ластоўскага заахвоціў многіх беларускіх эмігрантаў вярнуцца на радзіму. Некалькі гадоў пазней, калі памянялася нацыянальная палітыка Сталіна, яны першымі былі абвінавачаны ў нацыяналізме, варожасці да народа і савецкай улады.

## Барацьба супраць "нацыянал-дэмакратаў"

У 1925 г. з'явіліся першыя спробы замарудзіць працэс нацыянальнага адраджэння. У кастрычніку гэтага ж года на пленуме ЦК КП(б)Б была прынята пастанова "Аб нацыянальнай палітыцы", у якой далейшае працягванне палітыкі нэпа і звязанае з гэтым развіццё капіталізму ў гаспадарцы прызнавалася немэтазгодным, паколькі ўмацоўвае яно буржуазную ідэалогію, якая ў Беларусі выяўлялася

ростам нацыяналдэмакратычных настрояў. Гэтая з'ява - сцвярджалася ў пастанове - ахапіла не толькі дробную буржуазію, інтэлігентаў і сялян, але і частку камуністаў. Пленум заклікаў партыю на барацьбу дзеля забеспячэння выканання "бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі". У 1925 г. больш за палову партыйнага апарату складалі бальшавікі, якія прыбылі сюды з Расіі. Да гэтай пары, пакуль не было выразных указанняў з Масквы, яны самі не мелі магчымасці прынцыпова памяняць палітыку партыі ў нацыянальных пытаннях.

Рэзалюцыя ЦК КП(б)Б ад сакавіка 1926 г. "Аб працы сярод інтэлігенцыі" была чарговым дакументам, які прадвяшчаў рэвізію ранейшай палітыкі. У рэзалюцыі сцвярджалася, што далейшая крышталізацыя нацыяналдэмакратычных настрояў вядзе да адмаўлення інтэлігенцыяй тэорыі класавай барацьбы, зраўнання грамадскага значэння рабочага класа і сялян (кулакоў) ды росту беларускага нацыяналізму, асабліва ў адносінах да нацыянальных меншасцей. У дакуменце ўказвалася на непралетарскае паходжанне беларускай інтэлігенцыі і яе сямейныя сувязі з кулацкім асяроддзем. Асабліва небяспечнай для савецкай улады прызнавалася прысутнасць такой інтэлігенцыі ў кіруючых органах КП(б)Б.

У студзені і кастрычніку 1927 г. адбыліся два чарговыя з'езды КП(б)Б, якія далі пачатак адкрытаму змаганню з беларускай культурай і інтэлігенцыяй. На студзеньскім - Х З'ездзе - прыхільнікі г.зв. нацыяналдэмакратычнай плыні, якія выказваліся за захаванне беларускага культурнага вобліку рэспублікі, былі названы шавіністамі і контррэвалюцыянерамі, што ў бальшавіцкай тэрміналогіі абазначала абвінавачанне ў самым вялікім злачынстве супраць савецкай улады. Ярым прыхільнікам антыінтэлігенцкай акцыі быў І сакратар ЦК Аляксандр Крыніцкі, які пазней сам стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій.

Да 1929 г. ствараліся толькі ідэалагічныя і прапагандысцкія падставы для расправы над беларускімі інстытутамі нацыянальнага жыцця і творцамі беларускай культуры. У маі 1929 г. па загаду Сталіна ў Мінск прыбыла Цэнтральная камісія партыйнага кантролю Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў). Пасля двухмесячнага кантролю камісія абвінаваціла кіраўніцтва КП(б)Б у дапушчэнні да публічнага жыцця эміграцыйных палітыкаў і асоб, якія раней былі членамі "буржуазных" партый, а таксама ў адсутнасці рашучасці ў змаганні з "нацдэмаўшчынай". Сталін не давяраў беларускім камуністам, якія, апрача дэкларацый аб асуджэнні інтэлігенцыі, на практыцы не рабілі амаль нічога, каб спыніць працэс развіцця нацыянальнага жыцця. Менавіта таму аб "небяспецы", якая пагражала савецкай уладзе ў Беларусі, мусілі заяўляць прысланыя з

Расіі і Украіны бальшавікі.

Рашэнні аб расправе над беларускім "нацыяналдэмакратызмам" былі прыняты ў Маскве на канферэнцыі Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) [ВКП(б)]. Тады быў сфармуляваны загад устараніць з шэрагаў КП(б)Б хісткіх і няпэўных асоб, прыхільнікаў дапушчэння да публічнага жыцця "нацыяналдэмакратызму". Сталін, намагаючыся зрабіць гаспадарчае, палітычнае і ідэалагічнае жыццё на тэрыторыі ўсяго СССР аднародным, не мог дапусціць існавання якіх-небудзь істотных фактараў, якія б сведчылі аб беларускай адасобленасці. Было б гэта перашкодай на шляху да таталітарнай уніфікацыі, якая пачалася ў канцы дваццатых гадоў.

У палове 1929 г. пачалася нахабная і бязлітасная прапагандысцкая кампанія супраць беларускай інтэлігенцыі. Работнікі Беларускай Акадэміі навук і народных камісарыятаў сельскай гаспадаркі і асветы былі абвінавачаны ў прапагандаванні нацыяналізму. Многія былі адміністрацыйнымі метадамі прымушаны пакінуць работу і займаемыя кіруючыя дзяржаўныя пасты.

Арышты тварцоў беларускай культуры і арганізатараў нацыянальнага жыцця пачаліся пасля правядзення кадравых змен у кіруючых цэнтрах Мінска. У студзені 1930 г. I сакратаром ЦК КП(б)Б стаў Канстанцін Гей, які прыхільнікаў захавання нацыянальнага вобліку рэспублікі, сярод беларускіх камуністаў, абвінаваціў у імкненні да адбудовы капіталізму, удзельніцтве ў польскай агентуры і спробе штучнага супрацьпастаўлення культуры беларускай рускай культуры. У чэрвені Аддзел Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення БССР, якім кіраваў прысланы з Масквы Пётр Рапапорт, "выкрыў" існаванне контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі - Саюза вызвалення Беларусі. Была гэта першая вялікая правакацыя чэкістаў, накіраваная супраць беларускай інтэлігенцыі. Былі тады арыштаваны 108 чалавек, галоўным чынам прафесары Беларускай Акадэміі навук і Белдзяржуніверсітэта ў Мінску, загадчыкі ведамства асветы, літаратары, дырэктары навуковых і выдавецкіх таварыстваў, гісторыкі і дзеячы, якія ў 1918-1920 гадах удзельнічалі ў заснаванні Беларускай Народнай Рэспублікі, а таксама арганізатары беларускага нацыянальнага жыцця ў БССР у дваццатых гадах. У ліку арыштаваных апынуліся Вацлаў Ластоўскі, Аляксандр Цвікевіч, Язэп Лёсік, Аркадзь Смоліч, Іван Серада, Антон Баліцкі, Зміцер Жылуновіч, Усевалад Ігнатоўскі, самыя выдатныя прадстаўнікі беларускай літаратуры разам з Янкам Купалам і Якубам Коласам. Купала, абвінавачаны ў кіраванні гэтай зрыхтаванай органамі дзяржбяспекі арганізацыі, прабаваў пакончыць жыццё самагубствам.

Цэнтр Саюза вызвалення Беларусі, паводле бальшавіцкай прапаганды, знаходзіўся ў Беларускай Акадэміі навук, а яе прэзідэнт Усевалад Ігнатоўскі быў абвінавачаны ў кіраванні адной з груп нацыяналдэмакратаў. Ігнатоўскі не перанёс прыніжэння і паклёпаў. 4 лютага 1931 г. пакончыў жыццё самагубствам.

У выніку працэсу, які доўжыўся са снежня 1930 г. да сакавіка 1931 г., найбольш жорстка былі пакараны камуністы - канструктары палітыкі нацыянальнага адраджэння ў дваццатых гадах: Зміцер Жылуновіч, Аляксей Адамовіч, Антон Баліцкі, Пётр Ільючонак, Дзмітрый Прышчэпаў. Былі яны прысуджаны да 10 гадоў ссылкі ў канцэнтрацыйныя лагеры. 86 абвінавачаных атрымалі па 3-5 гадоў турэмнага зняволення, а некалькі асоб часова былі апраўданы. У 1937 г., у выніку рэвізіі гэтых прысудаў, большасць абвінавачаных у прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі была прыгаворана да пакарання смерцю.

Расправа над беларускай нацыянальнай элітай праводзілася пад непасрэдным наглядам Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). Падобным чынам вялося таксама змаганне з украінскай інтэлігенцыяй. У той жа час савецкія органы "выкрылі" ў Харкаве Саюз вызвалення Украіны.

У наступных гадах барацьба з г.зв. нацыяналдэмакратызмам пераведзена была з Мінска на правінцыю, дзе спалучалі яе з уціхамірваннем процістаяння сялян супраць калектывізацыі. Прычынай арышту ў правінцыйным мястэчку магла быць, напрыклад, кніжка Гісторыя Беларусі Усевалада Ігнатоўскага, выдадзеная некалькі гадоў таму, калі яе аўтар быў наркамам асветы БССР.

У рамках змагання з нацыяналдэмакратызмам новыя кадры Інстытута моваазнаўства Беларускай Акадэміі навук распрацавалі новыя прынцыпы правапісу беларускай мовы, зацверджаныя ў жніўні 1933 г. Саветам Народных Камісараў БССР. Пад выдуманай прычынай ачышчэння беларускай мовы ад "буржуазных вульгарызмаў" Акадэмія навук давяла да збліжэння яе марфалагічных і сінтаксічных прынцыпаў да тых, якія абавязваюць у рускай мове. Русіфікацыйным аблягчэнням служыць мела замена беларускіх паняццяў рускімі словамі. З пачатку трыццатых гадоў хутка пачала скарачацца колькасць школ з беларускай мовай навучання. У дзяржаўнай і партыйнай адміністрацыі беларуская мова паўсюдна замянялася рускай.

## Калектывізацыя

У 1925 г. падчас XIV З’езда ВКП(б) Сталін заявіў, што для канчатковай перамогі сацыялізму ў свеце неабходнай з’яўляецца індустрыялізацыя Савецкага Саюза. Мілітарысцкія планы Сталіна вызначалі галоўныя напрамкі развіцця прамысловасці. У асноўным планавалася разбудова машынабудавання і металаапрацоўкі, неабходных для тэхнічнага абсталявання арміі, якая мела падтрымоўваць “пралетарскія рэвалюцыі” ў свеце. Планаваныя гіганцкія гаспадарчыя мерапрыемствы патрабавалі мабілізацыі сродкаў унутры СССР, паколькі немагчымымі былі крэдыты ад замежнага капіталу, супраць якога меў быць выкарыстаны гэты мілітарны патэнцыял. Падаткавая абцяжаранасць прыватных прадпрымальнікаў у 1926-1928 гадах хутка давяла да заняпаду гэтага сектара гаспадаркі. Шматкратнае павышэнне сялянам нормаў абавязковых паставак збожжа, якое экспартавалася дзеля атрымання валюты неабходнай для закупкі машын і абсталявання, давяло да змяншэння зацікаўлення сялян прадукцыйнасцю працы, а гэта ў сваю чаргу адмоўна паўплывала на валавую вытворчасць у сельскай гаспадарцы. Выкананне планаў Сталіна, значанае чарговымі пяцігодкамі, патрабавала ўвядзення прынцыпу дармовай працы, рабскай сістэмы, свабоднага перамяшчэння рабочай сілы па ўсёй тэрыторыі СССР па загаду кіруючых цэнтраў, якія каардынавалі бальшавіцкую гаспадарчую стратэгію. Вынікам гэтага была крайняя аб’ектывацыя грамадства і чалавечай адзінкі.

У 1930-1940 гадах у Беларусі паўстала звыш тысячы новых прадпрыемстваў, з ліку якіх каля 400 працавала на карысць ваеннапрамысловага комплексу Савецкага Саюза. Вытворчасць астатніх толькі часткова прызначана была для спажывецкіх мэт. Большасць накіроўвалася на рэалізацыю чарговых інвестыцый або замарожваліся ў якасці мілітарных рэзерваў.

Другой мэтай індустрыялізацыі, апрача будовы ваенна-прамысловага комплексу, была змена структуры грамадства шляхам павелічэння колькасці рабочага класа за кошт зненавіджванага камуністамі сялянскага асяроддзя. На працягу дзесяці гадоў індустрыялізацыі колькасць рабочых у Беларусі павялічылася ў тры разы. У 1939 г. рабочыя разам з сем’ямі складалі 22 працэнты жыхароў рэспублікі. Былі гэта перш за ўсё сяляне, якіх з вёсак выгнала палітыка калектывізацыі.

Становішча рабочага класа ў СССР у перыяд індустрыялізацыі - адна з найменш вывучаных тэмаў гісторыі гэтай краіны. За вялікім

прапагандысцкім матэрыялам амаль не выдаць праўды. Нізкія заработныя платы рабочых у БССР прымушалі жанчын таксама паступаць на працу. Прапанаваліся ім перш за ўсё месцы ў галіне машынабудавання і металаапрацоўкі. Камуністычная прапаганда стварыла асаблівую мадэль раўнапраўя і эмансіпацыі савецкай жанчыны, якая працуе ў традыцыйна лічаных мужчынскімі прафесіях. Жанчына з кавальскім молатам або за рулём калгаснага трактара мела сімвалізаваць роўнасць савецкіх грамадзян у доступе да ўсіх прафесій. У такі спосаб рыхтаваліся таксама кадры для прамысловасці ў выпадку абʼяўлення ўсеагульнай мабілізацыі.

Раптоўны наплыў вясковага насельніцтва ў гарады ў трыццатых гадах выклікаў узнікненне вялікіх жыллёвых праблем. Новых рабочых пасялялі ў бараках, дзе ў адным памяшканні найчасцей кватараваліся па дзве сямʼі. Пры разбудаванай сістэме пастаяннага нагляду за грамадзянамі забяспечвала гэта органам НКУС поўны кантроль рабочага асяроддзя.

У трыццатых гадах, у перыяд сталінскай мадэрнізацыі савецкай гаспадаркі, найбольш пацярпела сялянства. Калектывізацыя стала другім этапам грамадзянскай вайны, якая ў гэтым выпадку вялася супраць самай вялікай групы ўладальнікаў. У Беларусі калектывізацыя пачалася напрыканцы 1929 г. Большасць беларускіх камуністаў, у тым ліку народны камісар сельскай гаспадаркі Дзмітрый Прышчэпаў, не была прыхільнікамі сталінскай сельскагаспадарчай рэформы. Па гэтай прычыне калектывізацыя дасягнула тэмпаў толькі пасля іх арышту і прыгавору за добразычлівасць да "нацыяналдэмакратызму". У палове 1929 г. толькі 1,4% сельскагаспадарчых угоддзяў належала калгасам і саўгасам. Да канца года гэты паказчык павялічыўся да 10% - у выніку добраахвотнай перадачы сялянамі зямлі ў саўгасы, якім мадэрную інфраструктуру прыдбала дзяржава. На працягу некалькіх месяцаў савецкая прапаганда пераканала частку сялян у тым, што праца ў саўгасах будзе лягчэйшай і больш прыбытковай чым на сваіх уласных гаспадарках.

Ад пачатку 1930 г. новыя камісары БССР, якімі былі прысланыя з Масквы дзеячы або павышаныя правінцыйныя партыйныя актывісты, шчыра выконвалі найбольш абсурдныя дырэктывы Крамля. У лютым 1930 г. Бюро ЦК КП(б)Б вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы 80% сялянскіх гаспадарак. Быў гэта адказ правячых Беларуссю бальшавікоў на пастанову ЦК ВКП(б) "Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву". Новыя ўлады БССР намерваліся за месяц поўнасцю змяніць структуру зямельнай уласнасці на тэрыторыі рэспублікі і дасягнуць такія тэмпы

www.kamunikat.org

калектывізацыі, якіх нават не чакаў маскоўскі цэнтр. Шляхам насілля і тэрору да сакавіка 1930 г. канфіскавана было 58% сялянскай зямлі. Разам з зямлёй канфіскаваўся ўвесь інвентар - коні, каровы, свінні, а нават свойскія птушкі. Натуральнай рэакцыяй сялян сталі масавы зарэз жывёлы і хаванне запасаў мяса. Улады неўзабаве такія паводзіны прызналі праявай кулацкай контррэвалюцыі, што пацягнула за сабой усе паслядоўнасці, якія вынікалі з прынятых уладамі надзвычайных мер.

Рэквізаваная сялянская жывёла ў саўгасах і калгасах таксама падвяргалася масаваму зарэзу па прычыне адсутнасці корму і адпаведных будынкаў. У першых трох месяцах 1930 г. БССР страціла чвэрць усяго пагалоўя коней, кароў і свіней. Шэсць тысяч сялян, якія пратэставалі супраць калектывізацыі, былі сасланы ў Сібір. Далейшае фарсіраванне палітыкі калектывізацыі ў намечаным тэмпе пагражала развалам савецкай гаспадаркі і таму на пачатку красавіка 1930 г. у маскоўскай “Праўдзе” з’явіўся артыкул Сталіна, у якім партыйныя актывісты абвінавачваліся ў “здрадзе бальшавіцкім прынцыпам па аграрным пытанні”. Сталін асуджаў прымус і адсутнасць усведамлення сялян у мэтазгоднасці калектывізацыі. Крыху пазней, спасылаючыся на павучэнні Сталіна, да памылак і перагібаў прызнаўся Цэнтральны Камітэт ВКП(б). Кампанія асуджэння метадаў і людзей, якія нанеслі ўрон сельскай гаспадарцы на пачатку 1930 г., выклікала чарговую, непрадугледжаную бальшавікамі з’яву. Сяляне і партыйны апарат у глыбінцы ўспрынялі яе як згоду на выхад з калгасаў і саўгасаў. У красавіку і маі больш за 370 тыс. раней калектывізаваных гаспадарак вярнулася ва ўладанне сялян. У чэрвені дзяржаве або сельскагаспадарчым камунам належала толькі 11% угоддзяў у Беларусі. Аднак немагчыма было ў хуткім часе аднавіць пагалоўе свойскай жывёлы.

Савецкія ўлады аднак не адмовіліся ад калектывізацыі і рашылі яе ажыццявіць метадамі, якія не руйнавалі ўсёй гаспадаркі. Летам зноў сталі заганяць сялян у калгасы. Спачатку састаўляўся спіс інвентара, які потым рэквізаваўся разам з зямлёй. У снежні 1930 г. працэнт калектывізаванай зямлі павялічыўся да 15%, галоўным чынам за кошт найбольшых і самых прадукцыйных гаспадарак, а ў наступным годзе - да 50%. У ліпені 1931 г. ЦК КП(б)Б назначыў канчатковы тэрмін завяршэння калектывізацыі беларускай вёскі на снежань 1932 г. IV З’езд партыі бальшавікоў Беларусі назваў калгаснікаў галоўнай апорай савецкай улады.

Разам з ходам калектывізацыі нарастала супраціўленне сялян, якія стараліся абараніць сваю маёмасць. Многія земляробы мелі ўжо

нагоду спазнаць умовы жыцця і працы калгаснікаў. Таму бараніліся яны ад лёсу, да якога прыгаварыла іх савецкая ўлада. У 1932 г., нягледзячы на безупынны націск улад, плошчы калгаснай і саўгаснай зямлі не павялічыліся. Для ажыццяўлення планаў бальшавіцкай партыі былі патрэбны іншыя меры. З 1933 года пачаліся праследаванні аднаасобнікаў. Падвяргаліся яны штрафаванням па розных выдуманых прычынах, вобыскам кватэр, арыштам без прад'яўляння прычын. Гэтыя метады, праўду кажучы, прымусілі частку сялян уступіць у калгасы або ўцячы ў горад, але былі заслабым стымулам каб гэтыя з'явы ўчыніць масавымі.

Разам з ходам калектывізацыі хутка падала прадукцыйнасць сельскагаспадарчай вытворчасці як у галіне вырошчвання збожжавых культур, так і ў жывёлагадоўлі. Дзяржава, ажыццяўляючы план развіцця машынабудаўнічай прамысловасці, патрабавала дармных харчоў. Часта з калгасаў забіралі нават тое зерне, якое было прызначана на пасяўны матэрыял. Зарплата калгаснікаў, якая пераважна выдавалася натурай, не дазваляла нават на біялагічнае праіснаванне сялянскай сям'і, пазбаўленай кавалка сваёй зямлі. Таму крадзеж харчоў стаў масавай з'явай. Каб прадухіліць празмернае змяншэнне нацыяналізаванай маёмасці, 7 жніўня 1932 г. Савет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову "Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці", якую падпісаў Сталін. Згодна з пастановай савецкага ўрада, за крадзеж калгаснай уласнасці суды павінны былі абвінавачаных прыгаворваць да расстрэлу з канфіскацыяй усёй маёмасці. У паасобных выпадках кара магла быць змякчана, але мінімальны прысуд не павінен быў быць ніжэй за 10 гадоў турэмнага зняволення. Паколькі прыгаворы да вышэйшай меры пакарання выносіліся за крадзеж некалькіх каласкоў збожжа на дзяржаўным полі, пастанова бальшавіцкіх камісараў паўсюдна называлася "законам пяці каласкоў". У адпаведнасці з гэтым законам у Беларусі ў 1933-1934 гадах засуджаных было амаль 11 тыс. чалавек.

Паралельна з уступленнем у сілу "закона пяці каласкоў" павялічаны былі кантынгенты харчоў з калгасаў і ад аднаасобнікаў. Грамадскі кошт сталінскай аграрнай рэформы ў Беларусі быў папраўдзе меншы чым у Расіі і Украіне, дзе ад голаду памерла некалькі мільёнаў людзей, аднак і тут пацярпела некалькі тысяч ахвяр, а метады калектывізацыі шматлікіх яшчэ ўпорных сялянскіх аднаасобных гаспадарак сталі больш жорсткімі. Згодна з указаннямі бальшавіцкага кіраўніцтва, для паскарэння калектывізацыі ў вёскі былі накіраваны найбольш фанатычныя партыйныя работнікі і

www.kamunikat.org

камсамольцы - прадстаўнікі рабочага класа. Прызначаліся яны на кіраўнічыя пасады ў калгасах і саўгасах і карысталіся шырокімі кампетэнцыямі, уключна з правам накіроўваць у суд іскавыя заявы з патрабаваннем пакараць абвінавачаных у парушэнні савецкага заканадаўства. Іх агратэхнічныя веды былі надта сціплыя, а рашэнні часта супярэчылі прынцыпам рацыянальнага гаспадарання.

Дзеля ўдасканалення калектывізацыйных працэсаў на раённым узроўні былі створаны палітычныя аддзелы КП(б)Б, якія мелі наглядаць за ўсімі ўстановамі, абавязанымі садзейнічаць паўста-ванню калгасаў. У снежні 1934 г. больш за 72% зямлі належала калгасам, а год пазней - 85%. У выніку ўведзеных рэформаў ураджайнасць збожжа з аднаго гектара на калгасным полі ўпала ў 1936 г. да 4,5 цэнтнера. Масавыя рэпрэсіі ахапілі самых багатых і найбольш прадпрымальных сялян. Іх ссылка ў канцэнтрацыйныя лагеры толькі адмоўна паўплывала на харчовы баланс краіны. У 1939 г. усё яшчэ 10% сельскагаспадарчых угоддзяў знаходзілася ва ўладанні аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

У 1937-1938 гадах калгаснікам былі выдзелены невялікія зямельныя ўчасткі для вырошчвання бульбы і гародніны. Ураджай з гэтых участкаў не раз дазваляў праіснаваць сялянскім сем’ям. Зарплата калгаснікаў у 1928 г. складала 12 рублёў і была ўтрая ніжэйшая за аклад рабочых у прамысловасці.

Калектывізацыя давяла да таго, што юрыдычнае становішча сялян нагадвала сітуацыю да адмены прыгонніцтва ў Расійскай імперыі ў 1861 г. Бальшавікі напрыканцы трыццатых гадоў вярнулі амаль усе элементы расійскага феадальнага права. Сяляне былі пазбаўлены права на зямлю, пашпартоў, права на свабодную змену месцажыхарства. Тысячамі вывозілі іх у назначаныя месцы прымусовай работы. Розніца заключалася толькі ў тым, што распарадчыкамі іхнага лёсу былі не феадалы, а толькі партыйныя суды, якія абвяшчалі прыгаворы “ад імя працоўнага народа гарадоў і вёсак”.

## У сацыялізм цераз Курапаты

Рэпрэсіі і генацыд трыццатых гадоў у Беларусі, так як і на тэрыторыі ўсяго СССР, мелі дактрынёрскі характар і былі вынікам самой сутнасці марксісцкаленінскай тэорыі класавай барацьбы. Беларусь, у якой амаль 90% насельніцтва складалі сяляне, мусіла стацца аб’ектам бальшавіцкага насілля. Пазбаўленне ўласнасці так вялікай колькасці ўладальнікаў не магло абысціся без ахвяр. На XVII

З'ездзе ВКП(б) у лютым 1943 г. Сталін зрэшты не скрываў, што рэпрэсіі і насілле могуць быць істотным элементам сацыялістычнага будаўніцтва. Больш таго, ні індустрыялізацыя, ні калектывізацыя не маглі б здзейсніцца без папярэдняга збудавання таталітарнай сістэмы.

У снежні 1934 г. рашэннем Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР уведзены былі новыя прынцыпы следства супраць абвінавачаных у тэрарызме. Аб тым, хто быў тэрарыстам і які ўчынак лічыць тэрактам, вырашалі функцыянеры Народнага камісарыята ўнутраных спраў. "Тэрарыстаў" судзіла спецыяльная камісія ў структурах НКУС. Час следства быў скарочаны да 10 дзён, а прыгавор меў быць неадкладна выкананы. У 1937 г. такія ж прынцыпы прымяняліся да асоб, абінавачаных у дыверсіі і шкодніцтве савецкай уладзе. Узрост асуджаных, якіх можна было пакараць смерцю, зніжаўся да 12 гадоў. Функцыянеры НКУС атрымалі права катаваць падазроных у шкодніцтве. Данос пра антысавецкія сімпатыі быў дастатковай прычынай для таго, каб прыгаварыць чалавека да пакарання смерцю.

Беларусь была толькі адной з многіх рэспублік, праз якую пракацілася хваля ірацыянальнага насілля і злачынстваў, якім падвяргаліся часта выпадковыя ахвяры. У 1937-1938 гадах работнікі НКУС узнагароджваліся ордэнамі і павышэннямі па службе за колькасць выяўленых "ворагаў народа". Аддзяленні НКУС спаборнічалі паміж сабою ў забойствах людзей, якіх пазбаўлялі жыцця без судовага разбору і зачытання ім абвінаваўчага заключэння. У лесе каля вёскі Курапаты пад Мінскам у 1937-1941 гадах, паводле розных ацэнак, было забітых ад 100 да 250 тыс. чалавек. Ахвярамі ў большасці сталі сяляне Міншчыны і зняволеныя з усёй Беларусі, якія трапілі ў кіпцюры мінскага НКУС. Людзей забіралі з дамоў ноччу і пасля занясення ў спісак "ворагаў народа" завозілі іх у курапацкі лес.

У 1937-1938 гадах расстрэльвалі амаль усіх, якія мелі якоенебудзь дачыненне да беларускага нацыянальнага руху, асветы, навукі, культуры. Загінулі ўсе раней абвінавачаныя ў прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі. Гэтым разам абінавацілі іх у шпіянажы на карысць Польшчы. Страцілі жыццё 90% работнікаў Беларускай Акадэміі навук, большасць выкладчыкаў Дзяржаўнага універсітэта ў Мінску, работнікаў Тэатра оперы і балета, Дзяржаўнай філармоніі. Загінулі амаль усе арганізатары беларускага палітычнага, навуковага і культурнага жыцця дваццатых гадоў. З ліку 238 беларускіх літаратараў эпоху Сталіна пражыло толькі 20 тварцоў. З бібліятэк была выключана большасць літаратурных твораў на

www.kamunikat.org

беларускай мове.

Ад тэрору не ўсцерагліся таксама галоўныя каты і арганізатары масавых рэпрэсій у Беларусі. У красавіку 1939 г. ваенны суд НКУС Беларускай акругі прыгаварыў да пакарання смерцю кіраўнікоў гэтага ведамства на тэрыторыі Беларусі - Стаяноўскага, Каўфмана, Ягодзіна і кіраўнікоў Аддзела Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення БССР - Бермана, Закоўскага, Наседкіна, якія стваралі ідэалагічную і прапагандысцкую падставу для бальшавіцкага тэрору.

Невядома колькі жыхароў БССР страціла жыццё ў 1937-1941 гг., колькі магіл, такіх, як у Курапатах, узнікла тады на тэрыторыі рэспублікі. Невядома колькі людзей пражывала на гэтым абшары ў чэрвені 1941 г., калі пачалася нямецка-савецкая вайна.

# Беларусы ў II Рэчы Паспалітай

## Грамадства і гаспадарка

Паводле перапісу насельніцтва ад 1921 г. у Польшчы, на тэрыторыі Беластоцкага, Навагрудскага, Палескага і Віленскага ваяводстваў, пражывала 1 035 тысяч беларусаў. Ніхто, аднак, з сур'ёзных гісторыкаў ні ў міжваенны перыяд, ні пазней не лічыў гэты лік сапраўдным. Дзяржаўныя ўлады імкнуліся паказаць польскі характар зямель, распаложаных на ўсход ад рыжскай мяжы, таму ў час перапісу прымаліся розныя меры, каб паказаць там як найменшую колькасць беларускага насельніцтва. Паводле польскага гісторыка Анджэя Жарноўскага, у II Рэчы Паспалітай жыло каля 1,7 млн. беларусаў. Паводле вызначэнняў гісторыка Ежы Тамашэўскага, на тэрыторыі чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў было сама меней 1,95 млн. чалавек беларускай нацыянальнасці, у тым ліку ў Палескім ваяводстве 654 тыс., Навагрудскім - 616 тыс., Віленскім - 407 тыс., Беластоцкім - 269 тыс.

Так як і ў БССР, сярод беларусаў пражываючых у польскай дзяржаве пераважную большасць складала сялянства. Працэнт беларускага насельніцтва ў гарадах быў у восем разоў меншы за такі ж паказчык у вясковым асяроддзі. У сапраўднасці беларускіх жыхароў гарадоў было ў сорак разоў менш чым сялян, якія размаўлялі на такой самай мове. Больш за 90% беларускага насельніцтва ўтрымлівалася з працы на зямлі. Для 7% крыніцай утрымання была наёмная праца. Рабочыя беларускай нацыянальнасці працавалі на пасадах, якія не патрабавалі кваліфікацыі - у сельскай гаспадарцы,

рыбалоўстве, лесаводстве, або ў якасці хатняй службы. Наглядальных пасад, лепш платных і патрабуючых кваліфікацыі, беларусы наогул не атрымлівалі. У некаторых галінах гаспадаркі, асабліва кантраляваных дзяржавай, напрыклад, у камунікацыі, транспарце, сувязі, публічнай службе - беларусаў не прымалі на працу па палітычных прычынах, паколькі адміністрацыя баялася з іх боку сабатажу або дыверсійных дзеянняў.

Вытворчасць на тэрыторыі чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў была цесна звязана з сельскай гаспадаркай. Працавала тут 149 спіртзаводаў, 8 бровараў, 27 крухмальных заводаў, 44 смалакурні, 87 цагельняў, 34 малочныя заводы, 298 млыноў, 82 тартакі. Былі гэта невялікія прадпрыемствы, у якіх сацыяльнае заканадаўства прымянялася толькі ў сімвалічных памерах. Формы працы і аплаты рабочым вызначаліся паводле меркавання работадаўца.

Беларусы складалі самую вялікую групу рабочых у памешчыцкіх маёнтках. Найчасцей працавалі там цэлымі сем'ямі. Жонка даіла кароў, даглядала жывёлу, дзеці пасвілі свіней або выконвалі іншыя хатнія і палявыя работы. Узамен уладальнік маёнтка даваў ім прыстанішча, адпускаў кавалак зямлі для вырошчвання бульбы і гародніны ды плаціў у натуры малаком і свойскай птушкай. Ва ўмовах адсутнасці іншай працы беззямельныя сяляне найчасцей былі поўнасцю залежныя ад работадаўца.

Большасць палявых работ, на сенажацях, у лясах выконвалі сезонныя рабочыя, найчасцей навакольныя сяляне, якія ў такі спосаб зараблялі грошы, каб заплаціць падатак, або адраблялі пазычаную ў двары муку, збожжа, бульбу, якіх нястача, асабліва напрадвесні, была паўсюднай з'явай.

Рамеснікі і дробныя купцы беларускага паходжання гуртаваліся галоўным чынам у пасёлках і малых мястэчках. Рамяство звычайна папаўняла ім даходы з невялікай гаспадаркі. Таксама ў кожнай вёсцы была група сялян, якая, апрача працы на сваёй гаспадарцы, выконвала кавальскія, сталярскія, цяслярскія, кравецкія, ткацкія, шавецкія паслугі.

Беларуская інтэлігенцыя на абшары чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай была нешматлікай. Не было таксама ўмоў, якія садзейнічалі б росту гэтай грамадскай групы. Па палітычных прычынах беларусы вельмі рэдка прымаліся на працу ў адміністрацыю і іншыя дзяржаўныя ўстановы. Беларускае школьніцтва існавала толькі ў сімвалічных памерах. Магчымасці паступаць у польскія сярэднія школы і вышэйшыя навучальныя

ўстановы былі для беларускай моладзі абмежаваны фінансавымі абставінамі. Таму гэтая грамадская праслойка з цягам часу скарачалася. Частка беларускай інтэлігенцыі шукала паратунку ўладкоўваючыся на працу ў гандлі і дробнай вытворчасці, або выконваючы працы характэрныя для найніжэйшых слаёў грамадства. Многія займаліся палітыкай, звычайна імкнучыся звергнуць лад, які давёў іх да ўніжанай сітуацыі. Уздзеянне беларускай інтэлігенцыі на сялянства было невялікае. Не было разбудаваных інструментаў такога ўздзеяння ў выглядзе школ, друку, культурных устаноў.

Беларускія памешчыкі складалі зусім нешматлікую групу. На тэрыторыі чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў 84,4% маёнткаў належалі палякам, а толькі 4,1% - беларусам. У Беластоцкім ваяводстве беларускія памешчыкі складалі толькі 2,4% уладальнікаў маёнткаў (звыш 50 га), Віленскім - 8,2%, Навагрудскім - 8,2%, Палескім - 17,8%. Памешчыцкая ўласнасць складала значную частку ў аграрнай структуры згаданых ваяводстваў. У Палескім ваяводстве займала яна 50,8% плошчы зямлі, Навагрудскім - 35,1%, Віленскім - 32%, Беластоцкім - 18,1%. Самыя вялікія маёнткі налічвалі па некалькі дзесяткаў тысяч гектараў.

Вялікую частку плошчы на гэтай тэрыторыі - звыш 40% - займалі неўраджайныя землі, пашы, лясы, балоты. Існуючай аграрнай структуры спадарожнічалі архаічныя метады гаспадарання. У сялянскіх гаспадарках зямлю апрацоўвалі такімі спосабамі як і стагоддзі таму. Памешчыкі значную частку сваёй зямлі здавалі ў арэнду ўзамен за частку плёну. Грошы рэдка ўжываліся пры такога тыпу здзелках. Рэліктам мінулага былі таксама сервітуты. Аднак для мала і беззямельных сялян давалі яны шанц пратрымаць некалькі штук свіней ці быдла. Таму іх ліквідацыяй былі зацікаўлены толькі больш заможныя сяляне і ўладальнікі фальваркаў. Для гэтых апошніх вартаснымі былі галоўным чынам лясныя сервітуты, па прычыне магчымасці продажу драўніны.

Узровень тэхнікі і плён на Заходняй Беларусі - як звычайна называюць гэтую тэрыторыю ў беларускай пісьменнасці - былі самымі нізкімі ў Польшчы. Па вёсках панавала амаль натуральнае гаспадаранне. Сяляне большасць неабходных у штодзённым жыцці артыкулаў выраблялі саматужна: бялізну, вопратку, абутак, сельскагаспадарчыя прылады, хатняе абсталяванне, посуд. Льняное палатно - асноўны матэрыял для пашыўкі вопраткі - выраблялася амаль у кожнай хаце. У якасці летняга абутку паўсюдна выкарыстоўваліся лыкавыя лапці. Асноўнымі харчовымі прадуктамі

www.kamunikat.org

былі капуста, бульба і хлеб, які пяклі з мукі змеленай у жорнах. Прымянялася соль найгоршага гатунку, а цукар быў рэдкасцю ў сялянскай хаце і паўсюдна замяняўся сахарынам, які кантрабандысты перапраўлялі ў Польшчу цераз літоўскую граніцу. Папаўненнем сялянскага меню былі рыбы, якія ў вялікай колькасці вадзіліся ў адносна шчыльнай сетцы вадаёмаў. Ураджай з 5-10-гектарнай гаспадаркі з цяжкасцю дазваляў пратрымацца звычайна мнагалікай сялянскай сям'і. Голад на гэтай тэрыторыі, асабліва ў пераджніўны час, пастаянна спадарожнічаў насельніцтву.

Грошы ў тадышняй гаспадарцы не адыгрывалі істотнай ролі. Патрэбны яны былі для аплаты падаткаў і куплі неабходных тавараў - запалак, газы, солі. Свайго роду капіталаўкладаннем была жывёлагадоўля. Калі сялянам патрэбны былі грошы, тады прадавалі яны каня або карову, у крайнім выпадку - кавалак зямлі.

## Прагматыкі і партызаны

Грамадскія, палітычныя, эканамічныя і нацыянальныя адносіны на тэрыторыі чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў стваралі атмасферу калоніі. Спосаб польскага праўлення на землях, населеных беларусамі, ад самага пачатку не спрыяў усталяванню карэктных адносін паміж дзяржаўнай уладай і мясцовым насельніцтвам. Разам з замацаваннем дзяржаўных структур пачаліся ліквідацыя беларускага школьніцтва, разбуранне або адбіранне цэркваў, праследаванне падазроных у спрыянні камунізму. Паколькі ў Польшчы перамагла нацыяналдэмакратычная канцэпцыя нацыянальнай палітыкі, на практыцы сталі ажыццяўляцца найгоршыя і самыя брутальныя метады асіміляцыі славянскіх меншасцей. Ва ўмовах парламенцкага кіравання (1921-1926) не рэалізавалася аднак ніводная кампактная праграма нацыянальнай палітыкі. Гэтыя пытанні належалі кампетэнцыі чатырох ведамстваў: міністэрствам унутраных, ваенных і замежных спраў ды міністэрству веравызнанняў і публічнай асветы. За гэты перыд урады змяніліся дзесяць разоў, а кіраўнікі названых ведамстваў змяняліся значнай часцей. Таму палітыка на паўночнаўсходніх крэсах вызначалася перш за ўсё лакальнай адміністрацыяй, якая беларусаў лічыла элементам ніжэйшай катэгорыі, адсталым, прымітыўным, якога лёгка можна апалячыць. Адміністрацыйныя кадры папаўняліся чыноўнікамі з цэнтральных ваяводстваў. У Беларусь часта прысылаліся людзі, якія не праявілі сябе на папярэдняй пасадзе або скампраметаваліся. Гэтая адміністрацыя ажыццяўляла перш за ўсё такую палітыку, якой чакалі

www.kamunikat.org

мясцовыя памешчыкі і якая не заўсёды адпавядала інтарэсам польскай дзяржавы.

Тым часам для змякчэння грамадскіх напружанняў патрэбна была аграрная рэформа. Аднак кожнае дзеянне ў гэтым напрамку давяло б да змяншэння ўласнасці, якая заставалася б у польскіх руках. Таму на аснове закона ад 20 снежня 1920 г. сюды былі прывезены пасяленцы з цэнтральнай часткі Польшчы. Перасяляліся галоўным чынам былыя жаўнеры і афіцэры, якіх надзялялі зямлёй і падтрымоўвалі крэдытамі на асваенне гаспадаркі. Асаднікі мелі ўздзейнічаць на беларускае асяроддзе ў напрамку яго асіміляцыі, быць апорай мясцовай адміністрацыі і тым фактарам, які тармозіў бы антыдзяржаўныя выступленні. Асаднікі найчасцей выконвалі абавязкі солтысаў, войтаў, лаўнікаў (засядацеляў), становіліся ніжэйшай ступенькай улады. Часта на новае месца жыхарства прыязджалі яны з пісталетам або вінтоўкай. У выпадку патрэбы абавязаны яны былі дапамагаць войску, паліцыі, лясной ахове, прымаць удзел у аблавах на партызан.

Каланізацыя крэсаў, паводле планаў дзяржаўных улад, мела аб'яднаць іх з Польшчай, зменшыць зямельны голад у цэнтральных рэгіёнах краіны, стварыць адпаведныя тылы ў выпадку канфлікту з СССР. Хаця на беларускія землі перасяліліся некалькі дзесяткаў тысяч людзей, палітычныя і гаспадарчыя вынікі асадніцтва аказаліся малазначныя. Асаднікі не змянілі нацыянальнага аблічча гэтага рэгіёна. Іх прысутнасць даводзіла часам толькі да напружанняў у адносінах з мясцовым беларускім насельніцтвам.

Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора ўлады хутка давялі да заняпаду беларускае школьніцтва на Віленшчыне. Урад спыніў фінансавую падтрымку, паколькі існаванне гэтых школ палічыў спрэчным з інтарэсам дзяржавы. Пад уздзеяннем агітацыі нацыяналістычных груповак у беларусаў была адабрана большасць асветных устаноў. У іншых ваяводствах беларускія школы былі закрыты на пачатку 1921 г.

Беларускія палітыкі не былі згодны ў справе пазіцыі ў адносінах да рэчаіснасці, якую на населенай беларусамі тэрыторыі стваралі польскія ўлады. Дзеячы, раней звязаныя з Найвышэйшай Радай - Браніслаў Тарашкевіч, Антон Луцкевіч, Сымон РакМіхайлоўскі, ксёндз Адам Станкевіч, Аркадзь Смоліч, Лявон Дубейкаўскі, Эдуард Будзька, Фабіян Ярэміч - лічылі, што ва ўмовах нездзяйснення нацыянальных памкненняў, паражэнняў у галіне будовы сваёй дзяржавы і раздзелу Беларусі трэба прынамсі шукаць магчымасці для праіснавання народа. Зыходзілі яны з прадпасылкі, што змаганне з польскай

дзяржавай можа толькі пагоршыць сітуацыю беларусаў і ў склаўшыхся ўмовах самым галоўным павінна быць асветная праца з народам - змаганне за асвету на роднай мове, стваранне вытворчых каапэратываў, удзел у парламенцкіх выбарах. Браніслаў Тарашкевіч быў перакананы, што парламентарызм і польская дэмакратыя створаць беларусам магчымасць поўнага нацыянальнага жыцця. Прыхільнікі пошукаў пагаднення з палякамі называлі сябе рэалістамі і прагматыкамі. Вясною 1921 г. стварылі яны Беларускі палітычны камітэт (БПК), які супрацоўнічаў у барацьбе на тэрыторыі Рэчы Паспалітай з уплывамі эміграцыйнага ўрада Вацлава Ластоўскага. БПК быў неафіцыйнай арганізацыяй. Інтарэсы гэтай групы афіцыйна прадстаўляў віленскі Беларускі нацыянальны камітэт (БНК).

У сакавіку 1922 г. дэлегацыя Беларускага палітычнага камітэта з Тарашкевічам на чале была прынята начальнікам дзяржавы Юзафам Пілсудскім і прэм’ерміністрам Антоніем Панікоўскім. Беларусы прадставілі найважнейшым асобам у дзяржаве свае пажаданні ў галіне развіцця асветы на роднай мове. Патрабавалі яны стварыць пры Міністэрстве асветы ўстанову па справах беларускага школьніцтва, выдзеліць Віленскай беларускай гімназіі датацыю, адкрыць беларускую настаўніцкую семінарыю ды абняць усе беларускія дзеці навучаннем роднай мове. Апрача галантнасці і абяцанняў пацікавіцца справамі беларускай асветы польскія ўлады беларусам не мелі чаго прапанаваць.

У красавіку 1922 г. дзеячы Беларускага палітычнага камітэта заснавалі Палітычную камісію, якую састаўлялі Браніслаў Тарашкевіч, Антон Луцкевіч і Вячаслаў Багдановіч. Камісія мела распрацаваць прынцыпы працы афіцыйнага Беларускага нацыянальнага камітэта на глебе польскай дзяржаўнасці, а перш за ўсё падрыхтоўкі да парламенцкіх выбараў. Прытрымоўваючыся сваіх поглядаў дзеячы БПК хацелі змагацца за беларускія нацыянальныя інтарэсы ў Польшчы, скарыстоўваючы дэмакратычныя механізмы дзяржавы.

Іншую пазіцыю ў адносінах да польскай дзяржавы прадстаўлялі дзеячы верныя эміграцыйнаму ўраду БНР у Коўне. 26 верасня 1921 г. па ініцыятыве прэм’ера ўрада Вацлава Ластоўскага ў Прагу была склікана Беларуская нацыянальнапалітычная канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў Беларускай партыі сацыялістаўрэвалюцыянераў, Беларускай партыі сацыялістаўфедэралістаў, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, нацыяналсацыялістаў і беспартыйных дзеячаў. Амаль палову ўдзельнікаў канферэнцыі (18) складалі дэлегаты БПСР. На працягу пяці дзён нарадаў удзельнікі канферэнцыі распрацавалі план дзеяння ў новых палітычных умовах. У прынятай

на заканчэнне канферэнцыі рэзалюцыі было сказана, што Беларусь павінна быць непадзельнай і незалежнай дзяржавай. Адзінай легальнай уладай з'яўляецца ўрад БНР які мандат атрымаў ад Рады. Рыжскі дагавор удзельнікі канферэнцыі назвалі трактатам аб падзеле, а склаўшыся парадак па абодвух баках рыжскай мяжы - акупацыяй Беларусі дзвюма суседнімі дзяржавамі. У рэзалюцыі "ўсе актыўныя беларускія сілы" заклікаліся да барацьбы ўсімі магчымымі сродкамі "супраць падзелу Беларусі". "Кожнага, хто прызнае рыжскі дагавор, трэба прызнаць ворагам беларускага народа", - заявілі ўдзельнікі канферэнцыі.

Улічваючы - як было сказана ў рэзалюцыі - асабліва нялюдскае праследаванне беларускай культуры, інтэлігенцыі і нацыянальных дзеячаў у польскай акупацыйнай зоне, вырашана выслаць пратэст у Лігу Нацый з патрабаваннем адкінуць "польскі імперыялізм на лінію рэк Нарвы і Буга". З'езд прадстаўнікоў беларускіх сацыялістычных партый у Празе ўхваліў таксама рэзалюцыю ў справе дзейнасці ген. Станіслава БулакБалаховіча, які быў названы аферыстам і узурпатарам ды абвінавачаны ў злачынствах і грабяжах на беларускім і яўрэйскім мірным насельніцтве.

Хаця ўсе прынятыя ў Празе дакументы аднолькава ацэньвалі польскі і савецкі бакі, аднак партызанскі рух на практыцы арганізаваны быў толькі на заходнім баку рыжскай мяжы. Праўдападобна так дзеялася па волі літоўскіх і нямецкіх пратэктараў урада Ластоўскага. Менавіта Нямеччына і Літва падтрымоўвалі фінансава і забяспечвалі зброяй і амуніцыяй узнікаючыя беларускія партызанскія атрады. Звыш таго, галоўная палітычная сіла ў эміграцыйным урадзе - эсэры, традыцыйна прыяўлялі заходнерускія тэндэнцыі. Пачатак бальшавіцкай палітыкі беларусізацыі ў БССР спрыяў трактаванню іх як патэнцыяльных саюзнікаў беларускай справы.

На пачатку 1922 г. з малалікіх узброеных груп ствараліся буйнейшыя падраздзяленні, якія мелі пачаць паўстанцкую кампанію ў выпадку польскалітоўскага канфлікту. Увесь партызанскі рух кантраляваўся эсэрамі, якія дзейнічалі ў пагадненні з урадам Ластоўскага. У адпаведнасці з дырэктывай Паўстанцкага камітэта, бліжэй неакрэсленага складу, беларускія ваенныя структуры павінны ў канспірацыйных мэтах весці дзейнасць як асветныя гурткі, кааператыўныя арганізацыі, царкоўныя брацтвы. Ваенная вертыкаль эсэраўскай арганізацыі мела назву Брацтва беларусаў. Некаторыя камандзіры, каб падкрэсліць сялянскі характар руху, карысталіся назвай Брацтва сялянбеларусаў.

Побач эсэраўскай арганізацыі дзейнічаў таксама арыентаваны

на Мінск Саюз сялянскай самаахвоы.

Беларускай паўстанцкай арганізацыяй у Польшчы кіраваў Галоўны беларускі штаб, якія меў цесныя сувязі са штабам літоўскай арміі. Галоўнаму беларускаму штабу падначалены былі камандаванні чатырох паўстанцкіх груп са штабамі ў Аранах, Уцянах, Мерачы (на Літве) і праўдападобна ў Вільні. Штабы паасобных груп мелі весці арганізацыйную, палітычную, разведвальную і аперацыйную дзейнасць. У рамках аперацыйнай дзейнасці рыхтаваліся планы дыверсійна-сабатажных акцый у адносінах да стратэгічных аб’ектаў - мастоў, віядукаў, вакзалаў, тэлефонных і тэлеграфных станцый, а таксама наступальныя дзеянні супраць атрадаў польскага войска. З Літвы паступала паўстанцам зброя, амуніцыя, узрыўныя матэрыялы, грошы. Камандзір чацвёртай групы Вячаслаў Разумовіч “Хмара”, якой штаб знаходзіўся ў Мерачы, кіраваў канспірацыйнай структурай з амаль 8 тысяч чалавек. Большасць з іх займалася земляробствам і ніколі не прымала ўдзелу ў арганізаваных лакальнымі камандзірамі акцыях. Праўдападобна патэнцыяльныя паўстанцы не надта добра арыентаваліся таксама ў якім палітычным кантэксце адбывалася іхная канспірацыйная дзейнасць. У выдаваемым камандзірам атрада, які дзейнічаў у ваколіцах Белавежскай пушчы, Германам Шыманюком “Скамарохам” часопісе “Беларускі партызан” пісалася перш за ўсё пра лютасці і здзекі польскага боку над беларусамі. Удзельніцтва ў партызанскім руху мела быць абаронай і адначасна помстай за крыўды нанесеныя народу. Дзяржаўная ідэя ў змесце гэтых публікацый была ледзь прыкметная.

Паколькі структуры беларускай паўстанцкай арганізацыі ствараліся галоўным чынам з думкай аб удзеле ў польскалітоўскай вайне, дзейнасць беларускіх канспіратараў абмяжоўвалася да непрадбачаных Галоўным штабам акцый, якія праводзілі лакальныя камандзіры. Былі гэта перш за ўсё напады на пастарункі паліцыі, цягнікі, склады, магазіны, леснічоўкі, двары. Злоўленыя ў аблавах партызаны ў прынцыпе прыгаворваліся да вышэйшай меры пакарання. Першая экзекуцыя схопленых партызан атрада Германа Шыманюка адбылася 24 мая 1922 г.

15 сакавіка 1923 г. Савет Лігі Нацый прызнаў усходнія межы Польшчы з СССР і Літвой. Перспектыва польскалітоўскай вайны стала нерэальнай. Гэта вырашыла аб адмове падтрымкі літоўскага ўрада для беларускага цэнтра ў Коўне. Змена літоўскай палітыкі выклікала неабходнасць пераносу структур БНР у Берлін, а пазней у Прагу. Сталіца Чэхаславакіі ў другой палове дваццатых гадоў стала галоўным цэнтрам беларускай палітычнай эміграцыі.

www.kamunikat.org

У новай палітычнай сітуацыі канспірацыйныя беларускія структуры на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай, якія ствараліся з восені 1921 г., пачалі падвяргацца распаду. Паліцыі ўдалося арыштаваць арганізатараў беларускага руху на Гродзеншчыне і Беласточчыне. У маі 1923 г. у Беластоку адбыўся працэс 45 канспіратараў, у тым ліку двух дэпутатаў польскага парламента - Сяргея Барана і Сымона Якавюка.

У 1923 г. частка колішняй эсэраўскай канспірацыі апынулася пад кантролем прысланых з Мінска або Масквы эмісараў. На базе, між іншым, груп, якія раней дзейнічалі ў рамках Брацтва беларусаў і Саюза сялянскай самаахновы, ствараліся структуры Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

## Грамадаўская рэвалюцыя

1924 год характарызаваўся самай вялікай напружанасцю беларускіх выступленняў супраць польскай улады. Былі гэта як дзеянні інспіраваныя камуністычнымі арганізацыямі, так і звычайныя рэакцыі на паводзіны адміністрацыі, паліцыі і войска.

Палітыка польскага ўрада вагалася паміж дзвюма тэндэнцыямі, з аднаго боку прымаліся меры рэпрэсіўнага характару, з другога боку вяліся нясмелыя пошукі палітычных спосабаў вырашэння існуючых канфліктаў. Партызанскі рух ліквідаваўся пры дапамозе рашучых ваенных дзеянняў. Стварэнне новай ваеннай структуры - Корпуса аховы пагранічча (КАП), камандзіры якога атрымалі паўнамоцтвы весці контрразведвальную і паліцыйную дзейнасць, масавыя арышты, якія вяліся ў 1923-1925 гадах, абмежавалі развіццё ўсялякіх форм нелегальнай дзейнасці, але поўнасцю яе не ліквідавалі.

Урад разважаў таксама некалькі праектаў эканамічных і палітычных вырашэнняў, якія мелі стварыць шанц нармалізацыі сітуацыі ў паўночнаўсходніх ваяводствах. Першым такія меры прыняў прэм'ер Уладзіслаў Сікорскі. Па яго загаду Канстанты Срокаўскі вясною 1923 г. распрацаваў рапарт аб сітуацыі беларускага насельніцтва. Летам 1923 г. Палітычны камітэт Рады Міністраў падрыхтаваў закон аб дзяржаўнай мове. Закон дапускаў магчымасць карыстацца беларускай мовай у судах і школах, ва ўстановах абавязвала выключна польская мова. Адстаўка ўрада Сікорскага спыніла працы ў напрамку пошукаў палітычных вырашэнняў праблемаў на тэрыторыі населенай беларусамі. Палітыку Сікорскага ў нацыянальным пытанні намагаўся працягваць урад Уладзіслава Грабскага. Апрача стварэння згаданага Корпуса аховы пагранічча

кабінет Грабскага падрыхтаваў г.зв. моўныя законы. Былі яны ўхваленыя Сеймам у якасці закона 31 ліпеня 1924 г. Для разрадкі напружання ва ўсходніх ваяводствах было дазволена арганізаваць двухмоўныя школы, у якіх можна было вучыць беларускай і ўкраінскай мовам у польскіх школах. Гэты закон вырашаў пытанне толькі ў фармальным плане. Інтэрпрэтацыйныя акты да гэтага закона на практыцы рабілі немагчымым якоенебудзь развіццё беларускага школьніцтва. У заходняй частцы Беластоцкага ваяводства, у Беластоцкім, Бельскім і Сакольскім паветах наогул юрыдычна забаронена было ствараць школы з навучаннем беларускай мове. Год пасля ўвядзення закона двухмільённая беларуская меншасць мела 3 школы з выкладаннем прадметаў на роднай мове, з 425 вучнямі і 19 двухмоўных, у якіх роднай мове вучыліся 1 683 вучні. Усіх дзяцей, якія гаварылі пабеларуску і наведвалі ўсеагульныя школы, было звыш 125 тысяч. На кожную тысячу беларускіх дзетак толькі 3,5 мелі нагоду вывучаць родную мову.

Каб адвесці беларусаў ад партызанскага руху ўрад Грабскага разглядаў магчымасць правядзення аграрнай рэформы з улікам інтарэсаў няпольскага насельніцтва. Абмяркоўваўся нават намер увядзення беларускай мовы ва ўстановы тых паветаў, у якіх пераважную колькасць грамадзян складалі беларусы. Ва ўрадзе Грабскага прыхільнікам палітычных вырашэнняў быў Station Станіслаў Тугут. Прапанаваў ён парцэляваную зямлю перадаць беларусам, правесці дэмакратычныя муніцыпальныя выбары ва ўсходніх ваяводствах і адкрыць мясцоваму насельніцтву шырэйшы доступ да дзяржаўных і муніцыпальных установаў.

Аднак на практыцы для дасягнення нармалізацыі на ўсходзе краіны большае значэнне прыдавалася дзеянням КАПа і паліцыі, чым увядзенню развязак эканамічнага і палітычнага характару. Дзеля змены прывычак крэсавай адміністрацыі неабходная была вялікая рашучасць цэнтральнага ўрада. Воля паасобных міністраў рацыяналізаваць нацыянальную палітыку аказалася малазначным фактарам і не паўплывала на ўвядзенне асноўных змен у гэтай галіне. Бязлітаснае сыскванне падаткаў, паліцыйны тэрор і самаўпраўства чыноўнікаў толькі спрыялі росту папулярнасці прасавецкіх груповак, асабліва КПЗБ.

У канцы 1924 г. Камінтэрн памяняў палітыку ў адносінах да Польшчы. Адмовіўся ён ад маланкавых партызанскіх акцый, якія хаця парушалі ўстойлівае становішча ва ўсходніх ваяводствах, аднак вялі да вынішчэння патэнцыяльных рэвалюцыйных кадраў у выніку штораз больш паспяховай барацьбы польскай дзяржбяспекі з

падпольнымі структурамі. Стратэгічныя планы Камінтэрна прадугледжвалі падрыхтоўку "працоўных мас" да ўсеагульнай рэвалюцыі. Найбольш паспяховым метадам падрыхтоўкі было прызнана ўздзеянне на грамадства праз пасрэдніцтва легальна існуючых грамадскіх, палітычных, культурных, асветных і гаспадарчых арганізацый. Дзеля гэтага трэба было ініцыяваць іх узнікненне або пераймаць кантроль над існуючымі ўжо структурамі.

На парламенцкіх выбарах у лістападзе 1922 г. беларускія групоўкі, аб'яднаныя ў Беларускім цэнтральным выбарчым камітэце атрымалі 11 мандатаў у Сейме і 3 у Сенаце Рэчы Паспалітай. Дэпутаты абедзвюх палат польскага парламента заснавалі Беларускі пасольскі клуб, які ўзначаліў Браніслаў Тарашкевіч - прадстаўнік, разам з Сымонам РакМіхайлоўскім і Фабіянам Ярэмічам, беларускіх сацыялдэмакратаў. Дэпутатам Сейма стаў таксама прадстаўнік беларускай хрысціянскай дэмакратыі ксёндз Адам Станкевіч. Самую шматлікую групу беларускіх парламентарыяў складалі беспартыйныя - Аляксандр Уласаў, Вячаслаў Багдановіч, Міхал Кахановіч, Аляксандр Назарэўскі.

Згодна раней абранай палітычнай арыентацыі Тарашкевіч падняўся спрабаваць атрымаць палітычныя і культурныя канцэсіі ў карысць беларусаў пры скарыстанні дэмакратычных механізмаў польскай дзяржавы. У студзені 1923 г. дэпутаты, згуртаваныя ў Беларускім пасольскім клубе прадставілі праект культурнай аўтаноміі для беларусаў. Прапанавалі яны стварыць краёвы парламент у Вільні, дапусціць ужыванне беларускай мовы ў школах і судах, правесці аграрную рэформу і перадаць зямлю мясцовым сялянам, спыніць вайсковае асадніцтва, стварыць ваенізаваныя фарміраванні на прынцыпе грамадзянскай тэрытарыяльнай абароны замест гарнізонаў, якія сваёй прысутнасцю правакавалі антыдзяржаўныя выступленні. Беларускія парламентарыі патрабавалі таксама вярнуць Праваслаўнай царкве храмы, якія ў 1919-1922 гадах былі пераменены на касцёлы. У тадышніх умовах гэтыя патрабаванні былі нерэальнымі і поўнасцю ігнараваліся польскай парламентарнай большасцю і чарговымі ўрадамі.

Тарашкевіч не знеахвочваўся абвінавачваннямі ў паланафільстве, якім падвяргаўся з боку розных беларускіх арганізацый. Намагаўся ён, каб парламентарыі захавалі лаяльнасць у адносінах да польскай дзяржавы. У верасні 1923 г. вёў ён размовы з кандыдатам на пост прэм'ерміністра Станіславам Тугутам. Ад імені Беларускага пасольскага клуба абяцаў падтрымку для новага ўрада ўзамен за спыненне вайсковага асадніцтва, прад'яўленне зняволеным беларусам

абвінаваўчых актаў, стварэнне ў ведамстве асветы пасады намесніка міністра па справах беларускага школьніцтва, адстаўку навагрудскага ваяводы і замяненне яго чыноўнікам беларускай нацыянальнасці, стварэнне адной школьнай акругі для зямель заселеных беларусамі і даручэнне абавязкаў намесніка куратара чалавеку, які выводзіцца з гэтага асяроддзя, адкрыццё гімназіі і дзвюх беларускіх настаўніцкіх семінарыяў і прысваенне ім статусу публічных школ. Стварыць урад Тугуту не пашанцавала, а як міністр без партфеля ва ўрадзе Уладзіслава Грабскага нямнога мог зрабіць, паколькі астатнія міністры да беларускіх пытанняў ставіліся неахвотна.

Адсутнасць якіхколечы ўступак з польскага боку, хаця б у карысць беларускай культуры або асветы, адсутнасць нават жэстаў, якія стваралі б надзею на змену палітыкі ў будучым сталі прычынай адыходу часткі беларускіх парламентарыяў ад дэклараванай раней лаяльнасці ў адносінах да ўрада і інстытутаў польскай дзяржавы. Восенню 1923 г. Сымон РакМіхайлоўскі, Васіль Рагуля і Пётр Мятла стварылі асобны дэпутацкі гурток Беларускіх незалежных сацыялістаў. У адрозненне ад Браніслава Тарашкевіча, парламенцкую трыбуну выкарыстоўвалі яны для апісвання таго, што дзеялася на беларускіх землях.

Надыходзячыя з БССР весткі аб развіцці нацыянальнага жыцця ўсведамлялі тадышнім прыхільнікам прапольскай арыентацыі размеры іх памылковых палітычных разлікаў. У 1925 г. нішто яшчэ не паказвала, што некалькі гадоў пазней беларуская культура і яе стваральнікі стануць першымі ахвярамі сталінскага таталітарызму.

Змена палітычнай арыентацыі Браніслава Тарашкевіча даспявала даволі доўга. У палове ліпеня 1925 г. раіўся ён у гэтай справе ў Гдыні з Аляксандрам Цвікевічам, які неўзабаве адмовіўся ад усіх пастоў ва ўрадзе БНР і выехаў у Мінск. Тарашкевіч жа разам з Сымонам РакМіхаўлоўскім, Пятром Мятлой, Паўлам Валошыным і Юрыем Сабалеўскім выступілі з Беларускага пасольскага клуба і заснавалі новы клуб Беларускай работніцкасялянскай грамады (БСРГ). У час выступленняў у Сейме і на старонках друку Тарашкевіч тлумачыў, што стаўка на атрыманне аўтаноміі для “Белай Русі” ад польскага ўрада аказалася памылковай. “У нас такіх ілюзій няма. Мы раз назаўсёды ад гэтых усіх ілюзій былі вылечаны”, - падкрэсліваў правадыр Грамады. Ніколі ён, аднак, дэталёва не ўдакладняў канчатковую мэту, за якую хоча змагацца разам з узнікаючай на базе клуба палітычнай партыяй. Затое часта паўтараў пра “саюз рабочых і сялян польскіх і беларускіх” і “незалежнасць Белай Русі ў цеснай сувязі з народамі, якія рашыліся на новую грамадскую структуру”. Гэтая

новая структура была толькі ў народаў СССР.

Дэпутаты Грамады, у адрозненне ад калег з Беларускага пасольскага клуба, перасталі шукаць пагаднення з польскай парламентарнай большасцю і кампрамісных развязак з паасобнымі кабінетамі. Гаварылі перш за ўсё пра цёмныя бакі крэсавай рэчаіснасці, рэлікты феадалізму, злоўжыванні адміністрацыі, нахабнасць паліцыі, пародыі судовых працэсаў над беларусамі. Тарашкевіч рашыўся на поўнае супрацоўніцтва з камуністамі, стаў членам КПЗБ і нават быў удзельнікам III Канферэнцыі гэтай партыі, якая адбывалася ў лістападзе 1925 г. у Маскве.

Да майскага дзяржаўнага перавароту (1926 г.) Грамада была малалікай арганізацыяй. Пасля года існавання, у чэрвені 1926 г., гуртавала яна 569 членаў. У лістападзе гэтага ж года БСРГ налічвала ўжо 62 тысячы, а ў снежні - звыш 100 тысяч членаў. Раптоўны рост колькасці членаў гэтай партыі з аднаго боку быў выкліканы настроямі, якія панавалі ў беларускім асяроддзі, з другога - паводзінамі лакальнага дзяржаўнага апарату пасля майскага перавароту, які чакаў інструкцыі, баючыся прымаць якія-небудзь меры, паколькі маглі б яны аказацца супярэчлівымі да намераў новай урадавай каманды. Пасіўнасць лакальнага дзяржаўнага апарату дала правадырам Грамады шанц стварыць партыйныя структуры ўва ўсіх паветах, у якіх жылі беларусы.

Стыхійнасць грамадаўскага руху і адначасна легальныя метады дзейнасці - засноўванне чытальняў, бібліятэк, структур Таварыства беларускай школы, сельскагаспадарчых кааператываў, пазыковых касаў, самадзейных калектываў і выдавецтваў - выклікалі бяссілле паліцыі і крэсавай адміністрацыі.

Для пераважнай большасці беларускіх сялян Грамада давала надзею на змены, была сілай, якая заступілася за іхныя чалавечыя і грамадзянскія правы, стала партыяй, якая ўголас сказала пра польскую крэсавую ўладу тое, што аб ёй думала большасць беларусаў. Была арганізаванай формай пратэсту супраць прыніжаючай рэчаіснасці. Тактыка правадыроў цікавіла нямногіх. Людзі давяралі ім і ўключаліся ў розныя формы дзейнасці, прапанаваныя партыяй.

Дзеячы Грамады перанялі кантроль над Таварыствам беларускай школы, Беларускім навуковым таварыствам, Беларускім выдавецкім таварыствам, віленскім Беларускім нацыянальным камітэтам, Беларускім кааператыўным банкам, Беларускім студэнцкім саюзам. Іншыя беларускія партыі ў той час заставаліся ў цяні БСРГ.

13 лістапада дэпутаты Народнанацыянальнага саюза ўнеслі ў

www.kamunikat.org

Сейме прапанову неадкладна забараніць БСРГ, а баявыя дружыны Польскай сацыялістычнай партыі актыўна ўключыліся ў разгон грамадаўскіх мітынгаў і сходаў. Аб роспуску Грамады прадрашыла пазіцыя крэсавых памешчыкаў, асабліва Аляксандра Мяйштовіча, тадышняга міністра юстыцыі. Ноччу з 14 на 15 студзеня 1927 г. кіраўнікі партыі, а заадно дэпутаты польскага Сейма былі арыштаваны. Зняволенне парламентарыяў супярэчыла абавязваючым законам, якія гарантавалі ім недатыкальнасць у часе выконвання дэпутацкіх абавязкаў. Парламенцкая большасць адобрыла арышты і забарону Грамады.

Зняволенне правадыроў Грамады і забарона партыі не выклікалі ніякай рэакцыі ні Мінска, ні Масквы. У кіраўніцтве ВКП(б) распрацоўваліся ўжо планы расправы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Тарашкевіч, РакМіхайлоўскі, Мятла, Валошын, Сабалеўскі і іншыя лідэры Грамады пакінулі прапольскую арыентацыю і захапіліся тым, што дзеялася ў Савецкай Беларусі ў галіне развіцця нацыянальнага руху. Прадстаўлялі яны самую дасканалую форму нацыяналдэмакратызму. На думку некаторых беларускіх гісторыкаў, правадыры БСРГ былі першымі ахвярамі бальшавіцкай расправы над беларускім нацыянальным рухам. Многае паказвае на тое, што агенты Камінтэрна дапамаглі атрымаць польскаму боку доказы супрацоўніцтва лідэраў Грамады з савецкімі палітычнымі цэнтрамі.

Асуджаныя правадыры Грамады пасля некалькіх гадоў пабыўкі ў польскіх турмах былі перададзены ўладам СССР у рамках абмену палітвязнямі. Загінулі яны падчас масавых рэпрэсій у 1937-1938 гадах, абвінавачаныя ў шпіёнскай дзейнасці на карысць Польшчы.

## Камуністы і прыхільнікі лаяльнасці

Дзейнасць Грамады прабаваў працягваць Беларускі дэпутацкі сялянскарабочы клуб “Змаганне”, створаны пры садзеянні камуністаў у палове 1928 г. Галоўную ролю ў гэтай арганізацыі адыгрывалі дэпутаты Ігнат Дварчанін, Язэп Гаўрылік, Флягонт Валынец. У адрозненне ад Грамады, “Змаганне” па загаду Камінтэрна пачало барацьбу з іншымі беларускімі арганізацыямі ў Польшчы, абвінавачваючы іх у нацыяналізме, згодніцтве і кулацтве. Дварчаніну не ўдалося дабіцца поспеху Тарашкевіча і стварыць такі ж магутны грамадскі рух, якім была Грамада. Перашкаджала гэтаму апатыя, якая апанавала беларусаў пасля забароны Грамады. Таксама ўлады, якія пільна сачылі за праявамі беларускай актыўнасці, паспяхова

тармазілі развіццё “Змагання”.

У лістападзе 1925 г. пасля выхаду групы Тарашкевіча з Беларускага пасольскага клуба дэпутаты Фабіян Ярэміч і Васіль Рагуля стварылі Беларускі сялянскі саюз (БСС). Меў ён быць процівагай і альтэрнатывай левай Грамадзе. БСС у сваёй праграме змяшчала ўсе ранейшыя патрабаванні Беларускага пасольскага клуба. Дальнабачнай мэтай БСС мела быць незалежная Беларусь, бліжэйшай - культурная аўтаномія для беларусаў у Польшчы.

У 1926 г. дзеячы БСС разам з беларускімі хрысціянскімі дэмакратамі стварылі Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГІК), якія ставіў сабе за мэту адмену эканамічнай сітуацыі беларускага насельніцтва. Нягледзячы на супрацьдзеянне ўлад, да 1930 г. узнікла 60 аддзяленняў Інстытута ў розных мясцовасцях Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў. Пад апекай БІГІК працавала 37 бібліятэк. Дзеячы Інстытута падтрымоўвалі развіццё рамяства, засноўванне сельскагаспадарчых кааператываў, стваранне машынных станцый на вёсках, арганізавалі сельскагаспадарчую асвету, прапагандавалі меліярацыю, у выніку якой сяляне маглі прыдбаць дадатковыя плошчы ўгоддзяў. Інстытут праіснаваў да студзеня 1937 г. і быў распушчаны рашэннем віленскага ваяводы па прычыне выдуманага абвінавачання ў антыдзяржаўнай дзейнасці.

Найбольш памяркоўную праграму сярод беларускіх партый, якія дзейнічалі ў ІІ Рэчы Паспалітай, прадстаўляла Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Гэтая арганізацыя дзейнічала з 1917 г. пад назвай Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці, пазней Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці. Цэнтрам беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху была Вільня. Дзейнасць хрысціянскай дэмакратыі абапіралася перш за ўсё на каталіцкім духавенстве і касцельных арганізацыях. Самымі вядомымі дзеячамі гэтага руху былі ксяндзы: Адам Станкевіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Люцыян Хвецька. Хрысціянскія дэмакраты асновай грамадскага парадку лічылі хрысціянскую рэлігію. У нацыянальных пытаннях падкрэслівалі права кожнага народа на самавызначэнне. Зыходзячы з гэтага пункту гледжання, патрабавалі свабоду беларусам у Польшчы на прынцыпе канстытуцыйнай роўнасці ўсіх грамадзян. Патрабавалі яны правядзення аграрнай рэформы, устанаўлення больш справядлівага грамадскага ладу і паўсюднага доступу да асветы на роднай мове. Хрысціянскія дэмакраты крытычна ставіліся да БССР не толькі за атэізацыю, але і за філасофскія асновы іхняга грамадскаюрыдычнага парадку, у якога аснове ляжала класавая барацьба і дыктатура пралетарыяту.

www.kamunikat.org

У 1926 г. партыя прыняла назву Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і стала не толькі каталіцкай, але і агульнанацыянальнай палітычнай арганізацыяй. Галоўнай мэтай БХД стала стварэнне аб'яднанай і незалежнай дзяржавы. У адрас Каталіцкага касцёла і Праваслаўнай царквы ставіліся патрабаванні ўвядзення багаслужбаў і пропаведзей на нацыянальнай мове, беларусізацыі праваслаўнага і каталіцкага духоўных семінарый у Вільні.

Супраць дзейнасці БХД выступалі дзяржаўныя і касцельныя ўлады. Дзяржаўная адміністрацыя не магла перанесці ўздзеяння ксяндзоў на станаўленне беларускай нацыянальнай свядомасці сярод католікаў. У польскай дзяржаве Касцёлу была адведзена іншая роля - пашырэнне польскасці сярод беларускага люду. Таму з пункту гледжання польскіх улад прапаведаванне Божага слова на беларускай мове было зусім непатрэбнае. Паўсюдна канфіскаваўся прэсавы орган БХД "Крыніца", а ксяндзы, якія пропаведзі гаварылі на беларускай мове, падвяргаліся паліцыйным рэпрэсіям.

У 1926 г. віленскі архібіскуп Рамуальд Ялбжыкоўскі адмысловым цыркулярам забараніў католікам чытаць беларускую "Крыніцу", а духавенству - чытаць пропаведзі пабеларуску і быць членамі БХД. У канцы дваццатых гадоў паўсюднай практыкай сталі пераносы ксяндзоў беларускай нацыянальнасці ў цэнтральныя ваяводствы і замена іх польскімі духоўнымі.

У 1935 г. Рада БХД перайменавала партыю на Беларускае нацыянальнае аб'яднанне, фармальна адмаўляючыся ад канфесійнага характару.

Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (ПБДА), якое дзейнічала ў 1927-1931 гг., прабавала браць прыклад ад БХД. У праграме ПБДА рэлігійныя акцэнты пераважалі над нацыянальнымі. Партыя перш за ўсё хацела абараняць інтарэсы праваслаўя, пратэставала супраць стаўлянння Царквы ў залежнасць ад дзяржаўнай улады, адбірання храмаў і царкоўнай маёмасці, патрабавала ажыццяўлення прынцыпу роўнасці ўсіх веравызнанняў. Толькі ў далейшым плане ў праграме партыі ставіліся пастулаты забеспячэння культурных і моўных правоў беларусаў.

Іншую канцэпцыю змагання за беларускія нацыянальныя інтарэсы прадстаўляла група дзеячаў, якія гуртаваліся вакол Антона Луцкевіча і Радаслава Астроўскага. Абодва палітыкі былі калісьці звязаныя з Грамадой, але падчас судовага працэсу ім не былі даказаны сувязі з пасланцамі Камінтэрна. У 1930 г. з некалькіх невялікіх грамадскіх, асветных і выдавецкіх арганізацый стварылі яны таварыства, якое прыняло назву Цэнтральны саюз культурных і

гаспадарчых арганізацый (у скарачэнні: Цэнтрсаюз) і пачалі выдаваць газету “Наперад”. Цэнтрсаюз і яго кіраўніцтва неўзабаве сталі называць “беларускай санацыяй”, “паланафіламі”. Атакавалі іх хрысціянскія дэмакраты, камуністы і іншыя беларускія групоўкі за згодніцтва і кантакты з урадавымі коламі. Дзеячы Цэнтрсаюза зыходзілі з прадпасылак, што ў дадзены момант адзіным вырашэннем для беларускіх арганізацый з’яўляецца аб’яднанне на глебе культурнаасветнай працы з народам. Адмаўляліся яны ад палітычных пастулатаў і барацьбы з польскімі ўладамі на населеных беларусамі землях. Луцкевіч увесь час бачыў магчымасць рэалізацыі беларускіх нацыянальных памкненняў у палітычных умовах II Рэчы Паспалітай. Быў ён перакананы, што змаганне з Грамадой і іншымі беларускімі арганізацыямі, якое вёў урад, адбывалася ў рамках барацьбы з камунізмам. Цэнтрсаюз займаўся заснаваннем бібліятэк і чытальняў на вёсках, распаўсюджваннем літаратуры пад агульнай назвай “Сялянская бібліятэка”, якой змест быў прыстасаваны да інтэлектуальнага узроўню чытача і якая ўсяведамляла яго ў галіне сельскай гаспадаркі і беларускай культуры.

Луцкевіч імкнуўся стварыць праўрадавы беларускі цэнтр, альтэрнатыўны да віленскага Беларускага нацыянальнага камітэта, у якім пераважалі дзеячы БХД. Удалося яму прыцягнуць да Цэнтрсаюза Беларускі студэнцкі саюз, Беларускае навуковае таварыства, Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускае дабрачыннае таварыства, Беларускі гаспадарчы саюз, Аб’яднанне беларускіх жанчын, бацькоўскія камітэты беларускіх гімназій у Вільні, Навагрудку і Клецку. Імпазантнай была таксама выдавецкая дзейнасць Цэнтрсаюза. Гэтая арганізацыя, так як і ўсе іншыя беларускія партыі пасля 1927 г., не мела аднак большай грамадскай падтрымкі.

З Цэнтрсаюзам супрацоўнічаў іншы грамадавец Фабіян Акінчыц. У маі 1931 г. адышоў ён аднак ад арганізацыі Луцкевіча, абвінавачваючы яго ў скрытным спрыянні камунізму. Неўзабаве Акінчыц пачаў ствараць сваю партыю - Віленскую беларускую групу “Адраджэнне”. На старонках выдаваемага ім “Народнага звону” заклікаў беларусаў быць лаяльнымі ў адносінах да польскай дзяржавы, асуджаў беларускіх камуністычных дзеячаў за здраду нацыянальным ідэалам. Не знаходзячы грамадскай падтрымкі Акінчыц на нейкі час спыніў сваю дзейнасць. У 1935 г. разам з Уладзіславам Казлоўскім стварыў Беларускую нацыянал-сацыялістычную партыю (БНСП) і пачаў выдаваць газету “Новы шлях”. Восенню 1935 г. апублікаваў на яе старонках праграму партыі, якая была спробай перанесці нямецкую фашысцкую ідэалогію на беларускі

www.kamunikat.org

грунт. БНСП у сапраўднасці мела нямнога супольнага, апрача назвы, з партыяй Гітлера. Такая прапанова для сялянскага грамадства прадстаўлялася надта кур'ёзна. Усётакі ў канцы трыццатых гадоў з'явіўся план увядзення ў гульню за Беларусь яшчэ аднаго фактара - гітлераўскай Нямеччыны.

БНСП апрача лозунгаў аб нацыянальным адраджэнні, аб'яднанні ўсіх этнічных беларускіх зямель і перадачы памешчыцкай ды калгаснай зямлі беларускім сялянам заяўляла таксама пра нацыяналізацыю лясоў і натуральных рэсурсаў ды змаганне за прынящце пад увагу беларускіх нацыянальных інтарэсаў праваслаўным і каталіцкім духавенствам.

У арганізацыі Акінчыца і Казлоўскага амаль не было грамадскай базы. Мабыць, таму як адзіная беларуская партыя пратрымалася яна да 1939 г. Астатнія беларускія арганізацыі або былі распушчаны ўладамі ў другой палове трыццатых гадоў, або спынілі дзейнасць у выніку самазнішчальных расколаў, якія зрэшты інспіраваліся дзейнасцю польскіх дзяржаўнах чыннікаў.

Найбольш уплывовай і моцнай партыяй, якая дзейнічала ў беларускім асяроддзі, была Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Была яна аўтаномнай арганізацыяй у складзе Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), якая, так як і іншыя партыі гэтага тыпу, заставалася ў поўнай залежнасці ад Камуністычнага інтэрнацыянала (Камінтэрна) з сядзібай у Маскве. Хаця КПЗБ прадстаўляла інтарэсы Савецкага Саюза, мела яна сярод беларусаў некалькі тысяч прыхільнікаў. Яе галоўным козырам было адмаўленне польскай дзяржаўнасці. Сяляне пра камуністаў ведалі толькі тое, што яны з'яўляюцца прыхільнікамі Расіі (СССР паўсюдна трактаваўся як сінонім і працяг Расіі), якая ў культурным, рэлігійным і псіхалагічным плане была беларускай праваслаўнай грамадскасці бліжэйшая чым Польшча. Праваслаўным называў сябе амаль кожны рашучы беларускі атэіст. Пра тое, што дзеялася на ўсходнім баку рыжскай мяжы, амаль не было вядома. Весткі пра калектывізацыю ўспрымаліся найчасцей як выдумкі польскай прапаганды. Большасць членаў КПЗБ складалі беларускія сяляне. У партыі былі таксама палякі, яўрэі, расіяне, якія жылі на тэрыторыі чатырох паўночнаўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. Прыналежнасць соцень тысяч сялян да камуністычнай партыі, якая прадвяшчала дыктатуру пралетарыяту і калектывізацыю зямлі, можна толькі параўнаць да ўдзельніцтва ў жыцці рэлігійнай секты. Адмова існуючай рэчаіснасці стварала членам партыі прыцягальную мадэль паводзін у адносінах да зненавіджанай сістэмы. Папулярнасць КПЗБ

www.kamunikat.org

не была вынікам прываблівасці яе праграмы, але склаўшайся эканамічнай сітуацыі і псіхалагічных патрэб беларускай грамадскасці. У аграрным пытанні КПЗБ зрэшты не мела ніводнай праграмы. Лозунгі, якія заклікалі сялян не плаціць падаткаў, не пагашаць даўгоў, не адрабляць шарваркаў з увагай успрымаліся беларускім насельніцтвам, паколькі жыло яно ў складаных сацыяльных абставінах. Аднак былі яны немагчымыя для выканання, бо спробы іх рэалізацыі выклікалі рэпрэсіі з боку дзяржаўнага апарату.

У адрозненне ад беларускіх партый КПЗБ мела сродкі на прапаганду і бягучую дзейнасць. Таму нават зняволенне правадыроў партыі не спыніла яе дзейнасці. Ізаляваных дзеячаў звычайна замянялі новыя.

Згодна дырэктывам Камінтэрна КПЗБ імкнулася пранікнуць ва ўсе беларускія грамадскія, палітычныя, гаспадарчыя, асветныя і культурныя арганізацыі. Прысутнасць камуністаў у структурах гэтых арганізацый найчасцей была прычынай іх ліквідацыі. Гэты метад улады прымянялі з такім размахам, што ў 1937 г. беларускае нацыянальнае жыццё ў Польшчы практычна замерла. У 1938 г. КПЗБ як секцыя Камуністычнай партыі Польшчы была Камітэрнам распушчана, а яе правадыры, якія апынуліся на тэрыторыі СССР, былі абвінавачаны ў супрацоўніцтве з польскай разведкай.

## Стаўленне санацыйнага лагера да беларускага пытання

Пасля майскага дзяржаўнага перавароту 1926 г. былі роблены спробы правесці рэвізію ранейшай палітыкі дзяржавы ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Некалькі палітыкаў з акружэння Юзафа Пілсудскага, між іншым, Тадэуш Галуўка, Леан Васілеўскі, Казімеж Младзяноўскі прапанавалі, каб палітыку нацыянальнай асіміляцыі, як малапаспяховую, замяніць дзяржаўнай асіміляцыяй - больш выгаднай для дзяржавы і не выклікаючай такога супраціву з боку меншасцей. Гэтая палітыка мела давесці да сфарміравання ў грамадзян няпольскай нацыянальнасці пераканання, што Польшча з’яўляецца таксама і іх айчынай. Начальнік Усходняга аддзялення Міністэрства замежных спраў Тадэуш Галуўка прапанаваў, каб у адносінах да беларусаў дзяржава ўздзейнічала шляхам стварання школ з беларускай мовай навучання, культурных установаў, беларусізацыі Царквы. Гэтыя дзеянні мелі ўчыніць беларусаў устойлівымі на расійскія ўплывы і выключыць прыцягальнасць уздзеяння мінскага цэнтра як у культурным, так і ў палітычным плане. 18 жніўня 1926 г.

міністр унутраных спраў Казімеж Младзяноўскі прадставіў “Дырэктывы ў справе адносін урадавых улад да нацыянальных меншасцей”. Младзяноўскі прапанаваў правядзенне аграрнай рэформы з улікам інтарэсаў беларускага і ўкраінскага насельніцтва, стварэнне магчымасці пашырэння асветы на нацыянальных мовах гэтых меншасцей, хуткую нармалізацыю юрыдычнага статусу Праваслаўнай царквы.

Восенню 1926 г., у перыяд бурнага развіцця структур Грамады, Леан Васілеўскі прадставіў праект “У справе беларускай палітыкі польскага ўрада ў цяперашняй хвіліне”. Прапанаваў ён неадкладную змену палітыкі ў адносінах да беларускага школьніцтва, стварэнне настаўніцкай семінарыі для беларусаў, прыём на працу ў публічных школах настаўнікаў беларускай нацыянальнасці, распрацоўку адпаведных праграм і падручнікаў для школ з беларускай мовай навучання, дапамогу беларускай моладзі ў доступе да польскіх вышэйшых навучальных установ, падтрымку беларускім культурнаасветным і выдавецкім установам.

Для рэалізацыі палітыкі дзяржаўнай асіміляцыі, прапанаванай некаторымі прадстаўнікамі пілсудчыкоўскага лагера, патрэбны былі фінансавае забеспячэнне, прыхільнасць крэсавай адміністрацыі і згода Юзафа Пілсудскага. Аднак ніводзін з гэтых фактараў не праявіўся. Пілсудскі лічыў, што найбольш надзейна польскія інтарэсы на крэсах забяспечаць войска і польская школа. Быў ён рашучым прыхільнікам захавання польскай мовы як адзінай дзяржаўнай, абараняў ідэю вайсковага асадніцтва, а большую надзею на захаванне спакою на ўсходзе ускладаў на паліцыю, чым на задавальненне беларускіх культурных і асветных патрабаванняў.

Расправа над Грамадой была дзеяннем згодным са спадзяваннямі нацыяналдэмакратаў і памешчыкаў паўночнаўсходніх ваяводстваў. Ліквідацыя грамадаўскага руху, хаця адсоўвала небяспеку некантраляванага ходу падзей, аднак узмацняла антыдзяржаўныя настроі. Вясною 1927 г. урад зрабіў некалькі жэстаў з мэтай як разрадзіць існуючае напружанне, так і адцягнуць беларускую інтэлігенцыю ад прасавецкіх палітычных структур. Дзяржаўныя чыноўнікі хацелі, каб склалася ўражанне, што лаяльнасць да польскай дзяржавы стварае беларусам лепшыя перспектывы, чым разлічванне на Мінск. У 1927 г. міністр веравызнанняў і публічнай асветы Густаў Дабруцкі ўвёў абавязковую навуку беларускай мовы ў польскіх гімназіях на землях населеных беларусамі, прысвоіў статус публічных школ дзвюм беларускім гімназіям - у Вільні і Навагрудку, дазволіў стварыць 26 школ з

www.kamunikat.org

беларускай мовай навучання і 49 - двухмоўных. Па загаду міністра Дабруцкага пачалася падрыхтоўка праграм і падручнікаў для школ з беларускай мовай навучання. Беларуская мова, пасля некалькіх гадоў перапынку, зноў была ўведзена ў Віленскую духоўную праваслаўную семінарыю. Апрача таго Апеляцыйны суд панізіў кары турэмнага зняволення для асуджаных правадыроў Грамады. У муніцыпальных выбарах беларусы атрымалі каля 20% месц у гарадскіх і гмінных радах.

Аднак хваля энтузіязму, выкліканая вясною 1927 г. новай палітыкай улад у адносінах да беларусаў, хутка апала. У 1928 г. урад спыніў пошукі новых вырашэнняў у беларускім пытанні, а лакальная адміністрацыя атрымала права самастойна фарміраваць нацыянальную палітыку. Не ўзніклі планаваныя новыя беларускія школы, закрылася гімназія ў Радашковічах, а палітычныя вырашэнні штораз часцей замяняліся рэпрэсіямі ў адносінах да сапраўдных і ўяўных камуністаў. Увядзенне такой палітыкі аблягчалі яшчэ весткі з БССР, дзе пачалося змаганне з беларускім нацыянальным рухам. З пункту гледжання прыхільнікаў нацыянальнай асіміляцыі тое, што дзеялася ў Савецкай Беларусі, было карысным для Польшчы. У такой сітуацыі спынялася ўздзеянне на беларускую інтэлігенцыю ў Польшчы канкурэнтнага мінскага цэнтра, які самым сваім існаваннем тармозіў рэалізацыю ўсялякіх асіміляцыйных планаў. На ўсходнім баку рыжскай мяжы пашыралася зона расійскіх уплываў, якой трэба было процiпаставіць суцэльную культурную і нацыянальную польскую прастору.

На пачатку трыццатых гадоў аб характары дзеянняў дзяржавы ў адносінах да беларусаў рашалі ўжо такія палітыкі санацыйнага лагера як міністр унутраных спраў Феліцыян СлавойСкладкоўскі ці палескі ваявода Вацлаў КостэкБярнацкі. Гэты апошні ў красавіку 1933 г. прапанаваў надзяліць урад надзвычайнымі паўнамоцтвамі, якія дазволілі б ачысціць Польшчу з “адкідаў грамадства і шкоднікаў”, якіх дзейнасць перашкаджала хуткай асіміляцыі беларускіх мас. У лістападзе 1933 г. праект вырашэння беларускага пытання на сваёй тэрыторыі прадставіў ваявода навагрудскі Стэфан Свідэрскі. Ягоны план прадугледжваў паступовае абмежаванне колькасці існуючых ужо беларускіх культурных, асветных, гаспадарчых, і палітычных установ ды недапушчэнне да ўзнікнення новых. Праект ваяводы Свідэрскага, пасля адабрэння яго міністрам унутраных спраў СлавоемСкладкоўскім, быў перададзены на рэалізацыю паасобным старастам. У 1934 г. была ліквідавана Навагрудская беларуская гімназія, а ў некалькіх школах было забаронена карыстацца

беларускай мовай, хаця былі ў іх захаваны ўсе тадышнія юрыдычныя нормы ў гэтай галіне.

Паспяховасць асіміляцыйнай палітыкі ў адносінах да беларусаў мелі каардынаваць Камітэт па справах нацыянальнасцей і Навуковая камісія па вывучэнні Усходніх зямель. Абедзве ўстановы рэкамендавалі выхоўванне "несвядомага беларускага люду" на лаяльных грамадзян. Пасвойму такое выхоўванне разумела крэсавая паліцыя. Арышты і здзекі над сялянамі, якія падазраваліся ў дзейнасці на шкоду дзяржаве, найчасцей давалі адваротны вынік, чым планавалася. Страх быў паўсюдным пачуццём у адносінах да польскага паліцыянта, чыноўніка, суддзі і настаўніка.

У кастрычніку 1936 г. Міністэрства ўнутраных спраў падрыхтавала праект паскарэння нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. На пачатку снежня гэтага ж года забаронена была дзейнасць Таварыства беларускай школы, а 22 студзеня 1937 г. - Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Фармальна да студзеня 1938 г. у Вільні існаваў яшчэ Беларускі нацыянальны камітэт, але і гэтую арганізацыю спачатку абвінавацілі ў нанясенні шкоды ў галіне абароны і адзінства польскай дзяржавы, а пасля распусцілі. У 1938 г. фактычна не было ў Польшчы ніводнай рэальнай беларускай арганізацыі. Партыя Акінчыца, хаця фармальна існавала, была зусім незаўважальнай у публічным жыцці. Напярэдані II сусветнай вайны польскі ўрад зрабіў надта многа, каб на беларускім баку на доўгія гады зніклі ўсялякія прапановы супрацоўніцтва з палякамі. Прынятая амаль усімі польскімі ўрадамі тэза, якая адмаўляла існаванне беларусаў як палітычнага фактара, аказалася згубнай для дзяржавы.

Пасля ліквідацыі нацыянальнага руху праблемай стала існаванне Праваслаўнай царквы, якая не надта добра прылягала да тэзы аб польскасці ўсходніх крэсаў. У 1924 г. ураду ўдалося давесці да аб'яўлення аўтакефаліі і вывядзення праваслаўя ў Польшчы з-пад юрысдыкцыі Маскоўскага патрыярхату. Аднак увядзенне аўтакефаліі адбылося наперакор абавязваючым працэдурам. Адкрыта крытыкавалася яна часткай епіскапаў і праваслаўнага духавенства ў Польшчы. Праваслаўная царква, у выніку навязвання ёй чарговых юрыдычных актаў, якія рэгулявалі яе ўнутранае жыццё, апынулася ў поўнай залежнасці ад адміністрацыйных улад.

У дваццатых гадах вялося многа судовых працэсаў паміж Каталіцкім касцёлам і Праваслаўнаю царквою за храмы, могільнікі, зямлю, якія раней належалі уніятам. Да 1937 г. дзяржаўныя ўлады да маёмасных спрэчак паміж абодвума веравызнаннямі ставіліся даволі памяркоўна. У 1937 г. маршал Эдвард РыдзСміглы пачаў аднак новы

этап дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да Праваслаўнай царквы, які меў паскорыць паланізацыю яе вернікаў. Там, дзе праваслаўнае насельніцтва лічылася падатлівым на польскія ўплывы (Віленшчына, Гродзеншчына, Беласточчына), вырашана пашырыць яе шляхам паланізацыі рэлігійнага і прыцаркоўнага жыцця. Там, дзе насельніцтва адкідала польскую культуру і мову ў царкоўным жыцці (Холмшчына, Валынь), вырашана прымусіць яго "вярнуцца да веры бацькоў" шляхам разбурэння храмаў і забароны выконваць святарам душпастырскую паслугу. Летам 1938 г. падвярґліся знішчэнню або былі адабраны ў праваслаўных каля ста сакральных аб'ектаў, што выклікала нават пратэсты Лігі Нацый.

На беларускім грунце станоўчы вынік дала палітыка фарміравання польскай нацыянальнай свядомасці сярод праваслаўных пры дапамозе царкоўных структур. Маладыя святары, выпускнікі Багаслоўскага аддзялення Варшаўскага універсітэта, сталі сапраўднымі місіянерамі польскасці сярод беларусаў. У палове трыццатых гадоў па ініцыятыве дзяржаўных улад узнік арганізаваны рух "праваслаўных палякаў". У 1935 г. у Беластоку было створана Таварыства праваслаўных палякаў імя Юзафа Пілсудскага. На другі год такія таварыствы паўсталі ў Гродне, Слоніме, Ваўкавыску і Навагрудку. Неўзабаве цэнтрам гэтага руху стала Гродна, сядзіба епіскапа Савы (Саветава), які шэфстваваў гэтай дзейнасці. 1 лютага 1938 г., у дзень імянінаў прэзідэнта Ігнацы Масціцкага, гродзенскае Таварыства праваслаўных палякаў вырашыла далучыцца да Лагера нацыянальнага аб'яднання. Епіскап Сава загадаў падначаленаму яму духавенству навучыцца польскай мове і прымаць удзел у дзейнасці польскіх палітычных і грамадскіх арганізацый. Пачаліся працы па падрыхтоўцы літургіі на польскай мове. Па жаданні дзяржаўных улад на Гродзеншчыне, Беласточчыне і Віленшчыне былі чынены спробы ўвядзення пропаведзей на польскай мове і спявання царкоўнымі харамі на заканчэнне літургіі польскіх патрыятычных песень. Такія дзеянні вялі толькі да кампраметацыі кліру. Вернікі тады найчасцей масава пакідалі храмы.

У лістападзе 1938 г. у епіскапскі сан былі рукапаложаны два вайсковыя капеланы ў званні палкоўніка, якія лічылі сябе палякамі: Цімафей (Ежы Шрэтэр) і Мацвей (Канстанцін Сямашка). Гэтыя епіскапы разам з гродзенскім епіскапам Савам пачалі інтэнсіўную працу ў карысць змены культурнага вобліку Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Вайна спыніла працэс станаўлення Праваслаўнай царквы ў Польшчы чыннікам, які ўспамагаў будову польскага нацыянальнага жыцця ў паўночнаўсходніх ваяводствах II Рэчы Паспалітай.

# Яднанне пад савецкім скіпетрам (1939-1941)

### Ад імя народу Заходняй Беларусі

У выніку пагаднення, падпісанага 23 жніўня 1939 г. Нямеччынай і Савецкім Саюзам, вядомага пад назвай пакта Рыбентроп-Молатаў, межы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе падвяргнуліся асноўным змяненням. Падпісаны дакумент прадугледжваў вызначэнне заходняй граніцы СССР па лініі рэк Нарвы, Віслы і Сана. На другім баку гэтых рэк мела знаходзіцца зона нямецкіх уплываў. Аднак было гэта толькі пагадненне, якое вызначала намеры абодвух бакоў. Нягледзячы на польсканямецкую вайну, якая пачалася 1 верасня 1939 г., і ўступленне савецкай арміі на тэрыторыю II Рэчы Паспалітай, усё вяліся перамовы наконт канчатковага падзелу зон уплываў у Еўропе, а тэрыторыя Польшчы была толькі адным з элементаў палітычных таргоў.

Нямецка-савецкі трактат аб дружбе і граніцах ад 28 верасня 1939 г. вызначаў супольную граніцу абодвух дзяржаў. Узамен за памяншэнне зоны ўплываў на тэрыторыі Польшчы савецкі бок атрымаў права вырашаць аб палітычным статусе Літвы. Згодна трактату паўночная частка граніцы СССР праходзіла па рэках Пісе, Нарве і Бугу. На савецкім баку апынуліся амаль усё даваеннае Беластоцкае ваяводства і Ломжынскі павет, які да 1 верасня 1939 г. уваходзіў у састаў Варшаўскага ваяводства. З Беластоцкага ваяводства да немцаў адышлі Сувальскі павет і некалькі гмін Аўгустаўскага павета.

Уступленне савецкай арміі на тэрыторыю Польшчы 17 верасня 1939 г. адбылося пад лозунгамі ўз'яднання беларускіх і ўкраінскіх зямель. Планаванае савецкімі ўладамі заваяванне тэрыторыі аж да ракі Віслы сведчыць аб тым, што лозунгі мелі выключна прапагандысцкі характар.

Вялікая перавага савецкіх падраздзяленняў над польскімі і загад маршала РыдзаСміглага аб пазбяганні сутычак з бальшавікамі садзейнічалі хуткаму паходу Чырвонай Арміі на захад. Да большых сутычак дайшло пасля некалькіх дзён савецкага паходу ў ваколіцах Сапоцкіна, Далістова, Кадзяўцоў. Двухдзённая бітва за Гродна, якая адбылася 20-21 верасня, была самым вялікім боем на польска-савецкім фронце. 22 верасня Чырвоная Армія ўвайшла ў Беласток і Брэст. У савецкі палон папала некалькі дзесяткаў тысяч польскіх салдат і афіцэраў, якія насуперак міжнародным канвенцыям былі

перададзены юрысдыкцыі палітычнай паліцыі - НКУС. 25 верасня ў Брэсце адбыўся супольны парад савецкіх і нямецкіх падраздзяленняў.

Уваход Чырвонай Арміі парознаму ўспрымаўся беларускім насельніцтвам паўночнаўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. У польскай літаратуры сфармаваўся даволі адназначны вобраз беларуса гэтага перыяду, які ставіў трыумфальныя аркі для прывітання савецкага войска, а пазней дапамагаў камісарам у праследаванні польскага насельніцтва. Проціլегласцю беларуса найчасцей быў палякпатрыёт, які перажываў трагедыю радзімы і сваю ўласную, паколькі сам стаў першай ахвярай савецкага рэпрэсіўнага апарату. Тым часам рэчаіснасць была больш складаная, а палітычнае стаўленне грамадства да новай улады не адлюстроўвала нацыянальных падзелаў.

Несумненна, большасць беларускіх палітыкаў, ад нацыяналістаў да камуністаў, з задавальненнем успрынялі факт далучэння паўночнаўсходніх тэрыторый польскай дзяржавы да Савецкай Беларусі. Кожная беларуская партыя ў II Рэчы Паспалітай у рознай форме ставіла сабе за мету імкненне да аб’яднання беларускіх зямель. Палітыка польскіх урадаў у канцы трыццатых гадоў была для большасці беларускіх дзеячаў найбольш пераканаўчым аргументам, каб падтрымаць якія-небудзь змены. Менавіта нават тыя, што ўцякалі ад бальшавікоў у нямецкую акупацыйную зону, адабралі тое, што сталася пасля 17 верасня 1939 г. Склаўшаяся сітуацыя многімі беларускімі палітыкамі ўспрымалася як пераходная. Разлічвалі яны - не беспадстаўна - на хуткі нямецка-савецкі канфлікт і дапамогу Нямеччыны ў будаўніцтве беларускай дзяржаўнасці.

Трыумфальныя аркі ў гонар Чырвонай Арміі ставіліся ўсюды там, дзе некалі дзейнічалі ячэйкі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі або ў нейкі асаблівы спосаб грамадства адчула паліцыйныя рэпрэсіі да 1939 г. У прынцыпе цырымонія прывітання чырвонаармейцаў была такая самая ўва ўсіх мясцовасцях, што сведчыць аб раней падрыхтаваным сцэнарыі.

У некалькіх месцах ад 17 да 25 верасня дайшло да сутычак паміж партызанскімі атрадамі, арганізаванымі беларускімі і яўрэйскімі камуністамі, і падраздзяленнямі войска, паліцыі і польскіх дабравольцаў. Найбольш такіх інцыдэнтаў здарылася на Гродзеншчыне, дзе ўзброеныя групы партызан атакавалі маёнткі, пастарункі паліцыі і меншыя вайсковыя падраздзяленні. Завяяванне атрадам беларускіх і яўрэйскіх камуністаў мястэчка Скідаля і двухдзённая барацьба з высланымі з Гродна карнікамі - жаўнерамі, паліцыянтамі і польскімі гарцэрамі, у савецкай гістарыяграфіі

атрымала назву Скідальскага паўстання. Да польскабеларускіх сутычак пасля ўступлення савецкай арміі дайшло таксама ў ваколіцах Ліды, Астрыны, Азёраў, Лунны і Зэльвы. Зброя, якой распараджаліся партызаны, а таксама хуткае фарміраванне ўзброеных падраздзяленняў паказваюць, што дзеянні на тылах польскай арміі планаваліся намнога раней. Апрача ваенных структур, арганізаваных камуністамі, стыхійна ўзнікла многа груп грабежніцкага характару. Пазней члены гэтых груп намагаліся дапісаць да сваёй злачыннай дзейнасці рэвалюцыйную ідэалогію. Напады на памешчыкаў, асаднікаў, работнікаў лясной аховы, чыноўнікаў, паліцыянтаў і польскіх настаўнікаў не асуджаліся камандзірамі Чырвонай Арміі ці функцыянерамі НКУС. Наадварот, многія выпадкі насілля, самасуду, помсты за ранейшыя крыўды адбываліся з іх ведама і дазволу нават пасля поўнага апанавання сітуацыі савецкімі ўладамі.

Аднак трэба адзначыць, што антыпольскія эксцэсы ў паводзінах беларускага і яўрэйскага насельніцтва былі выключнай рэдкасцю, а многія прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі і памешчыкаў знаходзілі ў беларускіх хатах прыстанішча ад функцыянераў савецкай палітычнай міліцыі. Пераважная большасць беларусаў змену палітычнай сітуацыі ўспрымала з вялікай насцярожанасцю і абыякавасцю. Стыхійна не паўставалі ні камітэты для вітання хлебам і соллю савецкіх камандзіраў, ні дыверсійныя атрады, а прыйшоўшае савецкае войска па прычыне свайго выгляду і паводзін замест энтузіязму выклікала паўсюднае здзіўленне.

Зараз жа пасля ўступлення Чырвонай Арміі актыўнасць праявілі вызваленыя з турмаў камуністы і дзеячы шматлікіх беларускіх палітычных, грамадскіх і культурных груповак. Разам са зменай улады паўсюдна чакалася радыкальная перабудова палітычных і грамадскіх адносін з улікам асноўных інтарэсаў беларускага насельніцтва. Таму часта ў вёсках і гарадскіх пасёлках спантанна ствараліся рэвалюцыйныя сялянскія камітэты (рэўкамы), якіх арганізатары пераймалі ролю гаспадароў дадзенай тэрыторыі. На павятовым і ваяводскім узроўні па загаду камандзіра войск Беларускага фронту Міхаіла Кавалёва ад 19 верасня 1939 г. былі створаны часовыя ўправы, якія мелі заняцца “адбудовай грамадскагаспадарчага жыцця на абшары Заходняй Беларусі” і наглядаць за дзейнасцю рэўкамаў. Часовыя ўправы былі ў прынцыпе органамі савецкай улады, назначанымі камандзірамі Чырвонай Арміі, падраздзяленнямі НКУС і прыбылымі з Савецкага Саюза партыйнымі актывістамі. Як правіла, часовыя ўправы папаўняліся прадстаўнікамі мясцовага беларускага і яўрэйскага, радзей польскага, насельніцтва.

www.kamunikat.org

21 верасня Кавалёў выдаў чарговы загад, якім упаўнаважыў часовыя ўправы арганізаваць народную міліцыю і рабочую гвардыю. Неўзабаве народная міліцыя, рабочая гвардыя і рэўкамы сталі галоўнымі інструментамі ўвядзення "рэвалюцыйнага парадку" на заваяваных абшарах. Не чакаючы ніякіх заканадаўчых актаў рэўкамы пры садзеянні народнай міліцыі і пры маўклівай згодзе часовых управаў пачалі парцэляваць памешчыцкую і царкоўную зямлю. Рэквізаваліся і дзяліліся паміж парабкаў і малазямельных сялян коні, каровы, свінні, якія былі ўласнасцю двароў і плябаній. У гарадах створаныя часовымі ўправамі камісіі пераймалі заводы і вытворчыя ды паслуговыя прадпрыемствы, якіх уладальнікі наймалі рабочую сілу. Большасць прадпрыемстваў, таксама як і памешчыцкіх маёнткаў, была пакінута ўладальнікамі, якія ўцяклі на вестку аб надыходзе Чырвонай Арміі. Частка тых, якія засталіся, былі арыштаваны ў першых днях панавання савецкай улады.

Рэўкамы і народная міліцыя, апанаваныя мясцовымі камуністамі, нават без загадаў часовых управаў ажыццяўлялі ўсе савецкія канцэпцыі грамадскага ладу. З першых дзён новых парадкаў памешчыкаў, духавенства, багатае мяшчанства, былых функцыянераў польскай дзяржавы, а таксама багатых сялян лічылі яны ворагамі савецкай улады. Усе названыя грамадскія групоўкі, за выключэннем духавенства і сялян, былі польскай нацыянальнасці. У міліцыі, гвардыі і рэўкамах пераважалі беларусы і яўрэі. У такой сітуацыі складалася ўражанне нацыянальнага канфлікту, хаця рэпрэсіям з боку новастворанных органаў падвяргаліся таксама беларускае кулацтва і інтэлігенцыя, праваслаўны клір, а таксама яўрэйскія купцы і фабрыканты. Гэтыя апошнія, у адрозненне ад польскіх прадпрымальнікаў, не мелі нават куды ўцякаць ад бальшавікоў. У іх выпадку антысеміцкая фобія ў нямецкай акупацыйнай зоне была таксама небяспечная як камуністычная класавая барацьба на ўсходзе.

Становішча, якое склалася на занятых пасля 17 верасня 1939 г. Чырвонай Арміяй землях патрабавала прынамсі фармальнага юрыдычнага афармлення. Савецкія ўлады вырашылі паказаць свету, што іхняя палітыка з'яўляецца ажыццяўленнем волі народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Здзейсненыя Чырвонай Арміяй факты мелі карыстацца паўсюднай падтрымкай насельніцтва занятых зямель. Спектакль ладзіўся з характэрным бальшавікам размахам, не зважаючы на рэальную сітуацыю і настроі грамадства.

5 кастрычніка 1939 г. Часовае ўпраўленне горада Беластока звярнулася да ўпраўленняў астатніх гарадоў склікаць Народны сход Заходняй Беларусі, які меў "вырашыць" аб дзяржаўнай будучыні

гэтага краю і яго грамадскапалітычным ладзе. Падрыхтоўкай сходу заняўся спецыяльна створаны Арганізацыйны камітэт, які вызначыў парадак вылучэння дэпутатаў. Права прапанаваць сваіх кандыдатаў у дэпутаты атрымалі часовыя ўпраўленні, рэвалюцыйныя сялянскія камітэты, падраздзяленні рабочай гвардыі і народнай міліцыі ды сходы працоўных калектываў. Згодна з аб'яўленым "Парадкам арганізацыі выбараў дэпутатаў Народнага сходу Заходняй Беларусі" мелі яны выбірацца ва "ўсеагульным, роўным і тайным" галасаванні.

Выбары ў Народны сход адбыліся 22 кастрычніка. Спадарожнічала ім вялікая эйфарыя на ладжаных уладамі мітынгах і дэманстрацыях. Некамуністычныя арганізацыі, як польскія і яўрэйскія, так і беларускія нават падчас гэтых "усеагульных" выбараў не прабавалі заяўляць аб сваёй прысутнасці. Паводле афіцыйных савецкіх даных, у выбарах удзельнічала 2 672 тыс. жыхароў Заходняй Беларусі - 96,7% выбаршчыкаў. Звыш 90% галасуючых аддалі свае галасы кандыдатам прапанаваным сялянскімі камітэтамі, часовымі ўпраўленнямі, рабочай гвардыяй. Паводле гэтых жа крыніц, выбрана 926 дэпутатаў, у тым ліку 621 беларус, 127 палякаў, 72 яўрэі, 43 рускіх, 53 украінцаў і 10 прадстаўнікоў іншых нацый. Народны сход, які адбыўся ў Беластоку, выказаўся за ўстанаўленне савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, а дзень пазней аднагалосна прыняў дэкларацыю аб далучэнні гэтых зямель да БССР. Фармальна ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад БССР адбылося 14 лістапада, калі прашэнне дэпутатаў, якое знаходзілася ў дэкларацыі Народнага сходу, разглядалася Вярхоўным Саветам БССР. Раней такое рашэнне прыняў Вярхоўны Савет СССР.

30 кастрычніка Народны сход выканаў яшчэ адну дырэктыву бальшавіцкіх улад - прыняў дэкларацыю аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель разам з жывым і мёртвым інвентарам і ўсімі будынкамі. Адпаведна гэтым жа законам канфіскавалася таксама зямля каталіцкіх і праваслаўных манаскіх ордэнаў і асоб, якія да 17 верасня 1939 г. займалі высокія дзяржаўныя пасады. У сапраўднасці гэтая дэкларацыя санкцыяніравала ўсё тое, што здарылася ў першых днях савецкага панавання.

У выніку вайны і палітычных змен у Еўропе восенню 1939 г. тэрыторыя БССР павялічылася на больш за 100 тыс. кв. км ды 4,7 млн. насельніцтва. У склад Савецкай Беларусі ўвайшлі таксама раёны населеныя выключна палякамі або з перавагай польскага насельніцтва. Новыя межы не адлюстроўвалі існуючай нацыянальнай структуры і былі перш за ўсё вынікам кампрамісу паміж Сталіным і Гітлерам у ходзе падзелу зон уплываў у Еўропе.

У сувязі з планаванай анексіяй Літвы савецкі ўрад, з мэтай нейтралізаваць спадзяваныя адмоўныя рэакцыі літоўцаў, перадаў ім частку заваяванай тэрыторыі - Віленскую вобласць плошчаю ў 6,9 тыс. кв. км. У лістападзе 1940 г. бальшавікі адрэзалі ад БССР чарговыя 2,6 тыс. кв. км з 300 тыс. насельніцтва і перадалі іх Літве. У канцы 1940 г. плошча Савецкай Беларусі складала 223 тыс. кв. км і, паводле афіцыйнай статыстыкі, 10,2 млн. жыхароў. У сувязі з тым, што ў той час перапісы насельніцтва не праводзіліся, але працягваліся масавыя дэпартацыі ды расстрэлы "ворагаў народа", гэтая апошняя лічба праўдападобна не адлюстроўвае сапраўднага стану.

**Усталяванне савецкай сістэмы ўладаў у Заходняй Беларусі**

5 снежня 1939 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР правёў новы адміністрацыйны падзел зямель, якія да 17 верасня 1939 г. знаходзіліся ў складзе польскай дзяржавы. Створана пяць абласцей: Баранавіцкую, Беластоцкую, Брэсцкую, Пінскую і Вілейскую. Вобласці дзяліліся на раёны згодна прынцыпу, што кожны раён павінен налічваць 35-50 тыс. жыхароў. На абласным і раённым узроўні адміністрацыйная ўлада належала выканаўчым камітэтам Саветаў дэпутатаў працоўных. Прэзідыум Вярхоўнага Савета зацвярджаў састаў аблвыканкамаў, а тыя - райвыканкамаў. Райвыканкамы вызначалі састаў вясковых кіруючых органаў - сельсаветаў. Канчаткова, аднак, толькі ў сакавіку 1940 г. улада часовых упраўленняў была замешчана выканаўчымі камітэтамі.

Паралельна са з'яўленнем структур дзяржаўнай адміністрацыі ўзнікалі камітэты Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. У сувязі з тым, што камітэты КП(б)Б у адносінах да выканаўчых камітэтаў Саветаў дэпутатаў працоўных былі вышэйстаячымі ўстановамі, у іх кіруючыя органы ў прынцыпе назначаліся камуністы, якія сюды прыбылі з усходу. На пераломе 1939 і 1940 гадоў 4 500 партыйных функцыянераў з Мінска і Масквы былі напраўлены на працу ў заходніх абласцях БССР. Партыйныя ячэйкі папаўняліся галоўным чынам людзьмі, якія да гэтай пары не ўдзельнічалі ў публічным жыцці. Неахвотна прымаліся ў рады партыі найбольш ідэйныя камуністы, якія раней былі членамі распушчанай Камінтэрнам КПЗБ. З усходніх абласцей Беларусі прыбыло таксама 6 200 дзеячаў камсамола з мэтай узяць пад ідэалагічную "апеку" моладзь, якая да гэтай пары знаходзілася ў рэчышчы "кулацкіх і буржуазных" уплываў. Апрача дзеячаў КП(б)Б і камсамола ў заходнія вобласці напраўляліся яшчэ настаўнікі, спецыялісты па савецкай

www.kamunikat.org

адміністрацыі, гаспадарцы і культуры. Агулам да кастрычніка 1940 г. дэлегавана была 31 тысяча цывільных работнікаў з мэтай арганізаваць публічнае жыццё па мадэлі, якая існавала ў БССР у трыццатых гадах.

17 кастрычніка Цэнтральны Камітэт КП(б)Б загадаў на кіруючыя пасады ў дзяржаўным апараце прызначыць “мясцовых”. У выніку да 21 чэрвеня 1941 г. на работу ў аблвыканкамах, райвыканкамах і сельсаветах паступіла 18 060 чалавек, у тым ліку 10 245 палякаў, 4 451 беларус, 3 045 яўрэяў і 329 расіян. Адносна вялікая лічба палякаў, якія паступілі на працу ў савецкую адміністрацыю была вынікам іх лепшай адукаванасці і інтэлектуальнай падрыхтоўкі вынесенай з даваеннага перыяду. Палякі, калі вызваліліся ад першага шоку пасля падзення сваёй дзяржавы, таксама шукалі спосабаў пратрымацца ва ўмовах савецкай сістэмы. Прынцыпова, аднак, не прымаліся на работу людзі, якія працавалі ў дзяржаўнай адміністрацыі да 17 верасня 1939 г. Паколькі ў даваеннай польскай адміністрацыі пераважалі палякі, былі яны падменены новымі людзьмі, часта таксама палякамі, якіх абучалі на кароткатэрміновых курсах для новай наменклатуры. У галіне падборкі кадраў нацыянальны крытэрый у савецкай сістэме не адыгрываў большай ролі. У выпадку беларусаў найчасцей прымаліся тыя, якія да гэтай пары не ўдзельнічалі ў публічным жыцці. Зрэшты, беларусы ўпершыню апынуліся ва ўсіх дзяржаўных структурах - адміністрацыі, судаводстве, пракуратуры. Было гэта магчымым таксама таму, што не патрабавалася ад іх адпаведная кваліфікацыя, а толькі акрэсленае грамадскае паходжанне і адпаведнае палітычнае стаўленне да існуючай рэчаіснасці. Старшынёю сельсавета, штатным работнікам партыі або інструктарам камсамола часта станаў той, у каго было многа дзяцей, мала зямлі, і ў каго замест ікон вісеў партрэт Сталіна.

## Эканамічная палітыка

Ад першых месяцаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі ўкараняліся асноўныя лозунгі камуністычнай дактрыны, паскараючы з цягам часу і ў выніку ліквідацыі “варожых грамадскіх класаў” тэмпы саветызацыі гэтай тэрыторыі. Пасля падзелу памешчыцкіх маёнткаў павялічылася плошча найменшых гаспадарак. Дадатковыя надзелы пераважна даставаліся беларускім сялянам.

Напрыканцы верасня 1939 г. часовыя ўправы і рэвалюцыйныя сельскія камітэты аб’яўлялі ў паасобных раёнах перыяд вольніцы - неабмежаванага доступу да лясоў. Спрыяла гэта забеспячэнню сялян

у недаступную ім да гэтай пары драўніну, якая выкарыстоўвалася ў якасці будаўнічага матэрылу і апалу. І хаця новыя адміністрацыйныя структуры ў выглядзе выканаўчых камітэтаў адмянілі вольніцу, аднак нелегальны гандаль драўнінай на выгадных для мясцовага насельніцтва ўмовах не спыняўся і займаліся ім і савецкія афіцэры, і цывільныя службоўцы. У якасці плацёжнага сродка найчасцей прымянялася гарэлка.

У першых месяцах савецкай улады выразна палепшылася матэрыяльнае становішча вясковага насельніцтва. Паўплывала на гэта галоўным чынам змяншэнне павіннасцей у карысць дзяржавы і зніжэнне цэн на прамысловыя артыкулы. Даступнасць да танных тавараў аказалася, аднак, кароткатрывалай. Пасля некалькіх месяцаў, калі вычарпаліся запасы ў польскіх складах, якія былі пераняты савецкімі ўладамі, і калі былі абмежаваны пастаўкі прамысловых тавараў з глыбі СССР, з'явіліся забытыя ўжо тут чэргі. У 1940 г. лёгка можна было зарабіць грошы, але цяжка было за іх нешта купіць. Таннасць палатна, цукеркаў, газы, прадметаў шырспажыву была прычынай таго, што вясковае насельніцтва большасць часу праводзіла ў чэргах перад магазінамі, якія знаходзіліся ў раённых або абласных цэнтрах.

Вялікая колькасць войска, якая дыслацыравалася ў пагранічных раёнах, выклікала павышаны попыт на харчовыя прадукты і гэтым самым стварала сялянам магчымасць заробку. Аднак плацілі ім грашыма, якія не гарантавалі куплі патрэбных для гаспадаркі тавараў. У палове 1940 г. у найдалей высунутых на захад абласцях пачаліся абарончыя інвестыцыі - будова аэрадромаў, мастоў, віядукаў, пад'язных дарог. У якасці рабочай сілы выкарыстоўвалася мясцовае насельніцтва. Частку прац пры гэтых аб'ектах выконвалі яны ў рамках шарваркаў, за частку атрымлівалі грошы. Ваеннае будаўніцтва з аднаго боку спрыяла змякчэнню перанаселенасці сельскіх гаспадарак, а з другога - не стварала пастаянных месцаў работы.

На ваенныя будаўнічыя пляцоўкі завозіліся таксама зняволеныя з глыбі Расіі. Улады не змаглі іх поўнасцю ізаляваць ад мясцовых жыхароў. Іх расказы пры сітуацыю ў СССР - пра калектывізацыю, голад, рэпрэсіі паспяхова абвяргалі міф аб рабочасялянскай уладзе ў гэтай краіне, які ствараўся левымі арганізацыямі ў міжваенны перыяд і савецкай прапагандай пасля 17 верасня 1939 г. Некаторыя вязні былі прыгавораны да шматгадовага зняволення за крадзеж галоўкі капусты ці некалькіх коласаў пшаніцы на калгасным полі, калі хацелі выратаваць ад голаду сваіх дзяцей. Паявіліся жудасныя

расказы пра галодную смерць і канібалізм на Украіне. На агульны здзіў, зняволеныя нават найбяднейшых сялян называлі кулакамі, паколькі былі ў іх конь, карова і некалькі гектараў зямлі. Савецкія зняволеныя, пераважна калгаснікі, уяўлялі сабе, што Чырвоная Армія, калі перасячэ польскую граніцу, сустрэне мясцовых сялян запрэжаных у ярмо і цягнучых плугі на панскім полі.

У першых месяцах савецкай улады невыноснай была не велічыня падатку або шарварку, але спосаб іх экзекуцыі. Шарваркі часта ладзіліся ў перыядах самых важных царкоўных святкаванняў, калі людзі ішлі на багаслужбы. У многіх раёнах збожжанарыхтоўчыя планы загадвалі выканаць яшчэ ў ходзе жніў. Абсурдныя рашэнні засланых сюды савецкіх чыноўнікаў прымушалі задумацца нават найбольш верных новай уладзе беларусаў.

Найбольш жахлівай аказалася барацьба з кулацтвам, якая з асаблівым размахам пачалася ў канцы 1940 г. Кулаком мог стаць кожны, у каго было за дзесяць гектараў зямлі, некалькі коней і кароў, або чарапіца замест страхі. Патэнцыяльна ў гэтую групу можна было занесці большасць сялян. Змаганне з кулацтвам было адным з этапаў на шляху да калектывізацыі. Бальшавікі ў гэтай галіне былі ўжо ў пэўнай меры спрактыкаваны і таму стварэнне калгасаў у заходніх абласцях Беларусі хацелі правесці больш плаўна, каб не выклікаць такіх як на ўсходзе грамадскіх і эканамічных трасенняў. Найбольш інтэнсіўна калектывізацыя праводзілася пры былой польска-савецкай граніцы. Да канца 1940 г. на тэрыторыі пяці новадалучаных абласцей створана 646 калгасаў, а да чэрвеня 1941 г. - 1 115. За гэты час лік сялянскіх гаспадарак скараціўся толькі на 7 працэнтаў.

Самымі павольнымі тэмпамі праводзілася калектывізацыя ў Беластоцкай вобласці. Тут калгасы арганізаваліся выключна на землях населеных беларусамі і ўзнікла толькі 18 калектыўных гаспадарак. На захад ад Беластока, на этнічна польскіх землях, калектывізацыя не праводзілася. Выключэннем быў калгас у Ломжынскім раёне, у якім пераважна працавалі работнікі яўрэйскай нацыянальнасці. Мабыць, іншае стаўленне да населеных палякамі зямель вынікала з планаў Сталіна стварыць польскую аўтаномную вобласць у якасці зародка польскай савецкай рэспублікі. Будова аэрадромаў у пагранічнай зоне паказвала, што не мелі яны выкарыстоўвацца толькі ў абарончых мэтах і што існуючае палітычнае становішча таксама ў Маскве лічылася часовым.

У калектыўных гаспадарках Беласточчыны большасць палявых прац выконвалі жанчыны. Мужчын у той час вывозілі будаваць дарогі, масты, аэрадромы. Заплатай за працадзень на калгасным полі

www.kamunikat.org

была міска пшаніцы ёмістасцю ў адзін літр. Найчасцей сельскагаспадарчымі кааператывамі кіравалі прыбылыя з СССР камсамольскія актывісты. Іх агратэхнічныя веды і спосаб кіравання сталі прычынай таго, што калгасы сталі пародыяй гаспадарання.

Нягледзячы на эскалацыю запалохвання сялян шляхам чарговых вывазак багацейшых сем’яў у глыб Расіі, павелічэння падаткаў і іншых павіннасцей у карысць дзяржавы тэмпы калектывізацыі не паскараліся. У красавіку 1941 г. Цэнтральны Камітэт ВКП(б) вызначыў максімальныя нормы плошчы сялянскіх гаспадарак у заходніх абласцях БССР на 10, 12, 15 гектараў, у залежнасці ад класа зямлі. Раней было забаронена наймаць рабочую сілу або здаваць зямлю ў арэнду. Не вядома як доўга дзейнічаў бы гэты закон, але несумненна быў ён больш лагодны за сістэму, якая панавала на ўсходзе Беларусі.

Паралельна з калектывізацыяй вёскі пачалася акцыя стварэння рамесніцкіх кааператываў, якая ліквідавала маламестачковую дробную вытворчасць, паслугі і гандаль. У выніку знішчэння структуры дробнага гандлю пагоршылася таксама сістэма забеспячэння гарадскога насельніцтва прадуктамі. Нацыяналізаваны гандаль хутка давёў да перманентнай нястачы тавараў і чэргаў ля магазінаў.

Некалькі дзесяткаў тысяч рамеснікаў былі напраўлены на працу ва ўсходнюю Беларусь, дзе былі яны прыняты на работу на заводах Мінска, Оршы, Гомеля, Віцебска. Некаторыя прадпрыемствы ў гэтых гарадах ад паловы 1940 г., у выніку прытоку рабочай сілы з заходніх абласцей, былі вымушаны працаваць на тры змены. Адначасна, па ідэалагічных прычынах, вяліся намаганні знайсці дадатковыя працоўныя месцы ў заходняй частцы краіны. Тут таксама амаль адзіным спосабам было ўвядзенне трохзменнай сістэмы працы. Такім чынам без ніякіх інвестыцый некаторыя заводы Беластока, Гродна, Баранавіч, Брэста ўтрая павялічылі колькасць працоўных месц, прымаючы на работу беспрацоўных, сялян і колішніх рамеснікаў.

## Асветная, культурная і канфесійная палітыка

У адпаведнасці з пастановай Савета Народных Камісараў БССР “Аб метадах арганізацыі асветы ў заходніх абласцях Беларускай Рэспублікі” ад снежня 1939 г. раённыя ўлады былі абавязаны ствараць школы з такой мовай выкладання, якая адпавядала б нацыянальнаму складу дадзенай тэрыторыі і спадзяванням насельніцтва. У канцы 1939 г. у выніку рэарганізацыі структуры

школьніцтва на 713 павялічыўся лік падставовых школ. Паводле даных Камісарыята асветы БССР ад жніўня 1940 г. у навучальным 1939/1940 годзе ў заходніх абласцях працавалі 5 633 школы, у тым ліку з беларускай мовай навучання 4 268, польскай - 923, рускай - 173, ідыш - 150, літоўскай - 61, украінскай - 49. Сетка школ у прынцыпе адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва. У Беластоцкай вобласці, дзе большасць насельніцтва складалі палякі, 58,7% школ працавала на польскай мове, а на беларускай - 33,8%, ідыш - 4,5%, рускай - 1,7% і літоўскай - 1,3%. Для беларускамоўных католікаў Сакольскага раёна і некаторых раёнаў Гродзеншчыны былі створаны польскія школы, зыходзячы, так як калісьці польская адміністрацыя, з пункту гледжання, што аб нацыянальнасці на гэтай тэрыторыі вырашае веравызнанне.

Арганізаваная ў 1939 г. сетка школ з нацыянальнымі мовамі як выкладовымі не была вынікам заклапочанасці савецкіх улад ні развіццём гэтых моў, ні пашанай для культур мясцовага насельніцтва. На тэрыторыі ўсходняй Беларусі школьніцтва ў той час амаль поўнасцю працавала на базе рускай мовы. Палітыка ў заходніх абласцях краіны вынікала з існуючай кан'юнктуры. У сувязі з планаваным далучэннем прыбалтыйскіх краін бальшавікі імкнуліся даказаць, што савецкая ўлада не пагражае нічым нацыянальным інтарэсам, а яе інтэрнацыянальны характар не падлягае сумненню. У 1940/1941 навучальным годзе сістэматычна скарачалася колькасць школ з беларускай мовай, якая замянялася рускай. Кіраўнікамі школьнай адміністрацыі і дырэктарамі школ назначаліся людзі, якія выводзіліся з Расіі і не ведалі ні беларускай, ні польскай, ні яўрэйскай моў. Напрыклад, у Беластоку было 13 польскіх падставовых школ, у якіх дырэктарамі было адзінаццаць прышэльцаў з Расіі і двое мясцовых рабочых. Ва ўсіх тыпах школ уведзена было навучанне гісторыі СССР, а выкладалі гэты прадмет перш за ўсё партыйныя актывісты, якія прыбылі з Расіі, усходняй Беларусі і Украіны. Спачатку ўва ўсіх нацыянальных школах абавязкова выкладалася беларуская мова, а з восені 1940 г. - руская.

У адпаведнасці з пастановай Камісарыята асветы БССР школьніцтва ў памеры сямі класаў падставовай школы на тэрыторыі ўсёй рэспублікі было бясплатнае і абавязковае. Улады дбалі, каб апошняе патрабаванне выконвалася бацькамі. У сувязі з гэтым савецкія школы наведвала на 25% дзяцей больш, чым польскія ўстановы да 1939 г. З мэтай ліквідацыі непісьменнасці арганізаваліся курсы чытання і пісання для старэйшай моладзі і дарослых.

Каб забяспечыць школьніцтва адпаведнымі кадрамі, у

www.kamunikat.org

Беластоку быў створаны Педагагічыны інстытут, у Баранавічах, Гродне і Пінску - інстытуты абучэння настаўнікаў, а ў Брэсце, Маладзечне, Навагрудку і Лідзе - настаўніцкія курсы. Даваенная польская гімназія і настаўніцкія курсы былі для асоб рабочага і сялянскага паходжання дастатковай адукацыяй, каб атрымаць працу ў школе. У заходнія вобласці было перанесена з усходняй Беларусі звыш 700 настаўнікаў. Школьная адміністрацыя ўхілялася, аднак, прымаць на працу ў якасці настаўнікаў асоб, якія працавалі ў польскай асвеце да 1939 г.

Да кастрычніка 1940 г. надрукавана было і распаўсюджана ў школах на тэрыторыі заходніх абласцей БССР 64 найменні падручнікаў на рускай мове, 44 - на польскай, 43 - на ідыш і 39 - на беларускай. Падручнікі былі адным з фактараў, якія спрыялі пераводу выкладання з беларускай мовы на рускую. Прытым сістэма падрыхтоўкі настаўнікаў на рускай мове, выдавецкая і кадравая палітыка ў школах паказвалі, што савецкія ўлады імкнуліся уніфікаваць сістэму навучання ва ўсёй БССР паводле мадэлі, якая абавязвала на ўсходзе рэспублікі. А гэта абазначала непазбежную русіфікацыю асветы таксама і ў заходніх абласцях.

Савецкая асветная сістэма мела перш за ўсё фарміраваць перакананне ў перавазе камуністычных стандартаў жыцця над усялякімі формамі, якія існуюць у капіталістычных краінах. Папаўненнем традыцыйнага школьніцтва былі курсы грамадзянскай адукацыі, якія вяліся на заводах, у вясковых клубах, на вышэйшых навучальных установах спецыяльна падрыхтаванымі групамі агітатараў. У вёсках і мястэчках арганізаваліся хатычытальні, дамы сацыялістычнай культуры або чырвоныя куткі, у якіх збіраліся экспанатыдоказы аб адвечным імкненні жыхароў дадзенай мясцовасці да савецкай сістэмы.

Савецкія ўлады многа ўвагі адводзілі культурнай актывізацыі грамадства. Перавагу аддавалі яны самадзейнасці. У кожнай большай вёсцы арганізаваліся гурткі самадзейнікаў, дэкламатарскія конкурсы і фестывалі рэвалюцыйнай песні. Для абслугі святкванняў, якія значыліся ў савецкім календары, прыцягваліся лепшыя музыканты, танцоры і спевакі.

Самым надзейным сродкам прапагандавання савецкай мадэлі жыцця і камуністычных вартасцей было кіно. У гарадах заходняй Беларусі ў 1939-1941 гадах колькасць кінатэатраў павялічылася ўтрая. Асаблівая роля ў галіне ідэалагізацыі вясковага грамадства адводзілася кінаперасоўкам. Большасць сялян рухомы вобраз на сцяне бачыла ўпершыню. Кінакарціна ўжо як тэхнічная з’ява так

моцна ўздзейнічала на ўяўленне, што на яго дэманстрацыю сыходзіліся сяляне з аддаленых вёсак. Была гэта для іх вялікая інтэлектуальная прыгода, якую падаравала ім савецкая ўлада. Героі экрана, якія ігралі ролі чэкістаў часоў бальшавіцкай рэвалюцыі, перадавікоў індустрыялізацыі і калектывізацыі ставаліся маральныі ўзорамі для мясцовай моладзі.

Падобную ролю мелі выконваць літаратура і друк. У кожным раёне была свая газета. Спачатку большасць рэспубліканскіх, абласных і раённых перыядычных выданняў выходзіла на беларускай мове. Пад канец 1940 г. у друку пачала пераважаць руская мова. Выходзіла таксама 8 газет на польскай мове, у тым ліку дзве рэспубліканскія - “Піянер” (“Pionier”) і “Сцяг свабоды” (“Sztandar Wolnosci”). Словы “свабода, вольнасць” віднеліся таксама і ў загалоўках двух польскамоўных лакальных газет - раённай “Свабодная Ломжа” (“Wolna Lomza”) і беластоцкай абласной “Вольная праца” (“Wolna Praca”).

Падчас уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю II Рэчы Паспалітай здарылася шэраг выпадкаў разбурэння цэркваў, касцёлаў, сінагог і манастыроў савецкімі салдатамі і мясцовымі партызанамі. Загінула некалькі дзесяткаў духоўных розных веравызнанняў. У першых месяцах савецкай улады, апрача канфіскацыі зямлі, не арганізаваліся масавыя акцыі супраць храмаў і рэлігійных абшчын. Багаслужбы ў цэрквах, касцёлах, сінагогах звычайна адбываліся без перашкод.

Вясною 1940 г. бальшавікі таксама і ў галіне веравызнанняў пачалі праводзіць палітыку падобную на тую, якую дзесяцігоддзямі ўкаранялі ў Савецкім Саюзе. Зыходзілі яны з пункту гледжання, што інтэграцыя краіны патрабавала ліквідацыі канкурэнтных светапоглядаў і ідэалогій. У сакавіку 1940 г. забаронена было выкладаць рэлігію ў школах. Неўзабаве многія духоўныя ўсіх веравызнанняў былі арыштаваны і абвінавачаны ў супрацоўніцтве з польскімі ўладамі да 1939 г. Найбольшым рэпрэсіям падвяргаўся праваслаўны клір, паколькі беларусы, якія складалі большасць вернікаў гэтага веравызнання, былі прызнаны найбольш падатлівымі светапогляднай пераарыентацыі. Часта арыштаваныя духоўныя замяняліся асобенямі, якіх паводзіны абражалі святарскі чын. Быў гэта адзін з метадаў кампраметацыі рэлігіі і інстытутаў Царквы ў вачах вернікаў. Большасць святароў была пазбаўлена права карыстацца прыхадскімі дамамі, якія перадаваліся ў распараджэнне арміі, райвыканкамаў ці сельсаветаў. Некаторыя настаяцелі прыходаў абкладаліся падаткамі, якіх яны нават з дапамогай прыхаджан не

маглі заплаціць. Неўзабаве канфесійныя абшчыны мелі таксама плаціць арэнду за карыстанне сакральнымі аб'ектамі - цэрквамі, касцёламі, сінагогамі. Памеры арэнднай платы вызначалі райвыканкамы ў залежнасці ад таго, ці дадзены сакральны аб'ект планаваўся перадаць нейкай савецкай установе ці не. У першым выпадку вызначаліся вялікія аплаты, несуразмерныя да фінансавых магчымасцей прыхаджан. Задоўжанасць абазначала неадкладную канфіскацыю храма. Такім чынам цэрквы, касцёлы, сінагогі замяняліся на кінатэатры, дамы народнай культуры, участкі НКУС, стайні, майстэрні, фабрыкі, казармы або турмы.

Большасць духоўных мела, аднак, магчымасць весці па меры нармальную душпастырскую дзейнасць. Улады ўвялі толькі пэўныя абмежаванні ў выконванні рэлігійных паслуг. Рашуча была забаронена ўсялякая рэлігійная дзейнасць паза агароджай храма. Кліру нельга было паказвацца публічна паза цэрквай у рызе ці аблачэнні. Забаронена юыло таксама ўжываць царкоўныя званы падчас рэлігійных урачыстасцей.

Многія райвыканкамы вызначылі кліру на сваёй тэрыторыі такі сам шарварак як і для сялян. Фізічная праца духавенства лічылася перавыхоўваннем "паразітычных элементаў". У сапраўднасці была гэта форма прыніжэння кліру. У другой палове 1940 г. паўсюдным стала парушанне багаслужбаў камсамольцамі і салдатамі. Уварванне групы маладых камуністаў у царкву падчас нядзельнай багаслужбы на практыцы абазначала спыненне традыцыйнага літургічнага парадку. У маі 1940 г. шлюбы, хрышчэнні і пахаванні, здзейсненыя ў цэрквах, сінагогах і касцёлах, у святле дзяржаўных законаў перасталі мець якоенебудзь значэнне.

Многа месца ў школах, на прадпрыемствах і вясковых сходах адводзілася атэістычнай прапагандзе. Грамадству прапанаваўся безліч кніжак, брашур, афішаў, лістовак антырэлігійнага зместу. Улюбёным заняткам прыбыўшых з усходу настаўнікаў было прымушанне дзяцей прасіць цукерак спачатку ў Бога, перад іконай, а пасля ў Сталіна, перад ягоным партрэтам. Эмпірычным шляхам пераконвалі яны дзяцей, што толькі Сталін уладны даць людзям усё, чаго ім трэба, адгукацца на іх патрэбы, караць вінbackўных. Школа ўсялякія атрыбуты Бога пераносіла на правадыра сусветнага камуністычнага руху.

**Арышты і дэпартацыі**

У адпаведнасці з савецкім заканадаўствам прыналежнасць да

www.kamunikat.org

некаторых грамадскіх саслоўяў і прафесійных груп была злачынствам. Уладальнікі прадпрыемстваў, якія наймалі рабочую сілу, памешчыкі, багатыя сяляне, клір, паводле вызначэнняў савецкага заканадаўства, гэта "контррэвалюцыйны, антысавецкі і антысацыялістычны элемент". Таксама ўсялякія фармальныя сувязі паасобных людзей са структурамі буржуазнай дзяржавы, а датычыла гэта перш за ўсё вайскоўцаў, паліцыянтаў, турэмшчыкаў, лясной аховы, чыноўнікаў, кваліфікавалі іх да групы "ворагаў народа". Злачынцамі, паводле савецкага права, былі таксама члены "буржуазных", "кулацкіх" і "контррэвалюцыйных" палітычных партый. На практыцы датычыла гэта ўсіх асоб, якія да 1939 г. удзельнічалі ў палітычным жыцці паза структурамі камуністычных арганізацый. Савецкая рэчаіснасць трыццатых гадоў паказала, што пералічаныя "злачынствы" не падлягалі даўнасці. Пашырэнне ў 1939 г. межаў СССР на захад. абазначала таксама ўвядзенне на далучаных абшарах савецкага заканадаўства.

На тэрыторыі заходніх абласцей БССР пад пагрозай знішчэння апынулася многа асоб, якія належалі да "злачынных" саслоўяў. Да вайны грамадскую эліту на гэтым абшары складалі палякі і ў сувязі з тым гэтая нацыянальная група падчас укаранення савецкай законнасці пацярпела найбольш. Рэпрэсіі пры ўдзеле ваенных чыннікаў Чырвонай Арміі і функцыянераў НКУС пачаліся з першых дзён усталёўвання савецкай улады на тэрыторыі былых усходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай. Да паловы кастрычніка 1939 г. арыштаваных было амаль 3,5 тыс. чалавек, галоўным чынам палітычных дзеячаў, паліцыянтаў, пагранічнікаў і прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі.

На тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі і Украіны Чырвоная Армія ўзяла ў палон 14 736 польскіх афіцэраў, паліцыянтаў, жандараў, турэмшчыкаў і супрацоўнікаў разведкі. Амаль 97% запалоненых складалі палякі. Іншыя нацыянальныя групы ў гэтых прафесіях складалі нязначны працэнт. Ваенныя палонныя былі арміяй перададзены органам НКУС. У адпаведнасці з распараджэннем шэфа гэтага ведамства Лаўрэнція Берыі ад 25 сакавіка 1940 г. усе асобы, якія былі затрыманы ў заходніх абласцях Беларусі і Украіны, па прычыне закаранелай варожасці да савецкай улады павінны былі быць асуджаны ў неадкладным парадку і расстраляны. Функцыянеры, якія разглядалі справы арыштаваных афіцэраў, памешчыкаў, фабрыкантаў, чыноўнікаў, даваенных палітычных дзеячаў, былі вызвалены ад абавязку кантактавацца з абвінавачанымі, слухаць іх паказанні, прад'яўляць ім абвінаваўчыя

www.kamunikat.org

акты і зачытваць ім прыгаворы. Палітбюро ЦК ВКП(б) адобрыла прапановы Берыі, вырашаючы такім чынам лёс арыштаваных. Фармальна, аднак, прыгаворы выдавала тройка работнікаў мінскага НКУС: Усевалад Мяркулаў, Амяк Кабулаў, Баштакоў.

Рашэннем Берыі ад 5 снежня 1939 г. з заходніх абласцей Беларусі высяленню падлягалі работнікі лясной аховы і вайсковыя асаднікі. Першыя абвінавачваліся ў ваенным абучэнні і ў падрыхтоўцы да ўдзелу ў ваенных дзеяннях супраць СССР, другія - у захопе чужой уласнасці па волі буржуазнага польскага ўрада і ў вернасці ды адданасці гэтаму ўраду. Па загаду камісара НКУС БССР Лаўрэнція Цанавы ад 25 снежня 1939 г. да 5 студзеня 1940 г. раённыя выканаўчыя камітэты саставілі спісы сем'яў асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Каб прадухіліць спробы ўцёкаў або супраціўлення, аперацыя высялення гэтых груп насельніцтва рыхтавалася амаль так, як ваенная акцыя. У паасобных раёнах і абласцях раней былі назначаны кіраўніцтвы аперацыі і акрэслены іх кампетэнцыі. Звычайна кіраванне высяленчай акцыяй перадавалася шэфам НКУС дадзенага ўзроўню. У распараджэнне палітычнай міліцыі ў заходняй Беларусі з усходніх абласцей было прысланых 2 тыс. работнікаў гэтага ведамства і амаль 7 тыс. чырвонаармейцаў і міліцыянераў. Было створана 4 тыс. аперацыйных груп, якія мелі прымаць непасрэдны ўдзел у правядзенні перасяленчай акцыі. Аказваць усялякага роду дапамогу НКУС у правядзенні гэтай аперацыі абавязаны былі таксама кіраўніцтвы ўсіх інстанцый партыі і камсамола. Падрыхтаваны былі адпаведныя чыгуначныя эшалоны, а нагляд за імі перанялі работнікі НКУС. У пачатку лютага Цанава пераслаў Берыю і першаму сакратару ЦК КП(б)Б Панцеляймону Панамарэнку камплектныя спісы людзей, якія падлягалі дэпартацыі. Занесена ў іх была 51 тысяча прозвішчаў. Акцыя пачалася 10 лютага 1940 г. раніцай ва ўсіх раёнах адначасна. На працягу гэтага дня ў вагоны пагружана было 50 тыс. чалавек. Вывазкі пазбегнулі толькі неприсутныя ў той дзень дома або цяжка хворыя. Раней падрыхтаваныя гаспадарчыя групы заняліся вопісам маёмасці, якая засталася ад вывезеных асаднікаў і работнікаў лясной аховы.

У сакавіку НКУС пачаў падрыхтоўку да другой высяленчай аперацыі, накіраванай гэтым разам супраць сем'яў асоб, якія апынуліся ў лагерах, турмах, уцяклі за мяжу, арыштаваных раней паліцыянтаў, жандараў, фабрыкантаў, памешчыкаў, дзеячаў некамуністычных палітычных партый. Другі тур высялення адбыўся 13 красавіка 1940 г. У Сібір і Казахстан саслана з Беларусі ў гэты дзень 24 тыс. чалавек.

www.kamunikat.org

29 чэрвеня 1940 г. праведзены быў трэці тур высялення, накіраваны супраць тых, што ўцяклі з нямецкай акупацыйнай зоны. Падвяргнуліся яму як палякі, так і беларусы і рускія, а перш за ўсё яўрэі, якія складалі амаль 90% уцекачоў. Многія з іх належалі да г.зв. эксплуататарскага класа і галоўным чынам яны былі дэпартаваны ў ходзе трэцяй аперацыі. З Беларусі выселена тады 23 тыс. чалавек. Гэтая астатняя аперацыя матывавалася м.ін. тым, што савецкія ўлады баяліся, каб сярод уцекачоў з захаду не апынуліся нямецкія шпіёны. Дзеля прафілактыкі з прыгранічнай зоны былі вывезены ўсе падазроныя.

Апошняя вялікая аперацыя масавага высялення адбылася 19 чэрвеня 1941 г. У вагоны грузілі тады галоўным чынам дзеячаў некамуністычных грамадскіх і палітычных арганізацый, якія дзейнічалі як у польскім, так і ў беларускім, рускім і яўрэйскім асяроддзях. Дэпартавана тады 22 тыс. чалавек.

Высяленні і дэпартацыі не абмежаваліся толькі да чатырох аднадзёнкых аперацый НКУС, накіраваных супраць асоб, якіх грамадскі або прафесійны статус кваліфікаваў іх, паводле савецкага заканадаўства, у лік “ворагаў народа”. Сістэматычна вяліся арышты асоб падазроных у прыналежнасці да нелегальных або антысавецкіх арганізацый. Аб віне часта вырашаў данос суседа або сваяка, які жадаў пазбыцца дадзенай асобы са свайго атачэння. У такіх справах не вялося ніякае следства, а падазроныя высылаліся ў Сібір або Казахстан.

Пачатак калектывізацыі абазначаў з’яўленне чарговай групы асоб, прыгавораных на дэпартацыю. Датычыла гэта галоўным чынам сялян, якіх маёмасны статус або, напрыклад, выгляд дома вылучаўся ад іншых. На 22 чэрвеня планавалася дэпартацыя некалькіх дзесяткаў кулакоў і іх сем’яў, але выбух нямецка-савецкай вайны перашкодзіў ажыццяўленню гэтай дэпартацыі. Ваенныя дзеянні не спынілі, аднак, эшалонаў з сасланымі 19 чэрвеня 1941 г. Машына НКУС скрупулёзна выконвала загады свайго цэнтра.

Паводле вызначэнняў беларускага гісторыка Аляксандра Хацкевіча, да 20 чэрвеня 1941 г. з заходніх абласцей Беларусі вывезена было ў Сібір або Казахстан звыш 120 тыс. чалавек. У гэты лік не ўключаны звыш 14 тыс. польскіх афіцэраў, якіх пераняў НКУС з чырвонаармейскіх лагераў для ваеннапалонных, ні арыштаваных і асуджаных перад высяленнем за гаспадарчыя і крымінальныя злачынствы.

www.kamunikat.org

# Нямецкая акупацыя Беларусі

## Адступленне Чырвонай Арміі

22 чэрвеня 1941 г. нямецкае войска перасякло межы СССР, выклікаючы сярод камандзіраў пагранічных гарнізонаў вялікую збянтэжанасць. Такі варыянт ходу падзей у штабах Чырвонай Арміі не разглядаўся. Хаця па абодвух баках мяжы, перад 22 чэрвеня 1941 г., была сабрана падобная колькасць салдат і ваеннай тэхнікі, у тым ліку танкаў, самалётаў, артылерыі, элемент неспадзяванасці прадрашыў аб поўнай перамозе Вермахта над Чырвонай Арміяй у першых днях вайны. Канцэнтрацыя савецкіх узброеных сіл у пагранічнай зоне была б абгрунтаванай у выпадку наступлення, аднак зусім непрыгоднай аказалася ў ходзе абарончых дзеянняў, асабліва ў сутыкненні з нямецкай тактыкай клінападобных удараў танкавых войск.

У першы дзень ваенных дзеянняў толькі на тэрыторыі Беларусі Чырвоная Армія страціла 738 самалётаў, у тым ліку 528 на аэрадромах. У сувязі з адсутнасцю якіх-небудзь планаў дзеяння на выпадак адступлення, большасць бронетанкавых войскаў і артылерыя аказаліся непрыдатнымі, а пакінутая ваенная тэхніка папоўніла запасы нямецкага ўзбраення. Аб паражэннях Чырвонай Арміі ў 1941 г. у вялікай ступені прадрашыла знішчэнне афіцэрскага саставу, праведзенае ў 1937-1939 гг. органамі сталінскай палітычнай міліцыі. У выніку тактычнымі злучэннямі камандавалі малодшыя афіцэры, якія аказаліся зусім бездапаможнымі ў канфрантацыі з вопытным у заваёўванні Еўропы камандным саставам Вермахта.

На працягу некалькіх дзён змаганняў немцы захапілі ўсе землі, якія калісьці ўваходзілі ў склад II Рэчы Паспалітай. 28 чэрвеня занялі яны сталіцу Беларусі Мінск. У ліпені большасць тэрыторыі рэспублікі апынулася пад іх кантролем. Толькі на паўднёваўсходніх акраінах, у наваколлі Гомеля і Мазыра, да 22 жніўня знаходзілася савецкае войска.

Многае паказвае на тое, што пачатак вайны спаралізаваў дзейнасць вярхоўных структур кіраўніцтва СССР. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі працаваў паводле раней распрацаваных інструкцый на выпадак вайны з якойнебудзь капіталістычнай краінай. 23 чэрвеня 1941 г. выдаў ён дырэктыву партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей па арганізацыі барацьбы з дыверсантамі і парашутыстамі.

www.kamunikat.org

ЦК КП(б)Б загадаў, між іншым, арганізаваць кругласутачныя назіранні ваколіцы пешымі патрулямі і коннымі раз'ездамі, якія мелі складаць калгаснікі ды жыхары вёсак і мястэчак. Мелі яны ахоўваць масты, чыгуначныя пуці, тэлеграфныя і тэлефонныя станцыі. У адпаведнасці з дырэктывай ЦК, у выпадку прыкмячэння нямецкіх салдат патруль абавязаны быў паведаміць самую блізкую савецкую ваенную часць і, не чакаючы чырвонаармейцаў, пачаць ліквідацыю ворага пры дамапозе ўсялякай даступнай зброі - вілаў, тапароў, палак, шабляў. Злоўленых дыверсантаў калгаснікі мелі дастаўляць у ваенныя часці для допытаў. Змест згаданай дырэктывы з'яўляецца доказам няведання савецкім кіраўніцтвам Беларусі ваеннай рэчаіснасці. Кожная спроба выканаць загады ЦК КП(б)Б прыгаворвала б жыхароў рэспублікі на бессэнсоўную смерць. 28 чэрвеня Савецкае інфармбюро паведаміла, што калгаснікі высачылі і ліквідавалі каля энскай вёскі ў Беларусі атрад парашутыстаў з 50 чалавек, з ліку якіх 32 салдаты былі забіты, а астатнія былі ўзяты ў палон. Не падобнае на праўду, што такое здарылася ў ходзе нямецка-савецкай вайны ў чэрвені 1941 г. Відаць, гэты ўзор паводзін савецкага чалавека быў створаны прапагандай у крытычнай сітуацыі, калі сацыялістычная айчына апынулася пад пагрозай. Адыход ад такога тыпу паводзін успрымаўся як здрада. Маланкавае наступленне нямецкіх войск і поўная дэзарганізацыя жыцця ў прыфрантавой зоне давялі да таго, што выкананне савецкіх ваенных законаў, асабліва ў заходніх абласцях, стала немагчымым.

28 чэрвеня Савет Народных Камісараў СССР і ЦК ВКП(б) выдалі дырэктыву да ўсіх партыйных камітэтаў і органаў выканаўчай улады ў прыфрантавой зоне, у якой паведамлялася, што нягледзячы на страту заходняй Беларусі і Украіны ды Літвы і Латвіі Чырвоная Армія змагаецца за кожную пядзю савецкай зямлі. Урад і партыя заклікалі камуністаў прымаць усялякія меры, якія маглі б аслабіць сілы ворага. Рэкамендавалася весці змаганне за кожныя горад, вёску, дом усімі даступнымі сродкамі. Дырэктыва абавязвала ўсе органы савецкай улады забяспечваць і ахоўваць шляхі зносін і транспарт для эвакуацыі людзей і маёмасці на тылы фронту. У выпадку "вымушанага адступлення" Чырвонай Арміі патрабавалася ў першую чаргу эвакуіраваць сродкі чыгуначнага транспарту - лакаматывы, вагоны, а потым знішчыць усё, што мела б якую-небудзь вартасць. "Не пакінуць ворагу ні кілаграма хлеба, ні літра паліва", - пісалася ў дырэктыве. Калгаснікі павінны былі перадаць жывёлу і збожжа органам дзяржаўнай улады для вывазу на тылы фронту. Дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) на камуністаў, якія прабывалі на захопленай

немцамі тэрыторыі, ускладала абавязак арганізаваць на месцы партызанскія атрады, дыверсійныя групы ды весці барацьбу з вайсковымі падраздзяленнямі ворага “ўсюды і заўсёды”. У акупіраваных раёнах загадвалася ствараць невыносныя ўмовы для “ворага і яго паплечнікаў”, “праследаваць і знішчажаць іх на кожным кроку”, а таксама “перадаваць ваенным судам усіх тых, што са страху не садзейнічаюць справе абароны, не зважаючы на тое, кім яны з’яўляюцца”.

Стратэгія савецкага камандавання пакінуць немцам спаленую зямлю магла ў нейкай ступені ажыццявіцца толькі ва ўсходянй Беларусі. У першых днях вайны расіяне страцілі ўсялякі кантроль у заходніх абласцях Беларусі. Таксама аб’яўленая ў першы дзень вайны мабілізацыя ў Чырвоную Армію мужчын 1905-1918 гадоў нараджэння з прычыны сітуацыі на фронце магла праводзіцца толькі ва ўсходняй частцы рэспублікі. З заходніх абласцей эвакуіраваліся перш за ўсё работнікі партыйнага і дзяржаўнага апарату, якія апынуліся тут пасля 17 верасня 1939 г. У выніку як мабілізацыя, так і эвакуацыя маёмасці ахапіла толькі 4 з 10 абласцей БССР - Віцебскую, Магілёўскую, Гомельскую і Палескую. Ад канца чэрвеня да жніўня 1941 г. пад мабілізацыю папала амаль 500 тыс. мужчын з гэтых абласцей. Армія пераняла таксама 2,5 тыс. грузавікоў і 35 тыс. коней. Гэта толькі ў невялікай ступені кампенсавала страты, якія былі нанесены ў першыя дні ваенных дзеянняў у пагранічнай зоне.

У выніку аб’яўленай савецкімі ўладамі эвакуацыі з усходніх абласцей Беларусі вывезеных было 1,5 млн. чалавек. У гэты лік не ўключаны работнікі заводаў і прамысловых прадпрыемстваў ды дзяржаўных установ, якія эвакуіраваліся ў першую чаргу. Да жніўня 1941 г. вывезена было 20% насельніцтва БССР, г.зн. кожны пяты жыхар рэспублікі. Улічыўшы, што перамяшчэнні закранулі ў асноўным усходнія вобласці, менавіта там страты насельніцтва былі значна большыя. Паводле савецкіх крыніц, з Гомельскай, Магілёўскай, Палескай і Віцебскай абласцей эвакуіравалася 35-37% жыхароў. З гэтай жа тэрыторыі найбольш вывезена было прамысловага абсталявання (рухавікоў, трансфарматараў, турбагенератараў, станкоў), запасаў каляровых металаў, амаль усе вагоны і лакаматывы. У заходніх абласцях і на тэрыторыі Мінскай прамысловая структура ў ходзе ваенных дзеянняў не падвяргнулася дэзарганізацыі. Дробныя заводы і прадпрыемствы, якія там працавалі, не мелі істотнага значэння для ваеннай гаспадаркі.

Намнога больш цяжкімі для насельніцтва, якога не паспелі эвакуіраваць, аказаліся паслядоўнасці выканання дырэктывы ад 29

чэрвеня ў галіне сельскай гаспадаркі. Да канца жніўня з Беларусі вывезеных было больш за 700 тыс. штук свойскай жывёлы. З прычыны складанасцей у транспарце жывой жывёлы некалькі соцень тысяч штук быдла, свіней і авечак вывезена ў выглядзе мяса. Агулам з Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай і Палескай абласцей вывезлі больш за 26% пагалоўя сельскагаспадарчай жывёлы і 54% запасаў збожжа. Вялікая колькасць збожжа была спалена. Пачалося таксама знішчэнне збожжа на палях, але наступленне нямецкіх войскаў на ўсход абмежавала маштаб гэтай акцыі.

Стратэгія спаленай зямлі прадугледжвала таксама разбуранне жыллёвых і публічных будынкаў. Праводзілася яно знішчальнымі (истребительными) батальёнамі, якіх у Віцебскай вобласці сарганізавалася 26, у Гомельскай - 19, Палескай - 18, Магілёўскай - 14. У складзе батальёнаў былі камсамольцы і работнікі калгасных упраўленняў, а камандавалі імі работнікі НКУС або члены райкамаў партыі. Разбуранне жыллёвых будынкаў мела схіліць людзей да эвакуацыі. У выніку дзейнасці знішчальных батальёнаў гарады і пасёлкі пацярпелі намнога больш чым ад ваенных дзеянняў.

Акцыя эвакуацыі маёмасці, якая мела ўскладніць забеспячэнне нямецкай арміі і зрабіць немагчымым выкарыстанне ворагам прамысловага патэнцыялу Беларусі, у сапраўднасці пагоршыла толькі становішча насельніцтва ў акупаванай зоне. Немцы распараджаліся ўсялякімі магчымасцямі прыдбаць сабе неабходную колькасць прадуктаў, а мірнае насельніцтва, пазбаўленае харчоў і жылля, апынулася ў адчайным становішчы. Як піша Юры Туронак, гэтае становішча, выкліканае Сталіным, было прадвесцем бязлітаснай барацьбы, у якой не ўлічваліся інтарэсы насельніцтва. "Ва ўмовах голаду, нэндзы і адсутнасці даху над галавой шанцы прыцягнуць насельніцтва да антынямецкіх выступленняў былі безумоўна большыя". Савецкія ўлады не прызнавалі ніякіх форм легальнай грамадскай актыўнасці дзеля паправы становішча насельніцтва. Ад пачатку вайны ўсялякая яўная дабрачынная, культурная або асветная дзейнасць на акупаванай тэрыторыі расцэньвалася як праява калабарацыянізму, за што пагражала найвышэйшая мера пакарання, так як за ігнараванне абавязку барацьбы з акупантам на тылах фронту.

## Нямецкая акупацыйная палітыка

У ходзе падрыхтоўкі да вайны, на пачатку 1941 г., нямецкае палітычнае і ваеннае кіраўніцтва распрацавала дэталёвыя планы

www.kamunikat.org

дзеянняў вайсковых і паліцэйскіх сіл на захопленых абшарах СССР і гаспадарчага выкарыстання мясцовых рэсурсаў, прамысловай структуры і рабочай сілы. Вясною 1941 г. са структур СС былі выдзелены спецыяльныя паліцэйскія падраздзяленні - Эйнзатцгрупы (аператыўныя групы) - для пацыфікацыі занятых Вермахтам тэрыторый і фізічнага знішчэння функцыянераў савецкага апарату ўлады, камуністаў і яўрэяў. У загадзе ад 13 мая 1941 г., падпісаным шэфам начальнага камандавання ўзброеных сіл ІІІ Рэйха Вільгельмам Кейтэлем, афіцэры Вермахта атрымалі паўнамоцтвы праводзіць пацыфікацыі і расстрэльваць мірнае насельніцтва на ўсім абшары рэалізацыі плана "Барбароса" ў выпадку падазрэння на наяўнасць якойнебудзь пагрозы з яго боку для бяспечнасці нямецкага войска. Загад фельдмаршала Кейтэля здымаў адначасна з салдат Вермахта ўсялякую адказнасць за дзеянні супраць мірнага насельніцтва і заахвочваў да бязлітаснага прымянення зброі ў адносінах да тых жыхароў занятых тэрыторый, якія варожа ставіліся да акупантаў. Чарговы загад Кейтэля ад 6 чэрвеня 1941 г., накіраваны афіцэрам узброеных сіл Рэйха і вядомы пад назвай "загаду аб камісарах", здымаў абавязак прытрымоўвацца норм міжнароднага права ў адносінах да савецкіх ваеннапалонных. Рэкамендаваў ён расстрэльваць без суда і тлумачэнняў усіх палітрукоў. Яшчэ да выбуху вайны была запланавана фізічная ліквідацыя салдат Чырвонай Арміі, якія мелі папасці ў нямецкі палон. Менавіта таму з ліку 3,3 млн. ваеннапалонных, якія трапілі ў няволю летам 1941 г., амаль палова памерла ад голаду і знясілення ў лагерах, арганізаваных найчасцей пад адкрытым небам.

Летам 1941 г. на тэрыторыі ўсёй акупаванай Беларусі ўведзена было ваеннае праўленне. Большасць тэрыторыі рэспублікі апынулася ў тыле дзеяння групы армій "Цэнтр", штаб якой знаходзіўся ў Баранавічах. Толькі паўднёвыя раёны ўваходзілі ў склад тэрыторыі, якой праўляла камандаванне групы армій "Поўдзень", кіруючае таксама ўсёй Украінай. На тэрыторыі Беларусі была створана сетка палявых камендатур і падначаленых ім ваенных праўленняў гарадоў і раёнаў. На кожнай ступені вайсковай адміністрацыі ствараліся спецыяльныя падраздзяленні паліцыі (Эйнзатцгрупы) і гаспадарчыя службы. Астатнія мелі займацца забеспячэннем войска харчамі і мабілізацыяй мясцовага насельніцтва на працу ў карысць ваеннай інфраструктуры.

Хуткі наступ нямецкай арміі на ўсход выклікаў неабходнасць стварання новых ваенных праўленняў і паліцэйскіх фарміраванняў. Атрады Эйнзатцгрупы ўжо на тэрыторыі акупаванай Беларусі і

www.kamunikat.org

Украіны не паспявалі забіваць сапраўдных і ўяўных праціўнікаў гітлерызму. Выкананне плана ачышчэння тылоў нямецкай арміі ад застаўшыхся савецкіх функцыянераў і камуністычных дзеячаў ды вынішчэння яўрэйскага насельніцтва патрабавала вялікіх людскіх рэзерваў. Адтуль вынікала неабходнасць разбудовы паліцэйскага і адміністрацыйнага апарату, абапіраючыся на мясцовы элемент. Немцы выкарысталі перш за ўсё стан грамадскіх настрояў, выкліканых савецкай палітыкай у заходніх абласцях у 1939-1941 гадах.

Уступленне нямецкіх войскаў успрымалася палякамі з надзеяй, але і беларусы з заходніх абласцей БССР таксама не надта сумавалі. Рапарт Дэпартамента ўнутраных спраў Дэлегатуры лонданскага ўрада на край аб сітуацыі на Гродзеншчыне і Беласточчыне ў другой палове 1941 г. грамадскія настроі ахарактарызваў адназначна: “Агульны тадышні настрой сярод польскага насельніцтва - гэта радасць з выпадку вызвалення з-пад бальшавіцкага тэрору і далучэння да рэшты краю. У першых месяцах акупацыі людзі да немцаў ставіліся бадай што з сімпатыяй, наогул паводзячы сябе стрымана і не прымаючы ўдзелу ў палітычнай дзейнасці. Здараліся аднак выпадкі, асабліва на Беласточчыне, на беларускай тэрыторыі, што частка моладзі фашысцкіх поглядаў, а нават многія колішнія члены незалежніцкіх арганізацый пайшлі на нямецкую службу, ствараючы атрады паліцыі. (...) Цяпер амаль усе адміністрацыйныя пастарункі, за выключэннем кіраўнічых, на якія прызначаліся немцы, апынуліся ў руках палякаў, паколькі акупант зыходзіў з такога пункту гледжання, што трэба вярнуць на працу тых людзей, якія працавалі ў дадзеных установах да 1939 г. Зрэшты, адсутнасць беларускіх спецыялістаў прымусіў акупанта абаперціся на польскі элемент. (...) Служба бяспекі даручана была Грэнцшуцу, які сваіх салдат дыслацыраваў у асноўным на граніцы акругі, а нагляд за парадкам даручыў мясцовай паліцыі, сарганізаванай амаль выключна з колішніх польскіх паліцыянтаў”. Падобная сітуацыя панавала на ўсёй тэрыторыі заходняй Беларусі.

Рапарты Дэлегатуры ўрада на край і Саюза ўзброенай барацьбы паведамлялі аб пагромах яўрэйскага насельніцтва ў розных гарадах Беласточчыны, Гродзеншчыны і Навагрудчыны ды многіх выпадках даносаў на беларусаў, якія рабіліся людзьмі з новастворанай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Часта ў выніку даносаў немцы расстрэльвалі як камуністаў арганізатараў беларускага культурнага ці асветнага жыцця да 1939 г. Гінулі перш за ўсё тыя, што ў нейкі спосаб адобрылі савецкую ўладу ў 1939- 1941 гадах.

У свае маёнткі ў Беларусі вярталіся з Літвы і Генеральнай

губерні (акупаванай цэнтральнай Польшчы) былыя памешчыкі. Некаторыя з іх прыязджалі пад аховай нямецкай паліцыі, прагныя помсты за ўсе крыўды 1939 года і жадання вярнуць маёмасць перададзеную савецкімі ўладамі мясцовым сялянам. Імкненні памешчыкаў падтрымоўваліся мясцовай адміністрацыяй, якая знаходзілася ў польскіх руках. Такім чынам ствараліся новыя абшары нацыянальных канфліктаў, якія ўмела распальваліся акупацыйнымі ўладамі.

Для польскага насельніцтва першыя месяцы нямецкай акупацыі ў Беларусі былі перыядам вяртання некаторым яго прадстаўнікам страчанага пасля 17 верасня 1939 г. эканамічнага, грамадскага і палітычнага значэння. Актыўны ўдзел у стварэнні адміністрацыі і паліцыі даваў палякам шанц адбудаваць знішчаныя ў перыяд савецкай улады кадры, а ў далейшай перспектыве садзейнічаў узнікненню структур польскай падпольнай дзяржавы. У нямецкай адміністрацыі, апрача асоб, якія шукалі працы выключна дзеля заробку, працавалі таксама людзі, які хацелі ўплываць на ход падзей на гэтай тэрыторыі. Таму неўзабаве змаганне за чыноўніцкія пасады паміж палякамі і беларусамі стане для прадстаўнікоў гэтых абодвух грамадскасцей элементам рэалізацыі ўласных нацыянальных мэт.

Аднак пачатак нямецкай акупацыі беларусамі ўспрымаўся паразнаму. У заходняй Беларусі сярод асоб, якія раней працавалі ў савецкіх асветных і культурных установах ды мясцовай адміністрацыі, панавалі настроі няўпэўненасці і чакання. Работнікамі гэтых установаў пераважна былі мясцовыя людзі, якія не эвакуіраваліся ў чэрвені 1941 г., так як зрабілі гэта прыбылыя з усходу прадстаўнікі савецкага апарату ўлады. Гэтым грамадскапрафесійным групоўкам нанесены былі найбольшыя страты ў выніку ліквідацыі камуністычных элементаў на тылах нямецкай арміі, якая праводзілася атрадамі Эйнзатцгрупы. Гэтае асяроддзе найбольш пацярпела таксама ад даносаў прадстаўнікоў ствараемай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Беларускія сяляне ў заходніх абласцях змену палітычнай сітуацыі скарысталі для роспуску калгасаў і вяртання да аднаасобніцтва, аднак многія з іх былі таксама ўладальнікамі зямлі і інвентару, якія раней належалі польскім памешчыкам. У выніку апынуліся яны сярод падазроных у спрыянні савецкай уладзе.

З-за адсутнасці вопыту і традыцыі працы ў дзяржаўных структурах і горшай, у параўнанні з палякамі, адукацыі, сярод беларусаў не было адпаведных людскіх рэсурсаў, якія маглі б быць скарыстаны немцамі пры стварэнні новага парадку на акупаванай

www.kamunikat.org

тэрыторыі. Перш за ўсё на беларускім баку не было групавой матывіроўкі да супрацоўніцтва з немцамі.

Беспаспяховай аказалася таксама спроба згуртаваных вакол старшыні Беларускага камітэта ў Варшаве Міколы Шчорса дзеячаў стварыць адміністрацыйны корпус з эмігрантаў, якія апынуліся ў Генеральнай губерні і Нямеччыне. Іх дзеянні падтрымоўваліся нямецкай палітычнай паліцыяй. Планавалася пасланць у Беларусь сотні чыноўнікаў, але завербаваць удалося толькі некалькі дзесяткаў чалавек, якія былі ўладкаваны на працу ў Мінску і гарадах усходняй Беларусі. Многія з іх атрымалі прэстыжныя пасады ў адміністрацыі і паліцыі.

Паліцыянты і чыноўнікі патрэбны былі акупантам перш за ўсё на тэрыторыі ўсходняй Беларусі. У гэтай частцы краіны наогул чакалася роспуску калгасаў, але такія змены не адбываліся. На думку немцаў, толькі вялікія сельскія гаспадаркі маглі лепш забяспечыць харчовыя патрэбы Рэйха. Насельніцтва абыякава ставілася да лозунгаў аб іх вызваленні з-пад савецкага ярма. Публічныя экзекуцыі, часта выпадковых людзей, якія выконваліся Вермахтам і атрадамі паліцыі наводзілі на людзей большы жах чым сталінскія злачынствы трыццатых гадоў. Многія жыхары ўсходняй Беларусі пазбягалі супрацоўніцтва з акупантам, баючыся хуткага вяртання савецкага парадку. Істотным фактарам, які стрымліваў ад удзельніцтва ў нямецкай сістэме ўлады, было таксама хуткае ўзнікненне савецкіх партызанскіх структур. Партызаны, выконваючы дырэктывы цэнтральных савецкіх улад, усіх тых, што працавалі ў акупацыйнай адміністрацыі, лічылі здраднікамі. У адпаведнасці з указаннямі СНК СССР і ЦК ВКП(б) былі яны абавязаны знішчаць усіх паплечнікаў акупанта.

Ва ўсходняй Беларусі нямецкія вайсковыя праўленні на працу ў цывільнай адміністрацыі прымалі ранейшых савецкіх чыноўнікаў, а ў дапаможную паліцыю - дабравольцаў з ліку ваеннапалонных і былых міліцыянераў. У прынцыпе і былыя чырвонаармейцы, і эксміліцыянеры сумленна выконвалі свае абавязкі для сваіх новых работадаўцаў.

Клопаты з прыцягненнем на паліцэйскую службу мясцовага беларускага элемента прымусілі немцаў перавесці восенню 1941 г. на тэрыторыю ўсходняй Беларусі некалькі літоўскіх, латышскіх і ўкраінскіх батальёнаў. Гэтыя фарміраванні, асабліва літоўскія часці, выкарыстоўваліся падчас масавых экзекуцый на яўрэйскім насельніцтве і падазроных у садзеянні савецкаму падполлю беларусах.

Нямецка-савецкая вайна абнадзейвала беларускіх палітыкаў.

Многія з іх у 1939-1941 гадах прабывалі на тэрыторыі Нямеччыны, Генеральнай губерні або Літвы. Назіранні і аналіз польскай і савецкай палітыкі ў адносінах да беларусаў у міжваенны перыяд, праведзеныя беларускімі палітыкамі, вырашылі аб неабходнасці шукаць прыхільнікаў беларускай справы сярод гітлераўскіх саноўнікаў. У галовах многіх беларускіх дзеячаў узнікла ілюзія, што немцы могуць дапамагчы аднавіць беларускую нацыянальную дзяржаву. Слабасцю беларускай нацыянальнай эліты была яе палітычная раздробленасць, унутраная пасваранасць і нерэальныя амбіцыі лідэраў паасобных груп. У адносінах да немцаў намагаліся яны выступаць у ролі патэнцыяльных партнёраў, прапанавалі гітлераўскім палітыкам палітычныя вырашэнні, якія - на іх думку - забяспечвалі б інтарэсы як Рэйха, так і беларускага народа. Немцы ахвотна прымалі прапанаваныя паслугі, аднак не спяшаліся ажыццявіць якія-небудзь праекты вырашэння беларускай праблемы, прад'яўленыя лідэрамі паасобных груп.

Пад канец 1939 г. немцы заснавалі ў Берліне рэдакцыю беларускага штотыднёвіка "Раніца", якога публікацыі ўнушалі прыхільнасць гітлераўцаў да беларускага народа. Выданне ўказвала таксама беларускім дзеячам магчымых нямецкіх партнёраў для перамоў. У жніўні 1939 г. па нямецкай ініцыятыве дайшло да перамоў прадстаўнікоў Міністэрства замежных спраў III Рэйха з прабываючым у Празе старшынёю Рады БНР Васілём Захаркам і эміграцыйным беларускім дзеячам Іванам Ермачэнкам. Стары і знясілены хваробаю Захарка сваім аўтарытэтам толькі адкрыў дарогу амбітнаму Ермачэнку, які неўзабаве ў знешнепалітычным ведамстве Рэйха прадставіў праект развалу СССР пасля паражэння ў вайне з Нямеччынай. Паколькі дзеялася гэта ў пік нямецка-савецкага прыбліжэння, Ермачэнка, відаць, карыстаўся вялікім даверам Берліна, калі ведаў аб маючай неўзабаве адбыцца радыкальнай змене ўсходняй палітыкі Гітлера. Праект Ермачэнкі прадугледжваў стварэнне саюзнай з Нямеччынай беларускай дзяржавы.

Летам 1940 г. беларусы, якія прабывалі ў Берліне, атрымалі дазвол стварыць Беларускі камітэт самапомачы. Неўзабаве філіі БКС узніклі ў Познані, Лодзі, Торуні, Лейпцыгу, Мюнхене, Празе. Раней немцы дазволілі стварыць такія камітэты ў Варшаве, Кракаве і БелайПадляшскай. Асноўнымі мэтамі камітэтаў мелі быць арганізацыя грамадскай апекі над беларускім насельніцтвам у нямецкай зоне ўплываў і культурнаасветная дзейнасць. Па меры набліжэння нямецка-савецкай вайны камітэты станавіліся цэнтрамі палітычнай дзейнасці. Некаторыя дзеячы сталі займацца

арганізацыяй разведвальнай, прапагандысцкай і дыверсійнай работы ў карысць Нямеччыны. Дзеля выканання гэтай мэты прыцягваліся ваеннапалонныя беларусы, былыя салдаты Войска Польскага. Іх абучэннем у лагеры пад Берлінам кіраваў правадыр беларускіх нацыяналсацыялістаў Фабіян Акінчыц. У такі спосаб рыхтаваў ён сабе групу людзей, якіх планаваў скарыстаць у якасці функцыянераў будучай беларускай дзяржавы.

19 чэрвеня 1941 г. у Берліне заснаваўся Беларускі нацыянальны цэнтр (БНЦ), які ўзначаліў шэф Беларускага камітэта ў Варшаве Мікола Шчорс. У кіраўніцтве гэтай арганізацыі апынуліся ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Чэслаў Ханяўка, Анатоль Шкуцька, Вітаўт Тумаш, Мікола Ждановіч, Барыс Стрэльчык, Пятро Ластаўка. Улічыўшы час узнікнення БНЦ можна меркаваць, што быў гэта той орган, які меў намер аб'явіць сябе беларускім урадам. Дзеячы БНЦ пераважалі ў камітэтах, складалі рэдакцыйны калектыў "Раніцы", намагаліся стварыць шырэйшае беларускае прадстаўніцтва ў выглядзе Беларускага нацыянальнага фронту, надзеленага заканадаўчымі паўнамоцтвамі.

Паза БНЦ апынуўся Фабіян Акінчыц, які лічыў, што пры дапамозе немцаў самастойна даб'ецца больш высокай пасады, і Радаслаў Астроўскі, якому эміграцыйныя дзеячы не маглі прабачыць супрацоўніцтва спачатку з камуністамі, а потым з польскімі ўладамі. Астроўскі да выбуху нямецка-савецкай вайны быў старшынёю Беларускага камітэта ў Лодзі.

Ад супрацоўніцтва з немцамі адмовіўся старшыня Рады БНР Васіль Захарка. Ён, стваральнік незалежнай беларускай дзяржаўнасці, не мог зміршцца з стаўленнем III Рэйха да Беларусі як да аб'екта і не адабраў палітычнага мінімалізму дзеячаў, якія хадайнічалі перад немцамі аб падтрымцы.

Зараз пасля выбуху вайны з'явілася яшчэ адна група беларускіх дзеячаў, згуртаваных вакол Вацлава Іваноўскага і Янкі Станкевіча. Прабавалі яны скарыстаць змену палітычнай сітуацыі для разбуджэння беларускіх нацыянальных пачуццяў, намерваліся ўвесці як найбольш людзей у нямецкую адміністрацыю і са згоды акупаната стварыць беларускія мілітарныя фарміраванні. Іх непасрэднай мэтай была падрыхтоўка беларускага грамадства як маральна, так і арганізацыйна да змагання за сваю дзяржаўнасць. Аднак меркавалі яны, што канчатковыя вырашэнні ў гэтай вайне будуць некарыснымі для Нямеччыны і таму прабавалі дамовіцца з палякамі і вызначыць нацыянальныя мэты кожнага з бакоў, каб прадухіліць пазнейшы канфлікт. Прапанавалі яны стварыць пасля вайны польскабеларускую

федэрацыю, а заходнюю мяжу Беларусі павесці па лініі Керзана. Аднак гэтая прапанова не падыходзіла польскаму боку, паколькі падтрымку беларускім незалежніцкім імкненням магла б яна аказаць толькі тады, калі б абмежаваліся яны да тэрыторый на ўсход ад рыжскай мяжы.

Імкненні беларускіх нацыянальных колаў ішлі ўразрэз з польскімі інтарэсамі, якія прадстаўлялі палітычныя структуры падначаленыя эміграцыйнаму ўраду ў Лондане. Супярэчлівасць асноўных беларускіх, савецкіх і польскіх інтарэсаў у Беларусі непазбежна вяла да вайны ўсіх з усімі. Канцэпцыя стварэння беларускай дзяржавы ў этнічных межах не супадала ні з мэтамі польскага падполля, якое намагалася вярнуць даваенны стан з 1939 года, ні з інтарэсамі савецкага падполля, якое ў сваю чаргу імкнулася аднавіць даваеннае становішча з 1941 года. У такіх умовах няўхільным было знішчанне ўсялякіх праяваў беларускага нацыянальнага жыцця як праз польскае, так і праз савецкае падполле. Немінучым быў таксама польска-савецкі канфлікт за заходнюю Беларусь.

Напружанні і канфлікты ўмела выкарыстоўваліся немцамі. У першых месяцах акупацыі ўсе выпадкі даносаў і абвінавачанняў у камунізме гітлераўскімі службамі бяспекі разглядаліся ў экстранным парадку. У адпаведнасці з указаннямі галоўнага камандавання ўзброеных сіл Рэйха ўсе абвінавачаныя ў прыхільнасці да бальшавізму асобы расстрэльваліся без судоў і праверкі сапраўднасці абвінавачанняў. Загінула тады многа беларусаў, якія паступілі на працу ў новастворанай адміністрацыі. Беларускі бок лічыў гэта арганізаванай акцыяй мясцовых польскіх чыноўнікаў і паліцыянтаў, якія дзейнічаюць у паразуменні з падпольлем і па ўказаннях лонданскага ўрада. Беларускія дзеячы і многія асобы, якія пазбягалі супрацоўніцтва з немцамі ў першых тыднях акупацыі, пачалі мсціцца, прымяняючы метады скарыстаныя палякамі. Знішчанне беларускіх і польскіх эліт рукамі нямецкай паліцыі цягнулася з розным напружаннем усю акупацыю, а інтэнсіўнасць канфлікту распальвалася найчасцей па меры патрэб акупацыйных улад.

Такой сітуацыі не наглядалася на тэрыторыі ўсходняй Беларусі, дзе не было польскай адміністрацыі і паліцыі, а беларуская нацыянальная эліта была знішчана яшчэ да вайны. Не абазначае гэта, што адсутнасць нацыянальных напружанняў паўплывала на абмежаванне ліку ахвяр сярод мясцовага мірнага насельніцтва. На ўсходзе нямецкія аператыўныя атрады Эйнзатцгрупы амаль з ходу пачалі знішчаць яўрэйскую інтэлігенцыю. Прафесія настаўніка,

www.kamunikat.org

чыноўніка, юрыста была для яўрэяў дастатковай прычынай для расстрэлу. У Мінску і ў іншых гарадах усходняй Беларусі ваеннаслужачыя нямецкіх фашысцкіх атрадаў СС пры дапамозе Вермахта стваралі лагеры для цывільных грамадзян, у якіх трымалі мужчын у прызыўным узросце пад выглядам пошуку афіцэраў і камісараў Чырвонай Арміі. Кожны дзень немцы забівалі некалькі соцень чалавек, выбіраючы свае ахвяры паводле іх вонкавага выгляду.

Не здзейсніліся спадзяванні дзеячаў Беларускага нацыянальнага цэнтра, што немцы паставяцца да іх як да палітычных партнёраў. Праўда, некаторыя з дзеячаў БНЦ, апынуўшыся ў Беларусі, атрымалі кіраўнічыя пасады ў адміністрацыі або ў дапаможнай паліцыі, аднак такія вырашэнні іх не задавальнялі. Вітаўт Тумаш стаў бургамістрам Мінска, а ягоным намеснікам - Адам ДземідэцкіДземідовіч. Кіраўніком адміністрацыі Мінскага раёна акупанты назначылі Мячыслава Кноўта, а камендантам дапаможнай паліцыі - Дзімітрыя Касмовіча. Дзеючага паза структарамі БНЦ Радаслава Астроўскага немцы назначылі шэфам адміністрацыі ўсёй Мінскай акругі. Некаторыя дзеячы БНЦ былі высланы ў Віцебск і Магілёў. Шэф БНЦ Мікола Шчорс апынуўся ў Беластоку, дзе арганізаваў Беларускі камітэт і пачаў выдаваць газету “Новая дарога”.

Камітэты хутка пачалі паўставаць у іншых гарадах Беларусі. Сталі яны пасрэднікамі паміж беларускім насельніцтвам і акупацыйнымі ўладамі і заадно цэнтрамі беларускага нацыянальнага жыцця. Неаднойчы хадайніцтвы дзеячаў камітэтаў засцерагалі людзей ад рэпрэсій, а ў іх радах шукалі прыстанішча таксама былыя чыноўнікі савецкага апарату ўлады.

Дазвол на дзейнасць камітэтаў, службу ў нямецкай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі, а затым таксама згода на арганізаванне асветнага і культурнага жыцця ды выдаванне газет аказаліся ўсім што маглі запрапанаваць немцы стараючымся атрымаць іхнюю падтрымку беларускім палітыкам. Планы дзеячаў БНЦ і лідэраў іншых палітычных груповак наконт стварэння ўласнай дзяржавы ў этнічных межах былі перакрэслены ў выніку новага адміністрацыйнага падзелу краіны. У адпаведнасці з распараджэннем Гітлера ад 22 ліпеня 1941 г. з колішняй Беластоцкай вобласці, з паўночнай часткі Брэсцкай і заходняй Баранавіцкай была створана Беластоцкая акруга, якая ўвайшла ў склад Усходняй Прусіі. Неўзабаве да Генеральнай акругі Літвы былі далучаны паўночныя раёны Вілейскай вобласці, а да Рэйхскамісарыята Украіны - паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з гарадамі

Брэстам, Пінскам, Мазыром, Рэчыцай. З астатніх зямель БССР немцы стварылі Генеральную акругу Беларусь, якая была ўключана ў састаў Рэйхскамісарыята Остланд з сядзібай у Рызе. Генеральная акруга Беларусь была часова падзелена на дзве зоны: заходнюю, у якой было ўстаноўлена цывільнае праўленне і ўсходнюю, дзе ў далейшым абавязвала вайсковае праўленне. Па меры поспехаў на фронце немцы планавалі пашырыць цывільнае праўленне на ўсход, але пасля паражэння нямецкіх войскаў пад Масквой устаноўлены восенню 1941 г. парадак пратрываў да канца акупацыі.

Заходняя частка Генеральнай акругі Беларусь займала плошчу 45 тыс. кв. км і дзялілася на 11 камісарыятаў: адзін гарадскі ў Мінску і дзесяць акруговых - у Баранавічах, Барысаве, Вілейцы, Ганцавічах, Глыбокім, Лідзе, Мінску, Навагрудку, Слоніме і Слуцку. Генеральным камісарам акругі Беларусь Гітлер назначыў Вільгельма Кубэ. Фармальна быў ён таксама начальнікам камандзіраў паліцыі і службы бяспекі на тэрыторыі акругі, але адначасна сам падлягаў шэфу паліцыі СС Генрыху Гімлеру.

Цяжка сказаць, якія былі канчатковыя мэты нямецкай палітыкі на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Адзіным на гэтую тэму вядомым дакументам з'яўляецца "Генеральны план «Ост»", распрацаваны начальнікам аддзела каланізацыі Галоўнага палітычнага праўлення Міністэрства па справах акупаваных усходніх тэрыторый Эргардам Ветцэлем ад 27 красавіка 1942 г. Праект Ветцэля ў кіруючых колах III Рэйха разглядаўся як аснова нацыянальнай палітыкі на ўсходзе Еўропы пасля пераможнага заканчэння вайны з Савецкім Саюзам. Адносна беларусаў прадугледжваў ён перасяленне 75% насельніцтва ў заходнюю Сібір або на паўночны Каўказ. Астатнія 25% беларусаў, асабліва маючых выразныя нардычныя рысы, Ветцэль прапанаваў перасяліць у Рэйх у якасці рабочай сілы для прамысловасці, сельскай гаспадаркі і рамесніцтва. Да іх акупанты ставіліся б як да грамадзян Нямеччыны. Адсутнасць выразнай нацыянальнай свядомасці - паводле аўтара праекта - павінна пасадзейнічаць іх паскоранай асіміляцыі. На тэрыторыі Беларусі планавалася пасяліць у будучым некалькі мільёнаў немцаў і асіміляваных у нямецкай культуры асоб. Гэтыя змены павінны былі адбыцца на працягу трыццаці гадоў пасля заканчэння вайны.

У нямецкай палітыцы перыяду акупацыі не назіралася прыкмет трактавання беларусаў як грамадскасці, якая ў будучым мела набыць нейкую форму дзяржаўнага існавання. Беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія хадайнічалі перад немцамі аб палітычных канцэсіях, акупанты трактавалі інструментальна,

павышаючы па службе паасобных асоб па меры сваіх патрэб.

Канцэпцый гарантыі бяспекі і стабільнасці нямецкага панавання на тэрыторыі акупаванай Беларусі было некалькі. Генеральны камісар Вільгельм Кубэ быў прыхільнікам развіцця беларускага нацыяналізму ў процівагу савецкім уплывам. Кубэ зыходзіў з прадпасылкі, што існуе натуральная супярэчлівасць паміж савецкімі інтарэсамі і беларускім рухам, якога канчатковай мэтай было стварэнне ўласнай дзяржаўнасці. Згодна гэтай жа логіцы беларускі нацыяналізм не мог быць адобраны польскім падпольем. У такой сітуацыі немцы, падтрымоўваючы беларускія нацыянальныя імкненні і спадзяванні на ўзнікненне беларускай дзяржаўнасці, маглі б памяняць настроі і выклікаць інтарэс грамадства да ліквідацыі савецкага партызанскага руху. Па гэтай прычыне некаторыя рашэнні генеральнага камісара ішлі ўразрэз з жудасцямі штодзённага жыцця, якія ўчыняліся нямецкай паліцыяй і службамі бяспекі.

У верасні 1941 г. на падлеглай цывільнаму праўленню тэрыторыі ўведзены быў абавязак навукі для дзяцей ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў. Выключэнне складалі яўрэйскія дзеці, якія разам з бацькамі былі зачынены ў гетах на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Гэтыя школы, апрача навучання беларускай мове, мелі вучыць дзяцей матэматыцы, біялогіі, практычным заняткам, а перш за ўсё мелі фарміраваць у школьнікаў вобраз Еўропы, у якой маторам усялякага прагрэсу і цывілізацыйнага развіцця былі немцы. У чэрвені 1942 г. на тэрыторыі цывільнага праўлення было каля 3,5 тыс. школ з 346 тыс. вучняў. У частцы школ навучанне вялося на польскай або рускай мовах. На тэрыторыі прыбалтыйскіх краін і Украіны ўлады дазволілі на адкрыццё толькі чатырохкласных школ, у якіх навука чытання і пісання была спалучана з прывучэннем да прафесіі.

Стаўка на развіццё беларускага нацыяналізму не знаходзіла, аднак, зразумення ў Берліне. Улады Рэйха больш верылі ў паспяховасць метадаў, прымяняемых падраздзяленнямі СС і Вермахта, чым у палітычныя вырашэнні. Узнікненне беларускіх школ і развіццё культурных устаноў адбывалася паралельна з генацыдам і грабяжом маёмасці, якія ўчынялі нямецкія салдаты і паліцыянты. Акупанты з размахам праводзілі акцыю вывазу твораў мастацтва, антычнай мэблі, каштоўных музейных экспанатаў у Нямеччыну. Грабяжы часта арганізаваліся як прыватныя мерапрыемствы камандзіраў паасобных часцей СС і Вермахта. Многія творы мастацтва былі бяздумна знішчаны салдатамі падчас раскрадання музеяў і палацаў.

Планам беларусізацыі краіны ў значнай ступені перашкаджала

www.kamunikat.org

адсутнасць адпаведных кадраў. Хаця беларускі фактар карыстаўся падтрымкай улад цывільнага праўлення, аднак нельга было польскіх чыноўнікаў замяніць беларускімі, паколькі ў гэтым асяроддзі цяжка было знайсці людзей з адпаведнымі кваліфікацыямі, якія б праявілі ахвоту працаваць і не былі б абцяжараны камуністычным мінулым. Гэты апошні фактар быў даволі істотным аргументам, які многіх стрымліваў ад публічнай дзейнасці, каб не падвяргнуцца даносам з боку патэнцыяльных канкурэнтаў. І хаця ў канцы 1941 г. пачаліся праверкі сапраўднасці даносаў, а ў выпадку беспадстаўнага прыпісання віны - пакаранні даносчыкаў, узаемныя абвінавачванні не спыняліся. Палякі даносілі на беларусаў, беларусы на палякаў, католікі на праваслаўных, праваслаўныя на католікаў. Нямецкая акупацыя вызваліла ўсе прадузятасці: беларускія - даваеннага часу і польскія - перыяду савецкай улады. На гэты багаж узаемных крыўд напластоўваліся бягучыя мэты палітычных дзеячаў па абодвух баках канфлікту. Для палякаў небяспекай станавілася кожная беларуская школа, кожная газета, якая выходзіла на захад ад рыжскай мяжы. Таксама з пункту гледжання савецкага падполля ўсе беларускія арганізацыі - школы, аб’язныя тэатры, установы, якія існавалі на прасторы ад Беластока да Смаленска лічыліся праявай здрады Савецкаму Саюзу.

Як ва ўсёй акупаванай немцамі Еўропе, так і ў Беларусі ў найгоршым становішчы апынуліся яўрэі. І хаця З-за плана выкарыстання яўрэйскіх рамеснікаў у нямецкай гаспадарцы ў Беларусі генацыд на гэтай тэрыторыі ў значнай ступені замарудзіўся, аднак лёс большасці гэтага народа быў прадрашоны. Пасля знішчэння інтэлігенцыі астатнія яўрэі мелі быць пасланы на работу ў розныя прадпрыемствы ў якасці дармовай рабочай сілы. Менавіта таму ў Рэйхскамісарыяце Остланд Беларусь была адзінай генеральнай акругай, дзе на пачатку 1942 г. пражывала 75% яўрэяў з ліку тых, якія не паспелі эвакуіравацца ў чэрвені 1941 г. У Эстоніі, Літве і Латвіі ў той час знішчэнне яўрэяў набліжалася да канца. Іншай прычынай замаруджання генацыду яўрэйскага насельніцтва была адсутнасць выразных антысеміцкіх настрояў на гэтай тэрыторыі. Яўрэі, якія ўцяклі з гетаў у лес, стваралі свае партызанскія атрады, карыстаючыся дапамогай мясцовага беларускага насельніцтва. Больш складаным было становішча яўрэяў на тэрыторыі, якая падлягала вайсковаму праўленню. Там гітлераўцы атаясамлівалі іх з бальшавізмам. Ва ўсходняй Беларусі пытанні яўрэйскага насельніцтва знаходзіліся ў выключнай кампетэнцыі камандзіра СС і паліцыі Эрыха фон дэм Баха. У 1942 г. пры ўдзеле літоўскай і латышскай

www.kamunikat.org

паліцыі была там ліквідавана большасць гетаў. Выратаваліся толькі тыя яўрэі, якія апынуліся на кантраляваных савецкімі партызанамі абшарах.

У Беластоцкай акрузе, якая была далучана да Усходняй Прусіі, нямецкія ўлады З-за яе нацыянальнай разрозненасці кіраваліся падобнай логікай як на тэрыторыі заходняй Беларусі. Пасля некалькіх тыдняў антыбеларускага тэрору, выкліканага людзьмі, якія працавалі ў мясцовай адміністрацыі і дапаможнай паліцыі, немцы пачалі падтрымліваць беларусаў. У жніўні 1941 г. акупанты дазволілі стварыць Беларускі нацыянальны камітэт, кіраўніцтва якога пераняў дэлегаваны Шчорсам Чэслаў Ханяўка. Пачаткова дзейнасць камітэта абмяжоўвалася да ладжання сходаў, лекцый, канцэртаў. Восенню 1941 г. пачаліся курсы для ахвотных працаваць у адміністрацыі, каб такім чынам аслабіць перавагу палякаў. Дзеячы камітэта дабіліся таксама дазволу на эксгумацыю беларусаў, якія былі забіты ў выніку даносаў у чэрвені 1941 г., і перапахаванне трупаў з месцаў экзекуцыі на праваслаўныя могільнікі. З 1942 г. камітэт арганізаваў курсы нямецкай мовы, распараджаўся кравецкім кааператывам, хорам, аркестрам, тэатрам, выдаваў газету “Новая дарога”, вёў дабрачынную дзейнасць у карысць выселеных жыхароў з ваколіц Белавежскай пушчы. Летам 1943 г. на грамадскай базе камітэта ў Беластоку было створана Беларускае нацыянальнадэмакратычнае аб’яднанне (БНДА), аддзелы якога паўсталі ў шасці мястэчках акругі. Была гэта арганізацыя з палітычнымі імкненнямі і ўсеагульнага значэння. У адрозненне ад камітэтаў, якія мелі лакальны характар і галоўным чынам займаліся сацыяльнымі і культурнымі справамі, БНДА апекавалася арганізацыяй ваенізаваных груп Беларускай самаахвовы. Ствараліся яны галоўным чынам для аказання супраціўлення савецкім партызанам, якіх акцыі былі прычынай жудасных нямецкіх рэпрэсій на мірным насельніцтве. Акупанты прабавалі выкарыстаць БНДА для ўраўнаважання польскіх уплываў у адміністрацыі і дапаможнай паліцыі. Хаця адносіны паміж палякамі і беларусамі ставаліся штораз горшыя, аднак настроі беларускіх мас не схіляліся ў бок пранямецкіх груповак. Злачынствы і тэрор акупанта нейтралізавалі адмоўнае ўражанне, якое пакінула па сабе савецкая сістэма. Папулярнасці нацыянальных арганізацый не спрыяла таксама змена сітуацыі на фронце ў другой палове 1943 г. На населенай беларусамі тэрыторыі пачыналася ажыўленне камуністычнага падполля.

Уздзеянне як камуністычнага, так і нацыянальнага руху датычыла адносна невялікай часткі беларускага насельніцтва. Большасць беларусаў звычайна хацела толькі выжыць, ухіляючыся ад

www.kamunikat.org

усяго, што магло б перашкодзіць дасягнуць гэту мэту.

Паражэнне Нямеччыны пад Масквой у 1941 г. і перспектыва працяглай вайны прымусілі немцаў шукаць розныя варыянты палітыкі дзеля забеспячэння шляхоў зносін і гаспадарчай эксплуатацыі заваяваных тэрыторый. Прымаліся адпаведныя меры, каб пашырыць сістэму калабарацыянізму, адцягнуць людзей ад буйнеючага партызанскага руху. З крымінальнікаў і савецкіх ваеннапалонных розных нацыянальнасцей ствараліся вайсковыя атрады, якіх камандзірамі назначаліся нямецкія афіцэры. У Беларусі дыслацыраваліся падраздзяленні г.зв. Рускай вызваленчай нацыянальнай арміі, якой камандаваў брыгадэнфюрэр СС Браніслаў Камінскі. РВНА складалі надзвычай дэмаралізаваныя салдаты, якіх адзінай мэтай былі грабеж і забойствы. Падраздзяленні Камінскага выкарыстоўваліся немцамі для пацыфікацыі беларускі вёсак. У жніўні 1944 г. былі яны высланы ў Варшаву, у якой успыхнула антынямецкае паўстанне.

У палове 1942 г. немцы прынялі тактыку павышэння па службе правадыроў беларускіх нацыянальных груповак, ствараючы такім чынам ілюзію суб'ектных адносін да іх дзяржаўных імкненняў. У верасні 1942 г. Вільгельм Кубэ аб'явіў адозву да беларусаў, у якой гарантаваў свабоднае развіццё краіны. Аднак гэта не мела ніякага ўплыву на пазіцыю грамадства. Зацікаўленне да адозвы праявілі толькі дзеячы, якія гуртаваліся ў адзінай легальнай арганізацыі - Беларускай народнай самапомачы (БНС). Узнікла яна ў канцы 1941 г. і мела свае структуры ва ўсіх акругах і раёнах. Кіраванне БНС немцы даручылі Івану Ермачэнку, які ў Беларусі быў малавядомым чалавекам. Яго галоўным козырам быў поўны давер нямецкага боку. У кіраўніцтве БНС апынуліся аднак такія вядомыя дзеячы, як Барыс Рагуля, Юрый Сабалеўскі, Станіслаў Станкевіч, Іван Касяк, Антон Адамовіч, Юльян Саковіч. У ліпені 1942 г. была створана Галоўная рада з дванаццаці чалавек, якая мела быць быццам бы ценевым кабінетам, гатовым пераняць кіраванне краінай з нямецкіх рук. Рада стварыла аддзелы, якія адпавядалі структурам выканаўчай улады. Былі гэта, між іншым, ведамствы вайсковых спраў, унутранай палітыкі, прапаганды, асветы, культуры і аховы здароўя. Рады БНС разам з адпаведнымі аддзеламі паўсталі таксама на ўзроўні акруг.

Немцы дазволілі таксама карыстацца ў публічных месцах беларускімі нацыянальнымі сімваламі - бел-чырвона-белым сцягам і гербам Пагоня. Гэтыя сімвалы маглі таксама быць змешчаны на мундзірах беларускай дапаможнай паліцыі. Акупанты дазволілі таксама заснаваць Беларускае навуковае таварыства і беларускую

Лігу жанчын. У жніўні 1942 г. пачалася арганізацыя беларускіх сярэдніх школ, планавалася адкрыццё універсітэта ў Мінску. У жніўні аб'яўлена было аб узнікненні незалежнай ад Маскоўскай патрыярхіі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. На ўсходзе краіны пачалася дзяльба калгаснай зямлі паміж сялян.

На працягу некалькіх месяцаў ажыццяўлялася канцэпцыя акупацыйнай палітыкі генеральнага камісара Вільгельма Кубэ, якая прадугледжвала падтрымку беларускаму нацыяналізму ў якасці метаду ўстаранення ўплываў рускага камунізму - ідэалагічнай асновы савецкага супраціўлення. Немцы перш за ўсё былі зацікаўлены стварэннем беларускіх антыпартызанскіх ваенных фарміраванняў, якія ў пачуцці службы свайму народу ў сапраўднасці вялі б вайну ў абароне нямецкіх інтарэсаў.

У палове 1942 г. пачалося арганізаванне атрадаў Беларускай самаахова. Меркавалася стварыць корпус у складзе трох дывізій. Фармальна гэтае войска складала ўзброеныя сілы падначаленыя шэфу Беларускай народнай самапомачы Івану Ермачэнку, аднак у аперацыйных справах падлягала камандзіру СС і паліцыі Генральнай акругі Беларусь. У жніўні пачала працу беларуская афіцэрская школа ў Мінску, а ў некалькіх іншых мясцовасцях адкрыліся падафіцэрскія курсы. Камендантам афіцэрскай школы стаў былы афіцэр Войска Польскага Францішак Кушаль. За кароткі час перападрыхтоўку прайшлі некалькі тысяч мужчын, якія мелі складаць кадры беларускага корпуса.

Восенню 1942 г. немцы, сумняваючыся ў лаяльнасці беларускага войска,ператварылі яго падраздзяленні ў паліцэйскія фарміраванні. Ермачэнка быў пазбаўлены тытула генеральнага каменданта і прымушаны пакінуць Беларусь. Быў ліквідаваны штаб, а камандзірам забаронена было карыстацца афіцэрскімі званнямі. У рамках БНС захаваўся аднак вайсковы сектар і далей вялася вярбоўка ў падраздзяленні Беларускай самааховы, якія пасля дыслакацыі былі аддадзены пад кантроль мясцовых камендантаў СС і паліцыі. Выкарыстоўваліся яны да акцый супраць савецкай партызанкі, да аховы чыгункі і выконвання іншых паліцэйскіх абавязкаў. Іх значэнне было зведзена да ролі дапаможнай паліцыі.

На пачатку 1943 г. сярод галоўнага камандавання СС і паліцыі перамагла канцэпцыя, што самым паспяховым метадам утрымання ладу і парадку ў Беларусі павінна быць жорсткая пацыфікацыя ўсялякіх праяваў непаслухмянасці і падтрымкі руху супраціўлення. Палітычныя канцэсіі ў карысць беларускага нацыянальнага руху ў такой сітуацыі аказаліся непатрэбнымі, а нават шкоднымі. У сакавіку

дзейнасць Беларускай народнай самапомачы была абмежавана да арганізацыі дабрачынных акцый і аказвання дапамогі мірнаму насельніцтву пацярпеламу ад ваенных дзеянняў. Месяц пазней ліквідавана была Беларуская самаахова, а яе салдаты фармальна былі пераведзены ў дапаможную паліцыю.

Пацыфікацыйныя акцыі ў Беларусі, якія вяліся на аснове загаду Гімлера, мелі на мэце ачышчэнне выдзеленай тэрыторыі ад партызан, яўрэяў і насельніцтва, якое падазравалася ў аказванні дапамогі руху супраціўлення. Аперацыі рыхтаваліся некалькі тыдняў. Акцыя, якая праводзілася на дадзеным абшары, атрымоўвала свой крыптанім, а паасобным падраздзяленням назначаліся заданні. У штабах СС і паліцыі ды Вермахта спакойна планавалася зніштажэнне паасобных вёсак і іх жыхароў. У рамках калектыўнай адказнасці выносіліся смяротныя прыгаворы для соцень тысяч чалавек. Падчас пацыфікацыі ў Слонімскай акрузе ў снежні 1942 г. жыццё страціла больш за 6 тыс. вяскоўцаў, а ў Слуцкай акрузе ў сакавіку 1943 г. расстраляных было 13 тыс. чалавек, у ваколіцы Барысава ў чэрвені 1943 г. загінула 13 тыс. мірных грамадзян з навакольных вёсак. Да канца акупацыі праведзеных было звыш 60 вялікіх пацыфікацыйных акцый, у ходзе якіх спаленых было 627 вёсак, а іх жыхары былі знішчаны. У гэтых акцыях прымала ўдзел некалькі тысяч украінскіх, літоўскіх, латышскіх паліцыянтаў, батальён польскай паліцыі і Руская вызваленчая нацыянальная армія Бранiслава Камінскага. Апрача вялікамаштабных акцый, якія ахоплівалі ўвесь раён і для выканання якіх прыцягваліся значныя сілы, праведзеных было звыш 80 карных экспедыцый з выкарыстаннем мясцовых сіл. Іх маштаб і характар залежалі ад волі раённага камандзіра СС і паліцыі. Часам абмяжоўваліся яны да знішчэння насельніцтва толькі адной вёскі або нават да расстрэлу выпадкова выбраных яе жыхароў. У прынцыпе ўсім пацыфікацыйным акцыям спадарожнічалі рэквізіцыі маёмасці загінуўшых людзей.

Аперацыі, накіраваныя галоўным чынам супраць партызан, наносілі ўдар перш за ўсё па мірным насельніцтве. Ахвярамі найчасцей ставалі выпадковыя людзі, каб такім чынам запалохаць насельніцтва і адхіліць яго ад супрацоўніцтва з партызанамі. Партызаны ў сваю чаргу ў ходзе канцэнтрацыі нямецкіх сіл найчасцей пакідалі раёны “ачысткі” на час трывання аперацыі і менавіта таму паліцэйскавайсковыя акцыі не наносілі вялікіх страт савецкаму падполлю. Пасля адступлення пацыфікацыйных атрадаў партызаны нанава пераймалі кантроль над гэтымі абшарамі.

## Партызанскі рух

Савецкі партызанскі рух у Беларусі ў прынцыпе быў адным з франтоў змагання Чырвонай Арміі, да ўдзелу ў якім прыцягнута было, часта насуперак сваёй волі, мірнае насельніцтва. Дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б)Б ад 29 чэрвеня 1941 г. ускладвала на камуністаў абавязак арганізаваць дыверсійныя дзеянні і рух супраціўлення на занятых немцамі абшарах СССР. У акупаванай зоне былі пакінуты 508 дыверсійных груп і 4 560 камуністаў і камсамольцаў для неадкладнага ажыццяўлення задач вызначаных урадам і кіраўніцтвам партыі. Усе савецкія грамадзяне былі абавязаны выконваць указанні ўлад у галіне барацьбы з акупантам, а спробы ўхіляцца ад падтрымкі партызанскаму руху расцэньваліся як здрада савецкай радзіме.

Натуральнай грамадскай базай для ўзнікнення савецкага падполля былі шматлікія групы салдат і афіцэраў, якія не паспелі адступіць на ўсход летам 1941 г. і якім удалося выратавацца ад нямецкага палону. Свой лёс усведамлялі таксама дзеячы партыі і камсамола ды прадстаўнікі яўрэйскай інтэлігенцыі, якія апынуліся пад нямецкай акупацыяй. Для іх удзел у руху супраціўлення быў адным з шанцаў выжывання.

Да часу паражэння гітлераўскай арміі пад Масквой партызанскія дзеянні на тэрыторыі акупаванай Беларусі былі нязначныя. Многія пакінутыя савецкім камандаваннем групы былі ліквідаваны ў ходзе пацыфікацыйных акцый, якія праводзіліся аператыўнымі атрадамі Эйнзатцгрупы летам і восенню 1941 г. Перапалоханае тэрорам эсэсаўцаў і салдат мірнае насельніцтва неахвотна ўключалася ў падтрымку дзеянняў камуністаў. Ажыўленне і рост значэння партызанскага руху наступілі вясною 1942 г. Савецкае камандаванне спадзявалася чарговага наступлення ў напрамку Масквы і таму прыняло шэраг мер па дэзарганізацыі тылоў Вермахта. Ужо ў студзені 1942 г. у Беларусь, паза лінію фронту, былі перакінуты 33 групы, якія налічвалі 215 абучаных у дыверсійных акцыях салдат. У лютым падрыхтаваных да высылкі было 12 груп, у склад якіх уваходзіла 558 салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, а ў перыяд ад сакавіка да чэрвеня - чарговых 16 груп па 49 салдат кожная. Былі гэта кадры для будучых вялікіх партызанскіх злучэнняў. Радавыя салдаты прызываліся з ліку мясцовага насельніцтва. У тылах Маскоўскай, Прыволжскай і Уральскай ваенных акруг сістэматычна абучаліся сотні салдат з прызначэннем арганізаваць партызанскую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Большасць перапраўленых цераз

www.kamunikat.org

лінію фронту чырвонаармейцаў складалі беларусы, прызваныя ў Чырвоную Армію летам 1941 г.

Партызанскім рухам у Беларусі кіраваў ЦК КП(б)Б, якога сядзіба знаходзілася ў Маскве. Ад сакавіка 1942 г. існаваў спецыяльны палітычнаваенны орган - ПаўночнаЗаходняя аператыўная група, які каардынаваў дзеянні Чырвонай Арміі і партызан у Беларусі. У выніку зімовага наступлення савецкіх войскаў у пачатку 1942 г. фронт клінам урэзаўся ў паўночнаўсходнюю тэрыторыю Віцебшчыны, дзе існавала сфарміраваная структура партызанскага руху. Звыш паўгода між Усвятамі і Веліжам усталяваўся калідор шырынёю больш за сорак кіламетраў, вядомы ў савецкай гістарыяграфіі як Віцебскія вароты, цераз якія амаль бесперашкодна засылаліся на тэрыторыю акупаванай Беларусі людзі, ваеннае абсталяванне, сродкі сувязі і прапагандысцкія матэрыялы. Партызаны ў сваю чаргу рэквізавалі ў насельніцтва і выслалі на ўсход цераз Віцебскія вароты некалькі тысяч коней і быдла, каля 1,5 тыс. тон збожжа і звыш 20 тыс. чалавек прызвалі на службу ў Чырвонай Арміі. Пры дапамозе ваенных спецыялістаў у Беларусі было пабудаваных некалькі дзесяткаў палявых аэрадромаў, дзякуючы якім магчымае было пастаяннае забеспячэнне партызанскіх атрадаў зброяй і амуніцыяй.

У маі 1942 г. пры галоўным камандаванні Чырвонай Арміі быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, які ўзначаліў І сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. Штаб Панамарэнкі намячаў галоўныя напрамкі дыверсійнабаявых дзеянняў, прапагандысцкай працы і вызначаў палітыку ў адносінах да несавецкіх падпольных структур у Беларусі. Рэалізацыяй указанняў Цэнтральнага штаба займаўся Беларускі штаб партызанскага руху, якім кіраваў Пётр Калінін.

У другой палове 1942 г., у сувязі з шырокамаштабнымі пацыфікацыйнымі акцыямі немцаў, партызанскія рады папоўніліся вялікай колькасцю ахвотных змагацца з фашыстамі. Адбыўся таксама адваротны зрух. Тысячы маладых людзей трапілі ў Беларускую самаахову. Такім чынам у Беларусі ствараўся фронт унутранага канфлікту, на якім беларусы змагаліся паміж сабой за інтарэсы фашысцкага або камуністычнага таталітарызму.

Да канца 1942 г. партызанскі рух канцэнтраваўся галоўным чынам ва ўсходняй Беларусі. У 417 партызанскіх атрадах змагалася больш за 47 тыс. салдат. Амаль 47% падпольных сіл знаходзілася ў Віцебскай і Мінскай абласцях. У заходніх раёнах дзейнічала толькі некалькі дзесяткаў маналікіх атрадаў, якія сталі разбудоўвацца толькі ў канцы 1943 г., калі з усходу перапраўленых было 7 тыс. салдат.

Штаб Панамарэнкі, баючыся наступлення ў цэнтральным напрамку, загадаў знішчаць чыгуначны рухомы састаў і пуці на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Паводле савецкіх крыніц, партызаны за час акупацыі знішчылі больш за 10 тыс. ваенных транспартаў. Найбольш акцый праведзеных было ад мая да верасня 1942 г. Канцэнтрацыя дыверсійных дзеянняў у Беларусі аказалася памылкай, паколькі нямецкае наступленне адбылося на паўднёвым фронце. Вялікім поспехам, аднак, быў параліч чыгуначнага транспарту ў жніўні і верасні 1943 г., што давяло да рашучага скарачэння нямецкіх рэзерваў на цэнтральным участку фронту.

Чарговай важнай задачай, даручанай партызанам штабам Панамарэнкі летам 1942 г., была ліквідацыя ўстаноў гміннай адміністрацыі і працуючых там служачых разам з сем'ямі. Смяротнаму пакаранню падвяргаліся таксама настаўнікі беларускіх школ, солтысы, а нават сяляне, якім дасталася зямля ад распушчаных калгасаў. Яны знішчаліся як здраднікі савецкай радзімы і складалі пераважную большасць людзей, якіх савецкая гістарыяграфія лічыла "устаранёнымі партызанамі сіламі ворага". 70% ад агульнага ліку забітых савецкім падполлем цывільных грамадзян складалі члены сем'яў солтысаў, гмінных чыноўнікаў, настаўнікаў. Тэрор з боку партызан, хаця і прымушаў настаўнікаў уцякаць са школ, а чыноўнікаў - з устаноў, аднак застаўляў іх шукаць ахову ў беларускіх пранямецкіх арганізацыях.

Псіхалагічнае становішча, якое склалася пасля пераможных баёў Чырвонай Арміі ў 1943 г., спрыяла развіццю савецкага партызанскага руху. Дзеянні штаба Панамарэнкі ўздым грамадскіх настрояўператваралі ў новыя партызанскія брыгады. На працягу 1943 г. колькасць салдат, якія змагаліся ў партызанскіх падраздзяленнях, павялічылася ў 2,7 раза і ў канцы снежня перасягнула 150 тысяч, у тым ліку 37 тыс. дзейнічала ў заходніх абласцях. У 1943 г. у Беларусь паветраным шляхам было перапраўлена 43 тыс. штук стралковай зброі, вялікія колькасці мін, гранатаў, амуніцыі. У гэты перыяд на бок партызанаў перайшло 12 тыс. паліцэйскіх і былых салдат Беларускай самаааховы ды 2,5-тысячная Нацыянальная руская брыгада СС пад камандаваннем палкоўніка Радыёнава. Астатняе падраздзяленне прымала ўдзел у шматлікіх пацыфікацыях беларускіх вёсак, а пасля змены фронту было перайменавана ў І Антыфашысцкую партызанскую брыгаду.

У 1943 г. амаль 20% даваеннай (да 1941 г.) Беларусі апынулася пад кантролем партызан. На гэтай тэрыторыі ўся ўлада належала камандзірам партызанскіх атрадаў. У большай частцы акупаванай

рэспублікі нямецкая ўлада ўтрымоўвалася толькі ў гарадскіх цэнтрах. На Палессі, Віцебшчыне і Магілёўшчыне, багатымі вялікімі ляснымі і дрыгвяністымі масівамі ўзніклі г.зв. партызанскія рэспублікі, у якіх была ўзноўлена большасць установаў савецкай дзяржавы.

У заходніх абласцях Беларусі значны ваенны патэнцыял прадстаўляла польскае падполле. Армія Краёва (АК), як узброеная сіла, падначаленая польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане, мела ствараць умовы для адбудовы польскай дзяржавы ў межах да 17 верасня 1939 г. Пасля заключэння 30 ліпеня 1941 г. пагаднення паміж польскім і савецкім урадамі падпольныя атрады Саюза ўзброенай барацьбы (СУБ), пазней АК, сталі саюзнікамі савецкай партызанкі. Хаця ў падпісаным урадавым пагадненні не была дасягнута дамоўленасць наконт граніц, заключаная цэнтрам дамова абавязвала ў нізах. У 1942 г. камандзіры АК заключалі з камандзірамі савецкіх атрадаў асобныя пагадненні, якія рэгулявалі ўзаемныя адносіны і вызначалі тэрыторыю харчовага забеспячэння для кожнага падпольнага падраздзялення. Спарадычна, аднак, даходзіла да супольных акцый супраць немцаў. Акцыя “Вахляж” (“Веер”), якая была серыяй дыверсійных дзеянняў праводзімых СУБАК у 1942 г. на тэрыторыі былых усходніх ваяводстваў, мела, аднак, палітычны антысавецкі падтэкст, паколькі была дэманстрацыяй польскай прысутнасці на гэтым абшары. Каб не ўскладняць адносін з палякамі, савецкія ўлады да 1943 г. не разбудоўвалі свайго падполля ў заходняй Беларусі. Сітуацыя рашуча памянялася толькі пасля парвання дыпламатычных зносін паміж СССР і польскім урадам у красавіку 1943 г. Армія Краёва з саюзніцкага фарміравання стала тады “фашысцкім”, які Цэнтральны штаб партызанскага руху загадаў знішчаць у такой жа ступені як нямецкія сілы або падтрымоўваючыя іх дапаможныя беларускія падраздзяленні.

22 чэрвеня 1943 г. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выдаў інструкцыю для партыйных арганізацый на тэрыторыі заходняй Беларусі, у якой было сказана, што заходнія вобласці з’яўляюцца неадʼемнай часткай БССР часова акупаванай немцамі. У адпаведнасці з інструкцыяй, на гэтай тэрыторыі мелі права дзейнічаць толькі тыя арганізацыі, якія кіраваліся інтарэсамі БССР. Прытым дадзены быў загад ліквідаваць дзейнасць польскіх нацыяналістычных арганізацый, да якіх прылічана была і АК, ды арганізаваць польскае савецкае падполле. Адначасна рашэннем ЦК КП(б)Б перапраўленых было з усходняй Беларусі ў заходнюю 40 меншых атрадаў, якія папаўняліся мясцовым насельніцтвам.

Савецкае падполле пранікнула таксама і на Беласточчыну і

налічвала каля 6 тыс. салдат. На гэтай тэрыторыі не ствараліся структуры Польскай рабочай партыі. Абазначала гэта паслядоўнае ажыццяўленне савецкім урадам плана ўзнаўлення межаў з 1941 г. Узброеныя сутычкі паміж АК і савецкай партызанкай сталі непазбежнымі.

Пагаршэнню польска-савецкіх адносін у заходняй Беларусі ў 1943 г. спадарожнічала абвастрэнне польскабеларускага канфлікту. У выніку палітыкі падтрымкі беларусаў пры падборцы кадраў у адміністрацыі і дапаможнай паліцыі іх удзел у канцы 1943 г. узрос адпаведна да 80 і 60 працэнтаў. Беларуская мова ў гэтай частцы Беларусі стала дзяржаўнай, на ёй выходзіла большасць легальных газет, пабеларуску выкладалася большасць прадметаў у пачатковых і сярэдніх школах. Выразнае развіццё беларускага нацыянальнага руху камандаванне АК, асабліва Навагрудскай і Віленскай акруг, расцаніла як пагрозу для польскіх інтарэсаў. Выклікаць польскабеларускі канфлікт імкнуліся таксама немцы, прымаючы адпаведныя меры, напрыклад, вызваляючы з пасад палякаў, арганізуючы скрытыя забойствы прадстаўнікоў польскай і беларускай інтэлігенцыі, узмацняючы гэтым жа атмасферу недаверу і варожасці. Беларускія чыноўнікі, у выпадку канфлікту інтарэсаў, у прынцыпе прымалі рашэнні ў некарысць палякаў. Больш ахвотна высылалі яны на прымусовыя работы польскую моладзь чым беларускую. З-за росту беларускай перавагі ў структурах акупацыйнай улады АК адказала антыбеларускім тэрорам. У Лідскай акрузе канфлікт ператварыўся ў вайну, якой мэтай было знішчажэнне элітаў. Садзеянне АК і маючай перавагу ў гэтай акрузе польскай дапаможнай паліцыі давялі да фізічнай ліквідацыі большасці арганізатараў беларускага нацыянальнага жыцця - настаўнікаў, чыноўнікаў, дзеячаў Саюза беларускай моладзі. Камендант Навагрудскай акругі АК піша, што яго салдаты ў другой палове 1943 г. выканалі больш за 300 смяротных пакаранняў на беларусах, а на 80 чалавек зрабілі даносы ў гестапа, абвінавачваючы іх у камунізме (глядзі: Nowogrodczyzna w walce 1940-1945, Londyn 1976).

Асаблівасцю Навагрудчыны было таксама і тое, што амаль палову ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, з якім змагалася АК, складалі каталікі (у II Рэчы Паспалітай улады схільныя былі лічыць іх палякамі), а ў радах АК амаль 40% салдат складалі праваслаўныя беларусы.

Цяжка вызначыць, якую палітычную гульню вёў Вацлаў Іваноўскі. Працуючы на пасадзе бургамістра Мінска прыняў ён на работу ў магістрат двух афіцэраў разведкі АК, падтрымоўваў

дзейнасць польскага падполля на Міншчыне. Быў ён саветнікам генеральнага камісара Вільгельма Кубэ, старшынёю Беларускай рады даверу, якая прадстаўляла інтарэсы беларускага насельніцтва перад немцамі. Апынуўся ён у цэнтры сіл, якія будучыню Беларусі бачылі ў шчыльнай сувязі з Нямеччынай. Паралельны ягоны ўдзел у супрацоўніцтве з польскім падполлем быў ажыццяўленнем зусім адваротнай канцэпцыі, праявай веры ў магчымасць стварэння федэрацыі Польшчы і Беларусі як раўнапраўных суб'ектаў. Была гэта сярод беларускіх палітыкаў пазіцыя надта асаблівая, зважыўшы на тое, што польскі бок рашуча выказваўся за вяртанне становішча, якое існавала да 1939 г.

## Беларуская цэнтральная рада

Побач пацыфікацыі вёсак і тэрору ў адносінах да падазроных у супрацоўніцтве з партызанамі асоб у палове 1943 г. нямецкія акупацыйныя ўлады вярнуліся да палітыкі падтрымкі беларускага нацыянальнага руху і стварання антысавецкай грамадскай базы. Вясною 1943 г. пачалася падрыхтоўка да заснавання беларускай маладзёжнай арганізацыі, якой узорам мелі быць падобныя арганізацыі ў прыбалтыйскіх краінах. Абучэнне кадраў будучай арганізацыі было даверана бязмежнаму прыхільніку ідэі супрацоўніцтва з Нямеччынай Фабіяну Акінчыцу. Былі адкрыты два падрыхтовачныя цэнтры - для дзяўчат у Драздах каля Мінска, а для хлопцаў - у Альбярціне каля Слоніма. 22 чэрвеня 1943 г. аб'яўлена было заснаванне Саюза беларускай моладзі (СБМ). Лідэр СБМ Міхал Ганько падначалены быў генеральнаму камісару Вільгельму Кубэ; яму падлягалі акруговыя кіраўнікі, а ім у сваю чаргу падначальваліся раённыя кіраўнікі. Члены СБМ атрымалі мундзіры падобныя на форму нямецай моладзі з арганізацыі Гітлерюгенд. Паводле статута, мэтай СБМ была падрыхтоўка маладога пакалення беларусаў да выканання нацыянальнай місіі. Арганізацыя выдавала свой часопіс "Жыве Беларусь". Лідэры ніжэйшых структур вербаваліся з ліку гімназічнай моладзі. Праходзілі яны спецыяльныя курсы, набліжаныя да ваеннага абучэння. СБМ гуртаваў гарадскую і маламестачковую моладзь. У гэтым асяроддзі ў савецкіх партызан былі абмежаваныя магчымасці знішчаць варожыя сабе палітычныя структуры і таму СБМ даволі хутка стаў шматлікай арганізацыяй - у канцы 1943 г. налічваў 40 тыс. членаў і меў свае структуры на ўсёй тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася пад нямецкім кантролем.

Разам з заснаваннем маладзёжнай арганізацыі Кубэ стварыў

таксама Беларускую раду даверу (БРД), якая мела быць заменнікам палітычнага прадстаўніцтва беларусаў перад нямецкімі ўладамі і, праўдападобна, зародкам нейкага калабарацыянісцкага ўрада. Старшынёю БРД стаў Вацлаў Іваноўскі, а ў яе складзе апынуліся таксама лідэры СБМ - Міхал Ганько і Надзея Абрамава. Радзе цяжка было дасягнуць давер беларусаў, паколькі ў той час СС, паліцыя і Вермахт не пераставалі пацыфікаваць беларускія вёскі. Чарговая спроба цывільнага праўлення стварыць антыбальшавіцкі беларускі фронт закончылася беспаспяхова. Аўтар гэтай палітычнай канцэпцыі Вільгельм Кубэ загінуў 22 верасня 1943 г. у выніку замаху праведзенага савецкім падполлем. Яго наступнікам стаў ініцыятар жорсткіх пацыфікацыйных акцый, камандзір СС і паліцыі ў Генеральнай акрузе Беларусь Курт фон Готберг. Са згоды Готберга 7 снежня 1943 г. старшыня Беларускай рады даверу Вацлаў Іваноўскі быў у Мінску забіты.

Новы генеральны камісар Акругі Беларусь не быў прыхільнікам стварання ўмоў для развіцця беларускага нацыяналізму ў якасці процівагі для савецкага падполля. Затое быў ён зацікаўлены ў падтрымцы розных сіл, якія па натуральных прычынах схільны былі весці вайну з СССР. На Навагрудчыне немцы заключылі з тамашнімі камандзірамі АК - палкоўнікам Янушам ПраўдзіцамШляскім, капітанам Адольфам Пільхам, паручнікам Юзэфам Сьвідам некалькі пагадненняў аб узаемнай неагрэсіі і забеспячэнні атрадаў АК ў зброю пры ўмове, што будзе яна скарыстана ў барацьбе з савецкімі партызанамі. Гэтыя пагадненні мелі выключна вайсковы характар, таму што афіцыйна навагрудскае злучэнне АК знаходзілася ў становішчы вайны з немцамі. Рашэнні лакальных камандзіраў АК ніколі не былі адобраны Галоўнай камендатурай, паколькі ішлі яны ўразрэз з планамі акцыі “Бура” і перакрэслівалі яе палітычны сэнс.

У выніку паляпшэння польсканямецкіх адносін на Навагрудчыне колькасць падпольшчыкаў у тамашніх падраздзяленнях узрасла да 8 тыс. салдат. Вярбоўка часта праводзілася па прынцыпе прызыву маладых мужчын вызначанага ўзросту. У Лідскай акрузе савецкае падполле на практыцы было выцеснена, а абвінавачаныя ў камунізме тамашнія беларускія дзеячы былі ў большасці забіты.

Становішча на фронце прымусіла немцаў пакарыстацца таксама беларускім людскім патэнцыялам. Восенню 1943 г. аб’яўлены быў прызыў мужчын 1922-1924 гадоў нараджэння ў беларускую дапаможную паліцыю. У казармах апынулася 20 тыс. чалавек, а паасобныя атрады ўзначалілі нямецкія афіцэры і падафіцэры. Самастойныя батальёны беларускай дапаможнай паліцыі пачалі

www.kamunikat.org

ствараццa таксама і ў Беластоцкай акрузе, якая была ў складзе Усходняй Прусіі. Прымусовыя рэкруты служылі выключна мілітарным мэтам Рэйха. З прычыны масавага дэзерцірства навабранцаў боегатоўнасць беларускіх паліцэйскіх падраздзяленняў была невялікая. Менавіта таму было вырашана стварыць беларускія ваенныя фарміраванні ў якасці ўзброеных сіл падлеглых нейкаму беларускаму палітычнаму цэнтру. Такі марыянетачны ўрад у сапраўднасці мог быць толькі шырмай для нямецкіх кіруючых цэнтраў. 21 снежня 1943 г. з удзелам нямецкіх акупацыйных улад была створана Беларуская цэнтральная рада (БЦР), названая афіцыйнай прапагандай "прадстаўніцтвам беларускага народа". Яе старшынёй быў прызначаны Радаслаў Астроўскі, які раней супрацоўнічаў з немцамі ў змаганні з савецкім падполлем на Смаленшчыне. БЦР, так як раней і СБМ, была поўнасцю падпарадкавана генеральнаму камісару, які вызначаў старшыню Рады і яе членаў.

БЦР атрымала вялікія сродкі для аказвання грамадскай апекі, падтрымкі культуры і на прапаганду. Астроўскі часта звяртаўся да грамадства з адозвамі, заклікаў партызан здавацца і абяцаў ім амністыю. Нямецкая прапаганда прадстаўляла яго як правадыра беларускага народа, які змагаецца за вызваленне радзімы з-пад маскоўскага бальшавізму.

У студзені 1944 г. праведзена была рэарганізцыя Рады. Пры Радзе быў створаны вайсковы рэферат, якога шэфам Готберг прызначыў Францішка Кушаля. 6 сакавіка Астроўскі выдаў шырока распаўсюджанае ў друку і распрагандаванае з дапамогай плакатаў распараджэнне, якое прызывала ўсіх мужчын 1908-1924 гадоў нараджэння на службу ў падраздзяленнях Беларускай краёвай абароны (БКА). Распараджэнне забавязвала беларусаў, каб на працягу трох гадзін з моманту даручэння павесткі ставіцца ў прызыўны пункт. Непаслухмянасць лічылася дэзерцірствам і падвяргалася судоваму пакаранню. Стварэнне БКА пачалося некалькі дзён пазней, пасля адабрэння праекта ўладамі Рэйха ў Берліне.

Вайсковыя камісіі БКА былі створаны ў Мінску, Баранавічах, Слуцку, Навагрудку, Вілейцы, Слоніме, Глыбокім. Пасля аб'яўлення прызыву ў "беларускае войска" частка прызыўнікоў уцякла да партызан, але ў прызыўныя камісіі з'явілася таксама 40 тыс. мужчын. Паколькі немцы не спадзяваліся так вялікага прытоку навабранцаў, загадалі яны вайсковым камісіям частку прызыўнікоў адаслаць дадому. Завербавана тады 28 тыс. салдат, з якіх створана было 45 батальёнаў, галоўным чынам пяхотных. У той час на бок партызан

перайшла Нацыянальная руская брыгада СС Радыёнава. Баючыся дэзерцірства немцы даставілі атрадам БКА столькі зброі, колькі неабходна было для абучэння. Па гэтай прычыне салдаты выкарыстоўваліся галоўным чынам пры будове ваенных аб'ектаў. Немцы не мелі дастатковай колькасці афіцэраў і падафіцэраў, каб згуртаваны ў БКА людскі патэнцыял скарыстаць для барацьбы з партызанамі. У палове чэрвеня ў Мінску адкрылася афіцэрская школа для 280 слухачоў, але ўжо два тыдні пазней горад заняла Чырвоная Армія.

27 чэрвеня, на некалькі дзён да ўступлення савецкіх войскаў у Мінск, Астроўскаму ўдалося давесці да склікання Другога Усебеларускага кангрэса (першы адбыўся ў снежні 1917 г.), з удзелам прадстаўнікоў беларускіх асяроддзяў з усёй тэрыторыі акупаванай немцамі Еўропы. Удзельнічала ў ім 1039 дэлегатаў. Кангрэс аб'явіў сябе органам, які працягвае палітычныя традыцыі Беларускай Народнай Рэспублікі, БЦР палічыў адзінай легальнай уладай у Беларусі, а БССР назваў творам маскоўскага імперыялізму. Усе дэкларацыі, таксама як і парадак пасяджэння Кангрэса, былі раней узгоднены са службай бяспекі Рэйха. Прапагандысцкая акцыя вакол Кангрэса мела ўказаць беларускаму грамадству, што ў Беларусі ёсць свой уласны ўрад, адобраны нацыянальным прадстаўніцтвам, што нямецкае войска - гэта часова размешчаная саюзніцкая армія, а ўступаючая Чырвоная Армія з'яўляецца агрэсарам. Два дні пасля заканчэння Кангрэса з Мінска эвакуіраваліся БЦР ды частка афіцэраў і падафіцэраў БКА. На месцы засталіся радавыя салдаты, якія разышліся па дамах, калі распалася ўлада, што прызвала іх на вайсковую службу. Частка з іх неўзабаве трапіла ў Чырвоную Армію, частка ў экстранным парадку была асуджана савецкімі ваеннымі трыбуналамі.

Рада БЦР з паловы ліпеня 1944 г. працягвала дзейнасць у Берліне, дзе немцы хацелі выкарыстаць яе для ўздзеяння на некалькі тысяч рабочых, вывезеных на прымусовыя работы ў Нямеччыну, на актывістаў СБМ, якія дабравольцамі прыбылі на тэрыторыю Рэйха, ды на некалькі дзесяткаў тысяч уцекачоў, якія баяліся рэпрэсій з боку савецкіх улад.

## Ваенныя страты

Паводле савецкіх крыніц ад 1945 г., з чэрвеня 1941 г. да канца 1944 г. у выніку вайны і нямецкай акупацыі загінула 2 219 317 жыхароў Беларусі. Гэты лік тычыцца толькі гэтых зямель, якія ў 1944

www.kamunikat.org

г. увайшлі ў склад БССР. У савецкай літаратуры, аднак, адсутнічаюць верагодныя калькуляцыі, на падставе якіх вызначана была велічыня людскіх страт. Перш за ўсё бракуе даных аб колькасці жыхароў Беларусі ў чэрвені 1941 г. У момант выбуху вайны ў Сібір імчаліся, між іншым, эшалоны з жыхарамі Беларусі, а ў турмах НКУС знішчаліся сапраўдныя і ўяўныя ворагі савецкай улады.

У ліку 2,2 млн. змяшчаецца 810 тыс. ваеннапалонных загінуўшых на тэрыторыі Беларусі, з якіх не ўсе былі жыхарамі рэспублікі да 1941 г. Большасць даследчыкаў карыстаецца дакладным лікам забітых - 1 409 225 чалавек. Гэтыя ж крыніцы паведамляюць, што ў чэрвені 1945 г. каля 0,5 млн. жыхароў усходняй Беларусі было прызваных у Чырвоную Армію, а 1,5 млн. эвакуіравалася ў Расію. Паколькі яшчэ працягваліся ваенныя дзеянні, не маглі вярнуцца на радзіму ні салдаты з фронту, ні цывільныя асобы, вывезеныя ўлетку 1941 г. Падводзячы вынікі можна сказаць, што страты насельніцтва ў 1945 г. павінны складаць каля 4 млн. дюдзей. Савецкая гістарыяграфія не дае адказу на пытанне: колькі людзей загінула ў барацьбе з немцамі, колькі ў выніку масавых расстрэлаў летам 1941 г., а колькі ў час масавых пацыфікацый у 1942-1944 гадах, колькі асоб загінула ў канцэнтрацыйных лагерах на тэрыторыі Беларусі, а колькі ў выніку рэпрэсій савецкага падполля. Не вядомы таксама лік ахвяр польскабеларускага і польска-савецкага канфліктаў, як і нацыянальны склад жыхароў Беларусі, якія страцілі жыццё падчас нямецкай акупацыі.

Да вайны ў Беларусі жыло каля 700 тыс. яўрэяў. Многія з іх эвакуіраваліся ў 1941 г. на ўсход. Большасць з тых, што засталіся, была знішчана. У канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Беларусі, асабліва ў Трасцянец каля Мінска, завозіліся яўрэі з усёй Еўропы. Дзесяце тысяч чалавек, загінуўшых у Трасцянцы, былі жыхарамі розных краін.

Падчас нямецкай акупацыі з Беларусі было вывезена на прымусовыя работы ў Нямеччыну амаль 385 тыс. маладых людзей. Толькі 120 тыс. вярнуліся дамоў, частка загінула ў выніку альянцкіх бамбардзіровак прамысловых цэнтраў на тэрыторыі Рэйха, а частка вырашыла не вяртацца ў Савецкі Саюз.

У 1944-1945 гадах працягваўся прызыў рэкрутаў у Чырвоную Армію. Завербавана тады 600 тыс. чалавек. Пачаліся таксама дэпартацыі абвінавачаных у калабарацыянізме з акупантам. Менавіта таму памер людскіх страт - 2,2 млн. ахвяр - здаецца быць няпэўным З-за таго, што ў тадышніх умовах не было ніякіх шанцаў сумленна іх вызначыць. Аднак савецкая гістарыяграфія прыняла гэты

лік як неаспрэчны факт. Бясспрэчным у сваю чаргу з'яўляецца тое, што З-за жорсткасці нямецкай акупацыйнай сістэмы ў Беларусі і татальнага характару вайны, якую вялі партызаны ў тыле ворага, лік ахвяр сярод мірнага насельніцтва быў незвычайна высокі ў параўнанні з іншымі краінамі акупаванай Еўропы. Беларусь знаходзілася ў зоне шырокага фронту змагання паміж двума таталітарызмамі, якія не зважалі на людскія кошты, і таму такімі вялікімі аказаліся памеры трагедыі пражываючага на гэтай тэрыторыі народа.

Апрача людскіх страт вайна і акупацыя давялі да зруйнавання гаспадаркі Беларусі. Згарэлі больш за дзвесце гарадоў і мястэчак. Найбольш пацярпелі Мінск і Віцебск, у якіх знішчэнне будынкаў і гарадской інфраструктуры дасягнула 80-90 працэнтаў. Частку страт ва ўсходніх абласцях нанесла Чырвоная Армія ў час адступлення ўлетку 1941 г. Наогул падчас II сусветнай вайны ў Беларусі спаленых было 9 200 вёсак, амаль 1,2 млн. будынкаў. Усе змагаючыяся бакі рэквізавалі ў беларускіх сялян 61% усіх коней, 69% быдла і ажно 89% свіней.

Партызанскія дзеянні, у адпаведнасці з загадам савецкага камандавання, таксама заключаліся ў разбурэнню ўсяго, што магло служыць узмацненню ваеннага патэнцыялу Нямеччыны. Найбольшыя страты гаспадарка Беларусі пацярпела ў час эвакуацыі прамысловых аб'ектаў на ўсход летам 1941 г. Астатнія вартасныя аб'екты забралі немцы адступаючы з Беларусі ў 1944 г. Менавіта таму ў 1945 г. велічыня прамысловай вытворчасці Беларусі склала толькі 20% даваеннай магутнасці.

У выпадку Беларусі II сусветная вайна мела таксама далейшыя адмоўныя паслядоўнасці. Краіна засталася без нацыянальнай эліты, частка якой загінула ў час акупацыі, частка эвакуіравалася з нямецкай арміяй, а астатнія неўзабаве апынуліся ў савецкіх канцэнтрацыйных лагерах. У Беларусі не стала сіл, якія маглі б хаця прыпамінаць аб ідэі незалежнасці, аб сваіх нацыянальных сімвалах. Усё гэта было акампраметаванае ў час нямецкай акупацыі, што старанна выкарыстала савецкая прапаганда, прадстаўляючы кожную думку аб Беларусі, якая не была б часткай савецкага свету, як нацыянальную здраду і праяву нацыяналістычнафашысцкай тэндэнцыі. Змаганне паміж савецкім і нацыянальным інтарэсамі не закончылася ў 1944 г. Пераможны савецкі бок пачаў знішчаць усё, што ў будучым магло б паспрыяць адраджэнню беларускіх нацыянальных імкненняў.

# Уніфікацыя палітычнай і гаспадарчай сістэмы БССР

## Карэктура межаў і перасяленні

Ад пачатку вайны з Нямеччынай савецкі ўрад прытрымоўваўся погляду аб неабходнасці вяртання да межаў СССР з чэрвеня 1941 г. Нічога, аднак, не згадвалася пра межы савецкіх рэспублік. Непасрэдна пасля вызвалення Беларусі Сталін прад'явіў прапанову змяніць межы рэспублікі з Расіяй. У жніўні гатовы быў праект передачы Расійскай Федэрацыі Полацкай вобласці. Дзякуючы настойлівым стараннем І сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнкі, падмацаваным аргументамі аб ахвярнасці насельніцтва Беларусі ў барацьбе з нямецкім акупантам, беларускім камуністам удалося абараніць усходнія граніцы рэспублікі.

Хаця Беларусь апынулася ў ліку дзяржаўзаснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, аднак не мела яна ніякіх прыкмет дзяржаўнага суверэнітэту. Не мог многа сказаць Панамарэнка ў справе мяжы з Польшчай. Фарміравалася яна без удзелу беларускага боку. Няма доказаў на тое, што Сталін, ствараючы польскую Краёву Раду Нарадову ў канцы 1943 г. даручыў ёй пад апеку таксама Беласточчыну. Толькі ў сакавіку 1944 г. у ходзе пасяджэння Вярхоўнага Савета БССР яе старшыня Нічыпар Наталевіч прыгадаў аб магчымасці передачы Беластоцкай вобласці Польшчы. Аднак ніякія канкрэтныя рашэнні ў гэтай справе не прымаліся. Панамарэнка патрабаваў пакінуць у межах Беларусі Бельскі павет. Прыналежнасць гэтых зямель не была яшчэ вырашана ў ліпені 1944 г., бо на працягу больш чым двух тыдняў пасля вызвалення Беласточчыны на тэрыторыі Бельскага павета стваралася савецкая адміністрацыя. Толькі 10 жніўня 1944 г. Брэсцкі абласны камітэт КП(б)Б выдаў інструкцыю аб вывадзе работнікаў савецкай адміністрацыі і партыйнага апарату з Кляшчэлеўскага і Сямятыцкага раёнаў. Іх месца занялі людзі, дэлегаваныя ўпаўнаважаным Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення (ПКНВ) на Беластоцкае ваяводства Леанардам Барковічам. Аднак Вярхоўны Савет БССР пастанову аб передачы Польшчы большасці зямель Беластоцкай вобласці фармальна прыняў толькі 20 жніўня. З астаткаў Беластоцкай вобласці, да якіх былі далучаны тры раёны Баранавіцкай і адзін Брэсцкай абласцей, была створана Гродзенская вобласць.

У 1946-1955 гадах мяжа паміж БССР і Польшчай

карэкціравалася неаднойчы. Па загаду цэнтральных савецкіх улад дзяржаўная мяжа перасоўвалася на ўсход чатыры разы, перадаючы Польшчы некалькі дзесяткаў вёсак Сапоцкінскага, Бераставіцкага і Свіслацкага раёнаў, якіх жыхары ў пераважнай большасці былі каталікамі. Савецкія ўлады прытрымоўваліся погляду, што самым карысным вырашэннем для СССР, якое забяспечыць стабільнасць заходніх граніц, будзе перасяленне палякаў з Літвы, Беларусі і Украіны. 14 верасня 1944 г. паміж урадам БССР і ПКНВ было заключана пагадненне аб рэпатрыяцыі беларускага насельніцтва з Польшчы і польскага з Беларусі. У выніку ў 1945-1947 гадах з Беларусі выехала 274 163 чалавек. Большасць выехаўшых з Беларусі складалі палякі, хаця выязджалі таксама і беларусы, і яўрэі. Рух у другі бок быў намнога меншы. З Польшчы ў гэты час выехала 36 388 чалавек беларускай нацыянальнасці, аднак не ўсе пасяліліся ў Беларусі. Некалькі тысяч рэпатрыянтаў, насуперак іхняй волі, было вывезеных у глыб Расіі. У Польшчы засталося каля 135 тыс. беларусаў праваслаўнага веравызнання і каля 200 тыс. каталікаў, якія карысталіся беларускімі гаворкамі і якіх нацыянальная свядомасць паступова развівалася ў напрамку польскасці.

Нельга, аднак, вызначыць колькасць беларусаў, якія ў адпаведнасці з пагадненнем аб рэпатрыяцыі ад 14 верасня 1944 г. перасяліліся ў Польшчу, запісваючыся палякамі. Так як і большасць рэпатрыянтаў пасялілі іх у паўночных і заходніх ваяводствах. Некаторыя з іх аб сваёй прыналежнасці да беларускага народа маглі заявіць толькі ў 1956 г.

## Адбудова гаспадаркі

Зруйнаваная ў выніку ваенных дзеянняў Беларусь была пазбаўлена аб'ектаў стратэгічнага значэння, якія маглі б быць скарыстаны для падмацавання тылоў савецкага фронту. Нямнога было, паза сельскай гаспадаркай, сектараў, якія маглі б наладзіць вытворчасць без дапамогі звонку. У 1945 г. выпрацавана было 82 млн. кілаватаў электрычнай энергіі, што складала ўсяго 16,1% вытворчасці 1940 г. Найбольшае падзенне вытворчасці наглядалася ў металаапрацоўчай прамысловасці, якая на практыцы ў 1945 г. не існавала, а таксама ў металургічнай, якая выпускала толькі 3,4% гадавой даваеннай вытворчасці. Адносна хутка ўдалося прывесці ў спраўнасць цэментныя заводы, што мела істотнае значэнне для адбудовы краіны. У 1945 г. вытворчасць цэменту дасягнула 50 тыс. тон. І хаця было гэта ўсяго 25% прадукцыі ў параўнанні з 1940 г.,

аднак стварала нейкія новыя магчымасці для рэканструкцыі гаспадаркі. Паколькі складана было забяспечыць пастаянны прыток энегргетычных рэсурсаў з Расіі, улады БССР рашыліся шырэй скарыстаць залежы торфу ў цэнтральных і паўднёвых раёнах рэспублікі.

Памеры знішчэнняў не дазвалялі, аднак, Беларусі самастойна адбудаваць гаспадарку. Яшчэ ў ходзе вайны паасобныя вобласці Расійскай Федэрацыі заяўлялі аб гатоўнасці дапамагчы вызваленым Чырвонай Арміяй абласцям Беларусі. Хаця фармальна велічыню дапамогі і яе адрасата вызначалі абласныя камітэты ВКП(б), аднак уся акцыя каардынавалася Цэнтральным Камітэтам партыі і Саветам Народных Камісараў. Дапамога гэтая рэалізавалася ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) ад 21 жніўня 1943 г. “Аб неадкладных мерах па аднаўленню гаспадаркі ў раёнах вызваленых з-пад нямецкай акупацыі”. 27 сакавіка 1944 г. першым аб высылцы ў Беларусь 41 вагона тавараў заявіў Абласны камітэт ВКП(б) у Яраслаўлі. У гэтым транспарце мела быць 25 штук металаапрацоўчых станкоў, 24 электрарухавікоў і трансфарматараў, 7 740 прылад, 41 тона фарб і лакаў, 1 цыстэрна паліва, 13 тыс. штук ботаў, бялізны і вопраткі, 2 748 кг мыла, 53 тыс. экземпляраў літаратуры, 37 тон ільнянога і канаплянага семя, 3,2 тыс. штук барон і конных плугоў. Такую ж дапамогу, з дэталёвым пералікам відаў і колькасці планаваных да высылкі тавараў, заяўлялі іншыя абласныя і гарадскія камітэты тых рэгіёнаў Расіі, якія не пацярпелі ад ваенных дзеянняў. Планаваны прыток тавараў быў аднак значна меншы чым іх вываз летам 1941 г. Тычылася гэта перш за ўсё пагалоўя жывёлы, якой дэфіцыт адчуваўся таксама ў самой Расіі. У Беларусь вярнулася толькі частка чыгуначнага і аўтамабільнага транспарту, металаапрацоўчых станкоў, рухавікоў і трансфарматараў, якія былі вывезены падчас вялікай эвакуацыі летам 1941 г.

Былі выпадкі вяртання ў Беларусь з глыбі Расіі паасобных прамысловых заводаў разам з працоўнымі калектывамі, інжынерскімі кадрамі і дакументацыяй. У сакавіку 1945 г. з Башкірыі ў Віцебск перавезена было абсталяванне станкабудаўнічага завода разам з работнікамі гэтага прадпрыемства. За месяц у адным ацалелым будынку была наладжана вытворчасць. Былі гэта, аднак, спарадычныя выпадкі. Большасць заводаў і працоўных калектываў, якія былі вывезены летам 1941 г., засталіся на тэрыторыі Расіі. У Беларусь пераехалі галоўным чынам тыя прадпрыемствы, якія выпускалі прадукцыю неабходную для забеспячэння патрэб арміі. З-за вялікага знішчэння чыгуначнага рухомага саставу транспарт

узбраення з Зауралля быў надта складанай справай. Па гэтай прычыне рамонт пашкоджаных самалётаў, танкаў, машын і гармат трэба было арганізаваць бліжэй лініі фронту і таму ў Беларусі былі адкрыты некаторыя прадпрыемствы па рамонце ваеннай тэхнікі.

Тэмпы адбудовы гаспадаркі замаруджваліся па прычыне дэфіцыту электраэнергіі, нястачы рабочых і накіравання большай часткі вытворчасці на патрэбы арміі. Прадукцыя для войска, хаця і не спрыяла бягучым патрэбам гаспадаркі, аднак стварала прамысловую інфраструктуру, якая з цягам часу стала базай для цывільнага сектара. У пачатку 1946 г., выкарыстоўваючы мясцовыя залежы торфу, прыведзена была ў рух большасць электрастанцый Мінскай, Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

У верасні 1946 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пяцігадовы план развіцця гаспадаркі, які складаў частку пяцігодкі СССР, якая мела ажыццяўляцца ў 1946-1950 гадах. План прадугледжваў рост вытворчасці беларускай гаспадаркі, якая ў 1950 г. мела на 16% перасягнуць даваенныя паказчыкі. У 1946 г. больш за 6 тыс. прадпрыемстваў гатовых было выпускаць інвестыцыйную і спажывецкую прадукцыю, а іх вытворчыя магутнасці дазвалялі выканаць і перавыканаць усе планы першай пасляваеннай пяцігодкі. Аднак перашкодай аказаўся дэфіцыт сыравіны і электарэнергіі. Гэтай апошняй бракавала асабліва ў заходніх абласцях, у якіх інфраструктура была горшай і да 1941 г. Таксама тэхналогія, якая прымянялася да вытворчасці ваеннага абсталявання, у многіх выпадках не падыходзіла да цывільнай прадукцыі. Сур'ёзнай перашкодай быў таксама дэфіцыт кваліфікаваных кадраў і рабочай сілы. Урон насельніцтва падчас вайны яшчэ доўгі час адмоўна адбіваўся на гаспадарчым жыцці рэспублікі.

Развіццю гаспадаркі перашкаджаў таксама буйны рост партыйнай і дзяржаўнай адміністрацыі. У 1936 г. урад БССР складаўся з 18 камісараў, а ў 1946 г. было іх ужо 44. Разбудова адміністрацыі ў многіх выпадках была формай узнагароды для заслужаных арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі, якіх камандзірскія здольнасці не заўсёды сумяшчаліся з гаспадарчымі і адміністрацыйнымі ведамі. Кампетэнцыі паасобных камісараў і падначаленых ім структур часта супадалі, што ў сваю чаргу выклікала хаос у кіраванні гаспадаркай. Выцясненне ўсіх элементаў рыначнай гаспадаркі і бюракратычны спосаб кіравання эканамічнымі працэсамі, паспяховы ў ваенны перыяд, у мірны час быў прычынай гіганцкага марнатраўства людской працы, сыравіны і энергіі.

На хвалі новага энтузіязму сацыялістычнага будаўніцтва кожны

чыноўнік, які кіраваў гаспадаркай на прадпрыемстве, у раёне або вобласці, хацеў паказаць вынікі сваёй дзейнасці. Былі яны меркай ягонага сацыялістычнага патрыятызму. Праводзіліся розныя формы “сацыялістычнага спаборніцтва працы”. Рабочыя, працоўныя брыгады, заводы “змагаліся” за выкананне і перавыкананне нормаў. Найлепшыя выконвалі - так прынамсі заяўляла савецкая прапаганда - нават 400% прадугледжанай планам нормы. Работнікі завода “Чырвоны змагар” з Оршы быццам бы ў 1954 г. выканалі план вытворчасці прадугледжаны на 1958 г. Савецкая гістарыяграфія паведамляе, што пяцігадовы план 1946-1950 гадоў быў выкананы датэрмінова.

Несумненна, Беларусь, як і іншыя савецкія рэспублікі, дасягнула вялікіх поспехаў у аднаўленні знішчанай падчас вайны гаспадаркі. Здзяйснялася гэта дзякуючы вялікім намаганням грамадзян і пры іх шчырым удзеле ў гэтым працэсе. Аднак паказчыкі колькасці выпушчанай у гэты час прадукцыі нямнога гавораць аб яе якасці, значыць, аб сапраўдных выніках працы рабочых і інжынераў, якія выконвалі па 400% нормы.

Большасць сродкаў, выпушчаных падчас першай пасляваеннай пяцігодкі, накіроўвалася на чарговыя інвестыцыі, абмяжоўваючы такім чынам спажыванне і ўзровень матэрыяльнага жыцця грамадства. У чарговай пяцігодцы 1951-1955 гадоў у Беларусі паўсталі прадпрыемствы ўсесаюзнага значэння. Мінскі трактарны завод, Мінскі аўтамабільны завод ці Гомельскі станкабудаўнічы завод выпускалі прадукцыю на патрэбы ўсяго Савецкага Саюза і іншых краін народнай дэмакратыі.

Савецкая гістарыяграфія паведамляе, што ў 1951-1955 гадах прамысловая вытворчасць Беларусі павялічылася на 210%. Найбольшым прамысловым цэнтрам стала сталіца рэспублікі - Мінск. У другой пасляваеннай пяцігодцы больш інвестыцый было накіраваных у заходнія вобласці. Да вялікіх будоў гэтага перыяду належаць электрастанцыя ў Гродне і галоўная аўтамабільная магістраль Мінск- Брэст. Стрыманасць савецкіх улад ад інвеставання ў заходнюю частку рэспублікі была выклікана, здаецца, боязззю, што ў выпадку новага канфлікту гэтыя землі, так як у 1941 г., на нейкі час могуць быць заваяваны патэнцыяльным праціўнікам. Большасць інвестыцый 1951-1955 гадоў, напрыклад магістраль Мінск-Брэст, праводзілася з улікам ваенных інтарэсаў СССР.

## Калектывізацыя заходняй Беларусі

www.kamunikat.org

Самай вялікай праблемай беларускай сельскай гаспадаркі пасляваеннага перыяду быў дэфіцыт цяглавай сілы. І хаця ў 1945 г. з Расіі ў Беларусь было дастаўлена 1 542 трактары і 70 тыс. коней, аднак гэтая дапамога толькі ў невялікай ступені змякчыла патрэбы ў гэтай галіне. Кожны з ліку 4 тыс. калгасаў распараджаўся 2-10 коньмі. У некаторых калгасах коні адсутнічалі. У Віцебскай вобласці ў якасці цягла выкарыстоўвалі кароў. Здаралася, што плуг прыводзіўся ў рух пры дапамозе людской сілы. Сітуацыю ўскладняла яшчэ і тое, што большасць сельскіх мужчын папоўніла рады Чырвонай Арміі або была накіравана на работы пры адбудове дарог, мастоў, чыгункі. Менавіта таму, нягледзячы на незвычайныя намаганні застаўшыхся на вёсцы жанчын, значная частка зямлі вясною 1945 г. засталася неабсеянай. Паправілася сітуацыя толькі ў 1947 г., калі частка сялян была дэмабілізавана і калі павялічылася колькасць прывезеных з Расіі трактароў. Паводле савецкіх крыніц, даваенны ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці быў дасягнуты ўжо ў 1950 г.

У заходняй частцы Беларусі пераважалі аднаасобніцкія гаспадаркі. У 1946 г. былі там толькі 133 калгасы, якія ўзніклі на базе ліквідаваных фальваркаў. Першапачаткова метады калектывізацыі ў заходніх абласцях, у параўнанні з тымі, якія прымяняліся ва ўсходняй Беларусі ў дваццатых і трыццатых гадах, былі надзвычай лагоднымі. Заснаванню калгасаў звычайна спадарожнічала прапагандысцкая акцыя. Новастваранья калектыўныя гаспадаркі атрымоўвалі трактары і сельскагаспадарчыя машыны, калгаснікам у першую чаргу электрыфікавалі дамы. Ствараліся таксама калгасныя партыйныя і камсамольскія камітэты, якія дбалі пра адпаведную атмасферу сярод сялян, прымушаных аддаць вотчыну.

Да 1949 г. калектывізацыя заходняй Беларусі вялася галоўным чынам пры выкарыстанні прапаганды, угаворвання і палітычных метадаў і таму ў пачатку гэтага года было там усяго 909 калгасаў. Вясной 1949 г. савецкія ўлады вырашылі пакарыстацца багатым арсеналам сродкаў, якія прымяняліся ў ходзе калектывізацыі ўсходняй часткі рэспублікі. Рэпрэсіі і дэпартацыі г.зв. кулакоў у глыб СССР зноў аказаліся неабходнымі для паспяховага правядзення “сацыялістычных пераўтварэнняў на вёсцы”. У канцы 1950 г. у заходніх абласцях працавалі ўжо 6 054 калгасы, якія гуртавалі амаль 84% усіх сялянскіх гаспадарак. Калектывізацыя ў Беларусі была завершана толькі ў 1952 г.

У верасні 1951 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову “Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР”. У прынцыпе, ужо пасля заканчэння калектывізацыі пачалі высылаць былых багатых сялян у

Сібір, Казахстан і Якуцію. У 1952 г. вывезеных было амаль 30 тыс. чалавек, у тым ліку дзяцей, жанчын, старэч, якіх віной было тое, што ў мінулым была ў іх большая чым у іншых гаспадарка.

Савецкія ўлады трактавалі калгасы так як і дзяржаўныя прадпрыемствы. Зверху слалі ім указанні аб відах вытворчасці без уліку якасці зямлі і кліматычных умоў на дадзенай тэрыторыі. Строгія пакаранні за невыкананне ўказанняў прымушалі калгаснікаў выконваць работу, якая не давала ніякіх гаспадарчых рэзультатаў. Дзяржаўная адміністрацыя вызначала таксама цэны збыту і велічыню заробкаў калгаснікаў, якія былі значна меншыя за зарплаты рабочых на заводах. Незавіднае становішча калгаснікаў выратоўвалі прысядзібныя ўчасткі, якія на фоне ўраджайнасці ў калектыўных гаспадарках былі цудам агратэхнічных дасягненняў.

У аснове сельскагаспадарчай палітыкі пасляваеннага сталінізму ляжала логіка трыццатых гадоў. Характарызавалася яна цэнтралізаваным кіраваннем і паўнявольніцкай працай сялян, пазбаўленых сваёй зямлі. Калгаснікі мусілі плаціць спецыяльны падатак ад усяго, што знаходзілася ў ягоных дварах і мела рысы прыватнай уласнасці - ад пладовых дрэў, вуллёў, хатняй птушкі, вырошчванай морквы або цыбулі. Такая палітыка, мэтай якой было засяроджанне высілкаў людзей на калгасным полі, забівала ўсялякую актыўнасць і ставіла калгаснікаў у поўную залежнасць ад улады.

Адзінай прыкметай змен у пасляваенны перыяд было змякчэнне пакаранняў за крадзеж “дзяржаўнай і грамадскай уласнасці”. Рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР усім, што ўкралі калгасную ўласнасць, хаця і далей называлі іх ворагамі народа, пагражала пакаранне ў памеры ад 5 да 20 гадоў турэмнага зняволення. Было гэта істотнае, у параўнанні з 30 гадамі турмы, змякчэнне рэпрэсіўнасці савецкага правасуддзя, паколькі раней за такія злачынствы віноўнікі прыцягваліся нават да вышэйшай меры пакарання.

Пры цэнтралізаваным адміністрацыйным кіраванні ўраджайнасць калгаснай гаспадаркі была трывожна нізкая і таму ў 1952 г. былі ўчынены спробы стварыць такую сістэму працы, якая змяшчала б элементы эканамічнага заахвочвання і спрыяла б зацікаўленасці работнікаў гаспадарчымі вынікамі калгасаў. Велічыня заработнай платы пастаўлена была ў залежнасць ад колькасці выпрацаваных за месяц чалавекадзён. І хаця некаторыя калгаснікі выконвалі па два чалавекадні (16 гадзін) у суткі, мела гэта невялікі ўплыў на агульную прадукцыйнасць калгасаў.

У 1955 г. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага

www.kamunikat.org

Саюза (КПСС) рашыўся на частковае адмаўленне ад цэнтральнага вызначання задач паасобным калгасам. З вясны 1955 г. кіраўніцтвы калгасаў маглі самастойна вырашаць аб плошчах пасеваў збожжавых культур і відах жывёлагадоўлі. Гэтая невялікая доля свабоды вельмі хутка давяла да росту ўраджайнасці збожжавых і пагалоўя жывёлы. У палове пяцідзесятых гадоў Беларусь стала адной з важнейшых крыніц забеспячэння Расіі ў харчовыя прадукты.

## Рэпрэсіі не спыняюцца

У лютым 1945 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову "Аб перавыхаванні грамадства ў духу савецкага патрыятызму і нянавісці да нямецкіх акупантаў". Зважыўшы на тое, што нямецкія акупанты адступілі з Беларусі некалькі месяцаў раней, пастанова ЦК была прынята з мэтай расправы над людзьмі, якія падчас вайны не выказаліся дастатковай адданасцю савецкай радзіме. Савецкая прапаганда намагалася спалучаць нямецкія злачынствы з праявамі беларускага нацыяналізму і паказваць іх як адно цэлае. Калабарацыяністамі называліся не толькі былыя паліцыянты, чыноўнікі, настаўнікі, члены Саюза беларускай моладзі ці салдаты Беларускай самаахоўы, але таксама прыбіральшчыцы і сторажы, якія падчас акупацыі працавалі ў беларускіх установах. У ліку падазроных апынуліся вучні, якія наведвалі школы ў 1941-1944 гадах, вывезеныя ў Нямеччыну прымусовыя рабочыя і салдаты Чырвонай Арміі, якія вярнуліся з нямецкага палону.

Клеймаванне нямецкіх злачынстваў вялося паралельна са змаганнем з беларускай нацыянальнай элітай, некамуністычнай культурнай спадчынай, знішчаннем беларускай нацыянальнай свядомасці. Пасляваенная інтэграцыя Беларусі з Расіяй патрабавала выключэння з грамадскага жыцця гэтай нацыянальна свядомай праслойкі беларускага грамадства і замянення яе расійскай элітай. Пад шырмай барацьбы з калабарацыяністамі і нацыяналістамі і ў рамках "перавыхавання" ў 1945-1955 гадах з Беларусі было вывезеных каля мільёна чалавек. Было гэта галоўным чынам гарадское і маламестачковае насельніцтва, якое складала беларускую грамадскапрафесійную эліту. Іх месца занялі прышэльцы з Расіі, якія апанавалі партыйныя камітэты, дзяржаўную адміністрацыю і культурнаасветныя ўстановы. Русіфікацыя ахапіла большасць вышэйшых навучальных устаноў ды школ сярэдняга і пачатковага ўзроўню. Мігрыруючая ў гарады вясковая моладзь сустракалася з расійскай культурай і мовай, якіх засваенне станавілася неабходнай

умовай грамадскага павышэння.

Пасляваенны кадравы абмен датычыў таксама тых, якія падчас нямецкай акупацыі перайшлі на савецкі бок. У 1946 г. падменена было больш за 90% кіраўнікоў раённай і гарадской адміністрацыі ды 83% дырэктараў калгасаў. Частка з іх атрымала павышэнне па службе разам з пераводам іх у Расію або іншыя рэспублікі, частка была напраўлена на іншую працу. Іх месца занялі прышэльцы з-паза Беларусі. Таксама пераважная большасць партыйна-адміністрацыйнага кіраўніцтва рэспублікі была заменена расіянамі. У 1951 г. ва ўрадзе БССР было 22 расіян, 9 беларусаў, 1 грузін і 1 яўрэй. У 1953 г. з ліку 1 408 работнікаў адміністрацыі акругowага ўзроўню ў заходняй частцы краіны толькі 114 чалавек былі беларусамі мясцовага паходжання. Такое становішча наглядалася таксама і ў гарадской адміністрацыі, дзе на 321 супрацоўніка гарадскіх выканаўчых камітэтаў на гэтай тэрыторыі беларусаў было толькі 7,7 працэнта.

Нямнога вядома аб беларускай пасляваеннай узброенай апазіцыі. Савецкія гісторыкі пісалі, што "ўзброеныя банды ў 1945-1947 гадах здзейснілі шэраг распраў над партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі актывістамі. Пры актыўнай дапамозе мясцовага насельніцтва органы бяспекі ліквідавалі 814 антысавецкіх груп і ўзброеных банд". Безумоўна, большасць беларускіх нацыянальных дзеячаў, паліцэйскіх, чыноўнікаў не сумнявалася наконт свайго лёсу ў выпадку арыштавання іх НКУСам. Нямногім яны рызыкавалі адчайна змагаючыся перш за ўсё за выжыванне чым за якую-небудзь ідэю.

З вайны ў арэоле пераможцаў вярнуліся ў Беларусь сотні тысяч салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі. Многія з іх былі таксама ветэранамі партызанскага руху. Сярод гэтай шматтысячнай грамады даволі паўсюдным было чаканне змен, а ў першую чаргу спынення рэпрэсій і роспуску калгасаў. Выйгралі яны вайну з імем Сталіна на вуснах і былі перакананы, што сваёй ахвярнасцю даказалі сваю адданасць "вялікаму правадыру", камунізму і сацыялістычнай айчыне. Гэтыя настроі савецкія ўлады палічылі надта небяспечнымі і зрабілі шэраг захадаў па іх ліквідацыі. Частка салдат засталася ў гарнізонах на тэрыторыі Расіі, частка была выслана на вайну супраць Японіі. Тэрмін дэмабалізацыі быў расцягнуты на некалькі гадоў, а звольненыя з вайсковай службы асобы падвяргаліся пільнаму нагляду.

У 1946-1949 гадах органы НКУС выявілі больш за дзесяць нелегальных груп у асяроддзі гімназічнай і студэнцкай моладзі. Не вядома, аднак, ці служба бяспекі не была ініцыятарам паўстання некаторых маладзёжных антысавецкіх арганізацый, якія мелі прыцягнуць усіх патэнцыяльных праціўнікаў сталінізму і аблягчыць НКУС

іх ліквідацыю. Вясной 1946 г. у Слоніме заснавалася падпольная арганізацыя з назвай "Чайка". Падпольшчыкі наладзілі супрацоўніцтва з групай слухачоў Баранавіцкага педагагічнага інстытута. Да нелегальнай дзейнасці ўключылася многа асоб з розных асяроддзяў і мястэчак заходняй Беларусі. Мэтай арганізацыі было змаганне за захаванне нацыянальных свабод, абарона беларускай культуры і мовы, а таксама папулярызацыя гісторыі Беларусі ў якасці канкурэнцыі для савецкай міфалогіі. Нефармальныя групы ўзніклі таксама ў Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, Ганцавіцкім педагагічным вучылішчы. У жніўні 1947 г. арыштаваны былі некалькі дзесяткаў асоб з гэтых цэнтраў і абвінавачаны ў прыналежнасці да арганізацыі з назвай Цэнтр беларускага вызвольнага руху, які меў весці беларускую нацыяналістычную прапаганду і рыхтаваць кадры для тэрарыстычных фарміраванняў. Не вядома ці ў сапраўднасці такая арганізацыя існавала, але за прыналежнасць да яе Мінскі ваенны суд прыгаварыў на шматгадовае зняволенне ў канцэнтрацыйных лагерах 29 чалавек. На пачатку лютага савецкая дзяржбяспека арыштавала 33 слухачоў Глыбоцкага педагагічнага вучылішча, абвінаваціўшы іх у прыналежнасці да Саюза беларускіх патрыётаў. Арганізацыя гэтая існавала са студзеня 1946 г. і займалася прапагандаваннем патрыятычных ідэй сярод моладзі. 20 чэрвеня Мінскі ваенны суд прыгаварыў арыштаваных да шматгадовага турэмнага зняволення. Большасць асуджаных атрымала па 25 гадоў турмы.

Падобныя арганізацыі ў маладзёжным асяроддзі функцыянеры НКУС выявілі восенню 1947 г. у Полацку, Маладзечне, Пінску і Мінску. Ваенныя суды ў прынцыпе не выносілі меншых прыгавораў чым 5 гадоў у г.зв. працоўных калоніях.

У 1949 г. Сталін даў пачатак новай хвалі чыстак у партыйным апараце і сярод кіраўнічых адміністрацыйных кадраў. У Беларусі змаганне са "здраднікамі і рэвізіяністамі" ўзначаліў шэф рэспубліканскага НКУС Лаўрэнцій Цанава. У 1951 г. Цанава ў нацыяналізме абвінаваціў нават героя беларускага камуністычнага руху Сяргея Прытыцкага, тадышняга І сакратара Абласнога камітэта КП(б)Б у Гродне. Іншы заслужаны бальшавік, міністр асветы БССР Пётр Саевіч за нацыяналістычны "ўхіл" быў сасланы на 25 гадоў у канцэнтрацыйны лагер.

Пасляваенным рэпрэсіям у першую чаргу падвяргалася інтэлігенцыя. Сталінізм апускаўся ў акасцянеласць і дагматызм, што стала прычынай ганенняў на тых, якія праяўлялі хаця б цень сумненняў у адносінах да праўд, прапаведаваных тадышняй

www.kamunikat.org

бальшавіцкай прапагандай. Ацэнкай літаратурнай і мастацкай творчасці займаўся Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У канцэнтрацыйныя лагеры зноў ссылаліся пісьменнікі і паэты, якія не прытрымоўваліся сталінскай этыкі пры апісванні вайны і з'яў грамадскага і палітычнага жыцця ў Беларусі - Андрэй Александровіч, Рыгор Бярозкін, Сяргей Грахоўскі, Барыс Мікуліч, Станіслаў Шушкевіч.

У коле найбольш падазроных апынуліся тыя інтэлектуалы, у якіх былі якія-небудзь кантакты з Захадам. Гучнай стала справа прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі Антона Жэбрака, якога артыкул Савецкая біялогія ў 1945 г. быў апублікаваны ў амерыканскім часопісе "Science" ("Навука"). Жэбрак пераконваў у ім амерыканскіх вучоных аб няслушнасці ацэнкі дасягненняў савецкіх біёлагаў цераз прызму тэорый Трафіма Лысенкі. Публікацыя Жэбрака была прызнана праявай здрады савецкай навуцы і кампраметавання яе выдатнейшых аўтарытэтаў. 14 верасня 1948 г. яго навуковыя погляды былі ацэнены на пасяджэнні Палітбюро ЦК КП(б)Б. Рашэннем гэтага партыйнага органа ліквідаваны быў Інстытут біялогіі АН Беларусі, а ўсе кіраўнікі паасобных яго аддзяленняў, у якіх вяліся доследы ў галіне медыцыны, біялогіі і генетыкі, былі звольнены з працы. Занятак страцілі таксама навукоўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у навуковых дасягненнях якіх ставіліліся тэзісы падобныя на палажэнні біёлагаў з Акадэіі навук.

У пасляваенны перыяд культ Сталіна стаў набываць рысы рэлігійнага рытуалу. Савецкая прапаганда прадстаўляла Сталіна як пераможнага правадыра, які ўбярог чалавецтва ад фашысцкіх крэматорыяў і вяртання ў эпоху нявольніцтва. Вярхоўнай уладай у абласцях, раёнах, калгасах, заводах сталіся партыйныя камітэты, якіх функцыянеры выконвалі ролю жрацоў культу правадыра. І хаця праводзіліся выбары ў Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, іх улада ў большай ступені была сімвалічнай чым сапраўднай. Пры стопрацэнтнай прысутнасці выбаршчыкаў на ўчастках для галасавання прапанаваныя партыйнымі камітэтамі кандыдаты атрымоўвалі стопрацэнтную падтрымку. Выбарчыя кампаніі ў Вярхоўны Савет у 1948 г. і ў мясцовыя Саветы ў 1950 г. сталі своеасаблівымі спектаклямі, падчас якіх на працягу некалькіх месяцаў усслаўляліся Сталін і камунізм. Партыйныя камітэты прызначалі і адклікалі старшынь Саветаў народных дэпутатаў, вядома, пры захаванні працэдур, якія абавязвалі ў савецкім заканадаўстве.

Прапагандаванне культу Сталіна з асаблівай інтэнсіўнасцю праводзілася ў маладзёжным асяроддзі. 450-тысячны камсамол у

Беларусі быў цесна звязаны з партыяй і верна ўкараняў яе ідэі сярод наймалодшых пакаленняў. Дзеці сталінскіх ахвяр шчыра верылі ў тое, што іхнія бацькі заслужылі долю, якую падрыхтавала ім савецкая ўлада.

## Беларуская культура пасляваеннага сталінізму

Нягледзячы на жудасныя рэпрэсіі, у выніку якіх мільёны людзей апынуліся ў канцэнтрацыйных лагерах, Сталін быў натхненнем для тварцоў усіх галін культуры. Кожны твор інтэлектуальнай дзейнасці лічыўся нявартым увагі, калі не абагатвараў "правадыра сусветнага пралетарыяту". У 1947-1951 гадах на беларускай мове выйшлі ўсе творы Сталіна. Мільённым тыражом выпушчана была Кароткая біяграфія І. В. Сталіна. У Беларусі ўзнікла больш за 7 тыс. гурткоў вывучэння жыцця і мыслей "вялікага правадыра". У снежні 1949 г. па інспірацыі ЦК КП(б)Б напісаны быў "Ліст Вялікаму Сталіну ў 70 гадавіну з дня нараджэння ад беларускага народа", пад якім падпісаліся тысячы інтэлектуалаў і звычайных жыхароў рэспублікі. Яго змест у большай ступені нагадваў малітву чым юбілейныя віншаванні чалавеку. З нагоды дня нараджэння Сталіна ў Беларусі адбылося 32 тыс. мітынгаў і сходаў, у якіх прыняло ўдзел больш за 3 млн. чалавек. Паэты чыталі вершы, спевакі, акцёры, танцоры дасягалі самага высокага ўзроўню прафесійнасці, рыхтуючыся да выступленняў у гонар правадыра партыі - "рэпрэзентанта інтарэсаў працоўнага народа".

Культура і ўстановы яе распаўсюджвання служылі перш за ўсё пашырэнню культу Сталіна. Выдаткі на культуру былі адносна высокія. Клубы культуры, бібліятэкі, чытальні працавалі амаль у кожным калгасе. З раённых і калгасных бюджэтаў выдзяляліся сродкі для вядзення розных форм мастацкай самадзейнасці, прычым мелі яны быць цесна звязаны з афіцыйнай ідэалогіяй. Кніжкі, прызнаныя слушнымі, друкаваліся шматмільённымі тыражамі. Дзякуючы шчыльнай сетцы бібліятэк і чытальняў былі яны агульнадаступнымі. Арганізаваліся шматлікія чытальніцкія конкурсы. З чытальняў і бібліятэк сістэматычна выводзіліся творы тых пісьменнікаў, якіх расстралялі або саслалі ў канцэнтрацыйныя лагеры. У бібліятэкі рэгулярна паступалі спісы забароненых кніг, а бібліятэкары кантраляваліся ці сапраўды выводзяць з абарачэння крамольную літаратуру. У 1952 г. такі кантроль праведзены быў у 18 тыс. бібліятэчных пунктах і чытальнях, з якіх выведзена 24 тыс. кніг. Год пазней скантралявана было ўжо 21 тыс. пунктаў, з кнігазбораў якіх

www.kamunikat.org

выключана было 41 тыс. кніжак.

Да 1949 г. 96% газет і кніжак друкаваліся на беларускай мове. Савецкія ўлады не маглі ж ставіцца да беларускай мовы горш чым нямецкія акупанты. У 1950 г. пачаўся паступовы спад колькасці найменняў друкаваных выданняў на гэтай мове. Пяць гадоў пазней ужо больш за 30% кніжак і 20% газет друкаваліся на рускай мове. Гэты працэс значна паскорыўся ў наступных гадах.

У жніўні 1946 г. Цэнтральны Камітэт ВКП(б)Б акрэсліў дырэктыву для савецкай літаратурнай творчасці. У ліпені 1947 г. крытэрыі, якімі павінны кіравацца беларускія літаратары, вызначыў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У адпаведнасці з указаннямі ЦК вядучымі тэмамі беларускай літаратуры павінны былі стаць барацьба беларускага народа з фашысцкім акупантам і прапагандаванне дасягненняў партыі і яе правадыроў у будове дабрабыту працоўнага народа і справядлівага грамадскага ладу. За адпаведнае, згоднае з жаданнем улад, апісанне савецкага руху супраціўлення і сацыялістычных пераўтаврэнняў аўтарам прысвойвалася самая высокая літаратурная ўзнагарода - Сталінская прэмія. Атрымалі яе ў 1949 г. Якуб Колася за паэму “Рыбакова хата”, Пятрусь Броўка за паэму “Хлеб” і Аркадзь Куляшоў за паэму “Новае рэчышча”.

Таксама адміністрацыйнымі метадамі стваралася літаратурная крытыка. Савецкія літаратуразнаўцы ў прынцыпе прадстаўлялі пазіцыю нейкага партыйнага калектыву. Іх ацэнка на старонках газеты або часопіса прадвяшчала адабрэнне або адхіленне твора партыйнымі ідэолагамі. Была яна таксама ўказальнікам для журналістаў і работнікаў культуры як трэба ацэньваць творчасць паасобных аўтараў. Адмоўная ацэнка твора партыйным актывам адкрывала шлях да паклёпаў на аўтара, таварыскага астракізму і пазбаўляла выдавецкіх перспектыў на доўгія гады. У такі спосаб зацкавана была Эдзі Агняцвет (сапр. Эдзі Каган), у вершах якой прыкмечаны былі мяшчанскія элементы, і Канстанцыя Буйло, абвінавачаная ў прапагандаванні беларускага нацыяналізму, таму што ў адным з вершаў напісала пра Беларусь як пра самае прыгожае месца на Зямлі.

З 1951 г. аб друку літаратурных твораў вырашала Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецкай дзейнасці пры Савеце Міністраў БССР. Вобраз свету, які прадстаўляла савецкая літаратура сталінскага перыяду, толькі ў невялікай ступені адлюстроўваў існуючыя рэаліі, людскія пачуцці і думкі і ствараўся пад густы партыйных ідэолагаў, паводле дакладна вызначаных імі крытэрыяў. Чым вобраз гэты быў больш скажоны, тым большы гонар і

ўзнагароды чакалі аўтараў. Хлусня, якая ствaралася пры ўдзеле самых выдатных тварцоў эпохі і шматкратна паўтаралася прапагандысцкім апаратам, для новых пакаленняў станавілася неаспрэчнай праўдай. Творчасць Ільы Гурскага, Усевалада Краўчанкі, Кастуся Губарэвіча ці Тараса Хадкевіча стала сімвалам канфармізму пасляваеннага пакалення беларускіх літаратараў. Тыя, што прабавалі захаваць нейкую долю незалежнага мыслення, апынуліся ў Сібіры.

Так як і літаратарам падобныя патрабаванні бальшавікі ставілі рэжысёрам і акцёрам. Рэпертуар паасобных тэатраў зацвярджаўся спецыяльнай установай, якая дзейнічала пры ЦК КП(б)Б. У 1949 г. з рэпертуару беларускіх тэатраў зніклі амаль усе творы заходнееўрапейскіх драматургаў. Развязаная ў той час Сталіным антысеміцкая кампанія давяла да змены кіраўнічых кадраў у большасці тэатраў. Змаганне з касмапалітызмам вялося паралельна з пашырэннем рэпертуару, які адклікаўся да славянафільскай міфалогіі. Палітбюро ЦК дазваляла тэатрам ставіць у асноўным тыя творы беларускіх драматургаў, якія адклікаліся да народных элементаў, класавай барацьбы на вёсцы або барацьбы беларускага народа з нямецкімі захопнікамі, пазбягаючы п'ес, якія спасыліся на традыцыю Вялікага княства Літоўскага.

www.kamunikat.org

## Школьніцтва

Вялікую ролю ў выхаванні маладых пакаленняў беларусаў савецкія ўлады назначылі школе. Пасля вайны спраўна і адносна хутка была адбудавана сістэма ўсіх узроўняў навучання. У 1945/1946 навучальным годзе ў Беларусі працавала 10,9 тыс. навучальных установаў, у якіх вучылася 1 337 тыс. школьнікаў. Найбольш складанай праблемай беларускай асветы быў недахоп кадраў. Настаўнікі, якія працавалі ў школах падчас акупацыі, у большасці былі вывезены з Беларусі, а пераказаныя імі веды, асабліва ў галіне гуманітарных навук, выклікалі неабходнасць перавыхавання маладога пакалення. Менавіта таму значную частку кадраў складалі актывісты камсамола, якія прыехалі сюды з Расіі. У сувязі з гэтым з'явілася праблема мовы выкладання ў школах, паколькі вучні, асабліва ў заходняй Беларусі, не заўсёды разумелі мову настаўнікаў. У Мінску ў 1946 г. на 28 падставовых школ у палове ўрокі вяліся на рускай мове. У 1953 г. лік школ павялічыўся да 46, але беларуская мова захавалася толькі ў дзевяці. У Брэсце на 14 школ толькі ў адной прадметы выкладаліся пабеларуску. Падобнае становішча было і ў іншых гарадах, дзе настаўніцкія кадры складалі прышэльцы з Расіі. Беларускае школьніцтва сістэматычна скарачалася і ў асноўным абмежавалася да вясковага асяроддзя.

Цэнтрам, які падтрымоўваў русіфікатарскія тэндэнцыі ў Беларусі быў Цэнтральны Камітэт КП(б)Б. У чэрвені 1952 г. прыняў ён адмысловую пастанову "Аб ходзе выкладання расійскай і беларускай моў у школах БССР у святле вучэнняў таварыша Сталіна аб мовазнаўстве". Хаця пастанова ЦК не аспрэчвала мэтазгоднасці навучання беларускай мове, аднак указвала, што ў інтарэсе савецкай дзяржавы веданне грамадзянамі рускай мовы з'яўляецца неабходнасцю. На пачатку 50-х гадоў амаль 70% сярэдніх школ працавала на базе рускай мовы.

Больш дынамічным аказаўся працэс русіфікацыі вышэйшага школьніцтва. У 1944/1945 акадэмічным годзе працу пачалі 22 установы, якія лічыліся вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Амаль палова ўсіх беларускіх студэнтаў - 5 тыс. - у той час вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ў Мінску. З прычыны нястачы настаўніцкіх кадраў найбольш увагі адводзілася тварэнню педагагічных інстытутаў. У чэрвені 1951 г. у рэспубліцы было 10 такіх ВНУ.

У вышэйшым школьніцтве таксама асноўнай праблемай былі настаўніцкія кадры. У 1951 г. з ліку 1,4 тыс. акадэмічных

выкладчыкаў педагагічных, медыцынскіх, мастацкіх, політэхнічных і універсітэцкіх устаноў толькі 5,3% мела званне доктара навук. Большасць навуковай эліты, якая прабывала ў Беларусі падчас акупацыі, была перасена ў Расію і іншыя савецкія рэспублікі. Хутка, аднак, навучальныя ўстановы выхавалі свае кадры, а беларускія навуковыя цэнтры сталі важнымі элементамі тылоў савецкай гаспадаркі. Тычылася гэта такіх галін навукі як матэматыка, фізіка, хімія. Гуманітарныя навукі ў далейшым былі часткай апарату распаўсюджвання камуністычнай ідэалогіі. Па прапанове ЦК КП(б) у 1952 г. у мінскім БДУ абмежавана было выкладанне беларускай гісторыі і культуры. У палове пяцідзесятых гадоў беларуская мова амаль поўнасцю была выцеснена з муроў гэтай найбольшай ВНУ ў Беларусі. Засталася яна мовай выкладання толькі ў некаторых педагагічных інстытутах.

# Ударніцтва ў пабудове камунізму (1956-1990)

### Рэфармаванне сталінізму

Смерць Сталіна (5 сакавіка 1953 г.) выклікала шчырую роспач мільёнаў жыхароў Беларусі. Па рэспубліцы пракацілася хваля жалобных мітынгаў. Сотні тысяч людзей рушылі ў напрамку Масквы, каб развітацца з чалавекам, які пры жыцці стварыў легенду пра самога сябе. Ад жалю па Сталіне плакалі нават ахвяры ягоных рэпрэсій.

Пасля смерці правадыра савецкай імперыі створаная ім сістэма патрабавала вялікіх змяненняў. Раней давала яна абсалютную ўладу аднаму чалавеку. Тым часам сярод бальшавіцкіх правадыроў не было такіх аўтарытэтных асоб як Сталін. Сама логіка сістэмы не дапускала існавання іншай індывідуальнасці. Гіганцкая прапаганда доўгія гады стварала вобраз звышчалавечага генія толькі аднаго члена партыі, калі астатнія былі яму толькі фонам і выканаўцамі ўказанняў. Менавіта таму спробы шэфа НКУС Лаўрэнція Берыі пераняць усе рычагі ўлады закончыліся ягоным арыштаваннем у чэрвені 1953 г. У верасні 1953 г. на пасаду I сакратара ЦК КПСС і кіраўніка савецкай дзяржавы ўступіў Мікіта Хрушчоў, адзін з самых блізкіх супрацоўнікаў Сталіна, які пасля смерці дыктатара стаў разбуральнікам ягонага культу і прыхільнікам абмежавання выраджэнскіх метадаў выконвання ўлады.

Неўзабаве пасля смерці Сталіна праведзена была рэарганізацыя

цэнтральнага апарату ўлады. Значна скарацілася колькасць міністэрстваў і чыноўнікаў. 27 сакавіка 1953 г. Вярхоўны Савет СССР абʼявіў амністыю зняволеным, якія па палітычных прычынах былі прысуджаны да 5 гадоў турмы. У верасні распушчана была спецыяльная група пры Міністэрстве ўнутраных спраў, якая без судоў і пракуратуры магла высылаць людзей у канцэнтрацыйныя лагеры або прыцягваць да вышэйшай меры пакарання. 3 мая 1955 г. уведзены былі судовыя працэдуры, якія рэгулявалі парадак абыходжання з абвінавачанымі. Устаноўлена тады кампетэнцыі паасобных праваахоўных органаў у адносінах да абвінавачаных з моманту арыштавання да вынясення судовага прыгавору. Выразна былі аддзелены правамоцтвы пракурораў, суддзяў, міліцыі і НКУС.

У жніўні 1955 г. праведзена была таксама дэцэнтралізацыя сістэмы кіравання. Большую аўтаномію атрымалі абласныя і раённыя саветы. Маглі яны распараджацца сродкамі на жыллёвае будаўніцтва, камунальную гаспадарку і культурнаасветную дзейнасць. Саветы, аднак, у далейшым былі выканаўцамі волі мясцовых партыйных камітэтаў, а дэпутаты ў сапраўднасці надалей назначаліся сакратарамі партыі. Выбары ў такіх умовах былі толькі звычайнай фармальнасцю.

XX Зʼезд КПСС, які адбыўся ў лютым 1956 г., ва ўсіх злачынствах камунізму абвінаваціў Сталіна, адначасна здымаючы адказнасць з астатніх функцыянераў партыі і НКУС, якія прымалі ўдзел у пазбаўленні жыцця мільёнаў савецкіх грамадзян. У структурах улады засталася большасць выканаўцаў сталінскага генацыду трыццатых гадоў, якія ў новых палітычных умовах на словах асудзілі сістэму, якой верна служылі доўгія гады. Хрушчоў абвінаваціў Сталіна перш за ўсё ў злачынствах на камуністах, не ўспомніў, аднак, пра мільёны ахвяр, якія не былі членамі партыі.

Неўзабаве пасля XX Зʼезда КПСС пачалася рэабілітацыя ахвяр сталінізму. Сотні тысяч людзей былі вызвалены з канцэнтрацыйных лагераў. Да 1962 г. у Беларусі рэабілітаваных было 29 тыс. чалавек, галоўным чынам расстраляных работнікаў партыі і НКУС. Нешматлікімі былі выпадкі апраўдання рэпрэсіраваных тварцоў беларускай культуры, абвінавачаных у “нацыяналдэмакратызме” або замучаных сялян, якія супраціўляліся калектывізацыі. Разлічыцца пасапраўднаму са сталінізмам было немагчыма па той прычыне, што пры ўладзе засталіся людзі, якія былі сааўтарамі гэтай сістэмы. Праўду кажучы, трэба было б ім абвінаваціць саміх сябе. Разбуранне помнікаў Сталіну пад канец пяцідзесятых гадоў не абазначала развалу таталітарнай палітычнай сістэмы, якую ён стварыў. Сталінская

сістэма толькі рэфармавалася і прыстасоўвалася да патрэб новай каманды, якая поўнасцю кантралявала дзяржаўнае і грамадскае жыццё. Уся ўлада засталася ў руках партыйнага апарату. Захаваліся, а нават пашыраліся ягоныя прывілеі, ствараючы такім чынам структуры па ўзору каставага грамадства. Партыйныя работнікі карысталіся сваёй сістэмай зарплат, спецыяльным медабслугоўваннем, асобнымі магазінамі і сталовымі, у якія нельга было заходзіць звычайным грамадзянам, спецыяльнымі адпачынковымі цэнтрамі, службовым транспартам, які паўсюдна выкарыстоўваўся ў прыватных мэтах.

У ліпені 1956 г. I сакратаром ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) стаў Кірыла Мазураў. Быў ён першым беларусам прызначаным на самы высокі пост у партыйным апараце Беларусі. Пры Мазураве (1956-1965) рады КПБ павялічыліся з 145 тыс. да 296 тыс. членаў, а палітычнае і гаспадарчае жыццё стабілізавалася. У 1956 г. былі зменшаны падаткі з калгаснікаў і абніжаны цэны прамысловых тавараў. Прадукты для шырокага спажывання айчыннай вытворчасці былі нізкай якасці, а іх колькасць значна перавышала патрэбы грамадства. Агульнадаступнымі сталі такія тавары як тканіны, гадзіннікі, радыёпрыёмнікі, фотаапараты, веласіпеды. Паза магчымасцямі звычайных грамадзян былі прыватныя кватэры ў горадзе, легкавыя аўтамашыны, дываны, вырабы са шляхетных металаў.

У 1957 г. адменены быў падатак, уведзены падчас вайны з самотных асоб і бяздзетных шлюбных пар.

Найважнейшай зменай пасля смерці Сталіна было спыненне тэрору ў адносінах да сапраўдных і ўяўных праціўнікаў камунізму. Партыйныя функцыянеры ўжо не баяліся, што страцяць жыццё за адступніцтва ад догмаў, устаноўленых вышэйшым кіраўніцтвам. Уладны апарат пачаў карыстацца магчымасцямі, якія даваў яму кантроль за ўсім гаспадарчым патэнцыялам краіны. Па гэтай прычыне грамадскую пазіцыю савецкага грамадзяніна вызначала ягонае месца ў партыйнай іерархіі.

У 1956-1957 гадах адбылася частковая дэцэнтралізацыя кіравання прадпрыемствамі, якія раней падлягалі гаспадарчым міністэрствам СССР. У той час у распараджэнне адміністрацыі БССР перададзеных было 856 вялікіх прамысловых заводаў на тэрыторыі рэспублікі. Такім чынам пад кантролем улад БССР апынулася 85% айчыннай маёмасці.

У сакавіку 1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў пастанову, якая дазваляла саюзным рэспублікам самастойна вызначаць граніцы абласцей і раёнаў, а таксама ўводзіць у судовую сістэму элементы

www.kamunikat.org

свайго крымінальнага, працэсуальнага і цывільнага права. Аднак на практыцы Вярхоўны Савет БССР рэдка карыстаўся гэтымі паўнамоцтвамі.

Хрушчоў яшчэ раз спрабаваў звесці рахункі са сталінізмам на XXII З'ездзе КПСС у кастрычніку 1961 г. Успомніў ён тады, што сталінскія рэпрэсіі былі накіраваны не толькі супраць камуністаў, але таксама супраць звычайных савецкіх грамадзян. Запрапанаваў, аднак, паставіць помнік для ўшанавання памяці камуністаў, якія сталі ахвярамі сталінізму.

## Пабудова цяжкай прамысловасці

XXII З'езд КПСС прыняў пастанову аб пабудове камунізму пры жыцці аднаго пакалення. Хрушчоў вынес лозунг: "За 3-4 гады дагонім і абгонім Злучаныя Штаты", маючы перш за ўсё на ўвазе гаспадарку. Беларускія камуністы пад кіраўніцтвам Кірылы Мазурава, а пазней Пятра Машэрава мелі амбіцыю першымі давесці сваю рэспубліку да стану "развітага камунізму".

Паводле афіцыйных даных у другой палове пяцідзесятых гадоў вартасць вытворчасці беларускай гаспадаркі павялічылася на 79% . За гэты час узведзеных было 157 новых прадпрыемстваў, якіх прадукцыя галоўным чынам накіравана была на патрэбы агульнасавецкага рынку. Электрастанцыі, станкабудаўнічыя заводы, фабрыкі будаўнічых матэрыялаў, тэкстыльныя камбінаты выпускалі ў некалькі разоў больш прадукцыі чым мог увабраць у сябе беларускі рынак.

У 1961-1970 гадах прамысловы патэнцыял Беларусі павялічыўся на чарговыя 167 вялікіх прадпрыемстваў. Тады ў Мінску пабудаваны быў новы аўтамабільны завод, у Гомелі - магутны завод пускавых рухавікоў, у Салігорску - некалькі шахтаў калійнай солі і тры камбінаты па яе перапрацоўцы, у Полацку - нафтаперапрацоўчы камбінат, у Гродне - хімічныя фабрыкі, у Светлагорску і пад Магілёвам - заводы штучнага валакна. За некалькі гадоў Беларусь стала магутным цэнтрам хімічнай прамысловасці.

Савецкія гісторыкі з гонарам адзначалі, што ў 1966-1970 гадах прамысловая вытворчасць БССР дасягнула такой жа велічыні як за ўсё пасляваеннае дваццацігоддзе. У 1965 г. Беларусь выпусціла больш трактароў чым Савецкі Саюз у даваенны перыяд. У 1970 г. рэспубліка паставіла на савецкі рынак 49% мінеральных солей, 19% поліэтылену, 10% штучнага валакна, 18% трактароў, 13% металаапрацоўчых станкоў, 22% матацыклаў.

www.kamunikat.org

Беларуская гаспадарка была часткай агульнасавецкай планавай гаспадаркі. Прамысловыя інвестыцыі на тэрыторыі рэспублікі і віды прадукцыі не вынікалі з патрэб краіны і яе жыхароў. Большасць інвестыцый фінансавалася цэнтральным бюджэтам з думкай пра патрэбы савецкай імперыі. Пры іх рэалізацыі заняты былі тысячы людзей з іншых рэспублік. У той жа час мноства беларусаў працавала на будовах розных прамысловых аб'ектаў на тэрыторыі ўсяго СССР. Чарговыя пяцігодкі ў БССР былі толькі выкананнем часткі ўсесаюзных планаў. Тое, што адбывалася ў беларускай гаспадарцы, толькі ў невялікай ступені інспіравалася кіраўніцтвам БССР. Правадыры КПБ і тысячы партыйных актывістаў з вялікім перакананнем ажыццяўлялі ў Беларусі планы маскоўскага цэнтра. Сакратары ЦК КПБ - Мазураў і Машэраў - імкнуліся стаць найлепшымі будаўнікамі камунізму на ўсёй савецкай тэрыторыі і з вялікай адданасцю рэалізавалі найбольш недарэчныя - з пункту гледжання інтарэсаў Беларусі - праекты гаспадарчага развіцця. Савецкія крыніцы паведамляюць, што валавы нацыянальны даход БССР у 1970 г. у параўнанні з 1965 г. павялічыўся на 58%, у 1975 г. на 135%, у 1980 г. на 207%. У значна меншых тэмпах узрастаў даход у сельскай гаспадарцы.

Аднак нямнога вядома пра эфектыўнасць беларускай гаспадаркі пасля 1956 г. Спажыўцом значнай часткі прамысловай прадукцыі была Савецкая Армія. Многія прамысловыя аб'екты размяшчаліся ў гарадах, якія не мелі за сабою ніякіх аргументаў для абгрунтавання такога выбару - напрыклад, нафтаперапрацоўчы камбінат у Полацку. Ва ўмовах "сацыялістычнага спаборніцтва працы" і "змагання за выкананне планаў" кіраўнічыя кадры перш за ўсё клапаціліся пра колькасць выпушчаных тавараў, якая была паказчыкам прагрэсу ў савецкай гаспадарцы. Пра якасць прамысловых вырабаў не згадвае ніводная статыстыка, таму невядома якая была сапраўдная прыгоднасць выпускаемых у Беларусі машын, вузлоў, матэрыялаў, хімічных тавараў.

Падчас XXVII З'езда КПБ у лютым 1971 г. старшыня Савета Міністраў БССР Ціхан Кісялёў, характарызуючы развіццё беларускай гаспадаркі ў 1965-1971 гадах, гаварыў аб сярэднім 10-працэнтным гадавым росце валавога нацыянальнага прадукту ў згаданы перыяд. Многа месца шэф беларускага ўрада адвёў укараненню рэформаў у паасобных галінах гаспадаркі, аднак не ўказаў на істотныя элементы гэтых змен. У сапраўднасці рэформа праводзілася толькі на словах. Мэтай гаспадарчых дзеянняў стала змаганне за паказчыкі колькаснага росту вытворчасці згодна ўказанням цэнтральнага плана.

www.kamunikat.org

Выкананне плана было крытэрыем аператыўнасці партыйнага і адміністрацыйнага кіраўніцтва рэспублікі. Над гаспадарчымі механізмамі рашуча дамінавалі фармалізм і дагматызм.

Ва ўмовах зніжэння прадукцыйнасці працы на пачатку шасцідзесятых гадоў у працоўных калектывах многіх прадпрыемстваў пачалася новая акцыя “змагання за званне брыгады камуністычнай працы”. Штогод да гэтага спаборніцтва прыступала каля 90% працоўных калектываў. Прысваенне калектыву такога звання гарантавала рабочым лепшую зарплату, а кіраўнікам адкрывала шлях да павышэння па службе.

## Дабрабыт эпохі Машэрава

Адстаўка Хрушчова ў 1964 г. выклікала таксама кадравыя змены ў рэспубліках. У сакавіку 1965 г. І сакратара ЦК КПБ Кірылу Мазурава замяніў Пётр Машэраў, які знаходзіўся на гэтай пасадзе да 1980 г. У юрыдычных умовах савецкага ладу выявіўся ён як аператыўны адміністратар. Пад ягоным кіраўніцтвам Беларусь заняла перадавое месца ў СССР як па развіцці гаспадаркі, так і па ўзроўню жыцця грамадзян рэспублікі. Машэраў намагаўся нават рэфармаваць савецкую сістэму на сваёй тэрыторыі, не парушаючы, вядома, яе ідэалагічных і юрыдычных асноў. Клапаціўся, каб дэпутатамі мясцовых Саветаў былі адукаваныя і аператыўныя людзі. У мясцовых Саветах ствараў камісіі, якія мелі распрацоўваць планы грамадскага і гаспадарчага развіцця сваёй тэрыторыі. Наваўвядзеннем было тое, што ў склад камісій можна было ўключаць у якасці спецыялістаў асоб, якія не былі дэпутатамі. Тэарэтычна ўзніклі ўмовы для прэзентацыі поглядаў асоб, якія фармальна не залежалі ад партыйнага апарату. Аднак у сапраўднасці ўлада заставалася ў руках сакратароў партыі, якія мелі права даваць дэпутатам загады і патрабаваць справаздач з іхняй дзейнасці. Па гэтай прычыне камісіі сталі ўсяго дарадчым органам, да рэкамендацый якіх можна было ставіцца абыякава.

Згодна Канстытуцыі СССР ад 1977 г. сацыялістычнае грамадства мела вылучацца самай высокай ступенню арганізаванасці, ідэйнасці і свядомасці працоўных мас. “Развітае сацыялістычнае грамадства - пісалася ў Канстытуцыі - заканамерны этап на шляху да камунізму”.

Машэраў з вялікім энтузіязмам ажыццяўляў гэтыя прынцыпы і несумненна правёў Беларусь цераз “заканамерны этап на шляху да камунізму”. У 1965-1980 гадах усе працаўнікі - 5 млн. чалавек - сталі членамі дзяржаўнапартыйных прафсаюзаў. Амаль сто працэнтаў

моладзі належала да камсамола, а лік членаў партыі перасягнуў 650 тыс. Амаль кожны адзінаццаты жыхар рэспублікі насіў пры сабе камуністычны білет.

У 1970-1985 гадах у Беларусі запушчаных было 186 чарговых новых прадпрыемстваў, мадэрнізаваліся многія дзеючыя заводы. Развіваліся перш за ўсё хімічная, машынабудаўнічая, металургічная, а таксама ў меншых тэмпах тэкстыльная і перапрацоўчая прамысловасць. Адсутнасць хаця б невялікай долі самастойнасці прадпрыемстваў стала прычынай нізкай прадукцыйнасці працаўнікоў. Прамысловасць усмоктвала вялікія колькасці сельскага насельніцтва, якое пакідала калгасы з-за нізкіх заробкаў і дрэнных умоў працы. Празмерная колькасць работнікаў на прадпрыемствах як вынік ідэалогіі, якая выключала з'яву беспрацоўя ў сацыялізме, рабіла немагчымай рацыянальную арганізацыю працы. Разбудаваная заводская адміністрацыя таксама перашкаджала дабіцца высокай эфектыўнасці беларускіх прадпрыемстваў.

БССР была поўнасцю залежная ад даставак сыравіны з Расіі. Таму перабоі ў дастаўках нафты, вугалю і газу, якія сталі паяўляцца з канца сямідзесятых гадоў, выклікалі застой цэлых галін прамысловасці.

Інвестыцыі ў хімічнай, машынабудаўнічай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці праводзіліся без уліку экалагічных патрабаванняў. Вакол прамысловых аб'ектаў узнікалі вялікія зоны забруджанай атмасферы і грунтавых вод ды прасторы без лясоў і ўсялякай расліннасці. Хімічная прамысловасць Беларусі нагадвала бомбу з запавольнікам. З часам штораз больш востра бачна было яе адмоўнае ўздзеянне на натуральнае асяроддзе.

Савецкія статыстыкі паведамляюць аб высокіх тэмпах развіцця беларускай прамысловасці да 1985 г. З 1970 г. вытворчасць машынабудаўнічай і хімічнай прамысловасці штогод павялічвалася на 30 працэнтаў. Аднак у пачатку васьмідзесятых гадоў савецкая гаспадарка вычарпала ўсе магчымасці развіцця. Пры існуючай цэнтралізаванай сістэме ўпраўлення і пры адсутнасці ўздзеяння якіх-небудзь рыначных механізмаў гаспадарчае жыццё кацілася па інерцыі. Ідэалогія ў перспектыве не магла замяніць эканамічных фактараў. У той час сярод работнікаў паўсюдным было перакананне, што зарплату даюць за прысутнасць на рабоце, а не за яе выкананне. Паўсюдная адсутнасць тэхналагічнай дысцыпліны з-за дэфіцыту адпаведных кампанентаў прыводзіла да выпуску вялікай колькасці няякасных тавараў. Каштоўнымі яны былі толькі для статыстыкі. У сапраўднасці было гэта марнатраўства сыравіны, энергіі і людской працы.

www.kamunikat.org

Таксама паспешліва будаваныя прамысловыя аб'екты ўжо ў ходзе іх эксплуатацыі прыводзілі да вялікіх страт энергіі і сыравіны. Афіцыйныя статыстыкі ў 1972 г. адзначылі, што 6,3% прадпрыемстваў давялі да беспадстаўных страт паліва, 7,1% - электраэнергіі і 6,5% - цяпла. Маштабы марнатраўства ў гэтых прадпрыемствах ніхто не вызначаў. Спробы выправіць якаснасць вытворчасці і абмежаваць страты, якія ўзніклі ў 1981-1985 гадах, выклікалі значнае падзенне тэмпаў росту колькасці прадукцыі, а амаль 7% фірм не выканалі гадавых планаў.

Намаганні правесці мадэрнізацыю прадпрыемстваў, якія чыніліся працуючымі там тэхнікамі і інжынерамі, звычайна насцярожвалі заводскую адміністрацыю і фабрычныя партыйныя камітэты. Бюракратычны апарат здаўна быў прывыклы выконваць загады, якія паступалі зверху. Ініцыятывы нізоў па ўдасканаленні вытворчых працэсаў праходзілі доўгі шлях атрымання адабрэння з боку людзей і ўстаноў, якія не заўсёды мелі непасрэднае дачыненне да прамысловасці. У 1978 г. была адхілена рэкордная колькасць - звыш 20 тыс. - рацыяналізатарскіх прапаноў, якіх мэтай было абмежаванне страт у ходзе прадукцыі.

Нягледзячы на адмоўныя з'явы, якія спадарожнічалі развіццю прамысловасці ў Беларусі, па савецкіх мерках была яна вельмі сучаснай і эфектыўнай. Новыя прадпрыемствы, напрыклад, фабрыкі апрацоўкі дыяментаў ці Мінскі гадзіннікавы завод выпускалі прадукцыю высокай якасці.

Ахілесавай пятой савецкай эканомікі была калектыўная сельская гаспадарка. Хаця на фоне ўсёй савецкай прасторы ў Беларусі былі найлепшыя паказчыкі сельскагаспадарчай вытворчасці, то ў параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі былі яны карыкатурна нізкія. У 1960 г. ураджайнасць збожжавых склала ўсяго 8,7 цэнтнера з аднаго гектара. Падобны плён дасягалі нашы продкі ў сярэднявеччы. Дзесяць гадоў пазней, у выніку забеспячэння калгасаў і саўгасаў тэхнікай і ўгнаеннямі, ураджайнасць з аднаго гектара ў Беларусі ўзрасла да 16 цэнтнераў, а ў пачатку васьмідзесятых - да 22 цэнтнераў. Былі гэта вынікі значна вышэйшыя за дасягненні сельскай гаспадаркі Расіі ці Украіны, але ў краінах Заходняй Еўропы, пры падобнай насычанасці сельскагаспадарчай тэхнікай, ураджайнасць была ўтрая большая.

Прычынай нізкай прадукцыйнасці працы калгаснікаў была перш за ўсё адстунасць якіх-небудзь стымулаў зацікаўлення яе вынікамі. Вялікія страты ў сельскай гаспадарцы наносілі крадзяжы калгаснай маёмасці, якія ўчынялі як праўленні, так і калгаснікі.

www.kamunikat.org

Астатнія кралі з прычыны нізкіх заробкаў. Значная частка страт была вынікам дрэннай арганізацыі жніўнай акцыі. Вялікае марнатраўства паўставала падчас транспарту збожжа і яго захоўвання. Між іншым, па гэтых прычынах беларускія калгасы не маглі нават наблізіцца да граніцы самаакупнасці і былі прыгавораны карыстацца датацыямі, якія ствараліся за кошт іншых галін гаспадаркі.

Прагрэс у галіне жывёлагадоўлі тармозіўся пастаяннай нястачай кармавых рэзерваў. Па гэтай прычыне калгасы ў вясенні перыяд вымушаны былі скарачаць пагалоўе быдла і свіней. Рэпрадукцыя статка як правіла патрабавала часу і вялікіх фінансавых затрат.

Нізкія заработныя платы і дрэнныя сацыяльныя ўмовы ў калгасах былі прычынай пастаяннага адтоку людзей з вёсак у гарады. Улады, каб зрабіць вёску падобнай на горад, у палове сямідзесятых гадоў пачалі ліквідаваць традыцыйную вясковую забудову і пераносіць жыхароў у вялікія жыллёвыя блокі, часта ўзведзеныя ў чыстым полі. У такі спосаб знішчаны былі астаткі вясковага традыцыяналізму і ўмоў да інтымнасці, якія даваў уласны дом. Статыстыкі паказвалі аптымістычны вобраз жыцця калгаснікаў, паведамлялі аб колькасці лазенек, тэлевізараў, радыятараў у іх кватэрах. За імі не было відаць адмоўных паслядоўнасцей знішчэння традыцыйнай вёскі - падзення народнай культуры, пашырэння п'янства, дэпрэсіі жыхароў новых блокаў.

У 1964 г. Вярхоўны Савет СССР ухваліў закон "Аб пенсіях і дапамозе членам калгасаў". Тады ўпершыню калгаснікі атрымалі пенсіённае забеспячэнне. У Беларусі ў 1966 г. пенсія складала толькі 12 рублёў у месяц. Сярэдняя зарплата калгасніка ў той час складала 38 рублёў, а самая нізкая ў пазасельскагаспадарчым сектары - 60 рублёў і была яна поўнасцю звольнена ад падаткаў. Пры Машэраве зарплаты калгаснікаў значна паправіліся. У 1968 г. мінімальная зарплата стала роўнай мінімальнаму заробку ў горадзе, а ў канцы сямідзесятых гадоў сярэдні заробак у сельскай гаспадарцы Беларусі склаў 157 рублёў і быў адным з вышэйшых у СССР.

Дынамічны рост нацыянальнага даходу Беларусі, які працягваўся пастаянна з пяцідзесятых гадоў, у канцы сямідзесятых значна запаволіўся. У ходзе выканання дзевятай пяцігодкі (1971-1975) сярэднія гадавыя тэмпы росту дасягнулі 8,3%, а ў наступнай пяцігодцы (1976-1980) - 5,1%. Хаця намінальныя зарплаты за гэты перыяд значна павялічыліся, рэальна яны падалі. Сярэднія тэмпы росту даходаў ва ўсёй дэкадзе сямідзесятых гадоў былі ўдвая меншыя чым у папярэднім дзесяцігоддзі. Апрача таго адмоўныя з'явы ў гаспадарцы ўказвалі на далейшае падзенне. Да паловы

www.kamunikat.org

васьмідзесятых гадоў не адбівалася гэта рашуча на стандарце жыцця жыхароў рэспублікі, бо згодна прынятай стратэгіі будовы камунізму дзяржава прымала на сябе штораз шырэйшы дыяпазон сацыяльнага забеспячэння грамадзян. У 1960-1985 гадах у сярэднім штогод на 20% узрасталі бюджэтныя выдаткі на адукацыю, культуру, спорт і ахову здароўя. Пры Машэраве сімвалічнымі сталі квартплаты, камунальныя і тэлефонныя паслугі, транспарт. У сапраўднасці выявіліся вельмі небяспечныя для гаспадаркі і савецкай дзяржавы тэндэнцыі. Тэмпы росту нацыянальнага даходу былі значна меншыя за тэмпы росту бюджэтных выдаткаў на сацыяльную сферу. Абавязкі дзяржавы ў адносінах да грамадства ўжо ў сямідзесятых гадах перасягалі ягоныя магчымасці. Апрача таго амаль трохкратнаму росту сярэдняй зарплаты ў 1971-1985 гадах спадарожнічаў толькі двухкратны рост вытворчасці, пры 3-працэнтнай інфляцыі для ўсяго перыяду. На пачатку васьмідзесятых гадоў з'явілася забытая ўжо нястача тавараў шырокага спажывання. У ашчадных касах накапіліся вялікія рэзервы грошай насельніцтва, на якія не было таварнага пакрыцця.

У грамадскай свядомасці эпоха Машэрава ўспрымалася як перыяд спакою і адноснага дабрабыту. Па гадах невераგодных намаганняў усяго грамадства пры адбудове знішчанай падчас вайны краіны і пры ўзвядзенні вялікіх будоў сацыялізму прыйшоў перыяд спажывання. Тэлевізар, радыёпрыёмнік, пральная машына, халадзільнік, адпачынак на Чорным моры сталі жыццёвым стандартам звычайнага жыхара Беларусі. Пасля некалькіх гадоў чакання кожны мог спадзявацца на кватэру ў адным з вялічэзных блокаў, якія выраслі на акраінах абласных гарадоў.

У пачатку васьмідзесятых гадоў амаль 70% насельніцтва Беларусі жыло ў гарадах. Перасяленне з калгасаў у гарады ўспрымалася як грамадскае і цывілізацыйнае павышэнне. Таму большасць жыхароў БССР жыло ў адчуванні поспеху, змен на лепшае. Прапаганда ўдачна замацоўвала гэтую карціну становучых пераўтварэнняў. Камуністычны лад, стварыць які імкнулася савецкае кіраўніцтва, меў быць яшчэ больш прываблівым. Таму ў сапраўднасці ў Беларусі не было ніякіх асяроддзяў, якія сумняваліся ў асноўных напрамках грамадскагаспадарчага развіцця краіны.

### Нарастанне гаспадарчага крызісу

Створаная ў ходзе выканання чарговых пяцігодак беларуская прамысловасць мела катастрафічны ўплыў на натуральнае асяроддзе.

www.kamunikat.org

Магутныя аб'екты ўзводзіліся ў рэкордных тэмпах. Мелі яны выпускаць прадукцыю і тым самым фарміраваць паказчыкі гаспадарчага прагрэсу. Абсталяванні, якія абмяжоўвалі колькасць атрутных выкідаў, значна павялічвалі інвестыцыйныя кошты і таму ўстанаўліваліся яны спарадычна.

У 1960-1985 гадах вытворчасць хімічнай прамысловасці павялічылася ў 49 разоў. У Беларусі выпускалася 25% хімічнай прадукцыі ўсяго Савецкага Саюза. Больш за 90% гэтай прадукцыі высылалася паза межы рэспублікі. У гарадах, у якіх знаходзіліся самыя вялікія хімічныя камбінаты - Наваполацку, Магілёве, Гомелі, Салігорску, Гродне, Бабруйску - забруджанасць паветра ў некалькі разоў перавышала дапушчальныя нормы. Беларуская прамысловасць патрабавала вялікіх капіталаўкладанняў для пабудовы ачышчальных установак. Тым часам рашуча скарачаліся фінансавыя магчымасці савецкай дзяржавы. І хаця гэтая прамысловасць служыла ўсяму Савецкаму Саюзу, вырашаць экалагічныя пытанні прыйшлося самім беларусам.

У кастрычніку 1985 г. XXVII З'езд КПСС нанава вызначыў планы "паскарэння сацыяльнаэканамічнага развіцця краіны", аднак гаспадарчая сістэма, пабудаваная на акасцянелых догмах камуністычнай ідэалогіі, аказалася зусім непадатлівай рэфармаванню. Карумпіраваная партыйная эліта не мела, апрача старых лозунгаў, ніякай ідэі ратавання непрадукцыйнай гаспадаркі. Ізаляванае ад рэшты свету савецкае грамадства не ўсведамляла становішча, у якім яно апынулася. Прапаганда паспяхова пераконвала грамадзян, што жывуць яны ў дзяржаве перадавой цывілізацыі. Тым часам узровень матэрыяльнага жыцця насельніцтва СССР быў незвычайна нізкі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы. Працяглая вайна ў Афганістане паскорыла працэс распаду савецкай эканомікі. Пачатак праўлення Міхаіла Гарбачова і абмежаванне дзейнасці цэнзуры адкрылі грамадству шматгадовы параліч савецкай гаспадаркі.

У Беларусі крызіс пачаўся крыху пазней. У 1988 г. адзначаны быў нават 8-працэнтны рост прамысловай вытворчасці. Аднак крызіс у Расіі і іншых рэспубліках хутка распаўсюдзіўся і на Беларусь. З'явіліся складанасці з забеспячэннем у сыравіну, якой 90% завозілася звонку. Скараціўся таксама рынак збыту вырабаў беларускай прамысловасці. Больш за 80% гатовых тавараў раней высылалася ў Расію, Украіну, Сярэднюю Азію і Закаўказзе. У выніку распаду структур савецкай дзяржавы ў 1990 г. усе планы стратэгічнага развіцця гаспадаркі страцілі актуальнасць. Ранейшыя кааператыўныя міжрэспубліканскія пагадненні сталі несапраўднымі. З-за браку

www.kamunikat.org

вузлоў, якія выпускаліся паза межамі Беларусі, значную частку вырабаў нельга было паставіць на рынак. Па гэтай прычыне ўлады рэспублікі рабілі ўсё магчымае, каб захаваць гаспадарчыя сувязі з іншымі палітычнымі суб'ектамі, якія пачалі вырысоўвацца пасля развалу Савецкага Саюза, асабліва з Расіяй, галоўным пастаўшчыком сыравіны і спажыўцом тавараў беларускай прамысловасці.

Вынікі развалу СССР неўзабаве знайшлі адбітак у беларускай гаспадарцы. У 1992 г. зафіксаваны быў 10-працэнтны спад прамысловай вытворчасці і быў гэта толькі пачатак працэсу, які з яшчэ большым напружаннем развіваўся ў наступных гадах. Лавінна расла колькасць нерэнтабельных прадпрыемстваў. Увядзенне Расіяй рыначных цэн нафты і газу выклікала параліч беларускай хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці і падзенне валавога нацыянальнага прадукту ў 1993 г. на 31% і нацыянальнага даходу на 20%. Інфляцыя перасягала 400% у год.

### Паслядоўнасці аварыі на Чарнобыльскай АЭС

Вялікі ўплыў на палітычную, грамадскую і гаспадарчую сітуацыю рэспублікі аказалі паслядоўнасці аварыі на Чарнобыльскай АЭС, якая адбылася 26 красавіка 1986 г. На Беларусь апала тады звыш 70% радыеактыўных выкідаў з палаючай атамнай электрастанцыі. Забруджанню падвяргласся чацвёртая частка рэспублікі, а найбольш ад аварыі пацярпелі Гомельская і Магілёўская вобласці. У зоне высокага забруджання цэзіем-137 апынулася больш за 2,2 млн. чалавек, амаль пятая частка насельніцтва Беларусі.

Дапамогу пацярпелым ад аварыі ўскладняла пазіцыя цэнтральных і рэспубліканскіх савецкіх улад. У той час, калі ў паветры ўтрымлівалася высокая канцэнтрацыя радыеактыўнага пылу, факт гэты ўтойваўся ад грамадства. Улады не рашыліся адмовіцца ад традыцыйных першамайскіх шэсцяў, у якіх як штогоду прыняла ўдзел большасць жыхароў забруджанай зоны. Пад забруджаным радыеактыўнымі выкідамі небам маршыравалі дзеці і моладзь. Калі весткі пра чарнобыльскую аварыю дайшлі да шырокага грамадства, камуністычная прапаганда намагалася мінімалізаваць памеры трагедыі, даказваючы людзям, што прабыванне на забруджанай тэрыторыі не нясе з сабой ніякай пагрозы. Службы, якія павінны былі несці насельніцтву ратунак у выпадку радыеактыўнага забруджання, аказаліся непадрыхтаванымі да такой акцыі. Партыйныя камітэты, адміністрацыя, службы бяспекі пасіўна і бяздарна паставіліся да пагрозы, якая павісла над насельніцтвам.

www.kamunikat.org

Мясцовыя наменклатурныя работнікі ў першую чаргу заняліся эвакуацыяй сваіх сем'яў у бяспечныя раёны краіны. І сакратар ЦК КПБ Мікалай Слюнькоў і прэм'ерміністр Міхаіл Кавалёў у шматлікіх публічных выступленнях заяўлялі, што аварыя на Чарнобыльскай АЭС мае лакальны характар і ў найменшай ступені не пагражае бяспецы насельніцтва Беларусі.

Да дэзінфармацыі грамадства прычыніліся таксама медыцынскія службы, якіх прадстаўнікі сваім аўтарытэтам пераконвалі насельніцтва аб адсутнасці небяспекі пасля чарнобыльскай аварыі. Рэкорд неадказнасці і некампетэнтнасці ўстанавіў начальнік Галоўнага санітарнаэпідэміялагічнага ўпраўлення, а заадно віцэміністр аховы здароўя Віктар Бур'як, які, спасылаючыся на маскоўскіх вучоных, даказваў, што можна бяспечна жыць у зоне, дзе забруджанасць у некалькі дзесяткаў разоў перавышае прызнаныя за бяспечныя для здароўя нормы.

Дапамогу насельніцтву ўскладняў таксама выезд з забруджаных раёнаў часткі лекараў, чыноўнікаў і спецыялістаў па ліквідацыі паслядоўнасцей радыеактыўнага забруджання. На працягу некалькіх дзён не праводзілася эвакуацыя насельніцтва з забруджаных зон, прабыванне ў якіх пагражала смерцю. Савецкія эліты праяўлялі бяспрыкладную абыякавасць у адносінах да суграмадзян.

Толькі 4 мая пры мяжы з Украінай вызначана была 30-кіламетровая зона, з якой усё насельніцтва падлягала абавязковай эвакуацыі. У паўднёваўсходняй Беларусі вызначана 485 населеных пунктаў, прабыванне ў якіх прызнана было небяспечным для людскога здароўя і жыцця. Больш за 20% сельскагаспадарчай плошчы краіны было прызнанай непрыгоднай для раслінаводства. З гаспадарчага карыстання выключаных было 15% лясной тэрыторыі рэспублікі.

Найбольш балючымі для Беларусі аказаліся дэмаграфічныя паслядоўнасці чарнобыльскай аварыі. Шматлікія выпадкі захворванняў немаўлят на рака крыві, касцявога мозгу, хваробы стрававальнага апарату, дыхальных шляхоў і агульнае аслабленне арганізму паўплывалі на рашучае змяншэнне колькасці нараджэнняў. Адначасна расла колькасць сконаў людзей у розным узросце. У 1992 г. у Магілёўскай вобласці памерла на 8% людзей больш чым нарадзілася. Год пазней паказчык гэты дасягнуў 19,4%, а ў 1994 г. - 29,6%. Боязь перад кволасцю патомства схіляла жанчын стрымоўвацца ад мацярынства, асабліва калі стан медыцынскай і сацыяльнай апекі з боку дзяржавы прыгаворваў бацькоў на адзіноцтва ў выпадку хваробы ці інваліднасці дзіцяці ў выніку пашкоджання генетычнага кода аднаго з бацькоў. З 1990 г. у Беларусі наглядаецца адмоўны

www.kamunikat.org

прырост насельніцтва. У 1994 г. склаў ён -1,9% .

Свядомасць пастаяннага прабывання ў забруджанай зоне спараджала многа паталогій псіхалагічнага характару. У большасці людзей з'явіўся асаблівы пастаянны стрэс, у аснове якога ляжала боязь за сваю і патомства будучыню. У раёнах наяўнасці гэтага масавага і хранічнага стрэсу паўсюднай з'явай было расстройства нервовай сістэмы, якое ахапляла вялікія групы насельніцтва. У штодзённым жыцці праяўлялася яно ў апатыі, неахайнасці, паўсюдным бязладдзі, ігнараванні ўсялякіх законных, этычных і маральных нормаў.

Паводле ацэнак ад 1992 г., на ліквідацыю паслядоўнасцей аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Беларусі спатрэбіцца 235 млрд. Доляраў. У гэтую суму ўлічаны страты, выкліканыя пагаршэннем стану здароўя грамадзян рэспублікі, абмежаваннем іх працаздольнасці і прадукцыйнасці, адмоўнымі дэмаграфічнымі працэсамі, неабходнасцю фінансаваць лячэнне хворых і аказваць сацыяльныя паслугі тым, якія ў выніку радыяцыі страцілі здольнасць зарабляць на сваё ўтрыманне. Другую групу страт складаюць матэрыяльныя каштоўнасці Беларусі - выключаныя з гаспадарчага ўжытку палі, лясы, воды, прамысловыя аб'екты і жыльлёвыя рэсурсы ў адселенай зоне.

На ліквідацыю паслядоўнасцей аварыі з бюджэту БССР у 1986-1990 гадах выдзелена было 29 млрд. доляраў, што склала 17% пяцігадовага нацыянальнага даходу рэспублікі. Ахінуты гаспадарчым і фінансавым крызісам Савецкі Саюз не выдзеліў з цэнтральнага бюджэту ніякіх сродкаў на дапамогу Беларусі. Расія і Украіна, хаця былі забруджаны ў меншай ступені, самі мелі вялікія клопаты з ліквідацыяй паслядоўнасцей аварыі. Развал СССР у 1991 г. пакінуў Беларусь у самоце ў змаганні з гіганцкімі праблемамі, несуразмернымі да магчымасцей дзяржаўнага бюджэту і інтэлектуальнага ўзроўню эліты, прывыклай выконваць загады Масквы. Адсутнасць вопыту і ўмеласці трымаць сябе ў свеце кіраўніцтва суверэннай Беларусі стала прычынай таго, што замежная дапамога па ліквідацыі паслядоўнасцей чарнобыльскай аварыі абмежавалася да сімвалічных памераў. Значна большыя сродкі накіраваны былі ў Расію і Украіну, паколькі палітыкі гэтых дзяржаў сумелі адпаведна зацікавіць гэтай праблемай заходнюю грамадскую думку.

Паслядоўнасці чарнобыльскай аварыі яшчэ больш ускладнілі экалагічнае становішча Беларусі. У 1990 г. прамысловаць выкінула ў атмасферу 4 млн. тон атрутных рэчываў. Забруджанасць паветра вакол вялікіх цэнтраў хімічнай прамысловасці - Магілёва, Гомеля, Светлагорска, Салігорска, Наваполацка - была нязначна меншай чым

www.kamunikat.org

у чарнобыльскай зоне. Сельская гаспадарка ўжо многія гады ў раслінаводстве прымяняла празмерныя колькасці штучных угнаенняў і пестыцыдаў. Якасць харчоў і забруджанне натуральнага асяроддзя, між іншым, паўплывалі на тое, што сярэдняя працягласць жыцця ў Беларусі ў пачатку дзевяностых гадоў была адной з самых нізкіх у Еўропе.

**Русіфікацыя**

Палітычная адліга пасля смерці Сталіна не мела, аднак, ніякага ўплыву на нацыянальную палітыку савецкіх улад. Падчас міжрэспубліканскай партыйнай канферэнцыі ў Ташкенце ў жніўні 1956 г. ухвалена была дэкларацыя, у якой сцвярджалася, што руская мова павінна стаць другой роднай мовай для ўсіх савецкіх народаў і элементам узбагачэння лексікі мясцовых моў. Гэтая тэндэнцыя ішла ўразрэз са спадзяваннямі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі і часткі партыйнай эліты. Гэтае асяроддзе паўсюдна чакала пашырэння роднай мовы ў публічным жыцці, спадзявалася, што сужыццё народаў Савецкага Саюза будзе наладжана на інтэрнацыяналістычных асновах. Сваю палітыку беларусізацыі спрабаваў весці І сакратар ЦК КПБ Кірыла Мазураў. Лічыў ён, так як многія іншыя камуністы, што неабходным элементам дэмакратызацыі з'яўляецца развіццё нацыянальнай культуры. Неўзабаве, аднак, калі больш выразнымі сталі прынцыпы нацыянальнай палітыкі Мікіты Хрушчова, Мазураў, як прыкладны камуніст, пакінуў свае ідэі ў карысць праграмы партыі. Паводле кіраўніцтва КПСС, русіфікацыя мела быць адным з асноўных элементаў цэментавання савецкай дзяржавы.

Падчас візіту Хрушчова ў Мінск у студзені 1959 г., прымеркаванага да 40-годдзя ўзнікнення БССР, І сакратар КПСС шматкратна паўтарыў публічна: “Чым хутчэй усе мы будзем гаварыць паруску, тым хутчэй пабудуем камунізм”. У прысутнасці членаў ЦК КПБ папракнуў ён Кірылу Мазурава за тое, што падчас урачыстай канферэнцыі ўводны даклад зачытаў на беларускай мове.

У сакавіку 1960 г. партыйную арганізацыю ў Беларусі ўзначаліў Пётр Машэраў, які даў пачатак паскоранаму пераводу школ з беларускай мовай навучання на рускую. Беларусь у канцэпцыях Машэрава, які некрытычна выконваў палітычную лінію кіраўніцтва КПСС, мела стаць мадэльным прыкладам савецкай нацыянальнай палітыкі, якой канчатковай мэтай было стварэнне на тэрыторыі СССР адзінай гістарычнай і культурнай супольнасці - савецкага народа. Значыць, вышэйшыя інтарэсы камунізму патрабавалі адрачэння ад

www.kamunikat.org

уласнай тоеснасці, нацыянальнай свядомасці, мовы і культуры. Трагедыяй Беларусі было тое, што яе правадыры, у адрозненні ад партыйных эліт прыбалтыйскіх рэспублік, былі глыбока перакананы ў патрэбе рэалізацыі гэтай стратэгіі нацыянальнай палітыкі і руплiва ажыццяўлялі ўсе русіфікатарскія канцэпцыі.

З 1960 г. большасць культурных устаноў Беларусі стала пераходзіць на рускую мову. У 1960 г. толькі 26,5% найменняў кніг надрукаваных было на беларускай мове, а дзесяць гадоў пазней - 12,3%. Змест літаратуры на беларускай мове знеахвочваў чытачоў карыстацца кніжкамі на роднай мове. Моладзь з творчасцю класікаў беларускай літаратуры знаёмілася на аснове рускамоўных перакладаў.

Згодна рашэнню ЦК КПБ ад красавіка 1959 г. "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў Беларускай ССР" беларуская мова стала прадметам, якога выкладанне залежала ад волі вучняў і іх бацькоў. Выкладанне беларускай мовы ў гарадскіх школах у прынцыпе спынілася ўжо ў шасцідзесятых гадах. Навучанне на беларускай мове вялося пераважна ў вясковых і маламестачковых школах. У 1985 г. на беларускай мове працавала толькі 23% сярэдніх школ у рэспубліцы. Аднак вясковай моладзі, якая паступала на вучобу або працу ў гарады, веданне рускай мовы станавілася неабходнасцю.

Выхаваўчая сістэма, літаратура, тэлебачанне, радыёвяшчанне, савецкая кінематаграфія вучылі думаць агульнасавецкімі катэгорыямі. У свядомасці большай часткі насельніцтва Беларусь захоўвала ранг адміністрацыйнай адзінкі Савецкага Саюза, геаграфічнай краіны. Не спадарожнічалі гэтаму ніякія каштоўнасці, ствараючыя культурную, гістарычную і этнічную супольнасць. Спроба пабудаваць у Беларусі савецкі народ завяршылася немалым поспехам. Перашкодай у поўнай удачы гэтага эксперыменту стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС, якая падарвала давер да савецкай улады. У 1988 г. археолаг Зянон Пазьняк выявіў праўду аб Курапатах. Магілы пад Мінскам, месца пакутнай смерці соцень тысяч людзей, адкрылі не толькі жудасныя злачынствы сталінскага рэжыму, але таксама двудушнасць і хлуслівасць савецкай прапагандысцкай сістэмы. Ва ўмовах гарбачоўскай перабудовы і свабоды слова таксама і ў Беларусі ўзніклі структуры апазіцыйных рухаў. Разам з дэмакратызацыяй публічнага жыцця з'явіўся пастулат адраджэння беларускіх нацыянальных каштоўнасцей.

# Суверэнная Беларусь

## Дэмакратычная апазіцыя і нацыянальнае адраджэнне

Вялікае хваляванне сярод беларускай інтэлектуальнай эліты выклікала “Пісьмо рускаму другу”, напісанае ў 1976 годзе ананімным аўтарам і перадаваемае з рук у рукі ў шматтысячных копіях. У той час партыйная адміністрацыя ажыццяўляла хрушчоўскі тэзіс: чым хутчэй перастанем размаўляць пабеларуску, тым хутчэй пабудуем камунізм, распаўсюджваючы адначасна лозунг аб раўнапраўнасці беларускай і рускай моў. Ананімны аўтар прадставіў тады катастрафічны стан беларускай культуры і школьніцтва, якія служылі дэнацыяналізацыі беларусаў і параўнаў гэтае становішча да роўнасці шанцаў Чырвонай Шапачкі і Шэрага Ваўка.

Адліга ў СССР, якая пачалася з прыходам да ўлады Міхаіла Гарбачова, найхутчэй паўплывала на змены ў Прыбалтыцы і самой Расіі. У Беларусі партыйны і адміністрацыйны апарат з вялікай рашучасцю абараняў ідэалы камуністычнай дзяржавы. Дадатковай псіхалагічнай перашкодай, якая замінала правядзенню палітычных змен у Беларусі, была глыбокая русіфікацыя беларускіх партыйных і інтэлектуальных элітаў. Рэформы па ўзору тых, якія адбываліся ў прыбалтыйскіх рэспубліках, патрабавалі прынамсі ўвядзення беларускай мовы і культуры ў публічны ўжытак. Лозунгі аб беларусізацыі, якія нясмела выносіліся ў палове васьмідзесятых гадоў нешматлікімі прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі, работнікамі партыйнага апарату ўспрымаліся як абвінавачанні ў здрадніцтве. Тое, што яны, як функцыянеры савецкай дзяржавы, учынілі ў галіне русіфікацыі асветы, культуры і публічнага жыцця было жахлівым сведчаннем іх адносін да беларускага нацыянальнага пытання. Беларусь стала адной з нешматлікіх савецкіх рэспублік, да якой ідэі гарбачоўскай перабудовы даходзілі з вялікім спазненнем.

Першым прадвесцем таго, што грамадства ўсумнілася ў савецкім ладзе, было наладжанне ў красавіку 1986 г. у старажытным квартале Мінска абраду гукання вясны. Арганізатарамі гэтага мерапрыемства былі выкладчыкі Мінскага мастацкага вучылішча Аляксей Марачкін і Мікола Купава разам са студэнтамі. Абрад адклікаўся да старадаўніх буларускіх традыцый, аднак насычаны быў сучасным кантэкстам і шматлікімі палітычнымі намёкамі. У ходзе інсцэнізацыі студэнты і гледачы былі разагнаны ветэранамі афганскай вайны і баявымі дружынамі камсамольцаў.

www.kamunikat.org

У другой палове васьмідзесятых гадоў дэманстраванне апазіцыйнасці ў адносінах да рэжыму стала моднай формай паводзін у інтэлігенцкіх асяроддзях. Аднак справядлівасці шукалі яны ў Маскве. Нават скаргі на русіфікатарскую палітыку мясцовых камуністычных правадыроў накіроўваліся І сакратару Цэнтральнага Камітэта КПСС. “Пісьмо 28-мі” ад снежня 1986 г., адрасаванае Міхаілу Гарбачову, падпісанае мастакамі, акцёрамі і вучонымі было ў прынцпе просьбай спыніць хрушчоўскую нацыянальную палітыку ў Беларусі. Са зместу пісьма вынікае, што ягоныя аўтары чакалі ад Крамля загаду савецкай адміністрацыі і партапарату адмяніць сваё стаўленне да беларускай мовы і культуры. Патрабавалі яны ад Гарбачова прысвоіць беларускай мове статус асноўнай у рабоце партыйнай і дзяржаўнай адміністрацыі, беларусізаваць школьніцтва, кінематаграфію і сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі. Да “Пісьма” на сямі старонках аўтарамі прыкладзены быў рапарт аб стане беларускай асветы і культуры.

Зварот беларускіх інтэлектуалаў, на здзіў саміх зацікаўленых, сустрэўся са станоўчым водгукам ЦК КПСС. У Мінск падалася адмысловая камісія для вывучэння справы. Аднак вынікі яе працы, прадстаўленыя пазней І сакратаром ЦК КПБ Яфрэмам Сакаловым, сведчылі аб адваротным - у БССР панавала поўная свабода развіцця беларускай мовы і культуры. У якасці прыкладу Сакалоў прывёў выданне 35-томнай Энцыклапедыі народнай творчасці і 10 тамоў твораў Леніна на беларускай мове.

“Пісьмо 28-мі” было аднак істотным крокам, які адкрыў магчымасць дыскусіі аб становішчы беларускай культуры і мовы ў БССР. І хаця з партыйных трыбун аўтары “Пісьма” падвяргаліся розным абвінавачанням, якія пасля распаўсюджваліся сродкамі масавай інфармацыі, аднак ужо справу нельга было вырашыць на ўзроўні Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Аўтары “Пісьма” не мусілі ўжо баяцца ні грамадскага, ні сяброўскага астракізму.

4 чэрвеня 1987 г. з Беларусі было выслана чарговае “Пісьмо” Гарбачову, пад якім падпісаліся 134 грамадзяніны рэспублікі - прадстаўнікі розных грамадскіх і прафесійных асяроддзяў. Хаця копіі гэтага “Пісьма” былі разасланы ўладам і партыйным газетам у Беларусі, не выклікала яно ніякай рэакцыі з боку адрасатаў.

Некалькі месяцаў пазней у цэнтры Мінска прайшла першая дэманстрацыя пад лозунгам асуджэння віноўнікаў сталінскага генацыду і спынення русіфікацыі рэспублікі. Нагодай для выступленняў стала святкаванне Дзядоў. Дэманстрацыя ад 30 кастрычніка, у якой удзельнічала некалькі соцень студэнцкай моладзі

www.kamunikat.org

і падчас якой злачынствы Сталіна ўпершыню былі параўнаны з генацыдам Гітлера, пераламала нейкі псіхалагічны бар'ер, што стрымліваў людзей ад шчырых выказванняў на тэму цёмных бакоў эпохі камунізму.

У другой палове 1987 г. у Беларусі паўстала некалькі соцень нефармальных маладзёжных суполак. Хаця большая частка іх не мела палітычнага характару, аднак у нейкай ступені змяншалі яны манаполію патрыі на арганізаванне грамадскага жыцця. Больш 60% студэнтаў мінскіх вышэйшых навучальных устаноў было членамі нефармальных суполак, якія дзейнічалі ў сталіцы Беларусі. Таксама дынамічна актывізаваліся інтэлігенцкія асяроддзі ў іншых абласных гарадах. Неўзабаве малалікія групы пачалі аб'ядноўвацца ў большыя арганізацыі, якія ў 1988 г. налічвалі па некалькі соцень членаў. Былі гэта перш за ўсё інтэлігенцкія дыскусійныя згуртаванні. Падчас арганізацыйных сустрэч панавала сапраўдная эйфарыя з прычыны раптоўна атрыманай свабоды слова. Тысячы чалавек хацелі папраўляць камуністычны свет, не аспрэчваючы, аднак, яго фундаментальныя асновы. Толькі некаторыя маладзёжныя суполкі - мінская "Талака", гродзенская "Паходня" - выступалі за вяртанне беларускай нацыянальнай сімволікі, стварэнне беларускай нацыянальнай арміі і ўвядзенне беларускага грамадзянства. Паколькі гэтыя пастулаты заклікалі ігнараваць канстытуцыю СССР, не атрымалі яны, аднак, шырэйшай грамадскай падтрымкі.

Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі наладзілі шэраг кантактаў з асяроддзямі Вільні, Львова, Масквы, Кіева, Пецярбурга, якія аспрэчвалі савецкі лад. Быў гэта нізавы рух, які імкнуўся рэфармаваць савецкую рэчаіснасць. Меў ён выключна элітны характар і таму паза яго ўздзеяннем апынулася большасць жыхароў рэспублікі.

Несумненна пачаткам палітычнага пералому ў Беларусі было апублікаванне ў чэрвені 1988 г. рэдакцыяй элітнага штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" артукула археолага Зянона Пазьняка і інжынера Яўгена Шмыгалёва Курапаты. Дарога смерці. Рэдакцыйны калектыў рашыўся, насуперак пазіцыі ЦК КПБ, надрукаваць матэрыял аб злачынствах НКУС у Беларусі ў канцы трыццатых гадоў. Змест артыкула ў штотыднёвіку, які выйшаў 8-тысячным тыражом, на працягу некалькіх дзён стаў у Беларусі агульнавядомым. З'явіліся перадрукі ў замежных перыядычных выданнях. Беларускія ўлады былі вымушаны стварыць спецыяльную камісію для праверкі сапраўднасці фактаў прыведзеных Пазьняком і Шмыгалёвым. У камісію ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў,

www.kamunikat.org

Міністэрства абароны, пракуратуры, Акадэміі навук, і грамадскіх арганізацый. Больш года спатрэбілася камісіі для сцвярджэння, што дзесяткі тысяч шкілетаў зарытых у лесе каля Курапатаў - гэта астанкі ахвяр НКУС і што з курапацкіх магіл пасля вайны неакрэсленая іх колькасць была вывезена ў невядомым напрамку. На думку Пазьняка, у 1937-1940 гадах у Курапатах загінула амаль чвэрць мільёна жыхароў Беларусі.

Два месяцы пасля апублікавання вышэйзгаданага артыкула ў Мінску заснавалася група з назвай Камітэт58, якая мела заняцца падрыхтоўкай да стварэння рэспубліканскай арганізацыі па збору інфармацыі і дакументацыі ўсіх злачынстваў, учыненых камуністычным рэжымам на беларускім народзе. Узначалілі Камітэт Зянон Пазьняк і вядомы беларускі пісьменнік Васіль Быкаў. 19 кастрычніка 1988 г. адбыўся з'езд, на якім 350 дзеячаў ператварылі арганізацыю ў Беларускае гісторыкаасветнае таварыства памяці ахвяр сталінізму "Мартыралог Беларусі" і выбралі яго ўлады з Зянонам Пазьняком на чале. Удзельнікі з'езда сфармулявалі палітычныя пастулаты, патрабуючы "асуджэння палітычнай сістэмы сталінізму і сталіншчыны, гвалтоўных і недэмакратычных метадаў вырашэння сацыяльных, палітычных і эканамічных праблемаў". Адначасна на гэтым жа з'ездзе "Мартыралога Беларусі", па ўзору прыбалтыйскіх краін, створаны быў арганізацыйны камітэт Беларускага народнага фронту за перабудову "Адраджэньне" (далей: БНФ). У сувязі з тым, што народныя франты Літвы, Латвіі і Эстоніі прад'яўлялі пастулаты дэмакратычнанезалежніцкага характару, ход падзей у Мінску насцярожваў Маскву і правячых у Беларусі камуністаў. Некалькі месяцаў раней І сакратар ЦК КПБ Яфрэм Сакалоў запэўніваў у Маскве цэнтральныя савецкія ўлады, што ў Беларусі народны фронт не ўзнікне. У жніўні 1988 г. у ходзе падрыхтоўкі дзеячаў Камітэта58 да з'езда камуністычныя ўлады вырашылі стварыць сваю арганізацыю з назвай Беларускі народны фронт, кіраўніцтва якога было даручана І сакратару Мінскага гарадскога камітэта КПБ Пятру Краўчанку. Створаны камуністамі фронт не знайшоў прыхільнікаў і не апраўдаў сябе. Затое расло значэнне арганізацыі Пазьняка. У рады БНФ уступала перш за ўсё інтэлігенцыя, сімпатызавала з ім частка членаў партыі, якія ў гэтай арганізацыі бачылі сілу здольную адрадзіць нацыянальную ідэю.

30 кастрычніка 1988 г. у дзень святкавання Дзядоў у Мінску адбылася вялікая дэманстрацыя. Дзесяткі тысяч людзей пад нацыянальнымі сцягамі рушылі ў напрамку Курапатаў ушанаваць памяць ахвяр сталінізму. Жорсткая атака міліцыі на дэманстрантаў

www.kamunikat.org

толькі замацавала ў грамадстве адмоўны вобраз улад. У канцы 1988 г. групы падтрымкі ідэі БНФ узніклі амаль ва ўсіх абласных гарадах Беларусі. БНФ пачаў выдаваць часопіс “Навіны”, аднак друкаваць яго вымушаны быў у Літве. Бэнэфаўская прапаганда адклікалася да беларускіх дзяржаўных традыцый Вялікага княства Літоўскага, барацьбы за незалежнасць, якой увасабленнем былі Тадэвуш Касцюшка і Кастусь Каліноўскі. Дзеячы БНФ легітымнасць беларускай дзяржаўнасці лічылі ад 25 сакавіка 1918 г., а ўсе дзяржаўныя арганізацыі ў Беларусі, якія існавалі пасля падзення Беларускай Народнай Рэспублікі, прызнавалі формамі акупацыйнай улады.

Лозунгі БНФ адначасна абвінавачвалі беларускія эліты ў нацыянальным здрадніцтве, прадстаўлянні інтарэсаў чужой дзяржавы, паклонніцтве ідэалогіі, якая загубіла мільёны людзей. З другога боку, у кантраляваных камуністычнай партыяй сродках масавай інфармацыі БНФ паказваўся як экстрэмісцкая нацыяналістычная арганізацыя, якая намагаецца парваць сувязі паміж Беларуссю і Расіяй, і рэлікт калабарацыяністкіх рухаў перыяду II сусветнай вайны.

У 1989 г. партыя страціла магчымасць кантраляваць увесь друк. Некаторыя газеты і часопісы, асабліва беларускамоўныя - “Звязда”, “Крыніца”, “Настаўніцкая газета”, “Полымя”, “Маладосць” - часта прапанавалі свае старонкі звязаным з БНФам людзям. Ідэя нацыянальнага адраджэння ставалася штораз больш папулярнай, асабліва сярод інтэлігенцыі. Большасць грамадства заставалася, аднак, пад уплывам камуністычнай прапаганды, распаўсюджваемай праз пасрэдніцтва тэлебачання, радыёвяшчання і рускамоўнага друку.

Атмасфера, якая спадарожнічала свабодзе слова, вельмі хутка дала вынікі ў выглядзе новых распрацовак па гісторыі Беларусі. Узніклыя новыя перыядычныя выданні - “Спадчына”, “Беларускі гістарычны часопіс”, “Беларуская мінуўшчына”, “Беларускі гістарычны агляд” - пераважна змяшчалі публікацыі, якія аспрэчвалі савецкія навуковыя дасягненні ў галіне гісторыі Беларусі. Гісторыкі пановаму пачалі прадстаўляць адносіны Беларусі з усімі суседзямі. З савецкага забыцця пачаў вяртацца вобраз народа, у якога ёсць свая гісторыя, культура, юрыдычныя і дзяржаўныя традыцыі. Аднак беларускім элітам не ўдалося новыя разумовыя плыні прышчапіць масам.

Пераважная большасць беларускага савецкага грамадства гатова была падтрымоўваць якія-небудзь палітычныя змены пад умовай, што паправяць яны эканамічнае становішча. Лозунг

“дэмакратыя” пачынаў грамадзянам Беларусі асацыявацца з анархіяй у інфармацыйнай сферы, развалам камуністычнай сістэмы каштоўнасцей, да якой былі яны прызвычаены і якая цяпер аспрэчвалася на кожным кроку. Для 2 мільёнаў ветэранаў II сусветнай вайны, якія з гонарам і пры кожнай нагодзе дэманстравалі ордэны, прысвоеныя ім за мужнасць і адвагу ў абароне Савецкага Саюза, неўспрымальнымі аказаліся тлумачэнні, якія давалі зразумець, што змагаліся яны за іншую форму акупацыі. Так прынамсі большасць іх успрымала тон антысталінскай і антыкамуністычнай рыторыкі некаторых публіцыстаў і апазіцыйных дзеячаў. Настойлівыя патрабаванні неадкладна правесці беларусізацыю насцярожвалі сотні тысяч лекараў, чыноўнікаў, інжынераў, настаўнікаў, якія баяліся стаць непрыдатнымі ў публічным жыцці па прычыне няведання беларускай мовы. Усе іхныя веды заснаваны былі на базе рускай тэрміналогіі. Выразна адмоўную пазіцыю ў справе нацыянальнага адраджэння заняла большасць амаль паўтарамільённай расійскай меншасці. Расіяне баяліся страціць ранейшае прывілеяванае становішча ў жыцці рэспублікі.

У пачатку 1989 г. у Беларусі вырысаваліся дзве выразныя палітычныя плыні - савецкая і нацыянальная. Паміж інтэлігенцкімі групоўкамі, якія выказаваліся за адну або другую плынь, знаходзілася дэзарыентаванае грамадства. Нарастанне гаспадарчага крызісу выклікала ў грамадстве рост апатыі і абыякавасці да ўсялякіх лозунгаў аб дэмакратыі і нацыянальным адраджэнні.

14 студзеня 1989 г. у Вільні адбыўся з’езд дэлегатаў 66 беларускіх маладзёжных арганізацый. Улады Беларусі не дазволілі правесці гэтае мерапрыемства ў Мінску. З’езд заснаваў Канфедэрацыю беларускіх маладзёжных суполак і падтрымаў ініцыятыву стварыць палітычную, некамуністычную і ўсенародную арганізацыю ў выглядзе Беларускага народнага фронту. Дэманстрацыя ў Мінску, арганізаваная Канфедэрацыяй і Аргкамітэтам БНФ, прыцягнула 40 тыс. чалавек. Упершыню ў такой форме ставіліся патрабаванні ліквідаваць запіс аб кіруючай ролі кампартыі, стварыць беларускія ваенныя фарміраванні, прысвоіць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы на тэрыторыі БССР.

Заснавальніцкі з’езд БНФ, у якім удзельнічала 400 дэлегатаў, адбыўся 24-25 чэрвеня 1989 г. у Вільні. Правесці яго на тэрыторыі Беларусі, як і раней для маладзёжных арганізацый, улады не дазволілі. Першапланавай мэтай БНФ з’езд назначыў адраджэнне мовы, культуры і беларускай нацыянальнай свядомасці. У прынятым

www.kamunikat.org

статуце арганізацыі гаварылася аб пабудове адкрытага грамадства ў духу дэмакратычных і гуманістычных каштоўнасцей, з пашанаваннем правоў нацыянальных меншасцей. У праграму БНФ занесены быў нават пастулат аб “адраджэнні ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі”. З’езд прыняў таксама пастанову, што БНФ будзе прытрымоўвацца канстытуцыі і заканадаўства БССР, аднак звярнуў увагу, што згодна канстытуцыі Беларусь - суверэнная дзяржава. Гэтую суверэннасць - на думку дэлегатаў - гарантаваў запіс аб вяршэнстве рэспубліканскага заканадаўства над саюзным. Аднак не быў гэта пастулат адлучэння Беларусі ад СССР, а толькі патрабаванне, каб савецкія ўлады прызналі, гарантаваную дзеючым правам, палітычную аўтаномію Беларусі ў складзе савецкай дзяржавы. Неадкладнай справай у рэспубліцы дэлегаты прызналі ліквідацыю паслядоўнасцей катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Узначалілі БНФ, апрача Пазьняка, прафесары Міхась Ткачоў і Юры Хадыка.

Летам 1989 г. дзеячы БНФ паспрабавалі стварыць незалежныя ад кампартыі беларускія прафсаюзы. У верасні прадстаўнікі 72 прадпрыемстваў заснавалі Арганізацыйны камітэт Рабочага саюза Беларусі, у склад якога ўвайшлі дзеячы БНФ Віктар Івашкевіч, Міхал Собаль і Сяргей Мухін. Абыякавае стаўленне рабочых да дэмакратычных і нацыянальных лозунгаў не дазволіла паўтарыць польскі сцэнарый. Незалежныя прафсаюзы згуртавалі ўсяго некалькі працэнтаў занятага насельніцтва і абмежавалі сваю дзейнасць выключна да сацыяльнай сферы.

У 1989 г. Камуністычная партыя Беларусі налічвала больш 700 тыс. членаў, у ліку якіх 71% складалі беларусы. Многія з іх у новай сітуацыі сталі шчырымі прыхільнікамі ідэі нацыянальнага адраджэння. Большасць членаў БНФ у момант заснавання арганізацыі былі камуністамі. Многія не ведалі беларускай мовы. З другога боку, сярод прадстаўнікоў кіруючых колаў КПБ былі шматлікія прыхільнікі беларусізацыі партыйных і дзяржаўных структур. Адным з іх быў І сакратар Мінскага гарадскога камітэта КПБ Пятро Краўчанка. Ад партыйнай інтэлігенцыі выйшла прапанова заснаваць Таварыства беларускай мовы (ТБМ), якога старшынёй стаў камуніст, вядомы абаронца роднай мовы, паэт Ніл Гілевіч. Таварыства адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы законапраектаў аб статусе беларускай мовы ў БССР, якая ў студзені 1990 г. рашэннем Вярхоўнага Савета стала адзінай дзяржаўнай мовай у Беларусі. Аднак значна часцей з боку партыйнай наменклатуры можна было пачуць нескрываную пагарду да дзяржаўнай мовы.

Змены ў БССР праходзілі галоўным чынам пад уплывам падзей,

www.kamunikat.org

якія адбываліся ў суседніх савецкіх рэспубліках, асабліва ў Літве, Латвіі і Украіне. На вуліцах беларускіх гарадоў, у адміністрацыі, школах, культурных установах і дамах большасці беларусаў паўсюднай была руская мова. Палітычная сітуацыя вакол Беларусі прымушала ствараць рэспубліканскае заканадаўства, якога ўжо само існаванне ўмацоўвала палітычную адасобленасць рэспублікі. У першай палове ліпеня 1990 г. незалежнасць абвясцілі Літва, Латвія, Эстонія, Украіна, а нават Расія. Беларускаму Вярхоўнаму Савету не выпадала рабіць нічога іншага, як толькі таксама абвясціць "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР". "Закон аб мовах у Беларускай ССР", які беларускай мове прысвойваў статус адзінай дзяржаўнай мовы, быў прыняты Вярхоўным Саветам, 80% дэпутатаў якога складалі камуністы. Пераважная іх большасць нават не карысталася роднай мовай. Аднак раней такія законы прынялі парламенты суседніх савецкіх рэспублік.

"Закон аб мовах" меў уступіць у сілу ў верасні 1990 г. Па прычыне няведання дзяржаўнымі чыноўнікамі беларускай мовы ажыццяўленне гэтага закона было адтэрмінавана. Паасобным ведамствам вызначаны былі тэрміны падрыхтоўкі да працы на аснове беларускай мовы. Да канца 2000 г. усе ўстановы, апрача школьніцтва нацыянальных меншасцей, мелі быць пераведзены на "дзяржаўную мову". Аднак на практыцы нямнога было зроблена для выканання гэтага закона. Дзяржаўныя чыноўнікі і партыйны апарат паўсюдна ігнаравалі абавязак беларусізацыі сваіх устаноў. З боку рускамоўных у сваёй большасці беларусаў таксама не было ціску на наменклатуру. Нават дзеячы новастворанных арганізацый, якія ўключыліся ў дэмакратызацыю палітычнага жыцця рэспублікі, не праяўлялі вялікага энтузіязму да нацыянальнай мовы. Часта яны самі не ўмелі сфармуляваць свае пастулаты на гэтай мове.

У атмасферы станаўлення незалежных дзяржаў на руінах Савецкага Саюза ў свядомасці грамадзян Беларусі расло значэнне беларускай мовы ў якасці асноўнага сродка зносін у сваёй дзяржаве. У выніку ціску інтэлігенцкіх асяроддзяў, дзеячаў БНФ, ТБМ і новастворанных палітычных партый Вярхоўны Савет ухваліў чарговыя законы, якія спрыялі ўмацаванню значэння роднай мовы. У чэрвені 1991 г. прыняты быў "Закон аб культуры", а ў кастрычніку - "Закон аб адукацыі". Абодва законы садзейнічалі беларусізацыі жыцця ў рэспубліцы. У 1991/1992 акадэмічным годзе ўсе педагагічныя інстытуты заняткі са студэнтамі пачалі весці на беларускай мове. Таксама першакласнікі, якія ў гэтым жа годзе пачалі навуку, мелі атрымоўваць веды на роднай мове. Старшакласнікам радыкальна

www.kamunikat.org

павялічана была колькасць урокаў “дзяржаўнай мовы”.

У 1989-1991 гадах паўсталі ўсе інстытуцкаправавыя формы, якія рабілі магчымым адраджэнне беларускіх нацыянальных каштоўнасцей - мовы, культуры, гістарычнай і нацыянальнай свядомасці. Гэты працэс, нягледзячы на перашкоды з боку прыхільнікаў старога ладу, ахопліваў штораз шырэйшыя грамадскія колы. Большасць грамадзян даходзіла да вываду, што будучыня ў сваёй дзяржаве патрабуе засваення дзяцьмі роднай мовы.

## Структурныя перамены 1989-1995 гадоў

Адсутнасць дэмакратычных традыцый і нізкі ўзровень палітычнай культуры грамадства сталі прычынай таго, што змены пасля 1989 г. адбываліся дзякуючы інтэлектуальным і палітычным элітам. Камунізм у людзях, якія мелі дачыненне да ўлады, укараніў дрэнныя прывычкі. Характэрныя ім перш за ўсё былі адмаўленне прынцыпу партнёрства ўлады і грамадзяніна, прысваенне першаму з гэтых фактараў дамінуючай пазіцыі, бюракратычная сістэма выдачы рашэнняў, якая выяўлялася ў шматлікіх дазволах, спраўках, пропусках. Сістэму, якая прыгаворвала людзей на пастаяннае чаканне, пакору і ўступчывасць у адносінах да ўладных структур, грамадства наогул лічыла нормай публічнага жыцця. У такім становішчы якоенебудзь самакіраванне, якое з’яўляецца асновай дэмакратыі, не магло існаваць. Змяніць гэты менталітэт магла толькі такая сіла, якая распараджалася поўнай уладай, шляхам яе паступовага самаабмежавання і перадачы кампетэнцый розным грамадскім арганізацыям і прадстаўнічым структурам. Ні з боку апазіцыі, а тым больш з боку рэжыму, не з’явіліся прапановы ўчыніць грамадства суб’ектам, уключыць яго ў працэс перабудовы грамадскапалітычнай сістэмы. Вялікі ўрок дэмакратыі, які пачаўся ў Беларусі ў пачатку дзевяностых гадоў, у прынцыпе абышоў бокам пераважную большасць грамадства. У далейшым заставалася яно аб’ектам уздзеяння з боку розных палітычных груповак, падатлівым на маніпуляцыю і некрытычнае стаўленне да дэмагогіі. Механізмы дэмакратыі паказаліся надта складанымі і чужымі, таму паўсюдна лічыліся яны не надта спраўным інструментам устанаўлівання ўлады.

У Беларусі адсутнічала грамадская перакананасць у тым, што воля народа можа ўплываць на ход палітычных працэсаў. Паўсюдна чакалася такая ўлада, якая забяспечыць справядлівасць і адносны дабрабыт. У грамадскім адчуванні формы ўстанаўлівання гэтай улады і метады яе выконвання мелі другараднае значэнне.

Нават калі злачынствы камунізму набылі шырокую вядомасць, помнікі Леніну, Дзяржынскаму і іншым бальшавіцкім героям не зніклі з цэнтральных плошчаў беларускіх гарадоў. Імёны вінаватых у генацыдзе бальшавікоў засталіся таксама ў назвах вуліц, калгасаў, прадпрыемстваў.

У 1990 г. упершыню адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет, падчас якіх кандыдытаў у дэпутаты маглі вылучаць г.зв. сходы жыхароў. У сітуацыі, калі адзінай арганізаванай сілай была КПБ, яе функцыянеры пераняла ініцыятыву ладзіць сходы для вылучэння кандыдатаў. Пяцьдзесят месц у Вярхоўным Савеце, у якім засядала 360 дэпутатаў, атрымалі падкантрольныя КПБ грамадскія арганізацыі - Беларускі саюз ветэранаў вайны і працы, Беларускае таварыства інвалідаў, Беларускае таварыства інвалідаў па зроку, Беларускае таварыства глухіх.

Апазіцыя пайшла на выбары арганізуючы Дэмакратычны блок, аснову якога складалі дзеячы БНФ. Апанаваны камуністамі Цэнтральны выбарчы камітэт месяц да выбараў адкінуў усіх кандыдатаў Дэмакратчынага блока. Толькі дэманстрацыя БНФ ад 25 лютага 1990 г., падчас якой прад'яўлены былі патрабаванні распусціць Цэнтрвыбаркам і КПБ, пасадзейнічала зарэгістраванню кандыдатаў ад апазіцыі на выбарчых спісках.

У першым туры галасавання 4 сакавіка 1990 г. выбраных было толькі 98 дэпутатаў, з ліку якіх 50 было дэлегаваных г.зв. грамадскімі арганізацыямі. Згодна палажэнню аб выбарах, дэпутацкі мандат атрымоўваў той кандыдат, які ў сваёй акрузе набраў 50% галасоў пры 50-працэнтнай прысутнасці грамадзян на выбарчых участках. У двух чарговых турах галасавання, да 10 мая 1990 г. агулам выбраных было 327 дэпутатаў. Амаль 86% народных дэпутатаў складалі члены КПБ. Дэмакратычны блок займеў 67 мандатаў, з таго ліку 26 месц атрымалі дэпутаты ад БНФ. Пасля некалькіх месяцаў фракцыя БНФ павялічылася да 36 дэпутатаў. Найбольшую падтрымку апазіцыя атрымала ў Мінску, у якім пражывала пятая частка ўсяго электарату Беларусі.

Першым старшынёю Вярхоўнага Савета стаў член Палітбюро ЦК КПБ Мікалай Дземянцей, а яго першым намеснікам - старшыня Дэмакратычнага блока Станіслаў Шушкевіч. Зянон Пазьняк узначаліў нешматлікую але кампактную фракцыю БНФ у складзе Дэмакратычнага блока. Старшынёю Савета Міністраў БССР назначаны быў Вячаслаў Кебіч.

Паўсюдныя выпадкі парушэння палажэння аб выбарах, а нават фальшаванне вынікаў выбараў, асабліва на правінцыі, давялі да

www.kamunikat.org

далейшай радыкалізацыі адносін паміж дзеячамі БНФ і камуністычныі ўладамі. 11 мая Сойм БНФ, вярхоўны орган гэтай арганізацыі паміж з'ездамі, увёў змяненні ў праграму. З гэтай пары мэтай БНФ стала дасягненне поўнай незалежнасці рэспублікі і вывад яе са складу СССР. Частка дзеячаў падтрымоўвала праект стварэння БалтыйскаЧарнаморскай федэрацыі, у якой апрача Беларусі апынуліся б Украіна, Літва і Латвія. Аднак аўтары гэтай ідэі не ўлічвалі ні пазіцыі партнёраў, ні эканамічных магчымасцей такога саюза. Канферэнцыя БНФ (форма нечарговага з'езда), якая адбылася ў Мінску 30 чэрвеня, адназначна выказалася за незалежнасць, перагледзела сваё стаўленне да "ленінскай нацыянальнай палітыкі", якая цяпер прызнавалася антынацыянальнай і антыгуманнай. Дэлегаты прад'явілі пастулат нацыяналізацыі маёмасці КПСС і камсамола ў Беларусі, адмены партыйнага кантролю за сродкамі масавай інфармацыі, судаводствам, арміяй, асветай і прадпрыемствамі. Ад сябраў БНФ, якія адначасна былі членамі КПБ, патрабавалася выступіць з партыі.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет мінімальнай большасцю галасоў абвясціў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР" у складзе савецкай федэрацыі. Гэты крок вымусіла вонкавая сітуацыя, асабліва абвяшчэнне незалежнасці Расіяй. Згаданае рашэнне, хаця не вынікала з пераканання і волі большасці дэпутатаў, адкрыла Беларусі шлях да сапраўднай незалежнасці. Аднак суверэнітэтам не была зацікаўлена таксама большасць беларускага грамадства.

У 12 артыкуле "Дэкларацыі" сцвярджалася, што "любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб праследуюцца па закону". Выступаць ад імя народа "Дэкларацыя" дазваляла выключна Вярхоўнаму Савету БССР (арт. 2). На тэрыторыі Беларусі ўстаноўлена вяршэнства Канстытуцыі і законаў (арт. 7). Пацвярджалася выключнасць беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай на тэрыторыі рэспублікі. "Дэкларацыя" давала ўраду права стварыць нацыянальную армію, рэспубліканскую міліцыю і службы бяспекі (арт.10). Камуністы прагаласавалі таксама за 11 артыкул аб неабходнасці падпісання новай саюзнай дамовы паміж рэспублікамі, якія ўваходзілі ў састаў Савецкага Саюза. Дэпутаты ад БНФ, якія выступалі супраць якіх-небудзь новых саюзаў з Расіяй, не ўдзельнічалі ў гэтай частцы пасяджэння.

Галоўным штуршком, які паўздзейнічаў на ход падзей у Беларусі, былі змены ў Расіі. Дэманстратыўнае выступленне Барыса Ельцына з КПСС выклікала ў Беларусі масавую здачу партыйных

www.kamunikat.org

білетаў. У многіх заводскіх і мясцовых структурах КПБ засталіся толькі штатныя работнікі. Падчас апошняга XXXI З'езда КПБ яе лідэр Яфрэм Сакалоў падняў трывогу, што калектывізм і інтэрнацыяналізм у Беларусі выцясняюцца сепаратызмам і нацыяналізмам. Партыя, калі перастала быць галоўным элементам дзяржаўнага апарату, а членства ў ёй - неабходнай умовай навуковай, прафесійнай або палітычнай кар'еры, сапраўды апынулася ў становішчы развалу.

Апрача КПБ і БНФ у 1990-1992 гадах у Беларусі з'явілася многа арганізацй, якія імкнуліся стаць палітычнымі партыямі. БНФ - на думку яго кіраўніцтва - не быў партыяй, а толькі грамадскім рухам, у якім дзейнічаць маглі прадстаўнікі розных палітычных плыняў - прыхільнікі незалежнасці Беларусі. Заснавальнікамі новых партый найчасцей былі колішнія дзеячы КПБ.

У чэрвені 1990 г. узнікла Нацыянальнадэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ). Была гэта нацыяналістычная арганізацыя, якая супрацiўлялася якомунебудзь супрацоўніцтву з камуністамі. Членства ў НДПБ абумоўлена было доказаннем прыналежнасці да беларускага народа і веданнем роднай мовы. Галоўнай мэтай партыі было змаганне за поўную незалежнасць і нацыянальнае адраджэнне. Яе кіраўнікі Аляксандр Емяльянаў і Віктар Навуменка засяроджваліся галоўным чынам на прыцягненні моладзі. Пасля некалькіх гадоў мала прыкметнай дзейнасці партыя знікла з палітычнай карты Беларусі.

Намнога большую ролю мела адыграць Аб'ядналая дэмакратычная партыя Беларусі (АДПБ), якая паўстала ў лістападзе 1990 г. у выніку аб'яднання некалькіх арганізацый ліберальнага ўхілу з Гродна, Мінска і Віцебска. АДПБ у сваёй дзейнасці кіравалася прынцыпам першаснасці інтарэсаў адзінкі над інтарэсамі грамадскіх і нацыянальных груп. Партыя падтрымоўвала працэс беларусізацыі, аднак супраціўлялася парушэнню інтарэсаў рускамоўнага насельніцтва. У гаспадарчай галіне лібералы ад АДПБ прапанавалі магчыма хуткую і ўсеагульную прыватызацыю ўсёй нацыянальнай маёмасці. Пераважную групу ў партыі складала тэхнічная інтэлігенцыя, юрысты і чыноўнікі. На II З'ездзе АДПБ у лістападзе 1991 г. падтрыманы былі тыя дзеянні, якія вялі да ўмацавання незалежнасці дзяржавы. Новым старшынёй стаў народны дэпутат, член Сойму БНФ Аляксандр Дабравольскі.

Дзеячы БНФ Міхась Ткачоў, Алег Трусаў, Мікалай Крыжаноўскі выступілі ініцыятарамі стварэння вясной 1991 г. левацэнтрысцкай Беларускай сацыялдэмакратычнай грамады (БСДГ). На думку заснавальнікаў, партыя мела быць платформай прыбліжэння і супрацоўніцтва для нацыянальных дзеячаў і прыхільнікаў рэформ у

камуністычным лагеры. БСДГ выказвалася за незалежнасць Беларусі, аднак не выключала магчымасці стварэння нейкай формы федэрацыі з іншымі краінамі, якія належаць да СССР. Грамадская і гаспадарчая праграма прадугледжвала магчымасць паступовай прыватызацыі нацыянальнай маёмасці, аднак пры ўмове забеспячэння бясплатнасці аховы здароўя і адукацыі, а таксама стварэння прыстойных умоў для пенсіянераў і маламаёмаснага насельніцтва. Першым старшынёю БСДГ стаў Міхась Ткачоў, а пасля ягонай смерці ў лістападзе 1993 г. - Алег Трусаў.

Заснавальнікам Беларускай сялянскай партыі (БСП) быў адстаўны палкоўнік Савецкай Арміі Яўген Лугін. БСП патрабавала вяртання зямельнай уласнасці і такой дзяржаўнай палітыкі, якая спрыяла б станаўленню фермерскіх гаспадарак, выказвалася за незалежнасць, прафесійную армію і захаванне нейтральнасці беларускай дзяржавы. Слабасцю гэтай партыі было тое, што большасць яе членаў не мела дачынення да сялянскага асяроддзя. Да яе праграмы не праявілі цікавасці ні калгаснікі, ні калгасная наменклатура. Гэтая апошняя, якая распараджалася гаспадаркамі ў некалькі тысяч гектараў, бюджэтнымі датацыямі, вялікімі ўплывамі ў мясцовых уладных структурах і амаль дармовай рабочай сілай, не мусілі баяцца банкруцтва. А калгаснікі ў сваю чаргу не ўмелі ўжо і не хацелі працаваць на ўласных гаспадарках. Не распараджаліся яны адпаведнай інфраструктурай - будынкамі, прыладамі, машынамі, цяглавай сілай - неабходнай для аднаасобніцкага гаспадарання. Прапагандаваная БСП ідэя сямейнафермерскіх гаспадарак не знаходзіла прыхільнікаў.

Створаная ў чэрвені 1991 г. Беларуская хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (БХДЗ) абвясціла сябе пераемніцай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, якая дзейнічала ў II Рэчы Паспалітай. У злучнасці пераважала інтэлігенцыя каталіцкага веравызнання, хаця ва ўладах былі прадстаўнікі праваслаўных і пратэстанцкіх асяроддзяў. Мэтай БЗХД была пабудова хрысціянскай мадэлі грамадскага жыцця, якая характарызавалася дэмакратычным спосабам станаўлення ўлады, павагай да прыватнай уласнасці, палітычным плюралізмам і сацыяльным забеспячэннем маламаёмасных.

У канцы 1991 г. у Беларусі існавала 20 арганізацый, якія лічылі сябе палітычнымі партыямі. Па словах лідэраў, налічвалі яны па некалькі соцень членаў. У сапраўднасці ў большасці гэтых арганізацый дзейнічала па некалькі дзесяткаў асоб. У палове 1993 г. адбылася фармальная рэгістрацыя палітычных партый. Неабходныя дакументы - статут, праграму і дэкларацыі мінімум 50 членаў - здолелі

прад’явіць 12 арганізацый. У іх ліку былі экалагічныя рухі, напрыклад Партыя зялёных, і згуртаванні рускіх нацыяналістаў, напрыклад Славянскі сабор “Белая Русь”.

Большасць лідэраў беларускіх апазіцыйных партый найважнейшай справай незалежнай дзяржавы лічылі стварэнне нацыянальнай арміі. Толькі 20% афіцэраў размешчанай у Беларусі Савецкай Арміі было беларусамі. Больш паловы афіцэрскага корпуса складалі расіяне, 20% - украінцы. Тым часам некалькі тысяч беларускіх афіцэраў служыла ў гарнізонах па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза. У кастрычніку 1991 г. па ініцыятыве БНФ і БСДГ дайшло да склікання I З’езда беларускіх вайскоўцаў, у якім прымалі ўдзел прадстаўнікі большасці савецкіх гарнізонаў. З’езд заснаваў Беларускае згуртаванне вайскоўцаў (БЗВ), якое ўзначаліў сацыялдэмакратычны дзеяч палкоўнік Мікола Статкевіч. Мэтай БЗВ было стварэнне беларускага нацыянальнага войска і абарона суверэнітэту Беларусі.

Рэальная ўлада ў арміі, якая дыслацыравалася на тэрыторыі Беларусі, заставалася ў руках савецкіх генералаў, часта расійскіх патрыётаў. Генералы прысягу давалі Савецкаму Саюзу і з новай дзяржавай не мелі яны нічога супольнага. Канфлікт паміж БЗВ і расійскімі генераламі быў непазбежны. У выніку прыдзірлівасці начальства частка сябраў БЗВ была вымушана пакінуць ваенную службу. Толькі ў лютым 1992 г., па прапанове дэпутатаў ад БНФ і Дэмакратычнага блока, Вярхоўны Савет, невялікай перавагай галасоў, прыняў пастанову аб падпарадкаванні размешчанага на тэрыторыі Беларусі войска ўраду рэспублікі. Парламент адобрыў таксама тэкст новай прысягі, якая адгэтуль давалася на вернасць Рэспубліцы Беларусь і яе народу. Расійскія афіцэры, якія адмовіліся даць новую прысягу, не былі звольнены з вайсковай службы, хаця гэтага дамагаліся дэпутаты ад БНФ.

Палітычным пераломам на тэрыторыі СССР, у тым ліку і ў Беларусі, стала няўдалая спроба ваеннага путчу ў Маскве ў жніўні 1991 г. Партыйны апарат імкнуўся вярнуць камуністычны лад, які панаваў да гарбачоўскай перабудовы. Атрымаў ён падтрымку часткі беларускай наменклатуры, у тым ліку камандзіраў Беларускай ваеннай акругі, генералаў Анатоля Кастэнкі і Паўла Казлоўскага. На баку путчыстаў аказаліся таксама старшыня Вярхоўнага Савета Мікалай Дзямянцей, новы I сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў, міністр юстыцыі Леанід Лашук і намеснік міністра ўнутраных спраў Віктар Кавалёў. Палітыку чакання прымянілі шэф беларускага КДБ Эдуард Шыркоўскі і прэм’ерміністр Вячаслаў Кебіч. 20 жніўня, калі

вырашаліся лёсы старога ладу, а таксама Гарбачова, Ельцына і Савецкага Саюза, Кебіч загадаў падначаленым сабе чыноўнікам стрымацца ад выконвання загадаў Масквы.

На дэманстрацыі некалькіх тысяч людзей, якія ў днях 19-21 жніўня арганізавалі БНФ, сацыялдэмакраты і лібералы ў абарону незалежнасці і дэмакратыі, войска, міліцыя і КДБ не адрэагавалі. Паведамленні з Масквы аб перамозе прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына над путчыстамі і прыпыненне дзейнасці КПСС выклікалі паніку сярод беларускай наменклатуры. Камуністы, апасаючыся рэпрэсій з боку лагера Ельцына, адобрывалі ўсе незалежніцкія прапановы, якія прад'яўляў БНФ.

Скліканая 24 жніўня па жаданню дэпутатаў ад БНФ нечарговая сесія Вярхоўнага Савета, па прапанове камуністычных парламентарыяў Аляксандра Лукашэнкі і Віктара Ганчара, адклікала з пасады старшыні ВС Мікалая Дземянцея. На другі дзень парламентарыі прынялі пастанову аб выхадзе Беларусі са складу СССР і абвясцілі незалежнасць дзяржавы. Галасаваць за незалежнасць заклікаў з парламенцкай трыбуны І сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў. Вярхоўны Савет забараніў дзейнасць палітычных партый на прадпрыемствах, у войску і адміністрацыі ды загадаў беларускаму МУС парваць усялякія сувязі з усесаюзным ведамствам.

28 жніўня 1991 г. прэм'ерміністр Вячаслаў Кебіч асудзіў падтрымку аказаную беларускімі камуністамі правадырам маскоўскага путчу і разам з членамі свайго кабінета абвясціў выступленне з партыі. Дзень пазней Вярхоўны Савет прыпыніў дзейнасць КПСС на тэрыторыі Беларусі. За гэтую пастанову прагаласавалі таксама камуністычныя дэпутаты. Кароткі час БНФ быў самай вялікай арганізаванай і легальнай палітычнай сілай у Беларусі.

Падчас другой нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета, якая адбылася 17-19 верасня, старшынёй і заадно кіраўніком дзяржавы выбраны быў падтрымоўваны БНФам Станіслаў Шушкевіч. Парламент памяняў назву дзяржавы на Рэспубліку Беларусь, вярнуў старажытную нацыянальную сімволіку - герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг. Апазіцыйныя групоўкі аказаліся надта кволымі, каб паспрабаваць пераняць выканаўчую ўладу. Пазбаўленыя магчымасці дзеяння камуністы рабілі ўступкі на кожным кроку. Аднак дэмакратычным партыям неўзабаве прыйшлося заплаціць высокую цану за брак волі кіравання дзяржавай.

На працягу некалькіх месяцаў пасля жнівеньскіх падзей у Маскве палітычная сітуацыя ў Беларусі стабілізавалася. Колішняя наменклатура, якая пераўтварылася ў калектыў беспартыйных

спецыялістаў, пачала ствараць "рэгуляваную рыначную эканоміку". Так як і ў Расіі, хутка павялічвалася маёмасць асоб звязаных з уладнымі элітамі. Сістэма канцэсій, дазволаў, мытных льгот, фіктыўных кантрактаў стварала заблытаны вузел нефармальных сувязей на стыку гаспадаркі і палітыкі. "Рэгуляваная рыначная эканоміка" давала магчымасць удзельніцтва ў станаўленні гаспадарчых працэсаў адносна невялікай колькасці грамадзян, галоўным чынам звязаных з лагерам улады. Залежнасць гаспадарчых суб'ектаў у Беларусі ад расійскіх сыравінных і паліўных рэсурсаў ды расійскіх рынкаў збыту прымушала ўрад Кебіча вярнуць нядаўна парваныя сувязі з Масквой.

Былыя члены КПСС сталі цяпер шчырымі прыхільнікамі дэмакратыі і палітычнага плюралізму. Дэмакратыі ў Беларусі - на іх думку - пагражала сур'ёзная небяспека з прычыны прыпынення дзейнасці камуністычнай партыі і патрабаванняў нацыяналізацыі партыйнай і камсамольскай маёмасці. Заўзятым абаронцам маёмасных правоў арганізацыі камуністычнай моладзі аказаўся дэпутат Аляксандр Лукашэнка. У выніку яго намаганняў Ленінскі Камуністычны саюз моладзі Беларусі, перайменаваны ў Саюз моладзі Беларусі (СМБ), збярог свае структуры, памяшканні, бюджэтныя датацыі і вялікую маёмасць. Некалькі гадоў пазней СМБ стане моцным звяном выбарчага штаба Лукашэнкі падчас ягонай прэзідэнцкай кампаніі.

Кантроль урада Кебіча за гаспадаркай і сродкамі масавай інфармацыі ставіў апазіцыю, асабліва БНФ, у выключна нявыгадным становішчы. Рэжымная прапаганда сістэматычна ўнушала грамадству, што пастаяннае пагоршванне матэрыяльнай сітуацыі гэта вынік дэмакратыі, парвання саюзных сувязей і нязгоды апазіцыі папраўляць гаспадарку. Восенню 1991 г. не было ўжо ніякіх шанцаў, каб урад Кебіча змяніць шляхам парламенцкіх дзеянняў. Вярхоўны Савет, з перавагай прадстаўнікоў наменклатуры, лічыў гэты ўрад фактарам, які стабілізуе эканамічнае і палітычнае становішча ў Беларусі.

8 снежня Станіслаў Шушкевіч разам з прэзідэнтамі Расіі Барысам Ельцыным і Украіны Леанідам Краўчуком падпісалі пагадненне аб фармальнай ліквідацыі СССР і стварэнні Супольнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Новая дамова давала Расіі права трымаць сваю армію на тэрыторыі Беларусі і абавязвала Беларусь каардынаваць замежную палітыку з Масквой. Гэта стала прычынай сур'ёзнага расколу ў самой апазіцыі. БНФ лічыў, што інтарэс Беларусі патрабуе пазбягаць якіх-небудзь палітычных і ваенных сувязей з Расіяй, а падпісанае

www.kamunikat.org

Шушкевічам пагадненне абмяжоўвала суверэнітэт рэспублікі. БСДГ і АДПБ падтрымалі Шушкевіча і адначасна стварылі блок партый і арганізацый “Новая Беларусь”.

Сацыялдэмакраты і лібералы лічылі, што без удзелу БНФ будзе ім лягчэй паразумецца з наменклатурай і распрацаваць праграму рэформы, якая дазволіла б стрымаць лавінна нарастаючы гаспадарчы крызіс. Партыі, якія ўваходзілі ў склад “Новай Беларусі”, чакалі прапановы правядзення беларускага “круглага стала” і перадачы наменклатурай часткі ўлады і ўплываў апазіцыі. Аднак такое не адбылося і БСДГ ды АДПБ вярнуліся да супрацоўніцтва з БНФ і далучыліся да акцыі збору подпісаў пад патрабаваннем роспуску Вярхоўнага Савета і абвяшчэння новых парламенцкіх выбараў. Апазіцыйныя партыі меркавалі, што ў склаўшайся гаспадарчай сітуацыі лёгка будзе ім атрымаць перамогу на выбарах і затым адклікаць карумпіраваны ўрад Кебіча.

У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам для адклікання Вярхоўнага Савета трэба было сабраць 350 тыс. подпісаў выбаршчыкаў. У красавіку 1992 г. апазіцыя даставіла ў Цэнтральную выбарчую камісію 450 тыс. подпісаў грамадзян, якія патрабавалі абвяшчэння новых парламенцкіх выбараў. Справа трапіла на разгляд у Вярхоўны Савет. Парламент незалежнай Беларусі, ігнаруючы ўстаноўленыя сабою законы, пераважнай большасцю галасоў адкінуў магчымасць скарачэння тэрміну сваіх паўнамоцтваў. Супраць гэтай акцыі выступіў таксама старшыня ВС Станіслаў Шушкевіч, які шукаў паразумення з прэм’ерміністрам Кебічам і падтрымоўваючымі яго камуністамі. Верыў ён, што парламент пад ягоным кіраўніцтвам - надзейны вартавы незалежнасці, здольны правесці структурныя рэформы.

29 кастрычніка 1992 г. Шушкевіч быў выбраны старшынёю Канстытуцыйнай камісіі, якая мела падрыхтаваць законапраект аб дзяржаўным ладзе Беларусі. Канфлікт паміж апазіцыяй і падтрымоўваючай Кебіча большасцю разыграўся вакол пытання прэзідэнцтва. Лагер улады, спадзеючыся перамогі Кебіча на прэзідэнцкіх выбарах, імкнуўся надзяліць кіраўніка дзяржавы як найбольшыі паўнамоцтвамі. Апазіцыя, баючыся вяртання камуністычнай дыктатуры, у якой пост І сакратара партыі заменены быў бы прэзідэнтурай, намагалася мінімалізаваць значэнне кіраўніка дзяржавы. На думку дэпутатаў ад БНФ, палітычная традыцыя Беларусі патрабавала парламенцкага кіравання. Апазіцыя прапанавала, каб прэзідэнт выбіраўся Вярхоўным Саветам. Праўрадавая большасць, аднак, прыняла такі варыянт канстытуцыі, у якой будучы прэйдэнт надзяляўся правам

поўнага кантролю за выканаўчай уладай, назначання членаў урада, старшынь Вярхоўнага суда, Канстытуцыйнага трыбунала і Нацыянальнага банка (арт. 100). Усе названыя пасады патрабавалі згоды парламента.

У чэрвені 1992 г. Вярхоўны суд зарэгістраваў Партыю камуністаў Беларусі і Аб'яднаную аграрнадэмакратычную партыю Беларусі. Гэтая апошняя прадстаўляла інтарэсы дырэктараў калгасаў і саўгасаў і выступала супраць якіх-небудзь форм раздзяржаўлення зямлі. У красавіку 1992 г. узнікла Партыя народнай згоды, якой членамі стала частка наменклатуры ніжэйшых інстанцый, зайцікаўленая і правядзеннем прыватызацыі, і ўзмацненнем беларускіх дзяржаўных структур. Вясною 1993 г. дырэктары вялікіх прадпрыемстваў заснавалі Беларускі навуковавытворчы кангрэс - партыю, якая, так як і прэм'ерміністр Кебіч, выказвалася за вяртанне шчыльных палітычных і гаспадарчых сувязей з Расіяй.

У 1992 г. былая партыйная і дзяржаўная намеклатура прадстаўляла даволі кансалідаваны лагер згуртаваны вакол прэм'ерміністра Кебіча. Кантралявала яна фінансы, гаспадарку, сродкі масавай інфармацыі, усе дзяржаўныя ўстановы, мела абсалютную большасць у Вярхоўным Савеце. У такой сітуацыі Кебіч мог дазволіць сабе поўнасцю ігнараваць апазіцыю. На кіруючыя пасты ў арміі вярнуліся генералы, якія раней абвінавачваліся ва ўдзеле ў загаворы супраць Гарбачова. Анатоль Кастэнка стаў камандзірам Беларускай ваеннай акругі, а Павел Казлоўскі - міністрам абароны. Казлоўскі замяніў на гэтай пасадзе генерала Пятра Чавуса, прыхільніка стварэння беларускай нацыянальнай арміі.

20 ліпеня 1992 г. Кебіч падпісаў з прэм'ерміністрам Расіі Ягорам Гайдарам шэраг ваенных дамоў, якія вярталі шчыльную мілітарную сувязь абедзвюх дзяржаў. Па гэтай прычыне дайшло да рознагалосся паміж Кебічам і старшынёю Вярхоўнага Савета Станіславам Шушкевічам. На думку Шушкевіча, падпісаныя прэм'ерміністрам пагадненні моцна абмяжоўвалі суверэнітэт Беларусі.

На пачатку 1993 г. беларуская армія налічвала 130 тыс. салдат. Большасць каманднага саставу складалі расіяне. У той час 13 тыс. беларускіх афіцэраў, якія праходзілі службу на тэрыторыі Расіі і іншых былых савецкіх рэспублік, заявілі аб сваім жаданні служыць у беларускім нацыянальным войску. Прынятая ў снежні 1992 г. праграма рэарганізацыі ўзброеных сіл прадугледжвала скарачэнне колькасці салдат да 60 тыс. Абарончую сістэму Беларусі мела папаўняць 100-тысячная расійская армія, дыслацыраваная на тэрыторыі рэспублікі. Летам 1992 г. генерал Чавус спрабаваў

www.kamunikat.org

падпарадкаваць расійскія гарнізоны беларускаму Міністэрству абароны, аднак гэтая акцыя закончылася яго адстаўкай.

У арміі, якой камандавалі Кастэнка і Казлоўскі, скора пачалася чыстка. У выніку войска развіталася з тымі афіцэрамі, якія выказваліся за незалежнасць і дэсаветызацыю. Членаў Беларускага згуртавання вайскоўцаў масава пераводзілі на ніжэйшыя пасты, пазбаўлялі кантакатў з салдатамі або звычайна звальнялі са службы. У маі 1993 г. звальненне атрымаў старшыня БЗВ палкоўнік Мікола Статкевіч, якога абвінавацілі ў “дыскрэдытацыі афіцэрскага гонару”. Прычынай абвінавачання стала ўзлажэнне ім, супольна з лідэрамі апазіцыйных партый, вянкоў да помніка ахвярам мінскага гета ў той час, калі адбываліся афіцыйныя ўрачыстасці з нагоды дня перамогі над фашызмам. Расійскія генералы не пераносілі беларускай мовы і нацыянальных сімвалаў у арміі. У снежні 1993 г. БЗВ было забаронена. Легальным застаўся Саюз афіцэраў Беларусі (САБ), заснаваны па ініцыятыве генерала Казлоўскага ў красавіку 1992 г. у процівагу БЗВ. САБ не пазбягаў палітыкі. Быў калектыўным членам новага посткамуністычнага палітычнага блока - Народнага руху Беларусі, патрабаваў змяніць у канстытуцыі запіс аб мовах і прысвоіць рускай мове статус дзяржаўнай.

26 сакавіка Вярхоўны Савет пачаў дэбаты па вызначэнні палітычнага статусу дзяржавы. Камуністычныя дэпутаты, аб’яднаныя ў дзвюх фракцыях “Саюз” і “Беларусь”, распараджаліся амаль 90% мандатаў і сталі моцным палітычным апірышчам для прэм’ерміністра Кебіча. Хаця старшыня ВС Станіслаў Шушкевіч не згаджаўся з незалежніцкімі канцэпцыямі БНФ і выказваўся за канфедэрацыю былых савецкіх рэспублік, аднак супраціўляўся заключэнню ваеннапалітычнага дагавору з Расіяй, паколькі ішло гэта ўразрэз з ранейшымі пастановамі парламента аб нейтралітэце дзяржавы. Шушкевіч, намагаючыся замарудзіць ратыфікацыю падпісаных прэм’ерміністрам трактатаў з Расіяй, запрапанаваў усенародны рэферэндум па гэтай справе. Фракцыі “Саюз” і “Беларусь” адхілілі прапанову старшыні і абавязалі яго, як кіраўніка дзяржавы, распісацца пад ратыфікаванымі дакументамі.

Працэс інтэграцыі Беларусі і Расіі праходзіў незвычайна марудна, а тармозіў яго расійскі бок. Кіруючыя расійскімі фінансамі і гаспадаркай віцэпрэм’еры Сяргей Шахрай і Ягор Гайдар трактат з Беларуссю лічылі лішнім абцяжараннем Расіі. Расіяне, хаця не спяшаліся даваць датацыі для архаічнай беларускай гаспадаркі, аднак зацікаўленыя былі захаваннем палітычнага і мілітарнага кантролю за гэтай тэрыторыяй, пакідаючы за Кебічам поўную свабоду

вырашання ўнутраных пытанняў. Па вядомых прычынах Расія не была зацікаўлена ростам значэння згуртаванай вакол Беларускага народнага фронту нацыянальнай і празаходняй апазіцыі. Інтэграцыйнаму працэсу не спрыялі таксама кастрычніцкія падзеі ў Маскве і драма вакол тамашняга парламента. Шушкевіч падтрымаў прэзідэнта Ельцына, а беларуская парламенцкая большасць - ягоных праціўнікаў Руцкога і Хазбулатава.

Восеньская сесія Вярхоўнага Савета, якая пачалася 9 лістапада 1993 г., завяршала перыяд застою і таптання на адным месцы беларускай палітыкі. Дэпутаты фракцыі "Саюз" і "Беларусь" паўторна запрапанавалі заключэнне пагадненняў з Расіяй, якія наблізілі б абедзве краіны ў палітычным і гаспадарчым плане. Апазіцыя заклікала парламент да самароспуску і правядзення дэмакратычных выбараў. Сімвалам працы Вярхоўнага Савета ў 1993 г. стала бясплённая дыскусія. У дзяржаве не вырашаліся наспелыя праблемы. Уся рэальная ўлада апынулася ў руках Кебіча, які аднак не прапанаваў ніякіх спосабаў вырашэння нагрувашчаных гаспадарчых пытанняў, апрача ўключэння беларускай фінансавай сістэмы ў расійскія структуры. За сабою пакідаў ён неабмежаваны кантроль на тэрыторыі фармальна незалежнай Беларусі. Усе сталі рыхтавацца да прэзідэнцкіх выбараў.

9 верасня БСДГ, АДПБ і БСП падпісалі ідэйнапраграмнае пагадненне "Вясна94". Новая кааліцыя ад пачатку карысталася падтрымкай Станіслава Шушкевіча, які сярод лібералаў і сацыялдэмакратаў шукаў палітычнай апоры на час прэзідэнцкіх выбараў. Да кааліцыі не далучыўся БНФ - фармальнай прычынай быў прыняты кааліцыяй прынцып вяршэнства інтарэсу адзінкі над інтарэсам народа. У сапраўднасці "Вясну94" і БНФ дзялілі розныя канцэпцыі змагання за ўладу, а таксама стратэгічныя мэты. На думку членаў "Вясны94", прапагандаванне лозунгаў нацыянальнага адраджэння ва ўмовах невялікага зацікаўлення гэтымі пытаннямі з боку беларускага грамадства, не прадвяшчала поспеху на надыходзячых выбарах. Для БНФ адрачэнне ад асноўных мэт было б перакрэсліваннем сэнсу існавання гэтай арганізацыі і змірэннем з існуючым станам культуры і нацыянальнай свядомасці.

Пачатак 1994 г. у Беларусі быў незвычайна багаты ў палітычныя падзеі. Прэзідэнцкія выбары, прадугледжаныя на чэрвень, прымусілі паасобныя лагеры да ўзмоцненай актыўнасці, рэдкай на беларускай палітычнай сцэне. У пачатку студзеня БНФ і Свабодныя прафсаюзы Беларусі спрабавалі арганізаваць усеагульную забастоўку з патрабаваннем адстаўкі прэм'ерміністра Кебіча і хуткага правядзення

гаспадарчых і структурных рэформ. Тым часам Кебіч аб'ядноўваў вакол сябе ўсіх прыхільнікаў аднаўлення старога ладу ды інтэграцыі з Расіяй. Акружэнне прэм'ерміністра палічыла, што сур'ёзнай перашкодай на шляху да аб'яднання з Расіяй з'яўляецца старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч. Фармальна ад яго подпісу залежала прыняццё або адхіленне ўсялякіх міждзяржаўных дакументаў. З асобай Шушкевіча звязаны былі міністр унутраных спраў Уладзімір Ягораў і шэф беларускага КДБ Эдуард Шыркоўскі. Прыхільнікі хуткай інтэграцыі з Расіяй працэдуру адхілення Шушкевіча ад пасады кіраўніка дзяржавы пачалі з адстаўкі абодвух сілавых міністраў. Зручнай прычынай для гэтага паслужыла г.зв. справа літоўскіх камуністаў - пражываючых у Мінску Нікаласа Буракявічуса і Юозаса Ермалавічуса, якіх шукалі літоўскія следчыя органы за здраду радзіме. Выдача літоўцам уцекачоў моцна абурыла камуністычных дэпутатаў, якія спешна прагаласавалі за адстаўку міністра ўнутраных спраў і шэфа КДБ. Дэпутат Аляксандр Лукашэнка патрабаваў яшчэ прагаласаваць за адстаўку Станіслава Шушкевіча, але яго прапанова не была прынята. Неўзабаве Аляксандр Лукашэнка, тады старшыня парламенцкай камісіі па барацьбе з карупцыяй, атрымаў магчымасць вынесці больш красамоўныя аргументы супраць старшыні Вярхоўнага Савета. Абвінаваціў ён Шушкевіча ў раскраданні дзяржаўнай маёмасці - шэф парламента не заплаціў рахункі вартасцю 100 долараў за матэрыялы пры будове дачы.

26 студзеня дэпутаты (209 галасоў за і 39 супраць) адклікалі Шушкевіча з займаемай пасады. Некалькі дзён пазней новым старшынёю ВС стаў генерал міліцыі Мячыслаў Грыб. 15 сакавіка Вярхоўны Савет ухваліў тэкст першай канстытуцыі незалежнай Беларусі.

Выступленне Аляксандра Лукашэнкі супраць Шушкевіча і некалькіх звязаных з ім дзяржаўных чыноўнікаў стала пачаткам маланкавай кар'еры гэтага палітыка. У якасці прызнання атрымаў ён магчымасць часта выступаць на кантраляваным урадам тэлебачанні. Лукашэнка скарыстаў гэты шанц і пры кожнай нагодзе гаварыў беларусам тое, што яны хацелі пачуць - аб карупцыі сярод дзяржаўных чыноўнікаў, аб загаворы дэмакратаў, аб здрадніках, якія ў змове з замежнымі разведкамі разбурылі Савецкі Саюз. Нечакана ў посткамуністычным лагеры з'явіўся палітык, які ў рэйтынгах папулярнасці хутка абагнаў прэм'ерміністра Кебіча, хаця за ім стаяў увесь прапагандысцкі апарат дзяржавы. Лукашэнка раней доўгі час працаваў у сектары прапаганды камсамола, затым быў палітруком у пагранічных войсках. Пасля нейкі час узначальваў калгас,

выконваючы адначасна абавязкі дэпутата Вярхоўнага Савета БССР. Падчас шматлікіх публічных выступленняў вясной 1994 г. удалося яму стварыць вакол сябе міф чалавека з народа, які смуткуе З-за дэмаралізацыі палітычнай эліты суверэннай Беларусі.

У ліку сур’ёзных кандыдатаў на прэзідэнцкае крэсла, апрача Аляксандра Лукашэнкі і прэм’ерміністра Вячаслава Кебіча, апынуліся лідэр БНФ Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч, якога падтрымоўвалі сацыялдэмакраты, лібералы і свабодныя прафсаюзы. У першай палове 1994 г., у ходзе выбарчай кампаніі, беларуская гаспадарка апынулася ў катастрафічным становішчы. Усё гэта абцяжарвала самога Кебіча. Яго вобраз у вачах грамадства не змаглі паправіць сродкі масавай інфармацыі, якія безупынна паказвалі яго як пасланца лёсу, гаранта гаспадарчай інтэграцыі з Расіяй. Амаль тое ж, што і Кебіч, гаварыў Лукашэнка, але ён мог яшчэ ўказваць на віноўнікаў складанага матэрыяльнага становішча грамадства. Апрача дэмакратаў, на спіску абвінавачаных у давядзенні гаспадаркі да руіны былі таксама Кебіч і яго акружэнне. Станіслаў Шушкевіч, які выступаў з сацыялдэмакратычнай праграмай, лічыўся палітыкам хісткім і нерашучым. Мог ён перш за ўсё спадзявацца на падтрымку інтэлігенцыі і часткі чыноўнікаў. Шушкевіч адклікаўся да незалежніцкага электарату і такім чынам змяншаў Пазьняку шанцы перайсці ў другі тур галасавання. Свайго кандыдата вылучыла Партыя камуністаў Беларусі. Яе лідэр і заадно кандыдат у прэзідэнты Васіль Новікаў зыходзіў з такога пункту погляду, што Кебіч не надта выразна выказваўся за ліквідацыю прыватнай уласнасці і не меў адпаведнай праграмы грамадскай апекі.

Неаспрэчным пераможцам першага тура выбараў ад 19 чэрвеня стаў Аляксандр Лукашэнка, які набраў 45% галасоў. Фаварыта, прэм’ерміністра Вячаслава Кебіча, хаця перайшоў у другі тур, падтрымала толькі 17,4%. Кандыдаты дэмакратычнай апазіцыі Пазьняк і Шушкевіч агулам атрымалі 23% галасоў. На Пазьняка галасавала 13%, а на Шушкевіча - 10%. Васіль Новікаў атрымаў 5% галасоў. Трохі больш за 10 працэнтаў выбаршчыкаў прагаласавала за некалькіх іншых, менш значных кандыдатаў.

10 ліпеня амаль 80% выбаршчыкаў першым прэзідэнтам Беларусі выбрала Аляксандра Лукашэнку. Грамадзяне Беларусі выразна выказаліся за радыкальныя змены, якія ў ходзе выбарчай кампаніі абяцаў прэзідэнт - за сумленную дзяржаву, грамадскую справядлівацць і супраць рыначнай гаспадаркі.

www.kamunikat.org

## Куды вядзе Беларусь Аляксандр Лукашэнка?

Першыя месяцы прэзідэнтуры Лукашэнкі прайшлі пад знакам фарміравання апарату ўлады на аснове поўнасцю адданых новаму кіраўніку дзяржавы людзей. На кароткі час страцілі свае пасады некаторыя супрацоўнкі Кебіча. У кастрычніку, пад выглялам удасканальвання дзяржаўнага апарату, Лукашэнка атрымаў згоду Вярхоўнага Савета самастойна прызначаць кіраўнікоў мясцовай адміністрацыі. Некалькі тыдняў пасля выбараў прэзідэнт падаўся ў першае замежнае падарожжа. У Маскве паўтарыў ён яшчэ раз тое, што гаварыў падчас выбарчыай кампаніі: яго палітычнай мэтай з’яўляецца палітычная, гаспадарчая і ваенная інтэграцыя з Расіяй. Адначасна першыя рашэнні ў гаспадарчай галіне паказалі, што прэідэнт, так як раней ягоны папярэднік прэм’ерміністр Кебіч, не меў ніякай ідэі выхаду з крызісу і здзяйснення перадвыбарчых абяцанняў.

1994 год быў перыядам далейшага скарачэння аб’ёмаў вытворчасці, раптоўнага росту цэн на тавары і паслугі, 50-працэнтнай інфляцыі штомесяц і зацягваючыхся прастояў на прадпрыемствах з прычыны недахопу сыравіны і паліва, а ў многіх выпадках таксама З-за браку збыту на выпушчаную прадукцыю. Беларускі ўрад, з прычыны ўдзелу прэм’ерміністра Кебіча ў прэзідэнцкай кампаніі, не прымаў непапулярных рашэнняў наконт структурных змен у прамысловасці. Не змяніўся профіль вытворчасці заводаўгігантаў, якія ў савецкі час працавалі на патрэбы імперыі. Замарожанне працоўнага саставу і ранейшых напрамкаў вытворчасці давяло гэтыя прадпрыемствы да грані банкруцтва. Кошты вытворчасці ва ўмовах імпарту сыравіны і паліва сталі прычынай таго, што вырабы гэтых заводаў страцілі канкурэнтаздольнасць нават на непераборлівым расійскім рынку. Апрача таго ў выніку адносна хуткай рэструктурызацыі расійскай прамысловасці айчынны рынак папоўніўся сваімі таварамі, якія раней завозіліся ў Расію з Беларусі. Па гэтай прычыне вытворчасць беларускай прамысловаці, асабліва машынабудаўнічай і хімічнай, заставалася ляжаць на складах. Напрыклад, Мінскі трактарны завод, які яшчэ ў 1993 г. дастаўляў на рынак 82 тыс. трактароў, у 1994 г. З-за недахопу вузлоў, энергіі і перш за ўсё збыту выпусціў толькі 43 тыс. машын. Па палітычных прычынах не абвяшчалася банкруцтва прадпрыемстваў, ані не праводзілася іх прыватызацыя, не скарачаліся аб’ёмы занятасці, а работнікі высылаліся на некалькі тыдняў або месяцаў у бясплатныя водпускі. Такім чынам колькасць беспрацоўных не павялічвалася.

Раптоўны рост цэн на энерганосьбіты выклікаў далейшае

www.kamunikat.org

паступовае скарачэнне іх спажывання. У 1994 г. у выніку ўвядзення Расіяй свабодных цэн кошт аднаго кубаметра прыроднага газу вырас у 11, а нафты - у 16 разоў. Доля паліва ў агульных коштах вытворчасці з 13,5% у канцы 1993 г. у снежні 1994 г. павялічылася да 24,9%, а матэрыяльнага фактара з 69,7% да 80,2%. Паслядоўнасцю гэтага стала радыкальнае зніжэнне зарплат работнікаў занятых у вытворчай сферы. У снежні 1994 г. зарплаты складалі ўсяго 7% коштаў вытворчасці (у 1990 г. - 29%). У параўнанні з 1993 г. рэальныя заработныя платы панізіліся на 25%.

На пачатку 1994 г. больш 90% вытворчасці выпускалі дзяржаўныя прадпрыемствы. Хаця ў 1993 г. пасля працяглых спрэчак Вярхоўны Савет прыняў закон, які дазваляў частковую прыватызацыю, аднак ні ўрад Кебіча, ні прызначаны Лукашэнкам кабінет Міхаіла Чыгіра не былі зацікаўлены скарачэннем “сацыялістычных форм уласнасці”. Кебіч, будучы прэтэндэнтам на прэзідэнцкі пост, баяўся грамадскіх паслядоўнасцей прыватызацыі. Лукашэнка супраціўляўся ёй па ідэалагічных прычынах, паколькі ў прыватнай уласнасці бачыў ён крыніцу дэмаралізацыі ўлады і грамадства. Прэзідэнт, бачачы неадабрэнне беларусамі рыначнай гаспадаркі, пачаў атакаваць яе прыхільнікаў. Уведзены быў строгі міліцыйначыноўніцкі кантроль за прыватнай гаспадарчай дзейнасцю. Амаль 300 тыс. малых гаспадарчых суб’ектаў было падпарадкаваных прэзідэнцкай гаспадарчай стратэгіі, якой эканамічная філасофія заключалася ў словах “рыначны сацыялізм”. Спосабам вырашэння ўсялякіх эканамічных пытанняў мела стаць дысцыпліна на ўсіх узроўнях вытворчасці. У выніку адміністрацыйныя метады замянілі рыначныя механізмы рэгулявання гаспадарчага жыцця.

Восенню 1995 г. апублікавана была прэзідэнцкая “Праграма грамадскагаспадарчага развіцця Беларусі да 2000 года”, якая прадугледжвала, між іншым, паляпшэнне фінансавага становішча дзяржавы, павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян, высокія дапамогі для беспрацоўных, поўнае забеспячэнне кватэрамі, датацыі для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. “Праграма” была спісам нерэальных пажаданняў і служыла пашырэнню ўлады чыноўнікаў у сферы гаспадаркі, прычым стваралася ім магчымасць карыстацца маёмнымі выгадамі ад гэтага нагляду. У асноўным план Лукашэнкі прадугледжваў вяртанне мадыфікаванага сацыялістычнага ладу, з цэнтралізаваным кіраваннем гаспадаркай і элементамі капіталізму на яго абочынах.

У 1995 г. паглыбіліся адмоўныя тэндэнцыі ў беларускай гаспадарцы. Валавы нацыянальны прадукт знізіўся на 10%, а 18%

прадпрыемстваў сталі нерэнтабельнымі. За дванаццаць месяцаў 1995 г. намінальная заработная плата павялічылася ў 6,3 раза, а цэны на тавары і паслугі - у 8,1 раза. На практыцы абазаначала гэта чарговае зніжэнне рэальнай зарплаты на 20,5%. Паслядоўнасцю адмоўных працэсаў у эканоміцы стаў хуткі рост ценявой гаспадаркі. Значная частка грамадзян Беларусі атрымоўвала даход ад кантрабанды тавараў, якія завозіліся ў суседнія краіны або вывозіліся з іх, асабліва з Польшчы і Расіі. Ва ўмовах маланкавай інфляцыі ашчаджанне страціла сэнс і таму людзі пачалі скупляць валюту, якая стала для іх своеасаблівым капіталаўкладаннем. У самым цяжкім становішчы апынуліся пенсіянеры, якія не маглі мець дадатковых крыніц даходу. Менавіта таму яны наймацней тужылі па Савецкім Саюзе і страчаным дабрабыце.

Сур'ёзнай крыніцай папаўнення хатняга бюджэту сталі для гараджан зямельныя ўчасткі, якія можна было купіць па даступнай цане ў суседнім калгасе. Калгаснікі на сваіх прысядзібных участках гадавалі свіней і хатніх птушак на свае патрэбы. Для хатніх бюджэтаў быў гэта незвычайна танны спосаб забеспячэння харчамі, тым больш што зямля апрацоўвалася амаль выключна пры дапамозе калгаснай сельгастэхнікі, а нефармальныя аплаты за паслугі былі намнога ніжэйшыя за сапраўдныя кошты. У Беларусі амаль 30% харчоў паходзіць з малых, пераважна аднагектарных гаспадарак.

Пераможаная на прэзідэнцкіх выбарах апазіцыя БНФ не адмовілася ад барацьбы за дзяржаўны лад. Нагодай для рэваншу сталі парламенцкія выбары, якія мелі адбыцца вясной 1995 г. У лістападзе 1994 г. арганізаваўся выбарчы блок незалежніцкіх і дэмакратычных партый, у які апрача БНФ увайшлі БСДГ, АДПБ, НДПБ і БСП. Паколькі палажэнне аб выбарах прадугледжвала падзел рэспублікі на аднамандатныя акругі, вырашана, што апазіцыя вылучыць па адным супольным кандыдаце ў кожнай акрузе.

Канец 1994 г. аказаўся вельмі багатым у падзеі. Дэпутат ад БНФ Сяргей Антончык, па ўзору колішняга дэпутата Лукашэнкі, абвінаваціў найбліжэйшых супрацоўнікаў прэзідэнта ў карупцыі, супрацоўніцтве з мафіяй і нелегальных гандлёвых здзелках. У адказ прэзідэнт выдаў распараджэнне аб забароне публікацыі выступлення Антончыка ў друку. Рэдактары газет, якія не падпарадкаваліся волі прэзідэнта, неўзабаве страцілі работу. Быў гэта адначасна канец ілюзій, што прэзідэнт з павагай будзе ставіцца да прынцыпаў дэмакратыі і законнасці.

Пасля некалькіх гадоў адноснай свабоды слова, у 1995 г. сродкі масавай інфармацыі паўторна сталі рупарам дзяржаўнай дактрыны.

www.kamunikat.org

Красамоўным фактам было адкліканне прэзідэнтам Іосіфа Сярэдзіча з пасады галоўнага рэдактара "Народнай газеты", якая фармальна была органам Вярхоўнага Савета. На практыцы аказалася, што парламенту не пад сілу запэўніць незалежнасць нават сваёй газеце. Пашырэнне ўлады прэзідэнта папярэдзіла грунтоўная змена кадраў у цэнтральных установах і зліццё кампетэнцый прэзідэнцкай і дзяржаўнай адміністрацый. Лукашэнка вельмі хутка пазбавіўся супрацоўнікаў, якія хаця і пасьпяхова павялі ягоную выбарчую кампанію, аднак прабавалі захаваць свае погляды на асноўныя пытанні дзяржаўнай палітыкі. Галоўным крытэрыем кадравай палітыкі стала павышэнне па службе людзей паслухмяных прэзідэнту. Непасрэднае ўмяшанне Лукашэнкі ў кадравыя справы не абмежавалася толькі да цэнтра, але датычыла таксама абласцей і раёнаў. У пачатку 1995 г. сфарміравалася г.зв. "вертыкальная ўлада" ("вертыкаль") - сістэма дзяржаўнага кіравання па вайсковаму ўзору.

Кантралюючы сродкі масавай інфармацыі, войска, спецслужбы і адміністрацыю Лукашэнка мог ігнараваць заканадаўчыя органы і правасуддзе. У грамадскім уяўленні прэзідэнцкая ўлада стала сінонімам дзяржаўнай улады, а парламент - месцам пастаянных, незразумелых і бясконцых спрэчак. Дэмакратыя стала сінонімам дэструкцыі ў палітычнай і гаспадарчай сферах ды прычынай парушэння сацыяльнай бяспекі. У сапраўднасці савецкае беларускае грамадства гатовае было поўнасцю адобрыць сістэму, якую ствараў Лукашэнка. Была гэта добра вядомая грамадзянам Беларусі сістэма, прызнаваная імі па сацыяльных прычынах. Змаганне прэзідэнта з "дэмакратамі" не выклікала ніякага грамадскага абурэння. Нават збіванне на тэрыторыі парламента, па загаду Лукашэнкі, апазіцыйных дэпутатаў ад БНФ спецыяльнымі атрадамі міліцыі, не выклікала рэакцыі ўнутры краіны. Аб тым, што дзеялася ў сядзібе Вярхоўнага Савета 19 красавіка 1995 г., насельніцтва Беларусі магло даведвацца толькі з замежных сродкаў масавай інфармацыі або са шматгадзінных выступленняў прэзідэнта па тэлебачанні. Паслядоўная манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі, мінімалізацыя значэння палітычных партый і парламента замацоўвалі перакананне грамадзян у тым, што вось выбралі яны кагосьці, хто "зробіць парадак з дэмакратыяй" і верне - так як абяцаў - савецкі дабрабыт.

Разам з выбарамі ў Вярхоўны Савет, назначаных на 14 мая 1995 г., Лукашэнка запрапанаваў правядзенне рэферэндуму, які меў быць паказчыкам папулярнасці ягонай палітыкі. Грамадзяне павінны былі адказаць на чатыры пытанні: ці падтрымоўваюць палітыку прэзідэнта, напраўленую на шчыльнае супрацоўніцтва з Расіяй; ці

хацелі б, каб руская мова, побач беларускай, стала дзяржаўнай мовай; ці акцэптуюць адмену беларускіх нацыянальных сімвалаў; ці даюць прэзідэнту згоду на роспуск Вярхоўнага Савета, калі б парламент парушыў канстытуцыю.

Напярэдадні выбараў прэзідэнт і людзі з яго акужэння адкрыта заклікалі байкатаваць выбары і прымаць удзел толькі ў рэферэндуме. Дзеля гэтага падрыхтаваны быў спецыяльны дакументальны фільм Нянавісць, які быццам бы па просьбе гледачоў да 14 мая дэманстраваўся па тэлебачанню двойчы. Фільм быў выдатным творам таталітарнай прапаганды, якая не нясе адказнасці ні за факты, ні за перадаваемы змест. Рэжысёр фільма Юрый Азаронак даказваў, што ў магілах у Курапатах ляжаць ахвяры беларускіх нацыяналістаў, якія падчас гітлераўскай акупацыі забівалі там савецкіх грамадзян і яўрэяў з усёй Еўропы. Нацыяналісты карысталіся такой жа сімволікай як незалежная беларуская дзяржава. У фільме Азаронка калабарацыяністы перыяду акупацыі прамаўлялі галасамі дэпутатаў - лідэраў БНФ. Апазіцыя не атрымала ніякіх магчымасцей абвяргнуць хлусню, якой на працягу некалькіх дзён кармілася грамадства.

14 мая выбраных было толькі 18 дэпутатаў, хаця ў галасаванні ўдзельнічала 64,7% выбаршчыкаў. А сталася гэта так па прычыне палажэння аб выбарах, якое дэпутацкі мандат прысвойвала толькі тым кандыдатам, якія ў аднамандатных акругах набралі звыш 50% галасоў пры больш чым 50-працэнтнай прысутнасці выбаршчыкаў. Паколькі за кожны мандат змагалася некалькі, а нават больш дзесяці кандыдатаў, вылучэнне пераможцы аказалася вельмі складаным. У 42 акругах горада Мінска не выбраны быў ніводзін дэпутат. У сельскіх акругах адпаведную колькасць выбаршчыкаў зябяспечвалі старшыні калгасаў і кіраўнікі мясцовай адміністрацыі, якія пакарысталіся багатым арсеналам савецкіх метадаў мабілізацыі грамадства.

Затое рэферэндум завяршыўся вялікай перамогай Лукашэнкі. Больш 75% грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні, станоўча адказалі на ўсе пытанні пастаўленыя прэзідэнтам. Такім чынам атрымаў ён грамадскую згоду на ўзмацненне сваёй улады, умацаванне сувязей з Расіяй і завяршэнне русіфікацыі краіны.

28 мая адбыўся другі тур выбараў. На выбарчыя ўчасткі прыйшло 56% выбаршчыкаў. Прадстаўнікі прэзідэнта зноў падказвалі, што найлепш было б, калі б парламент увогуле не быў выбраны. Апазіцыя не мела магчымасці прадставіць свой пункт гледжання на справу ці ў якінебудзь іншы спосаб запрэзентавацца грамадству. Пасля двух тураў галасавання выбраных было 119 дэпутатаў, галоўным чынам у сельскіх акругах. У адпаведнасці з

канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь парламент, які налічваў 260 дэпутатаў, мог пачаць працу пры ўкамплектаванні 2/3 дэпутацкіх месцаў.

12 чэрвеня прэзідэнт Лукашэнка падпісаў указ аб новай дзяржаўнай сімволіцы, хаця ў адпаведнасці з законам вынікі рэферэндуму павінны раней быць зацверджаны парламентам. Існуючы Вярхоўны Савет Лукашэнка прызнаў нелегітымным, у якога няма права прымаць новыя законы. На яго думку, паўнамоцтвы парламента папярэдняга склікання скончыліся з момантам абвяшчэння новых выбараў. Аднак паводле канстытуцыі (арт. 91), паўнамоцтвы парламента папярэдняга склікання канчаюцца з момантам склікання першай сесіі новаабранага Вярхоўнага Савета. На практыцы прэзідэнт ігнараваў пастановы ВС, прызнаючы вяршэнства сваіх указаў. Прэзідэнцкіх указаў у сваю чаргу не прызнаваў Канстытуцыйны трыбунал, які стары ВС далей лічыў паўнамоцным. Чарговыя ўказы прэзідэнта аспрэчваліся Трыбуналам як неадпаведныя канстытуцыі. Паколькі Трыбунал станавіўся галоўным абаронцам дэмакратыі, прэзідэнт прыгразіў чарговым рэферэндумам, на якім грамадзяне мелі вырашыць аб яго кампетэнцыях.

Паражэнне апазіцыі ў абодвух турах галасавання давяло да глыбокай ператасоўкі на беларускай палітычнай сцэне. Невялікія партыі, якія да гэтай пары супрацоўнічалі з БНФ, пасля адыходу ад групоўкі Пазьняка змянялі лідэраў і стваралі новыя кааліцыі. Некалькі партый і груповак сацыялдэмакратычнага напрамку стварылі Сацыялдэмакратычны саюз, а тры ліберальныя групоўкі заснавалі Аб'яднаную грамадзянскую партыю, якую ўзначаліў Станіслаў Багданкевіч, звольнены з пасады старшыні праўлення Нацыянальнага банка. На чарговы тур дапаўняльных выбараў, назначаных на 29 лістапада, апазіцыйныя групоўкі пайшлі аслабленыя партыйнымі міжусобіцамі і ўнутранымі спрэчкамі. Апрача калгаснага лобі, якое прадстаўляла Аб'яднаная аграрнадэмакратычная партыя Беларусі (30 мандатаў пасля майскіх выбараў), другой сілай у парламенце была Камуністычная партыя Беларусі (27 мандатаў). Хаця КПБ прапагандавала тыя ж лозунгі, што і прэзідэнт, аднак ніколі не дайшло да фармальнага паразумення паміж гэтымі абедзвюма сіламі. Прычынай гэтаму было нежаданне Лукашэнкі дзяліцца з кімнебудзь уладай. Апрача таго лідэры добра арганізаванай і ўплывовай камуністычнай партыі маглі перагнаць яго ў прапагандаванні лозунгаў аб вяртанні ў савецкую рэчаіснасць. Праграмы шматлікіх арганізацый, якія ўдзельнічалі ў выбарах, напрыклад, Славянскага

www.kamunikat.org

сабора “Белая Русь”, Саюза афіцэраў Беларусі, Патрыятычнага руху Беларусі ці беларускай фракцыі Ліберальнадэмакратычнай партыі Уладзіміра Жырыноўскага, у прынцыпе абмяжоўваліся да падтрымкі палітыкі прэзідэнта.

29 лістапада да змагання за 141 дэпутацкае месца прыступіла 826 кандыдатаў. Лукашэнку залежала на самым нізкім удзеле выбаршчкаў у галасаванні, паколькі ў выпадку невылучэння парламента стварыліся б законныя падставы для ўвядзення г.зв. “прамога прэзідэнцкага кіравання”. Па гэтай прычыне ў беларускіх сродках масавай інфармацыі, так як і ў маі, паведамленні аб маючых адбыцца выбарах паяўляліся спарадчына. Прэзідэнт публічна заявіў, што нават калі і пойдзе на выбарчы ўчастак, абавязкова скрэсліць усіх кандыдатаў. У дзень выбараў звычайна нуднае беларускае тэлебачанне амаль безупынна дэманстравала выдатныя творы сусветнай кінематаграфіі.

Нягледзячы на інфармацыйную блакаду і пастаяннае кампраметаванне інстытута парламентарызму грамадзяне Беларусі ўсётакі пайшлі на выбарчыя ўчасткі і ў двух турах дапаўняльных выбараў - 29 лістапада і 10 снежня - выбралі 79 дэпутатаў, у большасці беспартыйных, падтрымоўваных адміністрацыяй, камуністаў і кандыдатаў партыі аграрыяў. У гарадах большасць выбашчыкаў прагаласавала за апазіцыю, але З-за нізкай прысутнасці не атрымалі яны дэпутацкіх мандатаў. У новым парламенце дэпутаты, які называлі сябе незалежнымі, распараджаліся 96 мандатамі. На першай сесіі 60 незалежных дэпутатаў стварылі фракцыю “Згода” для падтрымкі прэзідэнта.

Састаў парламента ствараў шанц наладзіць гарманічныя адносіны з прэзідэнтам на прынцыпе паслухмянай акцэптацыі ягонай палітыкі і спосабу кіравання. Прыхільнікі незалежніцкай плыні складалі нязначны адсотак дэпутатаў. Вярхоўны Савет без супраціву адобрываў чарговыя, падпісваныя Лукашэнкам, дакументы аб інтэграцыі з Расіяй. Выбраны старшынёю ВС прадстаўнік калгаснага лобі Сямён Шарэцкі, як і пераважная большасць парламента згаджаліся з асноўным кірункам палітыкі прэзідэнта, напраўленым на аднаўленне сувязей з рэспублікамі былога Савецкага Саюза. Не было таксама істотных разыходжанняў паміж парламенцкай большасцю і прэзідэнтам у справах унутранай палітыкі. Аднак канфлікт паміж імі нарастаў з месяца ў месяц.

Галоўнай крыніцай супярэчнасцей паміж парламентам і прэзідэнтам стала лукашэнкаўская філасофія ўлады. Усе дзяржаўныя органы прызнаў ён дапаможнымі ўстановамі сваёй адміністрацыі.

www.kamunikat.org

Даказваў таксама, што выбрала яго 5 млн. грамадзян, калі за паасобных дэпутатаў прагаласавала па некалькі тысяч выбаршчыкаў. На яго думку, гэта яму па волі народа належаць большыя заканадаўчыя паўнамоцтвы, а не парламенту. У адпаведнасці з канстытуцыяй 1994 г. раўнапраўнай з прэзідэнтам уладай надзелены былі парламент, Канстытуцыйны трыбунал і Вярхоўны суд. Апрача таго парламент, у выпадку сцвярджэння антыканстытуцыйных дзеянняў прэзідэнта, мог адклікаць яго з займаемай пасады (арт. 104). Не адпавядаючыя асноўным законам рашэнні прэзідэнта мог таксама аспрэчваць Канстытуцыйны трыбунал. Менавіта таму кожны з гэтых уладных цэнтраў мог пагражаць прагнаму неабмежаванай улады Лукашэнку.

Затое канстытуцыя цалкам і поўнасцю аддавала прэзідэнту кантроль за выканаўчым сектарам - адміністрацыяй, міліцыяй, спецслужбамі, арміяй, замежнай палітыкай. Прэзідэнцкія ўстановы - Сакратарыят Савета бяспекі і Адміністрацыя Прэзідэнта - былі вышэйстаячымі органамі для Савета Міністраў. Таму ўказы Лукашэнкі, часта нязгодныя з канстытуцыяй і аспрэчаныя Канстытуцыйным трыбуналам, на практыцы набывалі законную сілу. У 1996 г. ігнараванне пастаноў Трыбунала стала нормай паводзін прэзідэнта. У Беларусі не было ніводнай сілы, ніводнага цэнтра ўлады, які змог бы прымусіць Лукашэнку шанаваць законы. Толькі адзін парламент большасцю галасоў мог яго адклікаць з прэзідэнцкага крэсла.

Ад самога пачатку Лукашэнку Вярхоўны Савет не быў патрэбны. Вельмі добра разумела гэта частка дэпутатаў і думка аб адкліканні прэзідэнта, хаця выразна не фармулявалася, з вясны 1996 г. знаходзіла штораз больш прыхільнікаў. Выкананне гэтага плана ўскладняў яшчэ факт, што большасць дэпутатаў новаабранага Вярхоўнага Савета складалі былыя функцыянеры савецкай дзяржавы, прызвычаеныя да парламенцкіх звычаяў папярэдняй эпохі, калі парламенты служылі фігавым лістком усемагутнасці партыйнага апарату. Лукашэнка вярнуў добра вядомы парламентарыям спосаб выконвання ўлады. Навязной было прыніжанне і высмейванне дэпутатаў у прэзідэнцкіх сродках масавай інфармацыі. Падвергнутыя нападкам не мелі шанцаў абараняцца.

Да бунту супраць прэзідэнта заахвочвалі дэпутатаў дэманстрацыі на вуліцах Мінска вясною 1996 г. Заява аб маючым адбыцца 2 красавіка ў Маскве падпісанні чарговых дакументаў аб стварэнні дзяржаўнай супольнасці Расіі і Беларусі стала прычынай 40-тысячнай дэманстрацыі перад прэзідэнцкім палацам у Мінску. Арганізатарамі дэманстрацыі, у ходзе якой гучэлі патрабаванні

www.kamunikat.org

адстаўкі Лукашэнкі, была пазапарламенцкая апазіцыя - БНФ, сацыялдэмакраты і лібералы. Яшчэ больш людзей выйшла на сталічныя вуліцы 26 красавіка, у дзесятую гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Атрады спецназа і КДБ арыштавалі тады сотні чалавек, а ў выніку вулічных сутычак сотні ўдзельнікаў дэманстрацыі атрымалі цялесныя пашкоджанні.

Май 1996 г. стаў месяцам дэманстрацый пратэсту, якія адбыліся ў большасці абласных гарадоў рэспублікі. Прычынай гэтаму стала пагаршэнне матэрыяльнага становішча большасці насельніцтва. Змаганне з дробнымі прыватнымі прадпрымальнікамі давяло да заняпаду большасці фірм, якіх уласнікі не здолелі дамовіцца з прадстаўнікамі прэзідэнцкай вертыкалі. У адпаведнасці з указам прэзідэнта ад 24 мая 1996 г. аб гаспадарчым кантролю пачалася абавязковая перарэгістрацыя ўсіх прыватных прадпрыемстваў. Атрыманне ліцэнзіі на далейшае вядзенне гаспадарчай дзейнасці звычайна патрабавала ўнясення неафіцыйнай аплаты ў карысць адміністрацыі прэзідэнта. Указ ствараў асабліва выгадныя ўмовы для карупцыі, стварання няясных суадносін на стыку ўлады і гаспадаркі.

У 1995 г. у Беларусі ўзнікла яшчэ адна форма ўласнасці - прэзідэнцкая, якая ахапіла найбольш прыбытковыя прадпрыемствы, рэстараны, будынкі. Адміністратар прэзідэнцкай уласнасці Іван Ціцянкоў, пад выглядам забеспячэння патрэб адміністрацыі прэзідэнта, пераймаў чарговыя будынкі ў Мінску, якія пасля здаваліся ў арэнду фірмам на офісы.

У найбліжэйшым акружэнні прэзідэнта апынуліся работнікі савецкай разведкі, КДБ і партыйнага апарату - Уладзімір Замяталін, Сяргей Посахаў, Віктар Шэйман, Іван Антановіч. Замянілі яны “камсамольцаў” - Анатоля Майсеню, Аляксандра Фядуту, Дзмітрыя Булахава, якія спадарожнічалі Лукашэнку на ягоным шляху да прэзідэнтуры. Згуртаваны вакол прэзідэнта калектыў даволі паспяхова рэалізаваў усялякія канцэпцыі ўмацавання ўлады. Ва ўмовах нарастаючага гаспадарчага крызісу, ізаляцыі ў свеце і перспектывы імпічменту Лукашэнка яшчэ раз рашыўся параіцца з народам - правесці чарговы рэферэндум. Хацеў ён даказаць, што ўсе яго дзеянні з’яўляюцца ўсяго выкананнем волі народа.

20 чэрвеня 1996 г. прэзідэнт прад’явіў Вярхоўнаму Савету прапанову правядзення рэферэндуму ў справе ўнясення змяненняў у канстытуцыю і перанясення нацыянальнага свята з 27 ліпеня (дзень абвяшчэння суверэнітэту ў 1990 г.) на 3 ліпеня (дзень вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй у 1944 г.). Два чарговыя пытанні датычылі свабоднага абароту зямлёй і адмены смяротнага пакарання.

www.kamunikat.org

Прапанаваныя Лукашэнкам змяненні ў канстытуцыі датычылі стварэння другой палаты парламента, якой частку саставу меў назначаць сам прэзідэнт, і прадаўжэння паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы з 5 да 7 гадоў.

Дэпутаты прабавалі давесці да склікання "круглага стала" з удзелам прэзідэнта і пазапарламенцкай апазіцыі, якой існаванне ўвесь час было відочнае на вуліцах Мінска. "Круглы стол", праўда, адбыўся, але без удзелу прэзідэнта. Прадстаўнікі партый, ад камуністаў да БНФ, заклікалі Лукашэнку вярнуцца на шлях легалізму. У адказ адміністрацыя прэзідэнта і ўрад узмоцнілі прапагандысцкую кампанію, у ходзе якой тлумачылася грамадству, што на рэферэндуме трэба станоўча адказаць на вынесеныя Лукашэнкам пытанні.

На 19-20 кастрычніка прэзідэнт склікаў у Мінск г.зв. Нацыянальны сход, на які з'ехалася 5 тыс. ягоных прыхільнікаў. Сход, спасылаючыся на волю народа, аднадушна выказаўся за правядзенне планаванага рэферэндуму. У той самы час апазіцыя сарганізавала таксама прадстаўнічы Нацыянальны кангрэс, які вылучыў камісію для вывучэння злачынстваў рэжыму. Канстытуцыйны трыбунал прызнаў, што вынесеныя на рэферэндум пытанні парушаюць канстытуцыйны лад. Такім чынам Вярхоўны Савет атрымаў законную падставу пачаць працэдуру адхілення Лукашэнкі ад пасады прэзідэнта.

Запланаваны на 24 лістапада рэферэндум аказаўся датай яго завяршэння. Галасаванне цягнулася ад 9 лістапада. Грамадзяне маглі ўдзельнічаць у рэферэндуме праз пасрэдніцтва пошты. У многіх акругах зарэгістравана большую колькасць галасуючых чым было выбаршчыкаў. У сельскіх акругах выбарчыя камісіі вазілі урны па дамах, дапамагалі выбаршчыкам даваць "правільныя" адказы. Супраць такога фарса выступаў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар і ў выніку быў адкліканы з пасады.

17 лістапада Вярхоўны Савет пачаў працэдуру імпічменту, а прэм'ерміністр Міхаіл Чыгір разам з трыма іншымі членамі кабінета падалі ў адстаўку. Усё паказвала на тое, што кар'ера Лукашэнкі набліжаецца да канца. Нават журналісты прэзідэнцкага тэлебачання спынілі паклёпніцкую кампанію супраць апазіцыйных дэпутатаў. Прэзідэнт зацягваў гульню. Найбольш ярыя ягоныя прыхільнікі з фракцыі "Згода" 20 лістапада не з'явіліся ў парламенце. У гэты дзень мелі адбыцца дыскусія і галасаванне ў справе адклікання прэзідэнта. Адсутнасць дэпутатаў фракцыі "Згода" стала прычынай таго, што Вярхоўнаму Савету не хапіла патрэбнага для прыняцця правамоцных рашэнняў кворуму - 2/3 саставу парламента. Вярхоўны Савет карыстаўся ў гэтай справе падтрымкай пазапарламенцкай апазіцыі,

www.kamunikat.org

якая ўвесь час на вуліцах Мінска арганізавала дэманстрацыі, пікеты, мітынгі. На бок парламента перайшлі некаторыя генералы войска і міліцыі, якім не адпавядалі пастаянныя змены на камандных пасадах і атмасфера даносаў, якой не было нават у час савецкага рабалепства.

У палітычных умовах Беларусі вырашальным фактарам з'яўляецца пазіцыя Масквы. Лукашэнку выратавалі расійскія "медыятары", якіх узначальвалі старшыня Думы Генадзій Селязнёў і прэм'ерміністр Віктар Чарнамырдзін. 21 лістапада схілілі яны Шарэцкага на ўступкі, а ў сапраўднасці далі яны Лукашэнку блаславенства на далейшае працягванне місіі. Узбунтаваныя посткамуністычныя і камуністычныя дэпутаты з Шарэцкім, Карпенкам, Грыбам, Новікавым і Багданкевічам на чале не ўмелі дзейнічаць насуперак пазіцыі Масквы. На другі дзень пасля візіту расійскіх "медыятараў" Лукашэнка заявіў па тэлебачанні, што ў выніку пагаднення са старшынёю Вярхоўнага Савета праводжаны рэферэндум прызнаецца легітымным. Апазіцыя не мела магчымасцей публічна прадставіць грамадству сваю пазіцыю ў гэтай справе.

Паводле афіцыйных даных у рэферэндуме прыняло ўдзел 84,2% упаўнаважаных. Больш 70% удзельнікаў галасавання мелі выказацца за ўвядзенне прэзідэнцкіх паправак у канстытуцыю. Амаль 88% галасуючых падтрымала пастулат Лукашэнкі ў справе пераняcення нацыянальнага свята на 3 ліпеня, 82,1% выказалася супраць адмены смяротнага пакарання, 84,7% не жадалі свабоднага абароту зямлёю.

Умацаванне пазіцыі Лукашэнкі стала прычынай таго, што большасць дэпутатаў, нават тых, якія раней гатовы былі галасаваць за адхіленне яго ад пасады прэзідэнта, перайшла ў новастворааны Нацыянальны Сход. Вярхоўны Савет, у якім засталося 85 парламентарыяў, не прызнаў законнасці рэферэндуму і працягваў працу. Аднак з прычыны браку кворуму ВС не мог прымаць правамоцных пастаноў. Неўзабаве пад выглядам рамонту ў будынку ВС адключаны былі электраток, ацяпленне тэлефоны і вада. Парламент, у якім пастаянна скарачалася колькасць дэпутатаў і якім верхаводзілі Сямён Шарэцкі, Станіслаў Шушкевіч і Станіслаў Багданкевіч, адзіным легальным нацыянальным прадстаўніцтвам Беларусі лічыўся толькі ў свеце, а ў сябе заставаўся ўсяго малазначнай установай, якая не мела ніякага рэальнага ўплыву на сітуацыю ў рэспубліцы. Лідэры Вярхоўнага Савета, так як іншыя грамадзяне, падвяргаліся адміністрацыйнаму пакаранню за ўдзел у нелегальных дэманстрацыях, траплялі ў следчыя ізалятары, плацілі вялікі штрафы за "парушэнне правапарадку".

Новая ніжэйшая палата Нацыянальнага Сходу, званая Палатай

Прадстаўнікоў, налічвала 110 дэпутатаў, якія перайшлі з Вярхоўнага Савета. Яе старшынёю выбраны быў адзін з лідэраў Партыі камуністаў Беларусі Анатоль Малафееў. Вышэйшая палата, Савет Рэспублікі, налічвала 64 асобы і, паводле новых законаў, увайшла ў яе частка дэпутатаў назначаных прэзідэнтам або выбраных абласнымі саветамі, у якіх пераважалі прэзідэнцкія "вертыкальшчыкі".

Адсутнасць падтрымкі ў парламенце ўскладніла становішча Канстытуцыйнага трыбунала, які аспрэчваў большасць прэзідэнцкіх указаў. Скора, аднак, суддзі Трыбунала свае перакананні памянялі на апартунізм. Адмянілі яны ранейшыя свае пастановы, а таксама прызналі, што рэферэндум быў праведзены ў адпаведнасці з канстытуцыяй.

Рэферэндум, які надзяліў Лукашэнку амаль абсалютнай уладай, стаў прычынай ізаляцыі Беларусі ў свеце. Дзяржавы Заходняй Еўропы не прызналі ні вынікаў рэферэндуму, ні створанага прэзідэнтам Нацыянальнага Сходу. Адначасна ізаляцыя Беларусі ў Еўропе вяла яе да шчыльнейшага збліжэння з Расіяй. Альтэрнатыўныя суадносіны прабаваў стварыць прэзідэнт Украіны Леанід Кучма, які рашуча выказваўся за стаўленне да Беларусі як да поўнасцю суверэннай дзяржавы. Хаця Лукашэнка ў сваіх доўгіх тэлевізійных прамовах часта гаварыў аб шматвектарнай замежнай палітыцы, на практыцы быў ён прыгавораны на пашыранне палітычных кантактаў з Расіяй, Югаславіяй, Малдовай, Балгарыяй, Кітаем, В'етнамам, Іранам, Іракам.

Ад пачатку свайго прэзідэнцтва Лукашэнка праявіўся як гарачы прыхільнік адзінства славянскіх народаў і неабходнасці іх інтэграцыі з прычыны пагрозы з боку НАТО. Паводле яго, славянскасць вызначалася не па этнічных прынцыпах, але прыналежнасцю да візантыйскай культурнай прасторы. У такім разуменні ў славянскасці не было месца для палякаў, чэхаў, затое было для армян і грузінаў, мардоўцаў. Арганізаваны штогод прэзідэнтам Беларусі фестываль славянскай культуры ў Віцебску стаў у прынцыпе аглядам творчасці народаў былога СССР.

У Расіі ідэя аб'яднання з Беларуссю знайшла многіх прыхільнікаў, асабліва ў камуністычных і нацыяналістычных колах. Нягледзячы на непрыхільнае стаўленне да Лукашэнкі расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, беларускі прэзідэнт карыстаўся вялікай папулярнасцю тамашняга грамадства. Быў ён проціпастаўленнем нямогламу Ельцыну, а ягоная антызаходняя рыторыка станоўча ўспрымалася таксама значнай часткай расійскай палітычнай сцэны. Аднак найбольш захапляліся яны Лукашэнкам за тэрміновую выплату

www.kamunikat.org

пенсій і зарплат бюджэтнікам. Бачыўся ён людзям як правадыр, які здольны вярнуць савецкі дабрабыт. Крамлёўскім элітам прэзідэнт Беларусі быў гарантам бясплатнага доступу да транзітных шляхоў у Заходнюю Еўропу, забяспечваў магчымасць размяшчэння ваенных гарнізонаў.

Фармальнае далучэнне Беларусі да Расіі ў якасці адміністрацыйнай адзінкі Федэрацыі - як часта мяркуюць журналісты - здаецца малапраўдападобным. Такога вырашэння не хоча, па фінансавых прычынах, таксама Расія. А Лукашэнка часта паўтараў, што выказваецца за інтэграцыю “суверэнных” дзяржаў. “Суверэнітэт” разумее ён як свабоду мінскіх улад вырашаць унутраныя пытанні на тэрыторыі рэспублікі. На практыцы абазначае гэта захаванне асобнай юрыдычнапалітычнай сістэмы ў Беларусі і выключэнне ўнутраных спраў Беларусі з-пад кантролю крамлёўскіх правячых цэнтраў. Зрэшты, ніводзін палітычны лагер у Расіі не цікавіўся ні лёсамі дэмакратыі ў Беларусі, ні паважаннем правоў чалавека ў гэтай краіне. Калі ў чэрвені 1998 г. Захад канчаткова закрыў межы Лукашэнку і ягоным чыноўнікам, добрыя адносіны з Расіяй сталі адзіным козырам прэзідэнта Беларусі на міжнароднай арэне.

Фінансавы крызіс, які ў жніўні 1998 г. паралізаваў жыццё ў самой Расіі, з прычыны цесных гаспадарчых сувязей з усёй сілай абрынуўся на Беларусь. За склаўшаеся становішча ў Расіі Лукашэнка 25 жніўня 1998 г. падчас тэлевізійнага выступлення абвінаваціў расійскіх палітыкаў, якія прабавалі ажыццявіць у сваёй краіне заходнюю мадэль палітычнага і гаспадарчага развіцця. Заявіў ён, што самай лепшай канцэпцыяй арганізацыі грамадскага, палітычнага і гаспадарчага жыцця на постсавецкай прасторы з’яўляецца беларускі варыянт. Хаця ў Расіі за падобнымі вырашэннямі выказваецца значная частка грамадства, малапраўдападобным, аднак, з’яўляецца экспарт “беларускай дэмакратыі” і “рыначнага сацыялізму” ў гэтую краіну. Назначэнне падтрымліванага камуністамі Яўгенія Прымакова на пасаду прэм’ерміністра Расіі ўспрымалася ў Беларусі як крок у правільным напрамку.

Праведзеныя апазіцыяй вясною 1999 г. прэзідэнцкія выбары закончыліся чарговым паражэннем антырэжымнага лагера. Узаемныя абвінавачанні абодвух кандыдатаў у прэзідэнты Зянона Пазьняка і Міхаіла Чыгіра звялі выбары да фарса. Пасвараная апазіцыя яшчэ раз паказала брак арганізаванасці і рашучасці ў захадах на звяржэнне дыктатуры. У палове 1999 г. Лукашэнка захоўваў уладу не маючы ў краіне ніякай сур’ёзнай палітычнай канкурэнцыі.

## Імянны паказальнік


Абрамава Надзея (н. 1907), сустаршыня Саюза беларускай моладзі,

Абэцэдарскі Лаўрэнцій (1916-1975), савецкі гісторык, аўтар падручнікаў па гісторыі Беларусі, прапагандуючых тэзіс аб вечным адзінстве інтарэсаў Беларусі і Расіі,

Агняцвет Эдзі, сапр. Каган (н. 1913), паэтэса,

Адамовіч Аляксей (1900-1937), камуністычны дзеяч, суарганізатар беларускага нацыянальнага жыцця ў БССР у дваццатых гадах,

Адамовіч Антон (1909-1998), гісторык, журналіст, эміграцыйны дзеяч, аўтар прац па гісторыі і культуры Беларусі,

Адамовіч Вячаслаў (1864-1939), арганізатар беларускага антыбальшавіцкага партызанскага руху ў 1919-1920 гг., прыхільнік інтэграцыі Беларусі з Польшчай,

Адамовіч Язэп (1897-1937), беларускі камуністычны дзеяч, адзін з правадыроў бальшавіцкай рэвалюцыі ў Беларусі, член вярхоўных улад БССР і СССР, арыштаваны за “контррэвалюцыйную дзейнасць” пакончыў жыццё самагубствам,

Азаронак Юрый, кінарэжысёр, аўтар прагандысцкай карціны “Нянавісць”,

Акінчыц Фабіян (1886-1943), журналіст і палітычны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускай нацыяналсацыялістычнай партыі, прыхільнік супрацоўніцтва з немцамі, загінуў у замаху,

Александровіч Андрэй (1906-1963), паэт, вязень сталінскіх лагераў,

Аляксюк Павел (1892-?), беларускі палітычны дзеяч, прыхільнік супрацоўніцтва з палякамі,

Аляхновіч Францішак (1883-1944), акцёр, драматург, журналіст, выдавец, арганізатар беларускага тэатральнага жыцця ў Вільні, аўтар кніжкі “У кіпцюрах ГПУ”, застрэлены ў Вільні невядомымі замахвальнікамі,

Антановіч Іван (н. 1937), ідэолаг Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, сакратар ЦК Камуністычнай партыі Расіі (1990-1991), у 1996-1998 гг. міністр замежных спраў Беларусі,

Антончык Сяргей, дзеяч Беларускага народнага фронту, дэпутат Вярхоўнага Савета (1990-1995),

Арол Міхась, сапр. Пятэльскі Сцяпан (1890-1918), паэт, перакладчык, публіцыст “Нашай нівы”, 15

Асмалоўскі Ежы, у 1919-1920 гг. генеральны камісар Цывільнага кіраўніцтва Усходніх зямель,


www.kamunikat.org

Астроўскі Радаслаў (1887-1976), палітык, педагог, удзельнік Слуцкага паўстання 1920 г., дырэктар Віленскай беларускай гімназіі, у 1928-1936 гг. прыхільнік ідэі супрацоўніцтва з палякамі, прэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады ў 1943-1944 гг., пасля вайны ў эміграцыі,

Багданкевіч Станіслаў (н. 1937), эканаміст, у 1991-1995 гг. старшыня Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі,

Багдановіч Вячаслаў (1878-1941), беларускі і праваслаўны дзеяч у II Рэчы Паспалітай, сенатар, у 1939 г. арыштаваны работнікамі НКУС,

Багдановіч Максім (1891-1917), паэт, перакладчык, крытык і гісторык літаратуры,

Багушэвіч Францішак (1840-1900), паэт, празаік, публіцыст, перакладчык,

Баліцкі Антон (1891-1937), народны камісар асветы БССР (1926-1930), пачынальнік беларускага нацыянальнага адраджэння, арыштаваны ў 1931 г. за дзейнасць у "контррэвалюцыйных арганізацыях", расстраляны,

Баран Сяргей (1894-1937), дэпутат Сейма РП (1922-1923), арганізатар антыпольскага партызанскага руху на Гродзеншчыне і Беласточчыне, прыгавораны польскім судом да 8 гадоў турэмнага зняволення, у 1930 г. эмігрыраваў у БССР, арыштаваны і абвінавачаны ў шпіянажы на карысць Польшчы, расстраляны,

Барковіч Леанард, упаўнаважаны Польскага камітэта нацыянальнага адраджэння па Беластоцкім ваяводстве (VIII-XII 1944 г.),

Бах Эрых фон дэм, камандзір СС і паліцыі ва ўсходняй Беларусі,

Баштакоў,

Берман Барыс (1901-1939), у 1937-1939 гг. народны камісар унутраных спраў БССР, адказны за смерць больш 100 тыс. грамадзян рэспублікі,

Берыя Лаўрэнцій (1899-1953), у 1934-1953 гг. шэф НКУС, адказны за палітычныя судовыя працэсы і генацыд,

Броўка Пятрусь (1905-1980), паэт,

Будзька Эдуард (1882-1958), паэт, публіцыст, выдавец, беларускі эмігранцкі дзеяч,

Буйло Канстанцыя (1893-1986), паэтэса,

Булак-Балаховіч Станіслаў (1883-1940), камандуючы Беларускім корпусам, удзельнік польска-савецкай вайны 1920 г., загінуў у вераснёўскай кампаніі 1939 г.,

Булахаў Дзімітрый,

Буракявічус Ніколас, літоўскі камуністычны дзеяч,

Бурбіс Аляксандр (1885-1922), адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады, у 1921-1922 гг. намеснік народнага камісара замежных спраў БССР, прыхільнік палітычнай і культурнай аўтаноміі рэспублікі,

Бур'як Віктар, віцэміністр аховы здароўя Беларусі ў 80-х гадах,

Быкаў Васіль (н. 1924), пісьменнік, аўтар аповесцей і апавяданняў аб вайне, сталінізме, у Беларусі многія лічаць яго сумленнем беларускага народа,

Бядуля Змітрок, сапр. Плаўнік Самуіл (1886-1941), пісьменнік,

Бярозкін Рыгор (1918-1981), літаратурны крытык, гісторык літаратуры,

Валошын Павел (1881-1937), адзін з заснавальнікаў Беларускай сялянскаработніцкай грамады, у 1928 г. прыгавораны да 12 гадоў турэмнага зняволення, у 1932 г. у рамках абмену палітвязнямі апынуўся ў Мінску, у 1933 г. арыштаваны па абвінавачанні ў антысавецкай дзейнасці, расстраляны,

Валынец Флягонт (1878-1937), дзеяч беларускіх левых арганізацый у II Рэчы Паспалітай, член управы Таварыства беларускай школы, у 1928-1930 гг. дэпутат Сейма, арыштаваны польскімі ўладамі ў 1930 г. і прыгавораны да 16 гадоў турэмнага зняволення, у 1932 г. у рамках абмену палітвязнямі апынуўся ў Мінску, у 1937 г. абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці, расстраляны,

Варонка Язэп (1891-1952), журналіст, публіцыст, з 1917 г. дзеяч Беларускай сацыялістычнай грамады, ініцыятар склікання I Усебеларускага з'езда, старшыня Народнага сакратарыята Беларусі, прыхільнік супрацоўніцтва з Літвой, да Польшчы і Расіі ставіўся як да раўнапраўных ворагаў Беларусі, у 1923 г. выехаў у Злучаныя Штаты,

Васілеўскі Леан (1883-1936), гісторык, публіцыст, польскі палітык, член кіраўніцтва сацыялістычнай партыі ППС - Фракцыя рэвалюцыйная, у 1918-1919 гг. міністр замежных спраў, з 1931 г. намеснік старшыні ППС і кіраўнік Інстытута даследавання нацыянальных меншасцей,

Ветцэль Эргард, аўтар плана нацыянальнай палітыкі III Рэйха ва Усходняй Еўропе,

Вільгельм II (1859-1941) імператар Нямеччыны ў 1888-1918 гг.,

Гадлеўскі Вінцэнт (1898-1942), каталіцкі духоўны, дзеяч беларускага нацыянальнага руху, прыхільнік беларусізацыі Касцёла ў Беларусі, адзін з лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі,

Гайдар Ягор, расійскі палітык, прэм'ерміністр Расіі ў 1991-1992 гг.,

Галуўка Тадэуш (1889-1931), польскі палітык, прыхільнік санацыйнага лагера,

Ганчар Віктар (н. 1954), юрыст, палітык, дэпутат Вярхоўнага Савета ў 1990-1995 гг., старшыня Цэнтрвыбаркама,

Ганько Міхал, старшыня Саюза беларускай моладзі ў 1943-1944 гг.,

Гарбачоў Міхаіл (н. 1931), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, генеральны сакратар ЦК КПСС (1985-1991), прэзідэнт СССР (1991),

Гарун Алесь, гл.: Прушынскі Аляксандр

Гаўрылік Язэп (1893-1937), педагог, арганізатар беларускага левага руху ў ІІ Рэчы Паспалітай, арыштаваны ў 1930 г. і перададзены савецкаму боку ў рамках абмену палітвязнямі, арыштаваны ў Мінску ў 1933 г. і абвінавачаны ў “антысавецкай дзейнасці”, расстраляны,

Гей Канстанцін (1896-1939), савецкі партыйны дзеяч, у 1930-1932 гг. І сакратар ЦК КП(б)Б, ініцыятар рэпрэсій супраць беларускай інтэлігенцыі,

Гілевіч Ніл (н. 1931), паэт, перакладчык, літаратуразнавец, у 1980-1989 гг. старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1990 г. старшыня Таварыства беларускай мовы, вяшчальнік адраджэння беларускай мовы і культуры,

Гімлер Генрых (1900-1945), адзін з галоўнейшых правадыроў ІІІ Рэйха і ваенных злачынцаў, міністр унутраных спраў, шэф СС, гестапа і паліцыі,

Гіндэнбург Паўль фон (1847-1934), нямецкі фельдмаршал і палітык, у 1916-1918 шэф генеральнага штаба, у 1925-1934 гг. прэзідэнт Рэйха,

Гітлер Адольф (1989-1945),

Готберг Курт фон, камандзір СС і паліцыі на тэрыторыі акупаванай Беларусі, з верасня 1943 г. генеральны камісар Камісарыята Беларусь, адказны за пацыфікацыі соцень населеных пунктаў,

Грабскі Уладзіслаў (1874-1938), польскі палітык і эканаміст, прыхільнік нацыянальнага лагера, прэм'ерміністр урада ў 1923-1925 гг.,

Грахоўскі Сяргей (н. 1913), пісьменнік, у 1936 і 1949 гг. па палітычных прычынах суджаны за антысавецкую пазіцыю,

Грыб Мячыслаў (н. 1938), генерал міліцыі, старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1994-1995 гг.,

Грыб Тамаш (1895-1938), палітычны дзеяч, сакратар Усебеларускага з’езда, кіраўнік знешнепалітычнага ведамства ва ўрадзе БНР, з 1922 г. у эміграцыі ў Чэхаславакіі,

Губарэвіч Кастусь (1907-1987), драматург,

Гурскі Ільля (1899-1969), пісьменнік,
Гутман,
Дабравольскі Аляксандр, дзеяч беларускай дэмакратычнай апазіцыі, у 1991-1995 гг. старшыня Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі,
Дабруцкі Густаў, польскі палітык санацыйнага лагера, міністр асветы ў 1927-1928 гг., 101
Дварчанін Ігнат (1895-1937), паэт, беларускі грамадскі і палітычны дзеяч у II Рэчы Паспалітай, у 1928-1930 гг. дэпутат Сейма РП, у 1932 г. у рамках абмену палітвязнямі пераехаў у Мінск, арыштаваны ў 1933 г. і расстраляны,
ДземідэцкіДземідовіч Адам, дзеяч беларускага нацыянальнага руху, намеснік бургамістра г. Мінска ў 1941-1943 гг.,
Дземянцей Мікалай (н. 1930), партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1979-1989 гг. сакратар ЦК КПБ, у 1990-1991 гг. старшыня Вярхоўнага Савета БССР,
Дзямідаў Мікола (1888-1967), педагог, ваенны, удзельнік баёў у абароне БНР, у 1919-1920 гг. камандзір батальёна, з 1945 г. эміграцыйны дзеяч,
Дзяржынскі Фелікс (1877-1926), польскі камуніст, суарганізатар бальшавіцкага перавароту ў Расіі ў 1917 г., старшыня ВЧК па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам,
ДоўбарМусніцкі Юзаф (1867-1937), генерал, у 1917-1918 гг. камандзір 1-га Польскага корпуса ў Расіі,
Дубейкаўскі Лявон (1869-1940), паэт, архітэктар, дзеяч беларускага нацыянальнага руху ў 1917-1922 гг.,
ДунінМарцінкевіч Вінцэнт (1808-1884), паэт, драматург,
Дыла Язэп (1880-1973), паэт, драматург, грамадскі і палітычны дзеяч, у 1921-1930 гг. выконваў шматлікія кіраўнічыя абавязкі ў культурных і навуковых установах Беларусі,
Езавітаў Канстанцін (1893-1946), палітычны дзеяч, адзін са стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі, памёр у мінскай турме падчас допытаў,
Ельцын Барыс (н. 1930), прэзідэнт Расіі,
Емяльянаў Аляксандр, старшыня Нацыянальнадэмакратычнай партыі Беларусі,
Ермалавічус Юозас, камуністычны літоўскі дзеяч,
Ермачэнка Іван (1894-1970), лекар, дыпламат, эміграцыйны дзеяч, прадстаўнік урада БНР у Турцыі, старшыня Беларускай народнай самапомачы ў перыяд нямецкай акупацыі, памёр у Злучаных Штатах,

www.kamunikat.org

Жалігоўскі Люцыян (1865-1947), генерал, падчас I сусветнай вайны арганізатар польскага войска ў Расіі, у 1920 г. па загадзе Ю. Пілсудскага заняў Вільню, у 1925-1926 гг. міністр вайсковых спраў,

Ждановіч Мікола, у 1941-1944 гг. дзеяч Беларускага нацыянальнага камітэта ў Варшаве,

Жылуновіч Зміцер (1887-1937), палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст, пісьменнік (літаратурны псеўданім - Цішка Гартны), актывіст Беларускай сацыялістычнай грамады, удзельнік Усебеларускага з’езда 1917 г., у 1919 г. прэм’ерміністр Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікі, з 1920 г. рэдактар “Савецкай Беларусі”, прафесар Акадэміі навук, член ЦК КП(б)Б, арыштаваны ў 1936 г. па абвінавачанню ў дзейнасці ў “контррэвалюцыйных арганізацыях”, замучаны ў турме НКУС,

Жырыноўскі Уладзімір, старшыня нацыяналістычнай Ліберальна-дэмакратычнай партыі Расіі,

Жэбрак Антон (1901-1965), біёлаггенетык, дзеяч КПБ, у 1945 г. член дэлегацыі БССР на заснавальніцкую канферэнцыю ААН, у 1947 г. прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі, звольнены з пасады за аспрэчванне навуковых дасягненняў Трафіма Лысенкі,

Закоўскі Леанід, сапр.: Штубіс Генрых (1894-1939), з 1917 г. у органах ВЧК, з 1934 г. народны камісар унутраных спраў БССР, галоўны арганізатар палітычных рэпрэсій і генацыду ў СССР у 1937-1938 гг.,

Замяталін Уладзімір (н. 1947), палкоўнік савецкага КДБ, адзін з блізкіх супрацоўнікаў Вячаслава Кебіча, а пасля Аляксандра Лукашэнкі, з 1997 г. віцэпрэм’ер урада Беларусі,

Зарубавель (Віткін),

Захарка Васіль (1877-1943), ваенны, палітычны дзеяч, у 1898-1916 гг. у расійскай арміі, у 1917 г. сакратар Беларускай цэнтральнай вайсковай рады, міністр фінансаў ва ўрадзе БНР, пасля падпісання Рыжскага дагавора рашучы праціўнік любога супрацоўніцтва з Польшчай і Расіяй, з 1920 г. у эміграцыі ў Чэхаславакіі, у 1928-1943 гг. старшыня Рады БНР,

Злобін,

Іваноўскі Вацлаў (1880-1943), палітык, выдавец, вучоны, пачынальнік беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст., міністр асветы ва ўрадзе БНР, бургамістр Мінска ў 1942-1943 гг., загінуў у замаху,

Івашкевіч Віктар, дзеяч Беларускага народнага фронту, адзін з лідэраў незалежных прафсаюзаў, выдавец і рэдактар бюлетэня “Рабочий”,

Ігнатоўскі Усевалад (1881-1931), гісторык, палітык, у 1920-1926 гг. народны камісар асветы БССР, у 1928-1931 гг. прэзідэнт Акадэміі навук, абвінавачаны ў нацыяналдэмакратычным загаворы пакончыў самагубствам,

Ільючонак Пётр (1891-1945), грамадскі і палітычны дзеяч, у 1920-1929 гг. на кіраўнічых пасадах у асвеце і дзяржаўных выдавецтвах БССР, у 1930-1943 гг. чатыры разы суджаны за “нацыяналдэмакратычныя” погляды, памёр у лагеры,

Кабулаў Амяк,

Кавалёў Віктар,

Кавалёў Міхаіл, камандуючы Беларускім фронтам у 1939 г.,

Кавалёў Міхаіл, прэм’ерміністр урада БССР у 1986-1990 гг., -

Каганец Карусь, сапр.: Кастравіцкі Казімір (1868-1918), пісьменнік, мастак, сын удзельніка паўстання 1863-1864 гг., адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады,

Казлоўскі Павел (н. 1942), генерал, міністр абароны Беларусі ў 1992-1994 гг.,

Казлоўскі Уладзіслаў (1896-1943), паэт, публіцыст, нацыянальны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускай нацыяналсацыялістычнай партыі,

Калінін Пётр (1902-1966), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, падчас акупацыі шэф Беларускага штаба партызанскага руху,

Каліноўскі Кастусь (1838-1864), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гг. у Беларусі,

Камінскі Station Браніслаў (1896-1944), ССбрыгадэфюрэр, камандзір Рускай вызваленчай арміі ў 1942-1944 гг.,

Карпенка Генадзь (1949-1999), старшыня камісіі навукі Вярхоўнага Савета ў 1990-1994 гг., старшыня Партыі нацыяналнай згоды,

Касмовіч Дзімітрый (1909-1991), нацыянальны дзеяч у перыяд нямецкай акупацыі, пасля 1944 г. у эміграцыі, член шматлікіх антыкамуністычных арганізацый,

Кастэнка Анатоль (н. 1940), савецкі генерал, у 1994-1995 гг. міністр абароны Беларусі,

Касцюшка Тадэвуш (1746-1817), польскі генерал, ураджэнец Беларусі,

Касяк Іван (1902-1989), беларускі нацыянальны дзеяч, ініцыятар аб’яўлення ў 1942 г. аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы, з 1944 г. у эміграцыі,

Каўфман,

Кахановіч Міхал (1882-1934), перакладчык, публіцыст, беларускі

www.kamunikat.org

палітычны дзеяч у Вільні ў 1920-1925 гг., рэдактар “Савецкай Беларусі”, прыгавораны да вышэйшай меры пакарання за прыналежнасць у неіснуючай арганізацыі “Беларускі нацыянальны цэнтр”,

Каяловіч Міхал (1828-1891), гісторык, этнограф, публіцыст, ідэолаг заходнерусізму,

Кебіч Вячаслаў (н. 1936), прэм’ерміністр беларускага ўрада ў 1990-1994 гг.,

Кейтэль Вільгельм (1882-1946), нямецкі фельдмаршал, шэф штаба Галоўнага камандавання Вермахтам, асуджаны ў Нюрнбергу за ваенныя злачынствы,

Керанскі Аляксандр (1881-1970), расійскі палітык, прэм’ерміністр Часовага ўрада ў 1917 г.,

Кісялёў Ціхан (1917-1983), прэм’ерміністр урада БССР у 1978-1980 гг., І сакратар ЦК КПБ у 1980-1983 гг.,

Кнорын Вільгельм (1890-1938), І сакратар ПаўночнаЗаходняга абласнога камітэта РКП(б), член ЦК КП(б)Б у 1920-1929 гг., праціўнік беларускай савецкай дзяржаўнасці,

Кноўт Мечыслаў, кіраўнік цывільнай адміністрацыі Мінскага раёна ў 1941-1943 гг.,

Колас Якуб, сапр.: Міцкевіч Канстанцін (1882-1956), пісьменнік,

Костэк-Бярнацкі Вацлаў (1884-1957), палкоўнік, польскі санацыйны палітык, заснавальнік канцэнтрацыйнага лагера ў Картуз-Бярозе,

Краскоўскі Іван (1880-1955), нацыянальны дзеяч, пісьменнік, педагог, у 30-х гадах рэпрэсіраваны за ўдзельніцтва ў неіснуючыай арганізацыі “Саюз вызвалення Беларусі”, пасля вайны жыў у Чэхаславакіі,

Краўчанка Пётр (н. 1950), партыйны дзеяч, у 1990-1994 гг. міністр замежных спраў Беларусі, з 1998 г. пасол РБ у Японіі,

Краўчанка Усевалад (1915-1961), пісьменнік,

Краўчук Леанід (н. 1934) першы прэзідэнт незалежнай Украіны ў 1991-1994 гг.,

Крачэўскі Пётр (1879-1928), палітык, паэт, драматург, гісторык, старшыня Рады БНР, з 1920 г. у эміграцыі,

Крыжаноўскі Мікалай, адзін з заснавальнікаў узніклай у 1991 г. Беларускай сацыялдэмакратычнай грамады,

Крыніцкі Аляксандр (1894-1937), член улад ВКП(б) і КП(б)Б, у 1925-1927 гг. І сакратар ЦК КП(б)Б, прыгавораны за шпіянаж у карысць Польшчы,

Кубэ Вільгельм (1887-1943) камісар Генеральнай акругі Беларусь,

Куляшоў Аркадзь (1914-1978), пісьменнік,

Купава Мікола (н. 1946), мастакграфік, педагог, публіцыст,

Купала Янка, сапр.: Луцэвіч Іван (1882-1942), паэт, класік беларускай літаратуры, загінуў у Маскве ў нявысветленых абставінах,

Кучма Леанід (н. 1938), з 1994 г. прэзідэнт Украіны,

Кушаль Францішак (1895-1968), да 1939 г. афіцэр польскага войска, падчас нямецкай акупацыі арганізаваў беларускія ваенныя фарміраванні, памёр у эміграцыі,

Ландар Карл (1883-1937), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1917-1918 гг. старшыня Выканкама Заходняй вобласці і фронту,

Ластаўка Пятро (1907-1968), дзеяч Беларускага нацыянальнага камітэта ў Варшаве і Беластоку ў 1940-1943 гг.,

Ластоўскі Вацлаў (1883-1938), палітык, гісторык, этнолаг, публіцыст, у 1920-1923 гг. прэм’ерміністр эміграцыйнага ўрада БНР, прыхільнік супрацоўніцтва з Літвою, у 1927-1929 гг. дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея, расстраляны за “антысавецкую дзейнасць”,

Лашук Леанід, міністр юстыцыі Беларусі ў 1990-1991 гг.,

Ленін (сапр. Ульянаў) Уладзімір (1870-1924),

Лёсік Язэп (1883-1940), пісьменнік, педагог, мовазнавец, адзін з заснавальнікаў БНР, у 1920-1930 гг. прафесар Белдзяржуніверсітэта, у 1931 г. прыгавораны за ўдзельніцтва ў “антысавецкім загаворы”, паводле афіцынай версіі памёр у турме ад туберкулёзу,

Лугін Яўген, старшыня заснаванай у 1991 г. Беларускай сялянскай партыі,

Лукашэнка Аляксандр (н. 1954), з 1994 г. прэзідэнт Беларусі,

Луцкевіч Антон (1884-1946 ?), ідэолаг беларускага адраджэння, палітык, публіцыст, ініцыятар абвяшчэння незалежнасці БНР, беларускі дзеяч у II Рэчы Паспалітай, арыштаваны НКУС у 1939 г., паводле афіцыйнай версіі памёр у турме,

Луцкевіч Іван (1881-1919), брат Антона, археолаг, этнограф, палітык, арганізатар беларускага нацыянальнага жыцця ў 1903-1919 гг.,

Лысенка Трафім (1898-1976), савецкі аграбіёлаг,

Мазураў Кірыла (1914-1989), партыйны дзеяч, у 1953-1956 гг. прэм’ерміністр урада БССР, а ў 1956-1965 гг. I сакратар ЦК КПБ,

Майсеня Анатоль (1956-1986), палітолаг, дырэктар Цэнтра стратэгічных ініцыятыў “УсходЗахад”,

Малафееў Анатоль (н. 1933), у 1990-1991 гг. старшыня КПБ, з 1996 г. старшыя створанай прэзідэнтам Лукашэнкам Палаты Прадстаўнікоў,

Марачкін Аляксей (н. 1940) мастак, дзеяч дэмакратычнай апазіцыі,

Масціцкі Ігнацы (1867-1946), хімік, палітык польскага санацыйнага лагера, у 1926-1939 гг. прэзідэнт Польскай Рэспублікі,

Мацвей (сапр.: Сямашка Канстанцін), праваслаўны капелан польскага войска, з 1938 г. епіскап, пасля вайны ў Лондане заснаваў Польскую праваслаўную царкву ў эміграцыі,

Машэраў Пётр (1918-1980), савецкі партыйны дзеяч, арганізатар партызанскага руху ў акупаванай немцамі Беларусі, у 1965-1980 гг. І сакратар ЦК КПБ,

Мікалай ІІ Раманаў (1868-1918), апошні цар Расіі,

Мікуліч Барыс (1912-1954), пісьменнік,

Мічуліс,

Младзяноўскі Казімеж (1880-1928), польскі палітык, міністр унутраных спраў у 1926 г., аўтар “Указанняў у справе стаўлення ўлад да нацыянальных меншасцей”,

Мураўёў Міхаіл (1796-1866), віленскі генералгубернатар у 1863-1865 гг., праславіўся жорсткімі метадамі падаўлення паўстання 1863-1864 гг.,

Мухін Сяргей, дзеяч незалежных прафсаюзаў,

Мяйштовіч Аляксандр (1864-1943), польскі палітык, старшыня Часовай правячай камісіі Сярэдняй Літвы, у 1926-1928 гг. міністр юстыцыі,

Мяркулаў Усевалад, работнік мінскага НКУС у 30-х гадах,

Мяснікоў (сапр.: Мяснікян) Аляксандр (1886-1925), адзін з кіраўнікоў кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1917-1918 гг. старшыня ПаўночнаЗаходняга абласнога камітэта РКП(б),

Мятла Пётр (1890-1936), беларускі дзеяч у ІІ Рэчы Паспалітай, адзін з правадыроў Беларускай сялянскаработніцкай грамады, у выніку абмену палітвязнямі апынуўся ў БССР, арыштаваны ў 1933 г., памёр у лагеры,

Навуменка Віктар, адзін з заснавальнікаў Беларускай нацыянальнадэмакратычнай партыі,

Назарэўскі Аляксандр, беларускі дэпутат Сейма РП у 1922-1926 гг.,

Наседкін,

Наталевіч Нічыпар (1900-1964), камуністычны дзеяч, у 1938-1947 гг. старшыня Вярхоўнага Савета БССР,

Новікаў Васіль (н. 1946), дзеяч Беларускай камуністычнай партыі, у 1995-1996 гг. адзін з правадыроў парламенцкай антыпрэзідэнцкай апазіцыі,

Падарэўскі Ігнацы (1860-1941), піяніст, кампазітар, польскі палітык, прэм'ерміністр урада ў 1919-1920 гг., прадстаўнік Польшчы ў Лізе Нацый,

Пазьняк Зянон (н. 1944), археолаг, гісторык мастацтва, палітык, старшыня БНФ, лідэр парламенцкай апазіцыі ў 1990-1995 гг., з 1996 г. у эміграцыі,

Палуян Сяргей (1890-1910), пісьменнік, публіцыст,

Панамарэнка Панцеляймон (1902-1984), савецкі партыйны дзеяч, арганізатар савецкага падполля ў Беларусі ў 1941-1944 гг., І сакратар ЦК КП(б)Б у 1938-1947 гг., прэм'ерміністр урада ў 1944-1948 гг.,

Панікоўскі Антоні (1878-1949), польскі палітык, прэм'ерміністр урада ў 1918 і 1921-1922 гг., прафесар Варшаўскага політэхнічнага інстытута,

Пашкевіч Алаіза (1876-1916), паэтэса, публіцыстка, пачынальніца беларускага нацыянальнага жыцця ў пачатку XX ст.,

Пілсудскі Юзаф (1867-1935), у 1918-1922 гг. начальнік Польскай дзяржавы, пасля вайсковага перавароту ў 1926 г. кантраляваў усю ўладу ў Польшчы,

Пільх Адольф, псеўд.: Гура, камандзір стаўбцоўскага згуртавання Арміі Краёвай,

Посахаў Сяргей,

ПраўдзіцШляскі Януш, камендант навагрудскай акругі Арміі Краёвай,

Прушынскі Аляксандр, псеўд.: Гарун Алесь (1887-1920), паэт, празаік, драматург, прапагандыст беларускага нацыянальнага адраджэння, ініцыятар абвяшчэння незалежнасці БНР,

Прымакоў Яўгеній (н. 1930), эканаміст, журналіст, работнік савецкай разведкі, у 1996-1998 гг. міністр замежных спраў, а ў 1998-1999 гг. прэм'ерміністр урада Расіі,

Прыстар Аляксандр (1874-1941), польскі палітык санацыйнага лагера, у 1931-1933 гг. прэм'ерміністр урада, у 1935-1938 гг. старшыня Сената,

Прытыцкі Сяргей (1913-1971) камуністычны дзеяч у ІІ Рэчы Паспалітай, у 1936 г. здзейсніў замах на правакатара падчас судовага працэсу, арганізатар савецкага падполля ў перыяд нямецкай акупацыі, з 1968 г. старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР,

Прышчэпаў Дзімітрый (1896-1940), у 1924-1929 гг. народны камісар сельскай гаспадаркі, арыштаваны ў 1930 г. за спрыянне "кулацтву", памёр у турме,

Рагуля Барыс (н. 1923), у 1942-1943 гг. дзеяч Беларускай

народнай самапомачы, адзін з камандзіраў БКА, з 1944 г. у эміграцыі,

Рагуля Васіль (1879-1955), дэпутат і сенатар парламента II Рэчы Паспалітай, лідэр Беларускага сялянскага саюза, з 1944 г. у эміграцыі,

Радзівіл Магдалена, з д. Кяжгайла (1861-1945), жонка князя Мікалая Радзівіла, падтрымоўвала беларускі рух, у сваіх маёнтках арганізавала беларускія школкі, з 1922 г. у эміграцыі,

Разумовіч Вячаслаў, у 1920-1922 гг. камандзір беларускай антыпольскай падпольнай арганізацыі, падначаленай ураду БНР,

РакМіхайлоўскі Сымон (1885-1937), арганізатар і ўдзельнік I Усебеларускага з'езда, член Рады БНР, арганізатар Таварыства беларускай школы, адзін з лідэраў БСРГ, з 1931 г. дырэктар Дзяржаўнага музея ў Мінску, арыштаваны ў 1933 г., расстраляны,

Рапапорт Пётр, расійскі камуністычны дзеяч, у 1929-1931 гг. кіраваў Аддзелам палітупраўлення БССР, адзін з ініцыятараў барацьбы з "нацыянальным дэмакратызмам",

Руцкой Барыс,

РыдзСміглы Эдвард (1886-1941), блізкі супрацоўнік Юзафа Пілсудскага, у 1917-1918 гг. камендант Польскай вайсковай арганізацыі, з 1936 г. маршал Польшчы,

Сабалеўскі Юрый (1889-1957), член кіраўніцтва Беларускай сялянска-работніцкай грамады, у 1943-1944 гг. віцэпрэзідэнт Беларускай Цэнтральнай Рады,

Сава (Саветаў), праваслаўны епіскап, у 1936 г. вікарны епіскап Люблінскай епархіі, у 1937-1939 гг. узначальваў Гродзенскую епархію, падтрымоўваў рух праваслаўных палякаў,

Саевіч Пётр, у 1945-1951 гг. міністр асветы БССР,

Сакалоў Яфрэм, у 1986-1990 гг. I сакратар ЦК КПБ,

Саковіч Юльян (1906-1943), у 30-х гадах дзеяч камуністычнага беларускага студэнцкага руху ў Вільні, у 1942-1943 гг. шэф Мінскай акругі Беларускай народнай самапомачы,

Свідэрскі Стэфан, у 1932-1935 гг. навагрудскі ваявода,

Селязнёў Генадзій, з 1996 г. старшыяня расійскай Дзяржаўнай Думы,

Серада Іван (1879-1943), у 1917 г. старшыня Выканаўчага камітэта Беларускай цэнтральнай вайсковай рады, у 1918 г. старшыня Рады БНР, у 20-х гг. працаваў у Інстытуце беларускай культуры і Сельскагаспадарчай акадэміі, арыштаваны ў 1930 г., шмат разоў падвяргаўся ссылкам за антысавецкую дзейнасць,

Сікорскі Уладзіслаў (1881-1943), генерал, польскі палітык, у 1922-1923 гг. прэм'ерміністр урада, у 1924-1925 міністр вайсковых спраў, праціўнік Ю. Пілсудскага, у 1939-1943 гг. прэм'ерміністр

www.kamunikat.org

польскага эміграцыйнага ўрада і галоўнакамандуючы,

Скірмунт Раман (1868-1939), палітык, памешчык, у 1917 г. Старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта, у 1918 г. член Рады БНР, пасля 1918 г. адышоў ад палітычнага жыцця, забіты камуністычнымі партызанамі ў верасні 1939 г.,

СлавойСкладкоўскі Феліцыян (1885-1962), польскі палітык санацыйнага лагера, у 1926-1929 і 1930-1936 гг. міністр унутраных спраў, у 1936-1939 гг. прэм'ерміністр урада РП,

Слюнькоў Мікалай, партыйны дзеяч, у 1983-1986 I сакратар ЦК КПБ,

Смоліч Аркадзь (1891-1938), эканаміст, картограф, палітык, удзельнік стварэння БНР, адзін з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, член кіраўніцтва Інстытута беларускай культуры, а пазней Акадэміі навук Беларусі, арыштаваны ў 1930 г. і абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці, расстраляны,

Собаль Міхал, дзеяч незалежных прафсаюзаў,

Срокаўскі Канстанты (1878-1935), польскі палітычны дзеяч, публіцыст газеты "Slowo Polskie" ("Слова польскае"), адзін з лідэраў Польскай дэмакратычнай партыі,

Сталін (сапр.: Джугашвілі) Іосіф (1879-1953),

Станкевіч Адам (1891-1949), каталіцкі духоўны, гісторык, публіцыст, палітычны і грамадскі дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, у 1924-1926 гг. старшыня Таварыства беларускай школы, рэдактар "Крыніцы", памёр у ссылцы ў Сібіры,

Станкевіч Станіслаў, у 1942-1943 гг. шэф Беларускай народнай самапомачы ў Барысаўскай акрузе,

Станкевіч Янка (1891-1976), мовазнаўца, гісторык, педагог, палітычны дзеяч, падчас нямецкай акупацыі паплечнік Вацлава Іваноўскага, прыхільнік супрацоўніцтва з польскім падполлем, з 1944 г. у эміграцыі,

Статкевіч Мікола (н. 1956), палкоўнік, палітычны дзеяч, заснавальнік Беларускага згуртавання вайскоўцаў, у 1993 г. звольнены з войска, з 1996 г. старшыня апазіцыйнай Беларускай сацыялдэмакратычнай партыі,

Стаяноўскі,

Стрэльчык Барыс, дзеяч Беларускага нацыянальнага камітэта ў Варшаве,

Сьвіда Юзаф, псеўд.: Лех, камандзір Наднёманскага згуртавання АК,

Сярэдзіч Іосіф, у 1990-1995 гг. галоўны рэдактар "Народнай

Газеты”, з 1996 г. выдае газету “Народная Воля”,

Тарашкевіч Браніслаў (1892-1938), філолаг, палітык, правадыр Беларускай сялянскаработніцкай грамады, аўтар беларускай граматыкі, перакладчык Іліяды і Пана Тадэвуша на беларускую мову, у выніку абмену палітвязнямі ў 1933 г. апынуўся ў Мінску, расстраляны за шпіянаж у карысць Польшчы,

Ткачоў Міхась (1942-1992), археолаг, гісторык, палітык, намеснік старшыні Беларускага народнага фронту, заснавальнік і старшыня Беларускай сацыялдэмакратычнай грамады (1991-1992),

Троцкі (сапр.: Бранштэйн) Леў (1879-1940), член вузкага кіраўніцтва бальшавіцкіх улад, ідэолаг расійскага камунізму, у 1927 г. выдалены з партыі, забіты ў Мексіцы агентам НКУС,

Трусаў Алег (н. 1954), археолаг, палітык, у 1990-1995 дэпутат Вярхоўнага Савета, у 1992-1995 гг. старшыня Беларускай сацыялдэмакратычнай грамады,

Тугут Станіслаў (1873-1941), польскі палітык, адзін з лідэраў сялянскай партыі ПСЛ “Вызваленне”, у 1924-1925 гг. віцэпрэм’ер урада,

Тумаш Вітаўт (н. 1910), у 30-х гг. дзеяч Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, у 1941 г. бургамістр Мінска, з 1943 г. рэдактар берлінскага штотыднёвіка “Раніца”, пасля вайны ў эміграцыі,

Уласаў Аляксандр (1874-1941), выдавец, публіцыст, палітычны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады, выдавец і рэдактар “Нашай нівы”, сенатар парламента II Рэчы Паспалітай, арыштаваны работнікамі НКУС у 1939 г.,

Умястоўскі Францішак (1882-1940), адзін з заснавальнікаў Круга беларускай народнай прасветы і культуры (1902), рэдактар “Нашай долі”, у 1927-1928 гг. у Вільні выдаваў штотыднёвік “Беларускі дзень”, афіцэр запаса польскага войска, загінуў у Катыні,

Фальскі Усевалад (1877-1924), акцёр тэатра, у 1917-1918 гг. дзеяч беларускага нацыянальнага руху, з 1919 г. член улад БССР, арыштаваны і прыгавораны ў 1921 г. за антысавецкую дзейнасць,

Фрунзе Міхаіл (1885-1925) савецкі каманадзір, народны камісар па ваенных і марскіх справах, суарганізатар Чырвонай Гвардыі, а пазней Чырвонай Арміі,

Фядута Аляксандр, у 1980-х гг. камсамольскі дзеяч, член выбарчага штаба Аляксандра Лукашэнкі, з 1995 г. незалежны публіцыст,

Хадкевіч Тарас (1912-1975), паэт, публіцыст,

Хадыка Юрый (н. 1938), фізік, дзеяч БНФ,

Хазбулатаў Руслан, у 1993-1994 старшыня расійскай Дзяржаў-

www.kamunikat.org

най Думы, правадыр бунту супраць улады прэзідэнта Ельцына,

Ханяўка Чэслаў, у 1941-1944 гг. дзеяч Беларускага нацыянальнага камітэта ў Варшаве і Беластоку,

Хвецька Люцыян, заснавальнік і першы рэдактар "Крыніцы" (1917), дзеяч беларускага хрысціянскадэмакратычнага руху,

Хрушчоў Мікіта (1894-1971), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1953-1964 гг. I сакратар ЦК КПСС, у 1958-1964 гг. прэм'ерміністр урада СССР,

Цанава Лаўрэнцій (?-1955), у 1939-1951 гг. народны камісар унутраных спраў Беларусі, адказны за праследаванні і палітычныя судовыя працэсы,

Цвікевіч Аляксандр (1888-1937), гісторык, філосаф, палітык, у 1919-1923 гг. міністр замежных спраў БНР, у 1923-1925 гг. прэм'ерміністр урада БНР, у 1929-1930 гг. прафесар гісторыі Акадэміі навук Беларусі, арыштаваны ў 1930 г., расстраляны,

Цімафей, у міры: Ежы Шрэтэр (1901-1961), праваслаўны вайсковы капелан, у 1938-1952 гг. епіскап Люблінскі, у 1951-1959 гг. епіскап Беластоцкі і Гданьскі, у 1959-1961 гг. мітрапаліт Праваслаўнай царквы ў Польшчы,

Ціцянкоў Іван (н. 1953), загадчык гаспадаркі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі,

Цярэшчанка Кузьма (?-1923), член улад БНР, у 1919-1920 гг. старшыня Часовага беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску, прыхільнік супрацоўніцтва з Польшчай,

Чавус Пётр, генерал, у 1991-1992 гг. міністр абароны РБ,

Чарвякоў Аляксандр (1892-1937), беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, у 1920-1924 гг. старшыня Савета Народных Камісараў БССР, член ЦК КП(б)Б, у 1937 г. арыштаваны і абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці, пакончыў самагубствам,

Чарнамырдзін Віктар, у 1993-1998 гг. прэм'ерміністр урада Расіі,

Чыгір Міхаіл (н. 1948), беларускі дзяржаўны дзеяч, у 1994-1996 гг. прэм'ерміністр урада РБ,

Шаптыцкі Станіслаў (1867-1950), генерал, польскі палітык, у 1918 г. шэф Генштаба Войска Польскага, у 1923 г. міністр вайсковых спраў, пасля вайны старшыня Польскага чырвонага крыжа,

Шарэцкі Сямён, у 1995-1996 гг. старшыня Вярхоўнага Савета, адзін з кіраўнікоў парламенцкай антыпрэзідэнцкай апазіцыі,

Шахрай Сяргей, з 1997 г. віцэпрэм'ер Расіі,

Шкуцька Анатоль, у 1939-1945 гг. кіраўнік Беларускага прадстаўніцтва пры Міністэрстве ўнутраных спраў III Рэйха,

Шмыгалёў Яўген,

Шушкевіч Станіслаў Пятровіч (1908-1991), паэт, празаік, больш 15 гадоў правёў у турмах, лагерах, месцах прымусовай работы,

Шушкевіч Станіслаў Станіслававіч (н. 1934), прафесар фізікі Белдзяржуніверсітэта, палітык, у 1991-1994 г. старшыня Вярхоўнага Савета,

Шчорс Мікола, лекар, палітык, у 1930-х гадах дзеяч Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, старшыня Беларускага нацыянальнага цэнтра (1941),

Шыманюк Герман "Скамарох" (1893-?), акцёр, у 1921-1922 гг. камандзір партызанскага атрада на Беласточчыне,

Шыркоўскі Эдуард, у 1990-1993 гг. шэф беларускага КДБ,

Шэйман Віктар, сакратар камітэта бяспекі ў адміністрацыі прэзідэнта Лукашэнкі,

Ягодзін,

Ягораў Уладзімір (н. 1939), работнік савецкага КДБ, у 1985-1986 гг. міністр унутраных спраў Латвійскай ССР, у 1990-1994 гг. міністр унутраных спраў Беларусі,

Якавюк Сымон (1881-1974), дэпутат Беларускага пасольскага клуба (1922-1923), адзін з правадыроў антыпольскай канспірацыі на Беласточчыне,

Ялбжыкоўскі Рамуальд (1876-1955), архібіскуп, з 1925 г. віленскі мітрапаліт,

Ярэміч Фабіян (1891-1958), дэпутат Сейма II Рэчы Паспалітай, старшыня Беларускага сялянскага саюза,

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

# Змест

Прадмова навуковага рэдактара

Уступ

РАЗДЗЕЛ 1. Беларусь у складзе Расеі
Фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі
Насельніцтва Беларусі ў пачатку XX стагоддзя
Час вайны, міграцыі і рэвалюцыі

РАЗДЗЕЛ 2. Змаганне за сваю дзяржаўнасць
Беларуская Народная Рэспубліка
Стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі
Польска-савецкая вайна. Падзеі на Беларусі

РАЗДЗЕЛ 3. Савецкая Беларусь (1921-1939)
Нэп і беларусізацыя краіны
Барацьба супраць "нацыянал-дэмакратаў"
Калектывізацыя
У сацыялізм - праз Курапаты

РАЗДЗЕЛ 4. Беларусы ў II Рэчы Паспалітай
Грамадства і гаспадарка
Прагматыкі і партызаны
Грамадаўская рэвалюцыя
Камуністы і прыхільнікі лаяльнасці
Стаўленне санацыйнага лагера да беларускага пытання

РАЗДЗЕЛ 5. Яднанне пад савецкім скіпетрам (1939-1941)
Ад імя народа Заходняй Беларусі
Усталяванне савецкай сістэмы ўладаў у Заходняй Беларусі
Эканамічная палітыка
Асветная, культурная і канфесійная палітыка
Арышты і дэпартацыі

РАЗДЗЕЛ 6. Нямецкая акупацыя Беларусі
Адступленне Чырвонай Арміі
Нямецкая акупацыйная палітыка
Партызанскі рух
Беларуская Цэнтральная Рада
Ваенныя страты

РАЗДЗЕЛ 7. Уніфікацыя палітычнай і гаспадарчай сістэмы БССР (1944-1956)
Карэктаванне межаў і перасяленні
Аднаўленне гаспадаркі
Калектывізацыя Заходняй Беларусі
Рэпрэсіі не спыняюцца
Беларуская культура перыяду пасляваеннага сталінізму
Школьніцтва

www.kamunikat.org

РАЗДЗЕЛ 8. Ударніцтва ў пабудове камунізму (1956-1990)
Рэфармаванне сталінізму
Пабудова цяжкай прамысловасці
Дабрабыт эпохі Машэрава
Нарастанне гаспадарчага крызісу
Наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС
Русіфікацыя

РАЗДЗЕЛ 9. Суверэнная Беларусь
Дэмакратычная апазіцыя і нацыянальнае адраджэнне
Структурныя перамены 1989-1995 гадоў
Куды вядзе Беларусь Аляксандар Лукашэнка?

Імянны паказальнік

www.kamunikat.org